Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў

**І. Н. Колабава**

# НУМІЗМАТЫКА

*Рэкамендавана вучэбна-метадычным аб’яднаннем
па гуманітарнай адукацыі ў якасці дапаможніка
для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці
«Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны»*

Мінск
БДУКМ
2024

УДК 94:737.1(476)(075.8)
ББК 63.221(4Беи)я73
К 60

Р э ц э н з е н т ы :
*кафедра* археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта;
*М. М. Елінская,* кандыдат гістарычных навук, вядучы рэферэнт
аддзела арганізацыйнай работы, інфармацыі і выкарыстання
дакументаў Дэпартамента па архівах і справаводстве
Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь

**Колабава, І. Н.**
К 60 Нумізматыка : дапам. / І. Н. Колабава ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2024. – 180 с.
ISBN 978-985-522-361-1.

Разглядаюцца асновы агульнай нумізматыкі, пытанні гісторыі грашовага абарачэння на тэрыторыі Беларусі. Лекцыйны матэрыял суправаджаецца ілюстрацыямі, якія не толькі наглядна паказваюць усю разнастайнасць грашовых знакаў, але і дапамагаюць уявіць этапы цывілізацыйнага развіцця нашых продкаў. Дапаможнік уключае кароткі слоўнік нумізматычных тэрмінаў і табліцу коштаў на разнастайныя тавары і паслугі ў другой палове XVII–XVIII ст.

Адрасуецца студэнтам устаноў вышэйшай адукацыі, выкладчыкам і ўсім, хто цікавіцца нумізматыкай.

**УДК 94:737.1(476)(075.8)**
**ББК 63.221(4Беи)я73**

**ISBN 978-985-522-361-1**

© Колабава І. Н., 2024
© Афармленне. Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», 2024

# ЗМЕСТ

УВОДЗІНЫ ………………………………………………………..………... 4

**Раздзел I**
**АСНОВЫ НУМІЗМАТЫКІ ЯК НАВУКІ**

Тэма 1.1. Прадмет, крыніцы і метады нумізматычных даследаванняў. Нумізматычнае калекцыяніраванне. Станаўленне навуковай нумізматыкі ……………………………………………………...… 6
Тэма 1.2. Тавар і грошы ……………………………………….……. 22
Тэма 1.3. Манета. Матэрыяльныя і знешнія характарыстыкі. Манеты нерэгулярных эмісій. Манета ў нумізматычным зборы …… 29
Тэма 1.4. Тэхніка манетнай вытворчасці ……………………..….… 44
Тэма 1.5. Грашовыя скарбы – помнікі гісторыі і культуры ….…… 54

**Раздзел II**
**ГІСТОРЫЯ ГРАШОВАГА АБАРАЧЭННЯ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (канец I – пачатак XXI ст.)** 62

Тэма 2.1. Перыяд рымскага дэнарыя (канец I – сярэдзіна V ст.). Перыяд куфіцкага дырхама (пачатак IX – канец X ст.) ……………..…… 63
Тэма 2.2. Перыяд заходнееўрапейскага дэнарыя (канец X – канец XI ст.) ……………………………..........……………………..… 72
Тэма 2.3. Безманетны перыяд [другі] (канец XI–XIII ст.). Перыяд пражскага гроша (XIV – канец XV ст.) …………………………....... 82
Тэма 2.4. Грашовае абарачэнне ў канцы XV – сярэдзіне XVII ст. ….. 91
Тэма 2.5. Грашовае абарачэнне ў другой палове XVII – канцы XVIII ст. ……………………………………………………………...... 105
Тэма 2.6. Грашовае абарачэнне ў канцы XVIII ст. – кастрычніку / лістападзе 1917 г. …………………………………………………....... 118
Тэма 2.7. Грашовае абарачэнне ў савецкі перыяд (кастрычнік / лістапад 1917 – снежань 1991 г.) ………………………………………. 131
Тэма 2.8. Грашовае абарачэнне ў Рэспубліцы Беларусь (з 1991 г.) 149

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ …….……………………..…… 159

**Кароткі слоўнік нумізматычных тэрмінаў** ……………………..… 165
**Кошты на харчовыя, нехарчовыя тавары і паслугі ў другой палове XVII–XVIII ст**. ……………………………………………… 175

# УВОДЗІНЫ

Нумізматыка, якая вывучае канцэпт «грошы», з'яўляецца адной з самых займальных гістарычных дысцыплін. Унікальнасць гэтай навукі ў першую чаргу ў тым, што яе праблематыка непасрэдна закранае штодзённае жыццё як асобнага чалавека, так і грамадства. Грошы пранікаюць ва ўсе сферы грамадскіх стасункаў: з побытавых адносін да ўдзелу ў фарміраванні маральных, псіхалагічных, сацыяльна-эканамічных і палітычных узроўняў. Гэтая асаблівасць нумізматыкі абумоўлівае зацікаўленасць і пэўную лёгкасць засваення вучэбнага матэрыялу.

Нумізматыка ўваходзіць у склад курса «Спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны», які аб'ядноўвае шырокае кола інфармацыйна ёмістых асобных дысцыплін, што даследуюць і інтэрпрэтуюць разнастайныя гістарычныя крыніцы.

Да спецыяльных гістарычных дысцыплін адносяцца археаграфія, банiстыка, вексілалогія, генеалогія, геральдыка, гістарычныя геаграфія, метралогія, храналогія і анамастыка (складаецца з антрапанімікі, тапанімікі, этнанімікі, астранімікі, заанімікі, тэанімікі і інш.), а таксама дыпламатыка, палеаграфія, сфрагістыка, уніфармалогія, фалерыстыка, эмблематыка, эпіграфіка і інш.

Значнасць кожнай са спецыяльных гістарычных дысцыплін абумоўлена тым, што, аналізуючы ўнутраныя і знешнія асаблівасці адпаведных крыніц, яны, у выніку, пашыраюць інфармацыйнае поле даследавання гістарычнага развіцця чалавецтва.

Дысцыпліна «Нумізматыка» знаходзіцца ў міждысцыплінарных сувязях з такімі вучэбнымі прадметамі, як «Гісторыя Беларусі», «Археалогія», «Этналогія і этнаграфія Беларусі», «Метралогія», «Храналогія», «Анамастыка», «Генеалогія», «Геральдыка» і «Палеаграфія».

Мэта дапаможніка па дысцыпліне «Нумізматыка» – арганізаваць самастойнае авалоданне студэнтамі тэарэтычнымі асновамі вучэбнага курса, у якім разглядаюцца этапы развіцця гісторыі грашовага абарачэння на тэрыторыі Беларусі з канца I да пачатку XXI ст.

У кола задач дапаможніка ўваходзяць паслядоўнае раскрыццё зместу вывучаемай дысцыпліны і фарміраванне ў студэнтаў грунтоўнай тэарэтычнай базы адпаведных ведаў, неабходных уменняў і навыкаў для далейшай практычнай дзейнасці.

Вучэбная дысцыпліна «Нумізматыка» выконвае інфармацыйна-пазнавальную, даведачную, матывацыйную, самаадукацыйную, самакантралюючую і выхаваўчую функцыі.

У працэсе выкладання дысцыпліны асаблівую значнасць набывае выкарыстанне кампаратыўнага, нагляднага, праблемнага і некаторых іншых метадаў, якія ствараюць магчымасць паўнавартаснага разумення тэарэтычнага матэрыялу.

Трывалае засваенне нумізматычных ведаў патрабуе, у першую чаргу, стараннага вывучэння лекцыйнага і адпаведнага ілюстрацыйнага матэрыялу. Для дасканалага вывучэння асобных пытанняў неабходна пазнаёміцца з літаратурай, якая ўзгадваецца ў тэксце лекцый у выглядзе спасылак.

Для сістэматызацыі і вызначэння ўзроўню набытых тэарэтычных ведаў прапануюцца самастойнае падсумаванне пасля кожнай з лекцый і адказы на пастаўленыя пытанні для самаправеркі.

Карысным будзе азнаямленне з дадаткамі да дапаможніка. Кароткі слоўнік нумізматычных тэрмінаў у сціслым выглядзе прадстаўляе выкарыстаную ў дапаможніку тэрміналогію. Разуменне рэальнай вартасці асобных грашовых адзінак дапамагае сфарміраваць прыведзеная ў дадатковых матэрыялах табліца коштаў на разнастайныя тавары і паслугі ў другой палове XVII–XVIII стст.

Тэарэтычныя веды аб прыёмах экспанавання і навуковай апрацоўкі нумізматычных калекцый замацоўваюцца на практыцы пры наведванні студэнтамі нумізматычных музеяў. Агляд нумізматычных экспазіцый стварае магчымасць правядзення кампаратыўнага (параўнальнага) аналізу падыходаў розных музеяў да паказу гісторыі грашовага абарачэння на беларускіх землях.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Нумізматыка» студэнты знаёмяцца з прадметам, метадамі, інфармацыйнымі крыніцамі і дасягненнямі айчынных і замежных даследчыкаў у галіне навуковай нумізматыкі. Выкарыстанне набытых тэарэтычных ведаў пашырае магчымасці самастойнай работы ў сферах музейнай, турыстычнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны краіны.

* * *

Аўтар дапаможніка выказвае бязмерную ўдзячнасць аўтарам манаграфій, навуковых, навукова-папулярных артыкулаў і даведачных матэрыялаў, узгаданых у спісе выкарыстанай літаратуры. Сваімі працамі яны дапамаглі стварыць гэта вучэбнае выданне.

Асобная ўдзячнасць за падтрымку і парады шаноўным рэцэнзентам і маім дарагім шматгадовым калегам па кафедры гісторыка-культурнай спадчыны Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

Шчырая ўдзячнасць за неверагодны творчы патэнцыял і працавітасць калектыву рэдакцыйнага аддзела БДУКМ.

## Раздзел І
## АСНОВЫ НУМІЗМАТЫКІ ЯК НАВУКІ

### Тэма 1.1. Прадмет, крыніцы і метады нумізматычных даследаванняў. Нумізматычнае калекцыяніраванне. Станаўленне навуковай нумізматыкі

Нумізматыка (ст.-грэч. νόμος – звычай, закон, права, законны сродак плацяжу; νόμισμα – манета; адкуль у далейшым утвараецца тэрмін – numismatica – збор манет) – спецыяльная дысцыпліна, якая вывучае гісторыю манетных сістэм, грашовае абарачэнне, манетную вытворчасць, манетнае права, грашовыя рэформы, працэсы скарбаўтварэння і інш.

Неабходна ўдакладніць, што ў межах выкладання вучэбнай дысцыпліны «Нумізматыка» гісторыя грашовага абарачэння разглядаецца ў асноўным у рэчышчы грашовых (манетных) сістэм.

Прадстаўлены ў дапаможніку лекцыйны матэрыял практычна не ўключае (акрамя асобных выпадкаў) вывучэнне іншых складовых частак паняцця «грашовая гаспадарка» ў шырокім разуменні (напрыклад, адсутнічае падрабязны разгляд функцыянавання папяровых грашовых эмісій, бон і іншых каштоўных папер; безнаяўных плацяжоў, разнастайных відаў электронных грошай – грошай на электронных кашальках, крыптавалюты, віртуальных грошай для гульняў і інш.).

Навуковая і даведачная літаратура адлюстроўвае гісторыю фарміравання вызначэння паняцця «нумізматыка» – ад спрошчанага да разгорнутага варыянта, у якім падаецца больш дакладны і шырокі пералік усіх напрамкаў вывучэння гісторыі развіцця грашовых адносін у грамадстве.

Аўтары нумізматычных даследаванняў у другой палове XX ст., як правіла, характарызавалі нумізматыку як навуку, што вывучае манеты і манетныя скарбы, гісторыю тавара-грашовага абарачэння. Даследчыкі адзначалі ролю грошай і грашовых сістэм у эканамічным і культурным развіцці асобных краін і народаў у тую ці іншую эпоху.

Найбольш поўным і дакладным з’яўляецца вызначэнне нумізматыкі, распрацаванае В. Н. Рабцэвічам (1995): *«нумізматыка вывучае гісторыю грашова-вагавых і манетных сістэм, характар іх узаемадзеяння і ўзаемаўплыву ў ходзе эканамічных, палітычных і культурных кантактаў этнасаў і дзяржаў; грашовае абарачэнне і яго ўзаемасувязі з таварнымі рынкамі; арганізацыю і тэхніку манетнай вытворчасці; станаўленне і эвалюцыю манетнага права; грашовыя рэформы; працэсы скарбаўтварэння і іх прычыны»*[*] [54, с. 3].

[*] Пераклад наш.

Адзначым, што калі на мяжы XIX–XX стст. нумізматыка яшчэ лічылася часткай археалогіі, то ў апошнія дзесяцігоддзі XX ст. яна перарасла значэнне «дапаможнай» і сфарміравалася як самастойная спецыяльная гістарычная дысцыпліна. Больш таго, у другой палове XX ст. паняцце «нумізмат» паступова адасобліваецца ад тэрміна «калекцыянер».

Сучаснае нумізматычнае даследаванне ўяўляе сабой комплексны працэс, накіраваны на пашырэнне інфармацыі аб прасторы, у якой разгортваліся пэўныя гістарычныя падзеі. Нумізматычныя крыніцы спрыяюць вырашэнню разнастайных праблем не толькі ў сферы гісторыі грашовага абарачэння, але і з'яўляюцца носьбітам унікальнай інфармацыі, якая закранае практычна ўсе бакі сацыяльна-палітычнага, эканамічнага развіцця краіны, а таксама і штодзённага жыцця асобы.

Пераўтварэнню нумізматыкі ў самастойную галіну гістарычных ведаў садзейнічалі значныя якасныя і колькасныя змены ва ўзроўні нумізматычных даследаванняў. Нумізматыка мае свае спецыфічныя крыніцы, тэрміналагічны апарат, робіць каштоўны ўнёсак у вырашэнне складаных гістарычных праблем.

*Прадметам вывучэння нумізматыкі* з'яўляюцца *манеты, манетныя скарбы, даманетныя сродкі плацяжу (таварагрошы).* Папяровыя грошы – прадмет вывучэння спецыяльнай гістарычнай дысцыпліны – баністыкі.

*Нумізматычныя крыніцы* падзяляюцца на 2 групы: *асноўныя* (манеты і манетныя скарбы, матэрыялы і прылады манетнай чаканкі, гіркі-разнавагі – для праверкі масы манет) і *дапаможныя* (таварагрошы; пісьмовыя крыніцы, звязаныя з манетным правам: дакументацыя манетных двароў, пастановы па рэформах манетнай справы і грашовага абарачэння, гандлёвыя дакументы, мытныя кнігі, тэстаменты, прыходна-расходныя кнігі, судовыя дакументы; творы мастацтва па адпаведнай тэматыцы, фалеронімы і пячаткі, што маюць аналагічную з манетамі тэхніку вытворчасці і інш.).

*Метадалогія* спецыяльных гістарычных дысцыплін характарызуецца спалучэннем і адпаведнай адаптацыяй агульнанавуковых і ўласных метадаў даследавання.

Пры аналізе якасных паказчыкаў манет выкарыстоўваюцца *фізічныя* і *хімічныя метады* вывучэння. Напрыклад, *рэнтгенафлуарэсцэнтны аналіз* дазваляе вызначыць хімічны склад металічнага сплаву на паверхні манеты. *Статыстычны* і *кампаратыўны* (параўнальны) *метады* спрыяюць фарміраванню аб'ектыўнай інфармацыйнай базы нумізматычных даследаванняў.

Асаблівую значнасць мае *тапаграфічны метад* вывучэння знаходак асобных манет і скарбаў. Месцы адкрыцця нумізматычных помнікаў, пазначаныя на карце, дапамагаюць даследчыку атрымаць рэальную карціну агульнай распаўсюджанасці і канцэнтрацыі тых ці іншых грашовых адзінак на адпаведнай тэрыторыі. У выніку з'яўляецца магчымасць выявіць міжнародныя сувязі, найбольш эканамічна развітыя рэгіёны, гандлёвыя цэнтры і шляхі.

У апошні час набывае папулярнасць *метад гісторыка-культурнага даследавання,* які дазваляе з пазіцый той ці іншай навуковай дысцыпліны звярнуцца да пэўных аспектаў духоўнага жыцця чалавека і ўстанавіць ролю фактару культуры ў гістарычным працэсе. З дапамогай гэтага метаду праводзіцца вывучэнне грошай як феномена культуры.

Асноўная задача сучаснай нумізматыкі – комплекснае даследаванне, накіраванае на ўзбагачэнне інфармацыйнага поля пэўных гістарычных падзей. Нумізматыка па розных параметрах цесна звязана з іншымі спецыяльнымі гістарычнымі дысцыплінамі (геральдыкай, сфрагістыкай, фалерыстыкай, метралогіяй, храналогіяй, палеаграфіяй, эпіграфікай, анамастыкай, генеалогіяй), а таксама з археалогіяй, музеязнаўствам, этналогіяй, філалогіяй і інш.

Напрыклад, даследаванне метралагічных параметраў і датаванне манеты патрабуе ведання метралагічных і храналагічных сістэм; чытанне манетных легенд немагчыма без знаёмства з асновамі палеаграфіі, эпіграфікі і анамастыкі; вызначэнне эмітэнта – асобы (арганізацыі), якая мае права чаканкі манеты, праводзіцца на аснове звестак радаводаў, якія складаюцца па законах генеалогіі; на манетах вельмі часта сустракаюцца выявы гербоў, чытанне якіх праводзіцца па правілах геральдыкі.

Тэма грошай, якія спрыяюць праяўленню і самых станоўчых, і самых негатыўных якасцей чалавека, знайшла шырокае асвятленне ў літаратуры, мастацтве, фальклоры. Сведчанне таму – шматлікія выказванні вядомых асоб аб месцы і значэнні грошай у жыцці чалавека.

Напрыклад, у Старажытнай Грэцыі філосаф Дэмакрыт (каля 460 – каля 370 да н. э.) канстатаваў, што сквапнасць да грошай, калі яна ненасытная, – горш за нястачу, а філосаф Арыстоцель (384–322 да н. э.) адзначаў, што грошы ў якасці меры робяць сувымернымі ўсе рэчы.

У Старажытным Рыме аратар і палітычны дзеяч Цыцэрон (106–43 да н. э.) разглядаў грошы як нервы вайны, паэт Гарацый (65–8 да н. э.) прыкмеціў, што грошы могуць быць і гаспадаром, і рабом таго, хто імі валодае, гісторык Святоній (каля 70 – пасля 122) перадае словы імператара Веспасіяна (9–79) аб тым, што грошы не маюць паху.

«Стары Запавет» папярэджвае, што той, хто любіць срэбра, той не наесца срэбрам і хто любіць багацце, таму няма карысці ад гэтага.

Французскі пісьменнік Анарэ дэ Бальзак (1799–1850) вызначаў жыццё як машыну, якую прыводзяць у рух грошы, а фінскі пісьменнік і журналіст Марці Ларні (1909–1993) выказаў арыгінальную думку аб непатрэбнасці рэкламы для прадукцыі манетнага двара.

Карл Маркс (1818–1883) сфармуляваў вызначэнне грошай як спецыфічнага тавару, які адыгрываў у гандлёвым свеце ролю ўсеагульнага эквіваленту.

Тэма грошай цесна перапляталася з гісторыяй жыцця герояў многіх літаратурных твораў, а таксама натхняла некаторых мастакоў на стварэнне адпаведных жывапісных твораў. Грашовая тэматыка вельмі папулярна і ў народным фальклоры.

Нумізматыка, як любая навука, пачыналася з доўгатэрміновага перыяду назапашвання фактычнага матэрыялу – калекцыяніравання манет. Манетныя зборы пачалі складацца ў антычныя часы, калі яны, у першую чаргу, павышалі прэстыж уладальніка, а самі манеты разглядаліся з эстэтычнага пункту гледжання, як прыгожыя вырабы. Зразумела, што нумізматычныя калекцыі выконвалі і эканамічную функцыю, з'яўляючыся сродкам акумуляцыі пэўнага багацця.

Да сярэдзіны XVI ст. у Еўропе, па звестках нідэрландскага мастака, навукоўца Губерта Гольца (Гальцыуса) (1526–1583), існавала прыкладна 950 мюнцкабінетаў (мінцкабінетаў), дзе экспанаваліся прыватныя нумізматычныя калекцыі [48, с. 10]. У гэты ж час паралельна з развіццём традыцыі манетнага збіральніцтва з'яўляецца і першая нумізматычная літаратура. Найбольш значныя прыватныя нумізматычныя калекцыі сталі ў далейшым асновай для фарміравання буйных манетных збораў еўрапейскіх дзяржаўных музеяў.

Менавіта ў сярэдзіне XVI ст. на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ) у рэзідэнцыях беларускіх магнатаў выстаўляліся першыя калекцыі манет, якія, не ў апошнюю чаргу, падтрымлівалі прэстыж уладальніка. У адпаведнасці з тагачаснай практыкай гэта былі ў большасці зборы антычных манет і медалёў.



Мікалай Радзівіл Чорны (1515–1565)

Найбольш каштоўнымі нумізматычнымі калекцыямі на той час валодалі прадстаўнікі заможных магнацкіх колаў, у першую чаргу, Радзівілы і Сапегі.

Заснавальнікам калекцыі манет і медалёў у Нясвіжы стаў вядомы дзяржаўны дзеяч, мецэнат, уплывовы прапагандыст рэфарматарскіх ідэй ***Мікалай Радзівіл Чорны*** (1515–1565), які мог пазнаёміцца з традыцыяй стварэння мюнцкабінетаў падчас вандровак у замежжа. Звесткі аб нясвіжскім манетным зборы носяць фрагмен-

тарны характар, тым не менш вядома, што калекцыя знаходзілася ў асобным памяшканні, манеты захоўваліся ў дзвюх спецыяльных скрынях з шуфлядамі. Унутры яны былі абабіты аксамітам і мелі асобныя заглыбленні для манет. Манеты былі падзелены па геаграфічнай прымеце (размеркаванне па дзяржавах) і мелі кароткае апісанне.

Калекцыя была складзена з манет Старажытнай Грэцыі і Рыма, ВКЛ, Польшчы і іншых еўрапейскіх краін. У 1812 г. іх колькасць складала 13 352 экз. [11, с. 16].

Па распараджэнні расійскіх улад у 1813 г. нумізматычны збор Радзівілаў быў беззваротна вывезены ў Харкаўскі ўніверсітэт.



Леў Сапега
(1557–1633)

Заснавальнікам манетнай калекцыі свайго роду стаў ***Леў Сапега*** (1557–1633). Першапачаткова манетны збор знаходзіўся ў Ружанскім палацы (Пружанскі раён Гродзенскай вобласці). Калекцыя (1125 экз. манет) складалася ў асноўным з антычных манет і насіла традыцыйна закрыты характар [11, с. 19]. У ходзе рэпрэсій пасля задушэння Польскага паўстання 1830–1831 гг. нумізматычная калекцыя Сапегаў была адпраўлена ў Санкт-Пецярбург і падзелена паміж Імператарскім Эрмітажам і Акадэміяй мастацтваў.

Аналагічныя па складзе манетныя зборы існавалі і ў іншых прадстаўнікоў магнацкіх колаў шляхты. Тагачасныя калекцыі пераважна складаліся з антычных манет, а іх уладальнікі здзяйснялі першыя спробы сістэматызацыі нумізматычных помнікаў. Экспазіцыі мюнцкабінетаў былі даступны для агляду абмежаванаму колу наведвальнікаў і насілі закрыты характар.

Уплыў асветніцкай ідэалогіі ў другой палове XVIII ст. прывёў да фарміравання на тэрыторыі Беларусі новых тэндэнцый у збіральніцкай дзейнасці. Уладальнікі манетных збораў імкнуліся папулярызаваць свае калекцыі і экспанаваць іх у невялікіх прыватных музеях.

У канцы XVIII–XIX ст. традыцыя нумізматычнага калекцыяніравання ахапіла шырокія колы грамадства. Старажытныя манеты сталі неад'емнай часткай многіх прыватных збораў і выстаўляліся ў экспазіцыях даступных для публікі музеяў рознай формы ўласнасці. Сістэматызацыя манетных калекцый у гэты час адбывалася ў адпаведнасці з новым узроўнем развіцця навуковых ведаў.

Сярод найбольш значных музейных устаноў канца XVIII – пачатку XX ст., якія мелі нумізматычныя калекцыі, можна назваць прыватны музей княгіні ***Ганны Ябланоўскай*** (1728–1800) у маёнтку Сямяцічы (Гродзенская губерня, зараз – Падляскае ваяводства, Польшча). Яго ўладальніца выкарыстоўвала свае зборы ў асветніцкіх мэтах. У далейшым калекцыя

старажытных манет і медалёў Г. Ябланоўскай была прададзена і захоўвалася ў Імператарскім Эрмітажы і Маскоўскім універсітэце.

У другой палове XIX ст. дэманстраванне старажытных манет стала для многіх музеяў шырокараспаўсюджанай з’явай.

Значнай нумізматычнай калекцыяй валодалі ***Канстанцін*** (1806–1868) і ***Яўстах Тышкевічы*** (1814–1873). Нумізматычны збор быў сістэматызаваны па геаграфічнай прымеце і размяшчаўся ў залах палаца ў Лагойску. У далейшым Я. Тышкевіч перадаў калекцыю залатых і срэбных манет і медалёў у Віленскі музей старажытнасцей (1855–1915). Нумізматычная калекцыя складалася з дзвюх частак – асобных манет і манетных скарбаў і займала адно з самых значных месцаў у музейных зборах. На працягу існавання Віленскага музея старажытнасцей манетная калекцыя актыўна папаўнялася за кошт падарункаў і перадачы скарбаў, знойдзеных на тэрыторыі Беларусі.



К. Тышкевіч
(1806–1868)



Я. Тышкевіч
(1814–1873)

У рэчышчы рэпрэсіўных мерапрыемстваў, разгарнуўшыхся пасля задушэння паўстання 1863–1864 гг., у музеі праведзена рэвізія фондаў, у выніку якой былі страчаны найбольш значныя для беларускай гісторыі музейныя прадметы. Па інфармацыі, прыведзенай Д. Грымалаўскайтэ, у 1866 г. у нумізматычным зборы музея налічвалася 8110 адзінак захоўвання, з іх у 1868 г. у Румянцаўскі музей вывозяцца 5995 адзінак (18 залатых манет, 3948 срэбных, 1997 медных, 14 бронзавых медалёў, 18 асігнацый) [31, с. 21]. Адсутнасць падрабязнага апісання не дае магчымасці дакладна вызначыць склад гэтай нумізматычнай калекцыі.

У адпаведнасці з каталогам Віленскага музея старажытнасцей за 1885 г. у «отделе И», у якім дэманстравалася нумізматычная калекцыя, былі прадстаўлены 5118 манет (без уліку дублетаў) і 1308 медалёў. Прыводзіўся і пералік краін, адкуль паходзілі манеты – Расія, Рэч Паспалітая, Швецыя, Англія, Францыя, Германія, Грэцыя, Рым, Турцыя, Данія, Італія, Іспанія, Швейцарыя. У каментарыі адзначалася, што «нумізматычная калекцыя па разнастайнасці і багацці складаючых яе прадметаў… займае першае месца ў шэрагу іншых аддзелаў музея» [31, с. 22].

У 1915 г. калекцыі Віленскага музея былі вывезены ў Маскву, а пасля 1921 г., за выключэннем археалагічнай, вернуты ў Вільню. Частка сучаснай экспазіцыі Нацыянальнага музея Літвы адведзена для паказу захаваўшыхся прадметаў з Віленскага музея старажытнасцей. З былой нумізматычнай калекцыі ў зборах музея зараз захоўваюцца адзін скарб і шведскія платы XVII ст. [31, с. 21].



М. Румянцаў
(1754–1826)

Гісторыя нумізматычнай калекцыі сям'і Тышкевічаў цесна звязана з гісторыяй краіны. У свой час яна была прадстаўлена ў экспазіцыі прыватнага Лагойскага музея, а затым стала асновай нумізматычнага збору Віленскага музея старажытнасцей, падзяліўшы з ім няпросты лёс.

Цікавая нумізматычная калекцыя належала дзяржаўнаму дзеячу, калекцыянеру, вядомаму мецэнату ***Мікалаю Пятровічу Румянцаву*** (1754–1826). Гэты збор знаходзіўся ў Гомелі і складаўся як з асобных манет, так і скарбаў, адкрытых на тэрыторыі Беларусі. Вядома, што ў 1825 г. усходні аддзел калекцыі складаўся з 950 манет, грэчаская частка антычнага аддзела ў 1828 г. налічвала 524 манеты. Пасля смерці М. Румянцава, гомельскія калекцыі былі перавезены ў Пецярбург, а потым у Маскву.



І. Паскевіч
(1782–1856)

Вялікая манетная калекцыя (некалькі тысяч экзэмпляраў) была і ў знакамітым музейным зборы ***Івана Фёдаравіча*** (1782–1856) і ***Фёдара Іванавіча Паскевічаў*** (1823–1903). Калекцыя таксама знаходзілася ў Гомелі і ў далейшым стала асновай для стварэння ў 1919 г. гарадскога музея.

Вядомым навукоўцам-нумізматам, бібліяфілам, збіральнікам мастацтва, аўтарам навуковых прац і манетных каталогаў, уладальнікам выбітнай нумізматычнай калекцыі (больш за 10 000 адзінак) з'яўляўся дзяржаўны дзеяч (займаў пасады віцэ-губернатара Ноўгарада і Санкт-Пецярбурга) ***Эмерык фон Гутэн-Чапскі*** (1828–1896). Зразумела, што такі вялікі нумізматычны збор мог быць скамплектаваны пры пэўным удзеле еўрапейскіх антыкварных фірм і наёмных агентаў, якія набывалі як асобныя манеты, так і цэлыя скарбы.

Калекцыі збіральніка экспанаваліся ў прыватным музеі ў радавым маёнтку Станькава недалёка ад Мінска, у спецыяльным павільёне «Скарбчык». Манетны збор захоўваўся ў драўляных шафах, упрыгожаных

радавым гербом Чапскіх «Ляліва». У музеі выдаваліся каталогі, і ён быў адкрыты для наведвання.


Э. фон Гутэн-Чапскі (1828–1896)

Э. фон Гутэн-Чапскі з’яўляўся фундатарам і адным з ініцыятараў заснавання Нумізматычнага таварыства, створанага ў 1888 г. у Кракаве. Друкаваным органам гэтага таварыства былі «Wiadomosci Numizmatyczno-Archeologiczne». У канцы жыцця Э. фон Гутэн-Чапскі прадаў збор расійскіх манет вялікаму князю Георгію Міхайлавічу, а астатнія манеты вывез у Кракаў, дзе яны і захоўваюцца ў фондах філіяла кракаўскага Нацыянальнага музея – Музея імя Э. Гутэн-Чапскага [11, с. 40–41].

Парэформенны перыяд адзначаны пэўнай дэмакратызацыяй сацыяльнага складу калекцыянераў. Нумізматычныя артэфакты праходзілі навуковую атрыбуцыю, калекцыі адкрываліся для свабоднага агляду і дэманстраваліся шырокім колам наведвальнікаў музеяў. Характэрнымі з’явамі сталі імкненне калекцыянераў да асэнсаванага збору і вывучэння мясцовага беларускага матэрыялу, разуменне неабходнасці захавання помнікаў сваёй гісторыі і культуры.

З другой паловы XIX ст., у адпаведнасці з існаваўшым парадкам, выяўленыя дэпазіты рэгістраваліся Імператарскай Археалагічнай камісіяй (1859–1917).

Пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг. і роспуску Віленскай археалагічнай камісіі (1855–1865) цэнтрамі збірання помнікаў даўніны ў губернскіх гарадах сталі музеі пры статыстычных камітэтах і царкоўна-археалагічныя музеі.

Значныя нумізматычныя калекцыі захоўваліся ў музеях Віцебскага і Гродзенскага статыстычных камітэтаў. Сабраныя манеты праходзілі атрыбутаванне, і звесткі аб іх заносіліся ў каталог.

Нумізматычныя калекцыі знаходзіліся і ў царкоўна-археалагічных музеях. У першую чаргу, неабходна адзначыць падобныя музеі ў Магілёве і Мінску. Царкоўна-археалагічныя музеі займаліся рознымі формамі асветніцкай працы (праводзілі экскурсіі, заняткі для вучняў, публічныя лекцыі), ажыццяўлялі першасную рэстаўрацыю музейных прадметаў, рыхтавалі і друкавалі музейныя каталогі і даведнікі.

Калекцыі ўзгаданых музейных устаноў у далейшым сталі асновай першых беларускіх музеяў савецкага перыяду.

Манетныя зборы былі таксама прадстаўлены ў некаторых музеях пры сярэдніх навучальных установах, напрыклад у музеі мясцовых старажытнасцей мужчынскай гімназіі ў Клімавічах (1911), музеі пры Мсціслаўскай духоўнай семінарыі (1915) і інш.

Нумізматычныя калекцыі гэтых навучальных устаноў насілі дыдактычны характар і выкарыстоўваліся для ілюстравання тэарэтычных ведаў і пашырэння кругагляду навучэнцаў.

Працягваўся і працэс стварэння прыватных музейных устаноў. У 1880-х гг. у Віцебску адкрыўся музей ***Вацлава Пятровіча Федаровіча*** (1848–1911), дзе сярод шматлікіх калекцый быў і нумізматычны збор, складзены ў асноўным са знаходак мясцовага паходжання.



А. Брадоўскі
(1859–1928)

Вядомым збіральнікам нумізматычных помнікаў у пачатку XX ст. быў віцебскі калекцыянер, загадчык заснаванага ў 1918 г. Віцебскага губернскага музея ***Антон Рафаілавіч Брадоўскі*** (1859–1928). Яго прыватная нумізматычная калекцыя ўтрымлівала значную колькасць сапраўдных рарытэтаў.

Нумізматычныя калекцыі В. Федаровіча і А. Брадоўскага ўвайшлі ў фонды Віцебскага губернскага музея і на наш час часткова прадстаўлены ў зборах Віцебскага абласнога краязнаўчага музея [71].

Такім чынам, у канцы XIX – пачатку XX ст. у грамадстве на хвалі абуджэння нацыянальнай самасвядомасці сфарміравалася разуменне таго, што музейныя калекцыі павінны быць даступны для шырокай аўдыторыі. З гэтага часу актыўна ствараюцца публічныя дзяржаўныя музеі. Нумізматычныя даследаванні накіраваны на справу навуковай апрацоўкі і захавання манетных знаходак.

У савецкі час на тэрыторыі Беларусі значная нумізматычная калекцыя знаходзілася ў Беларускім дзяржаўным музеі (1923). Яго фонды грунтаваліся на зборах Мінскага гарадскога і царкоўна-археалагічнага музеяў.

Высокую ступень развіцця нумізматычнае збіральніцтва ў міжваенны перыяд набыло на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы.



І. Луцкевіч
(1881–1919)

На пачатку XX ст. у Вільні сфарміравалася калекцыя беларускага археолага, этнографа, грамадскага дзеяча ***Івана Іванавіча Луцкевіча*** (1881–1919), у якую ўваходзіла і нумізматычная частка. Зборы І. Луцкевіча, перададзеныя ім у рэдакцыю «Нашай Нівы», сталі асновай для стварэння намаганнямі Беларускага навуковага таварыства ў 1921 г. Віленскага беларускага гісторыка-этнаграфічнага музея імя І. Луцкевіча (1921–1944/45).

Выбітны навуковец, нумізмат ***Юзэф Юзэфавіч Ядкоўскі*** (1890–1950) ініцыяваў адкрыццё ў Гродне дзяржаўнага музея, у фонды якога была перададзена і яго асабістая нумізматычная калекцыя [21]. У міжваенны перыяд у музеі ўтрымліваўся вялікі нумізматычны збор (больш за 15 тыс. манет), у якім было шмат рэдкіх экзэмпляраў. У пасляваенны перыяд Ю. Ядкоўскі загадваў Нумізматычным кабінетам Нацыянальнага музея ў Варшаве і займаўся актыўнай навуковай дзейнасцю.



Ю. Ядкоўскі
(1890–1950)

У перыяд Другой сусветнай вайны музейны нумізматычны фонд Беларусі быў амаль цалкам разрабаваны.

Новы этап у развіцці музейнага нумізматычнага калекцыяніравання ў Беларусі пачаўся ў пасляваенны час. Праводзіцца вялікая работа па адраджэнні беларускіх музеяў. У фондах абласных і многіх раённых музеяў практычна з нуля фарміруюцца нумізматычныя зборы.

У краіне працягваў развівацца і калекцыянерскі рух. Яшчэ ў 1921 г. была створана Савецкая філатэлістычная асацыяцыя, у якую ўваходзілі і калекцыянеры-нумізматы. Аднак у 1930-я гг. яна была ліквідавана. У 1966 г. калекцыянеры-нумізматы далучыліся да Усесаюзнага таварыства філатэлістаў, але ўжо ў 1969 г. дзейнасць нумізматычнай секцыі таварыства забараняецца.

У 1976 г. з’явілася заканадаўчая аснова для аднаўлення аматарскага нумізматычнага збіральніцтва – Указ «Аб здзелках з валютнымі каштоўнасцямі на тэрыторыі СССР» дазваляў савецкім грамадзянам праводзіць куплю-продаж і абмен манет з каштоўных металаў з мэтай калекцыяніравання. Але толькі ў 1990 г. развіццё нумізматычнага руху прывяло да ўтварэння Усесаюзнага аб’яднання калекцыянераў (Масква) і Усесаюзнага аб’яднання клубаў нумізматаў (Калінінград).

У сярэдзіне 1990-х гг. у Гродне ствараецца міжрэгіянальная грамадская арганізацыя «Беларускае нумізматычнае таварыства», якая з 2000 г. атрымала статус рэспубліканскага грамадскага аб’яднання.

Цэнтрамі музейнага нумізматычнага збіральніцтва ў сучаснай Беларусі сталі Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь, Нумізматычны кабінет музея гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Музей грошай Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, прыватны Музей Groshi, якія знаходзяцца ў Мінску.

Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь – найбуйнейшае сховішча манет і манетных скарбаў нашай краіны. Фарміраванне яго нумізматычнай калекцыі пачалося ў 1957 г. і працягваецца да сённяшняга часу. У калекцыі налічваецца больш за 52 тыс. манет і 120 скарбаў, знойдзеных на тэрыторыі Беларусі.

Нумізматычны збор музея складаецца з асобных манет, папяровых грошай, жэтонаў, грашовых і грашова-рэчавых скарбаў і ахоплівае ўсе перыяды гісторыі грашовага абарачэння на тэрыторыі Беларусі з канца I ст. па пачатак XXI ст. Багатая нумізматычная калекцыя музея дазваляе ствараць часовыя тэматычныя выставы, а таксама ўключаць узоры манетных эмісій у склад пастаяннай экспазіцыі.

Нумізматычны кабінет музея гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта быў заснаваны ў 1964 г. У яго аснову пакладзены прыватны збор манет вядомага беларускага нумізмата В. Рабцэвіча.

Калекцыя музея – гэта сістэматызаваны збор манет з антычнасці да нашага часу, які налічвае больш за 9 тыс. адзінак. У фондах Нумізматычнага кабінета захоўваецца больш за 40 грашовых і грашова-рэчавых скарбаў, адкрытых на тэрыторыі Беларусі [63, с. 4–5].

Экспазіцыя Нумізматычнага кабінета, створаная на гістарычным факультэце БДУ, першапачаткова размяшчалася ў двух пакоях галоўнага корпуса ўніверсітэта на праспекце Леніна (цяпер праспект Незалежнасці). У першым пакоі знаходзілася сістэматычная калекцыя манет, якія былі ў абарачэнні на тэрыторыі Беларусі. У экспазіцыі другога пакоя былі прадстаўлены беларускія скарбы.

Нумізматычны кабінет адразу набыў вялікую папулярнасць. Сярод яго наведвальнікаў былі студэнты, супрацоўнікі і госці ўніверсітэта. Трэба адзначыць, што гэта быў першы нумізматычны музей, створаны ў вышэйшых навучальных установах СССР. Яго калекцыя выкарыстоўвалася ў навучальным працэсе для непасрэднага азнаямлення студэнтаў з нумізматычным матэрыялам.

У далейшым, у сувязі з пераездам у 1992 г. гістарычнага факультэта ў корпус на вуліцу Чырвонаармейскую, туды быў перамешчаны і Нумізматычны кабінет. У ім была праведзена адпаведная рээкспазіцыя і значна ўзмоцнена сістэма аховы манетнага збору.

Папулярнасць Нумізматычнага кабінета, на жаль, прынесла яму і вельмі значныя страты, што адбыліся ў выніку двух рабаванняў.

Фонды кабінета на працягу яго існавання папаўняліся новымі скарбамі і асобнымі манетамі, прычым усе гэтыя набыцці – цалкам бескарыслівыя. У 2010 г. была адкрыта новая экспазіцыя, якая ў класічным стылі дэманструе сістэматычны збор манет і калекцыю скарбаў.

Экспазіцыя Нумізматычнага кабінета музея гістарычнага факультэта БДУ з'яўляецца самым паўнавартасным музейным адлюстраваннем гісторыі грашовага абарачэння на тэрыторыі нашай краіны. Сістэматызаваны збор асобных манет прадстаўляе практычна поўны набор асноўных грашовых наміналаў, што знаходзіліся ў абарачэнні на беларускіх землях. Удала дапаўняе агульную карціну развіцця гісторыі грошай на асобных яе этапах значная калекцыя скарбаў.

У іншым рэчышчы вырашана праблема экспанавання нумізматычнага збору ў Музеі грошай Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, дзе захоўваюцца больш за 20 грашова-рэчавых скарбаў. Акцэнт у экспазіцыі

музея, адкрытага ў 1996 г., робіцца на папулярызацыю гісторыі грашовага абарачэння ад антычнасці да сучаснасці праз стварэнне шэрагу адпаведных дыярам.

У экспазіцыі музея сабрана поўная калекцыя беларускіх памятных манет і матэрыялаў, звязаных з іх вытворчасцю (эскізы манет, гіпсавыя мадэлі, эталоны і працоўныя прылады). Грунтоўная калекцыя баністыкі (банкноты, каштоўныя паперы і купоны), сабраная ў музеі, адлюстроўвае працэс станаўлення Нацыянальнага банка як эмісійнага цэнтра [7, с. 17–18].

Нумізматычныя калекцыі ўваходзяць у фонды абласных і шэрагу раённых музеяў нашай краіны, але стан навуковай апрацоўкі асобных манет і манетных скарбаў беларускіх музеяў застаецца дастаткова незадавальняючым.

У музейных экспазіцыях нумізматычныя зборы выкарыстоўваюцца як дадатковы матэрыял для надання большага каларыту пры паказе адпаведных гістарычных падзей.

***

Асноўным этапам у развіцці кожнай навукі з'яўляецца перыяд яе заснавання. Такім часам стаў для навуковай нумізматыкі канец XVIII ст., калі прафесарам класічнай археалогіі Венскага ўніверсітэта, дырэктарам Імператарскага мюнцкабінета ў Вене, святаром-езуітам ***Ёганам-Іосіфам-Іларыям Экелем*** (1737–1798) былі *закладзены асновы* сістэматычнага навуковага *даследавання ў галіне нумізматыкі.* У 8-томнай працы «Вучэнне аб старажытных манетах» (1792–1798) на аснове гісторыка-геаграфічнага прынцыпу Ё. Экель правёў класіфікацыю больш за 70 тыс. антычных манет і стаў такім чынам заснавальнікам навуковай нумізматыкі [6, с. 83]. Неабходна адзначыць, што ўпершыню, але эпізадычна, геаграфічны парадак пры апісанні манет ажыццявіў у 1762 г. французскі навуковец Ж. Пэлерэн [48, с. 15].



Ёган-Іосіф-Іларый Экель
(1737–1798)

Цэнтрамі навуковай нумізматыкі і музейнага нумізматычнага калекцыяніравання ў свеце сталі – Брытанскі музей у Лондане, Аддзел медалёў і старажытнасцей Парыжскай Нацыянальнай бібліятэкі, Берлінскі мюнцкабінет, Венскі мюнцкабінет, Нацыянальны музей у Празе, Музей амерыканскага нумізматычнага таварыства ў Нью-Ёрку, Нацыянальны музей у Варшаве, Нацыянальны музей у Кракаве і інш.

Фіксацыяй нумізматычных аб'ектаў у Расіі займаліся Маскоўскае таварыства гісторыі і старажытнасцей (1804), Рускае археалагічнае таварыства (1846), Імператарская Археалагічная камісія (1859).

На тэрыторыі Беларусі пасля роспуску Віленскай археалагічнай камісіі (1855–1865) не засталося аніводнай навуковай установы.

У СССР фіксацыяй і навуковай апрацоўкай помнікаў нумізматыкі займаліся музейныя і акадэмічныя ўстановы – Камісія па нумізматыцы і гліптыцы (1918) пры Дзяржаўнай Акадэміі гісторыі матэрыяльнай культуры, аддзелы нумізматыкі Дзяржаўнага Эрмітажа (Ленінград) і Дзяржаўнага гістарычнага музея (Масква).

Значны ўклад у развіццё навуковай нумізматыкі зрабілі ў канцы XVIII–XX ст. аўстрыйскі нумізмат Ё. Мадэр, нямецкі даследчык Г. Гротэ, французскія нумізматы А. Анжэль і Р. Сэрур, польскі навуковец М. Гумоўскі, расійскія навукоўцы Х. Фрэн, А. Арэшнікаў, А. Ільін, А. Маркаў, І. Талстой, Р. Фасмэр, В. Янін, І. Спаскі і многія іншыя [48, с. 11–16].

Асобнае месца ў расійскай нумізматыцы належыць доктару гістарычных навук, стваральніку савецкай школы нумізматыкі І. Спаскаму (1904–1990).

Заснавальнікамі беларускай навуковай нумізматыкі з’яўляюцца П. Харламповіч (1884–?) і М. Шчакаціхін (1896–1940). Менавіта гэтыя навукоўцы першымі пачалі разглядаць манетную сістэму ВКЛ як сістэму самастойную і вызначылі асноўныя напрамкі вывучэння гісторыі грашовага абарачэння на тэрыторыі Беларусі.


П. Харламповіч
(1884–?)

Беларускі нумізмат ***Павел Васільевіч Харламповіч*** паходзіў з в. Рагачы Пружанскага павета Гродзенскай губерні [62]. У 1920-х гг. удзельнічаў у рабоце Мінскага таварыства гісторыі і старажытнасцей, гісторыка-археалагічнай і этнаграфічнай секцый Інбелкульта, выкладаў у БДУ, узначальваў Беларускі дзяржаўны музей.

П. Харламповічам у 1927 г. у першым нумары навуковага перыядычнага выдання «Гістарычна-археалагічны зборнік» былі надрукаваны артыкулы – «Манэтныя скарбы, знойдзеныя ў Беларусі, у зборах Беларускага Дзяржаўнага Музэю» і «Праскія грошы ў беларускіх манэтных скарбах».

У далейшым П. Харламповіч быў пазбаўлены працы, арыштаваны і сасланы на Поўнач СССР. Аб далейшым яго лёсе захаваліся адрывачныя і, магчыма, недакладныя звесткі.

***Мікалай Мікалаевіч Шчакаціхін*** нарадзіўся ў Маскве, у 1918 г. скончыў Маскоўскі ўніверсітэт. Працаваў у Харкаўскім музеі (1920), БДУ (1922–1924), Інбелкульце (1925–1928), АН БССР (1929–1930).

У 1930 г. быў арыштаваны ў сувязі са справай «Саюза вызвалення Беларусі» і высланы на 5 гадоў у г. Белябей Башкірскай АССР. Там працаваў планавікам у райспажыўсаюзе, а пазней – настаўнікам.

У ссылцы М. Шчакаціхін працягваў пачатую П. Харламповічам распрацоўку праблем беларускай нумізматыкі і напісаў (але, зразумела, не апублікаваў) некалькі навуковых артыкулаў па гісторыі грашовага абарачэння на тэрыторыі ВКЛ – «Очерк истории литовской монеты 16–17 столетий» (1932–1937), «Топография кладов с литовскими монетами на территории древнего Литовского государства. Часть 1, 2» (1933–1934), «Некоторые варианты литовских монет» (1936).



М. Шчакаціхін
(1896–1940)

У 1937 г., пасля чарговага «прафілактычнага» арышту, захварэў на сухоты, ад чаго і памёр у Белябеі ў 1940 г. Рэабілітацыя М. Шчакаціхіна судовай калегіяй па крымінальных справах Вярхоўнага суда БССР адбылася 30 студзеня 1956 г.

Рукапісы названых прац захоўваюцца ў Аддзеле нумізматыкі Дзяржаўнага Эрмітажа ў Санкт-Пецярбургу [61], а іх копіі (сканы) – у архіве Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь.

Навуковая дзейнасць М. Шчакаціхіна не абмяжоўвалася толькі нумізматычнымі даследаваннямі, ён таксама з'яўляўся і заснавальнікам беларускага мастацтвазнаўства.

Такім чынам, развіццё беларускай навуковай нумізматыкі было спынена хваляй рэпрэсій канца 1920–1930-х гг. супраць беларускай інтэлігенцыі.



В. Рабцэвіч
(1934–2008)

Традыцыі, закладзеныя П. Харламповічам і М. Шчакаціхіным, у другой палове XX – пачатку XXI ст. развіваў доктар гістарычных навук ***Валянцін Навумавіч Рабцэвіч*** (1934–2008).

Пасля сканчэння гістарычнага факультэта БДУ (1957) В. Рабцэвіч працаваў навуковым супрацоўнікам арганізацыйнай групы Дзяржаўнага музея БССР, а з 1959 г. навучаўся ў аспірантуры Аддзела нумізматыкі Дзяржаўнага Эрмітажа (г. Ленінград), дзе яго навуковым кіраўніком быў карыфей савецкай нумізматыкі – І. Спаскі [32].

Тэмай кандыдацкай дысертацыі В. Рабцэвіча, абароненай у Ленінградскім аддзяленні Інстытута археалогіі АН СССР у 1965 г., была «Топография монетных кладов на территории Белоруссии», у якой на падставе аналізу больш за тысячы манетных і манетнарэчавых скарбаў упершыню ў айчыннай гістарыяграфіі былі распрацавана перыядызацыя і праведзены комплексны аналіз гісторыі грашовага абарачэння на беларускіх землях.

На жаль, шмат часу і сіл даследчыка забірала абарона гістарычнай праўды аб функцыянаванні на беларускіх землях самастойнай грашовай гаспадаркі, што пацвярджалася вялізным фактычным матэрыялам. Асноўныя вынікі дысертацыйнага даследавання не ўкладаліся ў агульна прынятую ў савецкай гістарыяграфіі канцэпцыю развіцця гістарычнага працэсу на тэрыторыі Беларусі.

В. Рабцэвіч з 1963 г. першым у Беларусі пачаў выкладаць нумізматыку на гістарычным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Па ініцыятыве В. Рабцэвіча і на аснове яго прыватнай калекцыі на гістфаку БДУ быў створаны мюнцкабінет, які стаў у далейшым адным з самых значных нумізматычных збораў у Беларусі.

Сапраўдны навуковец, В. Рабцэвіч імкнуўся да папулярызацыі беларускай нумізматыкі. Менавіта ў такім ракурсе была напісана яго кніга «О чем рассказывают монеты», два выданні якой (1968, 1977), звернутыя да шырокай аўдыторыі, выклікалі значную зацікаўленасць па ўсёй краіне.

Найбольш вядомай стала яго манаграфія «Нумизматика Беларуси» (1995) [54], якая, па сутнасці, з’яўляецца энцыклапедыяй гісторыі грашовага абарачэння на тэрыторыі краіны. У гэтай рабоце, акрамя велізарнага фактычнага матэрыялу, утрымліваецца інфарматыўная даведачна-дапаможная частка ў выглядзе манетнага каталога і іншых дадаткаў.

У 1995 г. выходзіць яшчэ адна манаграфія вучонага – «Российско-“польские” монетные эмиссии эпохи Петра I» [56]. Гэта кніга з’яўляецца класічным прыкладам правядзення і напісання навуковага даследавання.

У 1996 г. В. Рабцэвічу была нададзена навуковая ступень доктара гістарычных навук. В. Рабцэвіч – лаўрэат прэміі імя У. Пічэты, узнагароджаны залатымі знакамі Беларускага і Польскага нумізматычных таварыстваў. У выніку шматгадовай барацьбы В. Рабцэвіча за аднаўленне законнасці ў Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь быў перададзены на пастаяннае захоўванне ўнікальны помнік гісторыі і культуры – знакаміты паясны набор канца XIV – першай трэці XV ст.

Галоўным вынікам навуковай дзейнасці В. Рабцэвіча стала тое, што ён здолеў падняць беларускую нумізматыку на ўзровень самастойнай галіны гістарычнай навукі. Навуковая спадчына вучонага будзе і ў далейшым вывучацца многімі пакаленнямі нумізматаў.

Пачынаючы з апошніх дзесяцігоддзяў XX ст. у айчынным нумізматычным руху адзначаецца актывізацыя вывучэння шырокага кола праблемных пытанняў беларускай нумізматыкі [19; 20].

Сярод асноўных напрамкаў сучасных навуковых нумізматычных даследаванняў можна вызначыць:

– актуалізацыю пытання аб фіксацыі знаходак грашовых зліткаў, асобных манет і манетных скарбаў на тэрыторыі краіны;

– вывучэнне ранніх этапаў манетнай вытворчасці ВКЛ, грашовай тэрміналогіі, канцэпту «грошы» ў беларускім фальклоры і літаратуры, дзейнасці фальшываманетчыкаў, музейнага нумізматычнага збіральніцтва;

– устанаўленне ролі асобных навукоўцаў і збіральнікаў нумізматычных калекцый у развіцці нумізматычнага руху краіны.

У Беларусі праводзяцца міжнародныя навуковыя нумізматычныя канферэнцыі, якія арганізуюцца Нацыянальным банкам (для прыкладу, «Манета – сімвал дзяржавы», 2007; «Нумізматыка і гераічная спадчына», 2015; «Беларускаму рублю – 25», 2019; «25 гадоў беларускай памятнай манеце», 2021) і гістарычным факультэтам БДУ (Навуковыя чытанні, прысвечаныя В. Н. Рабцэвічу, 2014, 2016, 2018).

!!

*Падводзячы вынікі, можна адзначыць, што нумізматыка, якая вывучае гісторыю грашовых сістэм і грашовага абарачэння, займае адно з асноўных месцаў у коле спецыяльных гістарычных дысцыплін. Прыватнае нумізматычнае збіральніцтва на тэрыторыі Беларусі спрыяла ўзнікненню ў далейшым значных музейных калекцый асобных манет і грашовых скарбаў. Працэс пераўтварэння нумізматыкі ў асобную галіну навуковых ведаў у рэчышчы гісторыі Беларусі прайшоў доўгатэрміновы шлях, які распачаўся яшчэ ў XVI ст.*

## Заданні для самакантролю

1. Вызначыць прадмет і метады нумізматычных даследаванняў.
2. Назваць імёны збіральнікаў нумізматычных калекцый XVI–XX стст. на тэрыторыі Беларусі.
3. Пералічыць найбольш значныя музейныя нумізматычныя калекцыі канца XVIII – пачатку XX ст.
4. Правесці параўнальны аналіз прадстаўлення нумізматычнага матэрыялу ў экспазіцыях беларускіх музеяў.
5. Назваць імя заснавальніка навуковай нумізматыкі ў свеце і вызначыць яго ўклад у яе развіццё.
6. Назваць імёны заснавальнікаў беларускай навуковай нумізматыкі і вызначыць іх уклад у яе развіццё.
7. Прывесці прыклады выкарыстання тэмы грошай у літаратурных і фальклорных творах.

## Тэма 1.2. Тавар і грошы

Грошы з'яўляюцца спецыфічным відам тавару. Таму правамерна звярнуцца да паняцця «*тавар*», які вызначаецца як прадукт чалавечай працы, зроблены на продаж ці абмен на іншы тавар. Сама ж праца – гэта мэтанакіраваная дзейнасць чалавека.

Тавар мае тры асноўныя ўласцівасці – спажывецкую вартасць, менавую вартасць і вартасць.

*Спажывецкая вартасць* паказвае, што тавар здольны задаволіць адпаведныя патрэбы чалавека. Яна падзяляе тавары па якасці, мае пэўную стабільнасць і канкрэтнасць.

Напрыклад, адзенне захоўвае цяпло, ежа забяспечвае працэсы жыццядзейнасці чалавека і г. д. Захаванне стабільнасці спажывецкай вартасці тавараў звязана з тым, што знешнія абставіны на працягу стагоддзяў практычна не паўплывалі на асноўныя патрэбы чалавека і застаюцца ў прынцыпе пастаяннымі, як і тавары, што іх задавальняюць.

Ацэнка спажывецкай вартасці ўскладняецца адсутнасцю адзінкі яе вымярэння, а таксама і неадназначнасцю ацэнкі гэтага віду вартасці рознымі людзьмі, сярод якіх кожны мае свой асабісты ўзровень патрэб. Разгортванне ў грамадстве двух узаемастымулюючых працэсаў: колькасны і якасны рост патрэб і адпаведнае развіццё таварнай вытворчасці, а таксама пашырэнне сферы паслуг для іх задавальнення азначаюць і павелічэнне аб'ёму спажывецкіх вартасцей.

*Менавая вартасць* паказвае колькасныя суадносіны, у якіх адзін тавар можа быць абменены на другі. Таксама менавая вартасць уяўляе сабой колькасныя суадносіны, у якіх спажывецкія вартасці абменьваюцца адна на другую.

Менавая вартасць падзяляе тавары колькасна, але з'яўляецца менш стабільнай і больш абстрактнай з'явай у параўнанні са спажывецкай вартасцю. Тлумачыцца гэта тым, што на менавую вартасць значны ўплыў аказваюць знешнія абставіны (агульны ўзровень развіцця вытворчасці, эканамічная дэстабілізацыя, ваенныя сутыкненні, неспрыяльныя тэхнагенныя сітуацыі, прыродныя катаклізмы і інш.). У выніку, рэчы, што маюць высокі кошт з-за сваёй матэрыяльнай, эстэтычнай, мастацкай і іншай вартасці, але не прызначаныя для задавальнення першасных патрэб чалавека, могуць у час надзвычайных падзей быць прададзены ці абменены на тавары першай неабходнасці па заніжаных каштоўнасных параметрах.

Прыкладам ваганняў менавой вартасці можа паслужыць гісторыя выкарыстання і каштоўнасных суадносін такіх металаў, як жалеза, алюміній, срэбра, золата і плаціна.

У старажытныя часы жалеза, якое выкарыстоўвалася ў вытворчасці прылад працы, было даражэй за золата, аб чым сведчыў старажытнагрэчаскі аўтар Страбон (каля 64/63 да н. э. – каля 23/24 н. э. ). Ён адзначаў, што ў арабскіх плямёнаў жалеза ацэньвалася ў дзесяць разоў вышэй за золата [54, с. 19].

Прыродны алюміній у сувязі з высокай хімічнай актыўнасцю ў абсалютнай большасці сустракаецца ў выглядзе злучэнняў, якія, верагодна, былі вядомы і выкарыстоўваліся са старажытных часоў.

Лабараторным спосабам алюміній упершыню быў атрыманы ў 1825 г., а ў прамысловым – у 1854 г. Вынік гэтага дасягнення ў выглядзе алюмініевага злітка дэманстраваўся на Сусветнай выставе 1855 г. у Парыжы.

Да адкрыцця (1886) і далейшага ўдасканалення паўнавартаснага прамысловага электралітычнага спосабу атрымання алюмінія гэты метал меў кошт вышэй за золата і срэбра. Яго выкарыстоўвалі для дарагіх побытавых прадметаў і ювелірных вырабаў.

Плаціна трапіла ў Еўропу ў сярэдзіне XVI ст. з Паўднёвай Амерыкі (хаця яна была вядома яшчэ ў Старажытным Егіпце). У сувязі з высокай тэмпературай плаўлення яна доўгі час не знаходзіла належнага прымянення і каштавала значна ніжэй, чым срэбра і золата. Плаціну выкарыстоўвалі нават фальшываманетчыкі.

З цягам часу плаціна па сваёй вартасці апярэджвае золата. Гэтаму садзейнічалі значна большая, чым у золата, удзельная вага, прыродная рэдкасць, складанасць апрацоўкі, прыгажосць і, зразумела, выдатныя фізіка-хімічныя якасці плаціны.

*Вартасць* тавару вызначаецца яго здольнасцю матэрыяльна ўвасобіць укладзеную ў яго працу. Аднолькавыя віды тавараў, выконваючы тоесную функцыю ў жыцці чалавека, могуць мець зусім розныя кошты, таму што ў працэсе вытворчасці ў іх быў укладзены розны аб’ём чалавечай працы.

Фарміраванне велічыні вартасці адбываецца на аснове грамадска неабходнай колькасці працы з улікам прадуктыўнасці, інтэнсіўнасці і складанасці вытворчага працэсу.

Важна разумець, што ўсе тры віды ўласцівасцей існуюць і праяўляюцца ў тавары адначасова. Кожны тавар задавальняе нейкую патрэбу чалавека, ён можа быць абменены на іншыя тавары, у яго вытворчасць укладзены пэўны аб’ём чалавечай працы.

* * *

Развіццё грамадства прыводзіць да таго, што ў працэсе абмену вартасць шэрагу тавараў пачынаюць суадносіць з вартасцю нейкага аднаго ўніверсальнага тавару. Такім чынам, з масы тавараў вылучаюцца так званыя таварагрошы, якія робяцца своеасаблівым эквівалентам вартасці. З’яўляючыся таварамі, яны адначасова выконваюць і некаторыя функцыі грошай.

У выніку аб’ектыўных працэсаў натуральнага адбору ролю паўнавартасных таварагрошай сярод шматлікіх прэтэндэнтаў пачыналі адыгры-

ваць тавары, што адпавядалі наступным патрабаванням – мелі дастатковую распаўсюджанасць у дадзенай мясцовасці, абмежаваную сферу выкарыстання і адносна высокую і стабільную менавую вартасць.

*У гісторыі таварагрошай* можна вылучыць *некалькі этапаў*.

Першымі таварагрошамі ў народаў, якія займаліся жывёлагадоўляй, стала *свойская жывёла*. Па вобразным вызначэнні К. Маркса, гэта так званыя мыкаючыя грошы. Доказамі існавання такіх таварагрошай служаць пісьмовыя крыніцы і лінгвістычныя прыклады. У творах Гамера («Іліяда», «Адысея»), у «Старым Запавеце» свойская жывёла неаднаразова выступае ў ролі сродку накаплення багацця.

У беларускай мове такімі прыкладамі з'яўляюцца словы «быдла» і «здабытак», «статак» і «дастатак», у польскай мове – «dostatek». У рускай мове адпаведна – «скот» і «скотница» («казна»), «бык» і «добыча». Аналагічныя прыклады ёсць і ў лацінскай мове – словы «pecus» («свойская жывёла») і «pecunia» («маёмасць», «грошы»), «caput» («галава свойскай жывёлы») і «capitalis» («капітал», «багацце»).

*На другім этапе* на змену свойскай жывёле прыйшлі больш зручныя на той час па шэрагу параметраў *варыянты таварагрошай – брускі солі, пярліны*, чалавечыя і каровіны чарапы, жорнавы, *скуркі пушных звяркоў*, шыферныя прасніцы, іклы кабаноў, ракавінкі каўры, пёры рэдкіх птушак, зубы кашалота, тытунёвае лісце, торбачкі з какава-бабамі, кавалкі баваўнянай тканіны, сушаная рыба, разнастайнае зерне і шмат чаго іншага.

Даследчыкамі была праведзена прыкладная класіфікацыя даманетных сродкаў плацяжу як усеагульных эквівалентаў. Былі выдзелены такія групы, як харчовыя тавары, грошы-ўпрыгажэнні, футравыя грошы, грошы з тканіны, грошы-зброя. Асаблівасцю некаторых (але не ўсіх!) відаў тагачасных таварагрошай было тое, што яны паралельна з магчымасцю быць эквівалентам вартасці іншых тавараў выкарыстоўваліся ў штодзённым жыцці па іх першасным прызначэнні (напрыклад, зброя, элементы адзення, прадметы культу, упрыгажэнні).



Ракавінкі каўры

Пакупная здольнасць таварагрошай для зручнасці разлікаў, верагодна, больш адпавядала вартасці іх абстрактнага эталона, чым вызначалася станам рэальнага носьбіта, які шматразова выконваў функцыю таварагрошай на рынку і ў выніку часткова страчваў свае якасці.

Для прыкладу, сярод мноства ракавін марскіх малюскаў, што выкарыстоўваліся ў якасці таварагрошай, першае месца займаюць унікальныя па прыгажосці ракавінкі каўры, якія атрымалі сваю назву ў гонар багіні ўрадлівасці Каўры. Здабывалі ракавінкі гэтых малюскаў на выспах у Індыйскім акіяне і выкарыстоўвалі як таварагрошы, у асноўным, у азіяцкіх і афрыканскіх рэгіёнах, а таксама і на еўрапейскіх землях.

Папулярнасці гэтай складанай і непаўторнай па форме ракавінкі з натуральнай паліроўкай у ролі таварагрошай садзейнічала немагчымасць

яе паўнавартаснай падробкі, хаця вядомы спробы зрабіць аналагі з каменю, косткі, а пазней і з металічных сплаваў.

Але і гэты стракаты набор таварагрошай не мог задаволіць патрэбы карыстальнікаў. Практыка рынкавых адносін з цягам часу выпрацавала асобныя патрабаванні да матэрыялаў, з якіх выраблялiся таварагрошы.

Наступае *трэці этап*, які характарызуецца панаваннем таварагрошай, зробленых з металічных сплаваў. Металы (жалеза, медзь і яе сплавы, срэбра, золата), акрамя таго, што маюць абмежаваную спажывецкую і адносна стабільную менавую вартасць, з’яўляюцца не вельмі распаўсюджаным прыродным аб’ектам. У здабычу і апрацоўку металічнай руды ўкладаецца значны аб’ём чалавечай працы, і ў выніку металічныя вырабы набываюць высокую вартасць. У дадатак металы добра захоўваюць свае фізічныя і хімічныя якасці пры плаўленні, ім можна надаць розную форму, яны маюць фізічнае даўгалецце, кампактныя і зручныя пры транспарціроўцы.

У Старажытным Кітаі, Старажытнай Грэцыі, на тэрыторыі Афрыкі ў якасці таварагрошай пачынаюць выкарыстоўваць металічныя вырабы ў выглядзе зліткаў ці разнастайных прадметаў.

Напрыклад, у Старажытным Кітаі выкарыстоўвалі паменшанага памеру медныя і бронзавыя нажы, сякеры, матыкі, званы, своеасаблівыя злiткі. У Старажытнай Грэцыі былі папулярны жалезныя пруткі (аболы).

У больш познія часы металічныя таварагрошы, таксама недастаткова зручныя для выконвання ўскладзеных на іх функцый, перадалі эстафету манетам, якія пры невялікай фіксаванай масе мелі высокую вартасць. Прычым некаторыя таварагрошы перанеслі на манеты і свае назвы – старажытнагрэчаскія аболы (жалезныя пруткі), драхмы (6 пруткоў) і інш.

Грошы як пасрэднікі ў працэсе тавараабмену з’явіліся ў выніку агульнага эвалюцыйнага працэсу развіцця грамадства.

Агульная характарыстыка грошай адзначае, у першую чаргу, высокі ўзровень іх ліквіднасці. У пэўнай ступені яны з’яўляюцца каштоўнасцю, якая падтрымліваецца асобым даверам і звычкай людзей.

Вышэй ужо ўзгадвалася разуменне грошай як спецыфічнага віду тавараў і ўсеагульнага эквіваленту, які выражае вартасць іншых тавараў і забяспечвае эфектыўнасць тавараабменных аперацый. Сутнасць грошай праяўляецца ў тым, што яны могуць увасабляць вартасць іншых тавараў і абменьвацца на любы з іх. Грошы матэрыялізуюць працоўны час, затрачаны на выраб тавараў.

Сярод асноўных патрабаванняў да афармлення грашовых адзінак можна адзначыць неабходнасць пэўнай аднастайнасці знешняга выгляду і пазнавальнасці, кампактнасці, наяўнасці элементаў абароны ад падробкі і, зразумела, выкарыстанне трывалага матэрыялу.

З развіццём тварнай вытворчасці ролю ўсеагульнага эквіваленту пачалі здзяйсняць манеты з высакародных металаў – золата і срэбра. Выкарыстанне гэтых каштоўных металаў тлумачыцца іх пераважнасцю: адносна рэдкай наяўнасцю ў прыродным асяроддзі, а таксама доўгатэр-

міновым і затратным працэсам іх здабычы. У выніку нават невялікія аб'ёмы золата і срэбра маюць высокую менавую вартасць. Высакародныя металы характарызуюцца і абмежаванай спажывецкай вартасцю: у жыцці чалавека яны маюць вузкую сферу выкарыстання.

Грошы, як асаблівы від тавару, выконваюць пэўныя асноўныя функцыі.

*Табліца*

**Функцыі грошай**

| Функцыі | Характарыстыка |
|---|---|
| Мера вартасці | Здольнасць грошай вымяраць вартасць тавараў. Грошы з'яўляюцца самай лепшай прыладай для вызначэння вартасці любога тавару. Разнастайныя тавары абменьваюцца на падставе кошту, які разглядаецца як грашовае вызначэнне вартасці тавару. У гэтым працэсе грошы прыраўноўваюцца да вартасці тавару і фарміруюць яго кошт |
| Сродак абарачэння | Грошы з'яўляюцца пасрэднікамі пры абмене аднаго тавара на другі: Т→Г→Т′→Г′→Т″→Г″… . Трэба звярнуць увагу на тое, што пасля рэалізацыі тавар выходзіць з абароту, а фінансы (грошы) застаюцца. Такім чынам, гэтая функцыя рэгулюе продаж тавараў і запускае ў дзеянне фінансавае абарачэнне. У ходзе абмену вялікую значнасць набывае хуткасць і лёгкасць, з якой грошы могуць абменьвацца на тавары. Таваравытворца (гандляр) у рэчышчы ажыццяўлення гэтай функцыі атрымлівае магчымасць раз'яднаць у часе і месцы продаж гатовага тавару і куплянне сыравіны ці іншага неабходнага яму тавару. Гэтая функцыя ў жыцці чалавека праяўляецца пры аплаце набытага тавару |
| Сродак плацяжу | Здольнасць грошай функцыянаваць у адрыве ад таварнага абарачэння: Г→Г′→Г″→… . Гэтая функцыя праяўляецца, напрыклад, у працэсе крэдытных адносін (ліхвярства, выдача і аплата банкаўскіх крэдытаў), а таксама пры правядзенні выплат, якія не дапускаюць атрымання нейкага эквіваленту: вяртанне пазык, аплата падаткаў, пералічэнне плацяжоў у фінансавыя фонды, страхаванне маёмасці |
| Сродак накаплення | Стварэнне грашовых запасаў, што часова не ўдзельнічаюць у абарачэнні. Дзеянне гэтай функцыі пачынаецца, калі даходы перавышаюць выдаткі і з'яўляецца магчымасць грашовага накаплення. Гэтая функцыя яскрава праяўлялася пры ўтварэнні манетных скарбаў – своеасаблівых рэзервуараў лішкавых грошай, якія часова не ўдзельнічалі ў абарачэнні. Пры неабходнасці частка іх вярталася ў рынкавы абарот. Накапленні на разліковых рахунках выкарыстоўваюцца банкамі ў якасці пазык для насельніцтва, што спрыяе развіццю грашова-крэдытных адносін. Асноўнай умовай выканання грашыма гэтай функцыі з'яўляецца стабільнасць іх пакупнай здольнасці: магчымасць абмену на тавары і паслугі |

| | |
|---|---|
| Сусветныя грошы | У ранейшыя часы – вольнае, без абмежаванняў абарачэнне манет з высакародных металаў (золата ці срэбра) па-за межамі сваіх краін. У сучаснасці функцыю сусветных грошай выконваюць такія валюты, як долар ЗША, фунт стэрлінгаў, еўра. Пры выкананні гэтай функцыі, па словах К. Маркса, грошы скідваюць з сябе нацыянальныя мундзіры і пераходзяць дзяржаўныя межы. Прыкладам можа служыць тэрыторыя Беларусі, на якой на працягу стагоддзяў у абарачэнні знаходзіліся залатыя і срэбныя замежныя манеты |

Кожная дзяржава мае сваю грашовую сістэму, заснаваную на канкрэтнай адзінцы (рубель, долар, еўра, фунт стэрлінгаў і інш.).

Манета ў адну такую грашовую адзінку называецца асноўнай, у дзве ці больш – зборнай, частка асноўнай грашовай адзінкі – дробнай.

Манета мае намінальную і рэальную вартасць.

*Намінальная вартасць (намінал)* – гэта вартасць, вызначаная эмітэнтам і, як правіла, абазначаная на грашовым знаку ці на каштоўнай паперы лічбамі, літарамі, кропкамі.

*Рэальная вартасць* манет вызначаецца вартасцю самой эмісіі (выдаткі на матэрыял і іх вытворчасць).

Грошы могуць быць *наяўнымі* і *безнаяўнымі* (знаходзяцца на банкаўскіх рахунках, дэпазітах, картках, у чэках, векселях, каштоўных паперах, у выглядзе крыптавалюты і электронных грошай). Наяўныя і безнаяўныя грошы з'яўляюцца ўзаемазамяняльнымі.

Па спосабе забеспячэння грошы падзяляюцца на *паўнавартасныя* і *непаўнавартасныя*. У выпадках, калі намінальная вартасць супадае з рэальнай, мы маем справу з паўнавартаснымі манетамі.

Манеты, сабекошт выраблення якіх ніжэй, чым паказаная на іх намінальная вартасць, з'яўляюцца непаўнавартаснымі і набываюць крэдытны характар. Забеспячэнне падобных грошай грунтуецца на даверы насельніцтва да аўтарытэту дзяржавы.

Для разумення сутнасці пэўных з'яў у гісторыі грашовага абарачэння неабходна звярнуцца да эканамічнага закону грашовага абарачэння Каперніка – Грэшэма.

Распрацоўваць гэты закон у 1526 г. пачаў польскі і нямецкі астраном, матэматык, механік, эканаміст, аўтар гелеацэнтрычнай сістэмы свету Мікалай Капернік (1473–1543). Канчатковую яго фармулёўку вызначыў у 1560 г. найбагацейшы англійскі купец, фінансіст, саветнік караля Эдуарда VI (1547–1553) і каралевы Елізаветы I (1558–1603) Томас Грэшэм (1519–1579).

У вельмі спрошчаным варыянце згаданы закон можа быць агучаны наступным чынам – больш высакаякасныя манеты выціскаюцца з абарачэння менш якаснымі пры ўмове іх аднолькавай вызначанай дзяржавай намінальнай вартасці.

У рэчышчы практычнага пацвярджэння гэтай заканамернасці можна прывесці некалькі характэрных прыкладаў.

Відавочнае праяўленне вынікаў дзеяння закону Каперніка – Грэшэма адбылося ў ходзе рэалізацыі грашовых рэформ Яна II Казіміра Вазы

ў 1659–1666 гг. у Рэчы Паспалітай і Пятра I у 1700–1704 гг. у Расіі (больш падрабязна гэтыя пытанні разглядаюцца ў адпаведных раздзелах падручніка).

У канцы XIX ст. у Расійскай імперыі быў уведзены залаты монаметалізм, але калі свабодны абмен папяровых грашовых знакаў (крэдытных білетаў) на адпаведную колькасць залатых манет быў скасаваны, апошнія вельмі хутка зніклі з абарачэння.

У 1922 г. у СССР у грашовае абарачэнне дадаткова да «звычайных» папяровых грашовых знакаў былі ўведзены забяспечаныя золатам папяровыя чырвонцы шэрагу наміналаў. Але для папярэджання натуральнага выціскання папяровых чырвонцаў з абарачэння былі прыняты прэвентыўныя меры. У прадпрыемствах гандлю на тавары ўказваліся два кошты – у папяровых чырвонцах і ў «звычайных» грашовых знаках. Гэта забяспечвала стабільны курс чырвонцаў і захоўвала іх у грашовым абарачэнні.

!!

*Такім чынам, у працэсе таварнага абарачэння асобныя тавары/таварагрошы ў сувязі са сваімі ўласцівасцямі (адносна дастатковая распаўсюджанасць, абмежаваная сфера выкарыстання, высокая і стабільная менавая вартасць) выконвалі ролю эквіваленту вартасці. У далейшым гэтая роля пераходзіць да грошай, якія з'яўляюцца спецыфічным відам тавару. Грошы выконваюць у жыцці чалавека шэраг функцый, што характарызуе іх універсальнасць (мера вартасці, сродак абарачэння, сродак плацяжу, сродак накаплення, сусветныя грошы).*

## Заданні для самакантролю

1. Даць азначэнне паняццям «тавар», «грошы», «рэальная і намінальная вартасць манеты».
2. Назваць уласцівасці тавару.
3. Вызначыць умовы, пры якіх тавар мог быць выкарыстаны ў ролі таварагрошай.
4. Назваць функцыі грошай.
5. Прывесці прыклады праяўлення кожнай функцыі грошай у штодзённым жыцці чалавека.
6. Выявіць агульны склад грашовай сістэмы.
7. Даць азначэнне і прывесці прыклады дзеяння эканамічнага закону грашовага абарачэння Каперніка – Грэшэма.

## Тэма 1.3. Манета. Матэрыяльныя і знешнія характарыстыкі. Манеты нерэгулярных эмісій. Манета ў нумізматычным зборы

Асновай нумізматычнага даследавання з'яўляецца манета. Тое, што яна акумулюе ў сабе велізарны аб'ём інфармацыі, пацвярджае філосаф і збіральнік манет *В. В. Ро́занаў* (1856–1919), які вобразна вызначыў манету як металічнае люстэрка часу.

Тлумачэнне паходжання слова «манета» звязана з імем старажытнарымскай багіні Юноны Манеты. Юнона мела некалькі мянушак, рымляне называлі яе Нумерыяй (апекавала дакладныя навукі), Папулоніяй (вырашала праблемы плоданашэння) і Клаацынай (аказвала дапамогу ў ачышчэнні Рыма ад смецця). Што датычыць мянушкі Манета, то яно паходзіць ад лац. monere – папярэдзіць, прадказаць, параіць. Такім чынам, Юнона выступала як прадказальніца, ці дарадчыца. Рымляне звярталіся да яе ў самых цяжкіх сітуацыях, калі неабходна было атрымаць параду ці дапамогу.

Па адной з версій, дзякуючы дапамозе Юноны Манеты, у 275 г. да н. э. рымляне перамаглі эпірскага цара Піра ў бітве пры Беняненце. Аддзячыць багіню было вельмі цяжка, але рымляне вырашылі гэтую праблему – яны перанеслі на тэрыторыю храма багіні на Капіталійскім узгорку свой грашовы двор, прадукцыя якога з цягам часу стала называцца манетамі.

Па другой версіі Юнона папярэдзіла рымлянаў аб землятрусе, і яны ў знак удзячнасці пабудавалі на Капіталійскім узгорку прысвечаны ёй храм. У IV ст. пры храме адкрыта першая ў Рыме грашовая майстэрня па вытворчасці медных асаў. З цягам часу прадукцыю гэтай майстэрні сталі называць манетамі [48, с. 111–112].

У адносінах да часу і месца з'яўлення першых манет у нумізматычнай літаратуры прыводзіцца дваістая інфармацыя. Існуе дзве версіі аб тым, што ўпершыню манеты з'явіліся ў XII ст. да н. э. у Старажытным Кітаі [70, с. 158], а таксама ў VII ст. да н. э. у Лідзіі. Аб першых лідзійскіх манетах паведамляў філосаф і паэт Ксенафан з Калафона (VI–V стст. да н. э.) і старажытнагрэчаскі гісторык Герадот (каля 484 – каля 425 да н. э.). Манеты былі выраблены з электрума (прыродны сплаў золата і срэбра) і мелі выяву льва – сімвала сталіцы Лідзіі г. Сарды [54, с. 46–47].

Пазней манетамі пачалі карыстацца на выспе Эгіна. Традыцыя манетнай вытворчасці распаўсюдзілася і на тэрыторыі мацерыковай Грэцыі.

Манета характарызуецца дзвюма асноўнымі групамі прымет – *матэрыяльнымі* і *знешнімі*.

Да *матэрыяльных характарыстык* манеты адносяцца *метал, маса, манетная стапа* і *манетная проба.*

Матэрыяламі для выраблення манет служаць, за рэдкім выключэннем, *металы* (металічныя сплавы), у тым ліку электр (электрум), золата, срэбра, білон (нізкапробны сплаў срэбра і медзі, дзе срэбра складае палову ці меншую частку ад агульнага аб'ёму), медзь і медныя сплавы – бронза (сплаў медзі і, звычайна, волава), латунь (сплаў медзі і асноўнага дадатковага элемента цынку), медна-нікелевы сплаў, нікель, жалеза, плаціна, алюміній і інш.

Нельга забываць, што ў вытворчасці высакародныя металы ніколі не выкарыстоўваюцца ў чыстым выглядзе, у якім яны не маюць неабходных хімічных і фізічных якасцей. Для паляпшэння трываласці і гнуткасці да высакародных металаў абавязкова дадаюцца менш каштоўныя дамешкі – лігатура (лац. ligatura – звязванне, зліццё). Да золата, напрыклад, можа дадавацца срэбра, медзь, нікель; да срэбра і плаціны – медзь, да паладзія – срэбра, нікель.

Выбар металу для вытворчасці манет залежыў ад шматлікіх прычын: магчымасцей здабычы металічнай руды ў краіне, наяўнасці крыніц для атрымання металічнага лому і ўвогуле ад узроўню эканамічнага развіцця грамадства.

> Для абазначэння металу (сплаву), з якога зроблена манета, у нумізматычных каталогах прыняты наступныя ўмоўныя вызначэнні, напрыклад:
> 
> A̸V (золата),
> 
> A̸R (срэбра),
> 
> Æ (медзь, грэч. – aes, aeris).

*Маса манеты* вымяраецца адпаведнымі адзінкамі. У наш час для гэтых мэт выкарыстоўваецца метрычная сістэма. *Маса высакародных металаў* можа *вызначацца ў тройскіх унцыях* (31,1034768 г). Назва паходзіць ад г. Труа (Францыя), дзе ўпершыню пачалі ўжываць гэтую меру.

Фіксацыя масы манет з высакародных металаў адбываецца з большай дакладнасцю, чым у іншых па якасці манет. *Чыстая маса* высакароднага металу ў манеце вызначаецца тэрмінам *«нета»*, а *агульная маса* манеты адпаведна – *«брута».*

*Манетная стапа* (правіла манетнай стапы) – гэта дакладна вызначаная колькасць экзэмпляраў манет аднаго і таго ж наміналу, якая можа быць адчаканена з вызначанай адзінкі масы металічнага сплаву. Выкарыстанне правіла манетнай стапы дазваляла вытрымліваць для манет аднаго і таго ж наміналу ў сярэднім аднолькавую масу.

Заканадаўча дазволенае адхіленне фактычнай масы манеты ад зацверджанай называецца ў манетнай справе *рэмедыумам.*

Веданне манетнай стапы дазваляе вылічыць масу манеты адпаведнага наміналу. Напрыклад, «9-талерная стапа» азначала, што на 1 кёльнскую марку (233,855 г хімічна чыстага срэбра) прыходзілася 9 талераў (адпаведна 1 талер = 25,98 г хімічна чыстага срэбра + лігатура); расійскія медныя манеты (1810–1830) мелі манетную стапу ў 24 рублі з пуда (16 380 г) медзі. Адсюль маса меднай капейкі складала прыблізна 6,8 г (16380 : 24 : 100).

*Проба* (лац. probo – вызначаю, ацэньваю) паказвае колькаснае ўтрыманне хімічна чыстага высакароднага металу ў сплаве, з якога зроблена манета (ювелірны выраб) [16, с. 102–103].

Існуе *чатыры сістэмы вызначэння пробы:* метрычная, каратная, залатніковая, лотавая. Кожная сістэма мае так званую абсалютную лічбу – умоўнае вызначэнне хімічна чыстага высакароднага металу. Колькасны паказчык абсалютнай лічбы звязаны з матэматычнымі суадносінамі паміж пэўнымі адзінкамі вымярэння масы.

*Метрычная сістэма* паказвае ўтрыманне высакароднага металу ў адносінах да лігатуры ў тысячных долях і адзначаецца спецыяльнай паметай – °. Абсалютная лічба ў гэтай сістэме – 1000° (суадносіны паміж кілаграмам і грамам: 1 кг = 1000 г). Метрычная сістэма проб выкарыстоўваецца для плаціны, золата, срэбра. Калі, напрыклад, залатая манета мае 575° пробу – гэта азначае, што ў ёй утрымліваецца 575 частак (долей) хімічна чыстага золата і 425 (1000–575) частак (долей) лігатуры.

*Каратная сістэма* (араб. «кірат» – зерня ражковага дрэва, якое адыгрывала ролю гіркі-разнавагі) выкарыстоўвалася для вызначэння пробы золата. У некаторых краінах гэта сістэма захавалася і ў наш час. Абсалютная лічба – 24 (суадносіны паміж кёльнскай маркай і каратам: 1 кёльнская марка = 24 каратам). Калі выраб мае, напрыклад, 20-каратную пробу, то ў ім утрымліваецца адпаведна 20 долей хімічна чыстага золата і 4 долі лігатуры.

*Залатніковая сістэма* (залатнік – руская адзінка вымярэння масы, 1 залатнік = 4,266 г) – прымянялася толькі ў Расіі і СССР (да 1927 г.) для золата і срэбра. Абсалютная лічба – 96 (суадносіны паміж фунтам і залатнікам: 1 фунт = 96 залатнікам). Залатніковая сістэма выкарыстоўвалася ў срэбнай чаканцы з 1711 г., у залатой – з 1733 г.

*Лотавая сістэма* (лот – адзінка вымярэння масы) выкарыстоўвалася ў Сярэдневякоўі для срэбра з традыцыйным вызначэннем пробы рымскімі лічбамі. Абсалютная лічба – XVI (суадносіны паміж кёльнскай маркай і лотам: 1 кёльнская марка = 16 лотам).

Пры неабходнасці пераводу пробы з адной сістэмы ў другую можна выкарыстоўваць розныя алгарытмы. Напрыклад, адзін з найбольш простых варыянтаў, – пробу, што пераводзіцца, памножыць на абсалютную лічбу новай пробы і падзяліць на абсалютную лічбу папярэдняй пробы (напрыклад, пры пераліку 36-залатніковай пробы ў метрычную трэба – 36 x 1000 : 96 = 375°).

У пэўнай сувязі з матэрыяльнымі характарыстыкамі манеты стаіць і працэс псавання манеты, які праводзіўся з мэтай атрымання дадатковых

прыбыткаў (сеньяраж) з ведама вярхоўнай улады на агульнадзяржаўных, а таксама на шматлікіх гарадскіх манетных дварах, у нелегальных манетных майстэрнях. Псаванне манеты давала магчымасць вырашаць дзяржаўныя і асабістыя фінансавыя праблемы, звязаныя з выдаткамі на ваенныя дзеянні, утрыманне двара, кіруючага апарату, папаўненне ўласнай кішэні і інш. Псаванне манеты магло ажыццяўляцца некалькімі шляхамі. Напрыклад, пагаршэннем манетнай стапы, калі з вагавай адзінкі металу чаканілася бóльшая колькасць манет, што азначала змяншэнне іх масы. Магла змяняцца і манетная проба, калі ў сплаве павялічвалася колькасць лігатуры. Гэтыя прыёмы выкарыстоўваліся паасобку і разам.

Зразумела, што псаванне манеты прыводзіла да разбалансавання грашовай сістэмы і адпаведных наступстваў. Для барацьбы з занадта шырокім распаўсюджваннем гэтай з’явы існавала адпаведная заканадаўчая база, паводле якой уводзіліся жорсткія пакаранні. Адным са спосабаў падтрымкі грашовай сістэмы была рэгулярная рэнавацыя (пераробка) манеты, калі старая манета абменьвалася на новую, якая адрознівалася нейкімі дэталямі афармлення.

Да знешніх характарыстык манеты адносяцца:
– форма;
– поле;
– выявы;
– аверс;
– рэверс;
– гурт;
– узвышаны ўчастак па краі манеты (абадок, атачэнне);
– абрэз;
– легенда;
– тып.

Асноўная манетная *форма* – дыск, але манета можа быць і любой іншай, без абмежаванняў, формы – трох-, чатырох-, шматкутнік, неправільнай формы і гэтак далей.

*Поле* – паверхня манеты з двух бакоў, дзе змяшчаюцца выявы і надпісы. Часам поле вызначаюць як частку паверхні, вольную ад выяў.

*Выявы* на манетах і іх змены маюць свае заканамернасці, і звязаны яны з узроўнем развіцця тэхнікі манетнай вытворчасці, палітычнымі ўплывамі, традыцыямі і іншымі тэндэнцыямі. Так, у старажытныя часы, у сувязі з недасканалай тэхнічнай базай, манеты даволі часта былі аднабаковыя, на іх размяшчаліся спрошчаныя профільныя партрэтныя выявы кіруючых асоб, міфалагічныя персанажы, сімвалы гарадоў (жывёлы, расліны, пэўныя збудаванні) і інш. З цягам часу выявы на манетах ускладняюцца, на іх з’яўляюцца больш дакладныя партрэты правіцеляў у анфас і гербы.

Манеты, на якіх прысутнічаюць толькі выявы, называюцца *анэпіграфнымі*.

*Аверс* (Av, лац. adversus – наперадзе, павернуты тварам) – гэта вонкавы бок манеты. Аверс вызначаецца наяўнасцю дзяржаўных сімвалаў (дзяржаўны герб, назва дзяржавы), партрэтам ці атрыбутамі ўлады (напрыклад карона, ініцыялы) найвышэйшай кіруючай асобы, якая мае права эмісіі манет.

*Рэверс* (Rv, англ. reverse – перагортваць) – адваротны бок манеты, на якім знаходзіцца менш значная інфармацыя.

> Пры навуковай апрацоўцы манеты суадносіны аверса і рэверса адзначаюцца спецыяльнымі значкамі:
> – супадзенне верху аверса і верху рэверса (выкарыстанне спалучаных штэмпеляў) – ↑↑ (↑);
> – супрацьлеглае размяшчэнне верху аверса і верху рэверса – ↑↓ (↓);
> – пры іх несупадзенні стрэлка, што адпавядае рэверснаму боку, адхіляецца на неабходны вугал, які для зручнасці параўноўваецца з гадзіннікавым цыферблатам, ці вызначаецца ў градусах круга – ↑↓ = 6 гадзін, 180°; ↑→ = 3 гадзіны, 90°.

*Гурт* – бакавая, утваральная паверхня, ці зрэз манетнага кружка. Манеты з гуртам пачалі з’яўляцца ў апошніх дзесяцігоддзях XVI ст. Гурт мог быць гладкім ці спецыяльна апрацаваным насечкай, узорамі, надпісамі.

Гурт выконваў некалькі функцый – захоўваў манету ад абрэзкі па краях і абараняў яе ад падробкі, таму што значна абцяжарваў, ці рабіў немагчымай падробку такой манеты фальшываманетчыкамі.

*Узвышаная частка па краі манеты* (абадок, атачэнне) прызначаецца для захавання ад сцірання рэльефных выяў.

*Абрэз* – ніжняя частка поля рэверса ці аверса манеты, адасобленая ад верхняй часткі гарызантальнай (часам з дэкаратыўнымі аздобамі) рысай. Звычайна ў гэтай частцы поля размяшчаецца другасная па значнасці інфармацыя.

*Легенда* – гэта надпіс на манеце. Значная частка еўрапейскіх манет да канца XVIII ст. мела легенды, напісаныя па-лацінску [47, с. 14].

Манеты, якія не маюць выяў і пакрыты толькі легендамі, называюцца *монаэпіграфнымі*.

Легенды маюць чатыры разнавіднасці: радковая (тэкст можа быць напісаны гарызантальна ці вертыкальна), кругавая (тэкст напісаны па крузе манеты, бывае дваістая і траістая кругавая легенда), камбінаваная (спалучэнне радковай і кругавой легенд), гуртавая (тэкст напісаны на гурце).

У большасці выпадкаў легенда можа пачынацца як з верхняга правага боку, так і з ніжняй левай часткі манеты і чытаецца па гадзіннікавай стрэлцы. Пры няправільна выразанай на штэмпелі легендзе, яна можа чытацца люстэркава (у адваротны бок).

Дапамагаюць вызначыць пачатак легенды спецыяльныя значкі – кропкі, крыжыкі, разеткі, зорачкі. Але трэба ўлічваць, што такія ж паметы маглі ставіцца і проста паміж словамі для іх адасаблення.

**Структура легенды**
1. Імя і тытул эмітэнта
2. Назва манеты
3. Дэвізы і выказванні
4. Дата
5. Назва манетнага двара
6. Імя манетнага майстра
7. Вызначэнне металу
8. Эмісійны знак
9. Намінал

Па змесце легенда можа складацца з наступных частак:

**1. Імя і тытул эмітэнта (манетнага сеньёра).** Эмітэнт – фізічная асоба, дзяржаўны інстытут, органы мясцовага самакіравання, якія маюць права выпуску манеты. Тытул эмітэнта, у якім узгадваецца назва краіны, ідзе ў складзе легенды за яго імем.

**2. Назва манеты** можа ўваходзіць у склад легенды. Акрамя афіцыйных, існуюць і народныя назвы, якія таксама з'яўляюцца прадметам нумізматычных даследаванняў.

Назвы манет могуць быць звязаны з тэрмінамі, утворанымі ў часы злітквага абарачэння – абол (жалезны пруток), драхма (жменя, 6 жалезных пруткоў, што змяшчаюцца ў руцэ, ад драхмы паходзіць назва манеты – дырхам), рубель (любая з вядомых версій (ад слоў «рубить», «рубец») звязвае гэты тэрмін з металічным зліткам).

Многія назвы манет (англійскі фунт стэрлінгаў, германская марка, грыўня) супадаюць з назвамі адзінак вызначэння масы. Гэта тлумачыцца тым, што працэс чаканкі манет быў звязаны з выкарыстаннем адпаведных сістэм вымярэнняў і іх адзінак.

У працэсе развіцця грашовых сістэм назвы манет, кансерватыўныя па сваёй сутнасці, мелі тэндэнцыю нязменна захоўвацца на доўгі час, тады як самі манеты, на якія ўплывалі шматлікія інфляцыйныя эканамічныя фактары, пастулова змяняюць масу і металічны сплаў (як правіла, у бок змяшчэння і пагаршэння). Зніжэнне рэальнай вартасці манет прыводзіла да ператварэння сапраўдных паўнавартасных грошай у іх сімвалы, якія толькі прадстаўляюць на рынках залаты і таварны запас дзяржавы.

Адлюстраваннем падобных метамарфоз могуць паслужыць наступныя прыклады.

Солід /шэлег/ (лац. solidus – цвёрды) – залатая манета ў Візантыі IV ст.; білонная еўрапейская манета ў XIV ст.; медная – у XVII ст.

Грош (лац. grossus – вялікі) – паўнавартасная срэбная еўрапейская манета ў канцы XII ст.; білонная – у XVII ст.; медная – у XVIII–XIX стст.;

алюмініевая – у XX ст. Грош з цягам часу становіцца сімвалам нязначнасці і чагосьці малакаштоўнага. Адсюль і адпаведныя выказванні: «прапасці ні за грош», «не каштуе ані гроша».

Паходжанне тэрміна «грыўня» даследчыкі звязваюць з конскай грывай; з IX ст. шыйнай грыўняй называюць адпаведнае ўпрыгажэнне; у далейшым грыўня – адзінка вымярэння масы (204,756 г); у XII–XIII стст. так называюць грашовую адзінку ў выглядзе злітка; у XVIII–XIX стст. грыўня – невялікая срэбная манета ў 10 капеек.

У назвах манет адлюстроўваліся адпаведныя тапонімы (партугал, маскоўка, наўгародка, а талер і яфімак паходзяць ад назвы г. Іоахімсталь).

Асновай для наймення манет служылі і металы, з якіх яны былі выраблены (аўрэус, златнік, срэбранік, чырвонец і інш.).

Назвы манет маглі быць звязаны з імёнамі пэўных гістарычных асоб (луідор, напалеандор, аўгустдор, станіслаўдор і інш.).

Многія назвы непасрэдна звязаны з выявамі на манеце (філіпок, палашнік, крыжовы, капейка, лабанчык, арапчык і інш.).

**3. Дэвізы і выказванні**, як правіла, сустракаюцца на манетах позняга Сярэдневякоўя і Новага часу. Звычайна гэтыя тэксты размяшчаліся па крузе ці ў камбінаваным варыянце (па крузе і радкамі) у полі манеты, а таксама адбіваліся на гурце.

Прыкладам могуць служыць такія манеты, як тымф, дукат і інш.

**4. Дата** ў большасці выпадкаў знаходзіцца ў канцы кругавой легенды ці ў полі манеты (пад выявай, ці падзеленая ёй на дзве часткі).

Перад датай мог быць тэкст: «Anno domini» (A.D.), што ў перакладзе азначае «У год Госпада…», ці «Anno» – «У год…». Дата, напрыклад, магла быць зашыфравана пры дапамозе хранаграмы – з нейкага тэксту выбіраліся тыя літары, што з'яўляліся адначасова лацінскімі лічбамі. Дата падлічвалася шляхам складання адпаведных лічбаў.

Да першай чвэрці XV ст. звычайна выкарыстоўваліся рымскія лічбы, пазней – як рымскія, так і арабскія, прычым часам на манетах указвалася не ўся дата, а толькі дзве-тры апошнія лічбы.

Літоўскія і польскія манеты набылі гэты вельмі значны элемент легенды толькі на пачатку XVI ст.

У Расіі з 1699 г. па 1722 г. для датавання выкарыстоўваліся літары славянскага алфавіта, якія мелі лічбавае значэнне. Выключэнне складалі яфімкі і некаторыя ўзнагародныя залатыя манеты Аляксея Міхайлавіча, дзе даты вызначаліся так званымі арабскімі лічбамі.

У краінах арабскага Усходу дата праставілялася па мусульманскім летазлічэнні.

Пры вызначэнні датавання манеты неабходна ўлічваць храналагічную сістэму, да якой адносіцца дата. Гэта можа быць, напрыклад, юліянская, грыгарыянская ці мусульманская каляндарная сістэма з адпаведнымі эрамі: ад стварэння свету; хрысціянская (лік гадоў ад нараджэння Хрыста); мусульманская, або Хіджра («уцёкі»), што звязана з перасяленнем Мухамеда з Мекі ў Мядзіну, якое адбылося па грыгарыянскім календары ў 622 г.

**5. Назва манетнага двара** (месца чаканкі) традыцыйна мела трывалыя скарачэнні – Віленскі манетны двор (W, V), Варшаўскі манетны двор (MW, WM), Маскоўскі манетны двор (ММ, ММД), Пецярбургскі манетны двор (СМ, СП, СПМ).

**6. Імя манетнага майстра** (пасадавай асобы манетнага двара) сустракаецца як у кругавой легендзе, так і ў полі манеты. Магло пазначацца яго ініцыяламі ці ўмоўнымі значкамі.

**7. Вызначэнне металу** на манетах часам спалучалася з указаннем колькасці хімічна чыстага высакароднага металу (напрыклад, савецкі «полтинник» (паўрубель) 1924 г.; беларускія памятныя манеты з высакародных металаў).

**8. Эмісійны знак** прастаўляецца ў манетным полі ў выглядзе, напрыклад, кропкі, кружка, крыжыка і служыць для зручнага адрознення паміж сабой аднатыпных манет розных выпускаў (напрыклад пры рэнавацыі манет, калі старыя манеты пэўных эмісій абменьваліся ў абавязковым парадку на новыя, звычайна больш нізкай якасці).

**9. Намінал** (лац. nominalis – імянны) – абазначэнне намінальнай вартасці (годнасці) манеты. Намінал мае адпаведную значнасць пры даследаванні манеты. Менавіта на яго звяртаюць асноўную ўвагу непасрэдныя карыстальнікі грашовых сродкаў.

> Аб неабходнасці ведання правільных суадносін паміж рознымі наміналамі сведчыць адна з паўночна-амерыканскіх казак, у якой мядзведзь прадае долары па цэнту, а ліса – цэнты па долары. У выніку дасведчаныя пакупнікі – бараны пасля доўгіх разважанняў вырашылі, што паўнавартасныя долары па цэнту прадавацца не будуць, і набылі ў лісы «добрыя» цэнты па долары за штуку!
>
> Недакладнае веданне рэалій грашовага абарачэння прыводзіць да шэрагу памылак у некаторых гістарычных і літаратурных творах.

Такім чынам, складовыя часткі легенды ўтрымліваюць даволі значную па аб’ёме інфармацыю. Для таго, каб яна магла быць змешчана на невялікім манетным полі, рэзчыкі штэмпеляў з мэтай эканоміі месца выкарыстоўвалі тэхнічныя *прыёмы скарачэння легенд – абрэвіятуру* і *лігатуру*.

*Абрэвіятура* – гэта скарачэнне слова да адной ці некалькіх літар.

Прыкладам могуць паслужыць тыповыя абрэвіятуры:
SC (Senatus consulto) – па рашэнні Сената;
D(ei) G(ratia) – Божаю ласкаю;
D(ux) – князь (герцаг);
R(ex) – кароль;
IM(perator), IMP(erator) – імператар;
DN (Dominus noster) – наш валадар
і інш.

У абрэвіятурным варыянце маглі быць вызначаны назвы манетных двароў:
W, V – Віленскі манетны двор;
MW, WM – Варшаўскі манетны двор;
ініцыялы асоб, адказных за чаканку;
TLB – Ціт Лівій Бараціні;
TT – Томас Тымф;
ПЛ – Пётр Латышаў;
TR – Томас Роўз.

Цікавым варыянтам абрэвіятуры з’яўляецца легенда на ўзнагародных «залатых» у 3, 2, 1 ½, 1, ⅔, ½, ¼ чырвонца ў гонар крымскіх паходаў рускіх войскаў у 1687 і 1689 гг. На аверсе гэтых манет чытаем:

+Б М В Г Ц І К И А П А (Божией милостию великие государи цари и князи Иоанн Алексеевич, Петр Алексеевич), а на рэверсе:

І Г Б Ц І К С А В В І И Р С (и государыня благоверная царевна и княжна Софья Алексеевна всея великая и иных России самодержцы) [66, с. 237].

Неабходна ўдакладніць, што расійскія ўзнагародныя залатыя манеты XVII ст. не выкарыстоўваліся як плацежныя сродкі, а выконвалі ролю вайсковых узнагарод.

*Лігатура* – зліццё некалькіх літар у адзіную канструкцыю (гэта другое значэнне тэрміна, першае – узгадвалася пры разглядзе пытання аб металічных сплавах). Такім жа чынам, напрыклад, адбываецца ўмоўнае вызначэнне металаў (AV, AR, Æ). Лігатура можа выкарыстоўвацца і пры напісанні ініцыялаў эмітэнтаў у выглядзе манаграмы (друкаваныя літары) ці вензеля (пісьмовыя літары, прыгожа пераплеценыя паміж сабой).

Часам у манетных легендах прысутнічае нейкі тэкст, у якім вылучаюцца (напрыклад, большым памерам) некаторыя літары, лічбы, ці проста першыя літары ў радках, з якіх складаецца зашыфраваная дата ці слова. Гэта *хранаграмы* (гр. chronos – час, gramma – літара, запіс). Хранаграмы звычайна выкарыстоўваліся на памятных манетах і медалях.

Трэба адзначыць, што прыёмы абрэвіятуры і лігатуры абцяжарваюць працэс чытання манетных легенд.

*Тып манеты* – вызначаецца як устойлівая кампазіцыя выяў і легенды (іх размяшчэнне ў манетным полі, аднолькавыя дэкаратыўныя дэталі, шрыфт і г. д.). Тып манеты – з'ява даволі кансерватыўная, наяўнасць адрозненняў у нязначных дэталях звязана з варыянтам манетнага тыпу. Варта падкрэсліць і тое, што тып манет фарміраваўся ў адпаведнасці з пануючымі мастацкімі стылямі.

* * *

*Эмісіі* (фр. émission – выпуск) *манет* могуць насіць як *рэгулярны*, так і *нерэгулярны характар*. Асноўная маса манет, што вырабляецца для шырокага грашовага абарачэння, адносіцца да рэгулярных эмісій. Але ёсць манеты, якія выпускаюцца з іншымі мэтамі, менавіта яны і складаюць групу нерэгулярных эмісій. Гэтая група аб'ядноўвае памятныя, данатыўныя (падарункавыя) манеты, прыватныя грошы, манеты-імітацыі, манеты надзвычайных абставін, пробныя, наваробныя манеты, антыкварныя падробкі.

Асобнае месца займаюць фальшывыя манеты, якія адрозніваюцца спецыфічнымі асаблівасцямі.

*Памятныя манеты* (мемарыяльныя) выпускаюцца з мэтай адзначэння нейкай важнай падзеі ці юбілейнай даты (у такіх выпадках іх могуць называць «юбілейнымі»). Прызначаюцца для калекцый, выкарыстоўваюцца як сувеніры, падарункі, а выкананыя з высакародных металаў – і як сродкі інвесціравання.

Памятныя манеты вырабляюцца з выкарыстаннем высокіх тэхналогій, але традыцыйна маюць вельмі невысокую, у параўнанні з рэальнай, намінальную вартасць, што, зразумела, з'яўляецца непераадольным бар'ерам для прысутнасці іх у грашовым абарачэнні. Выключэннем з гэтага сталі савецкія памятныя манеты 1965, 1967, 1970 гг. выпуску, якія былі далучаны да рэгулярных эмісій па ідэалагічных прычынах.

*Данатыўныя* (лац. dono – дарыць) манеты чаканіліся з мэтай выкарыстання іх у якасці падарунка. Гэтыя манеты вырабляліся на высокім тэхнічным узроўні з высакародных металаў высокай пробы. Прыкладам могуць служыць масіўныя залатыя манеты наміналам 10 дукатаў (партугалы).

*Прыватныя грошы* выпускаліся прыватнымі прамысловымі і гандлёвымі прадпрыемствамі, гарадскімі органамі ўлады пры недахопе дзяржаўных эмісій дробнай манеты ці па іншых прычынах. Манеты гэтага тыпу вырабляліся з танных матэрыялаў на невысокім тэхнічным узроўні, насілі лакальны характар і былі разлічаны для выкарыстання ў абмежаваны перыяд часу.

*Манеты-імітацыі* капіравалі тыпы стабільных паўнавартасных манет іншых краін і выпускаліся з мэтай забеспячэння іх актыўнага абарачэння на тэрыторыі як сваёй краіны, так і замежжа.

Прыкладамі такога імітавання манетнага тыпу з'яўляюцца «тынфы» і «шастакі» Пятра I, імітаванне галандскіх дукатаў на Варшаўскім манетным двары падчас паўстання 1830–1831 гг. з праўдзівым указаннем на месца чаканкі (выява маленькага польскага арла на аверсе) і тайны выпуск аналагаў галандскіх дукатаў (1768–1868) на Санкт-Пецярбургскім манетным двары.

*Манеты надзвычайных абставін* чаканіліся ў неспрыяльных умовах, у часы ваенных падзей, паўстанняў і выкарыстоўваліся, напрыклад, для тэрміновых выплат (ваенным наймітам і інш.). Эмісіі такіх манет маглі ажыццяўляцца і з палітычнымі мэтамі (напрыклад, манеты часоў Польскага паўстання 1830–1831 гг.). Манеты вырабляліся са звычайных для манетнай вытворчасці металаў, але маглі мець невысокі тэхнічны ўзровень выканання.

*Пробныя манеты* прызначаюцца для іспыту і ацэнкі манетным сеньёрам узорнага экзэмпляра перад масавай эмісіяй новай манеты. Пробныя манеты маглі быць выраблены з менш каштоўных матэрыялаў, чым звычайная чаканка.

Эмісіі *наваробных манет* адбываюцца на дзяржаўных манетных дварах у афіцыйным парадку з мэтай папаўнення музейных калекцый, продажу калекцыянерам і інш. Пры гэтым выкарыстоўваюцца сапраўдныя ці спецыяльна зробленыя аналагічныя штэмпелі і адпаведныя металы. Адрознівае гэтыя манеты ад сапраўдных больш позні час іх чаканкі, што можна высвятліць пры правядзенні дасканалага даследавання.

Наваробныя манеты могуць ці поўнасцю адпавядаць арыгіналу, ці мець некаторыя змены. Часам на такіх манетах прастаўляецца і новая дата. Прыкладам можа служыць савецкі залаты чырвонец 1923 г., які паўторна чаканіўся ў 1975–1982 гг. з указаннем рэальнай даты чаканкі і (з 1977 г.) манетнага двара (ЛМД, ММД) на гурце.

*Антыкварныя падробкі* – гэта манеты, зробленыя з адпаведных металаў у тэхніцы адліўкі, падробным штэмпелем ці шляхам стварэння гальванапластычнай копіі з мэтай падману збіральнікаў манет. Падробкі такога роду вядомы са старадаўніх часоў.

Неабходна звярнуць увагу і на манетападобныя жэтоны, якія маглі чаканіцца для падарункаў, адзначэння нейкай падзеі ці прыналежнасці да арганізацыі, установы і інш. Жэтоны ў залежнасці ад патрэбы выраблялiся як з некаштоўных сплаваў, так і з высакародных металаў. Ад манет яны адрозніваліся, напрыклад, адсутнасцю вызначэння намінальнай вартасці і адпаведных дзяржаўных сімвалаў.

Асобную групу манет складаюць фальшывыя манеты (не блытаць з антыкварнымі падробкамі!). *Фальшывыя манеты* – гэта незаконныя сродкі грашовага абарачэння, якія вырабляюцца з мэтай атрымання ўласнай выгады. Знешне яны практычна не адрозніваюцца ад сапраўдных, але

ў іх вытворчасці шляхам адліўкі ці чаканкі несапраўднымі штэмпелямі выкарыстоўваюцца больш танныя, чым у сапраўдных манет, матэрыялы з наступным, пры неабходнасці, серабрэннем ці залачэннем.

Рэальная вартасць фальшывых манет, зразумела, павінна быць значна ніжэйшая за намінальную. Падробныя манеты, калі яны нават і выкананы з высакародных металаў, маюць больш нізкую пробу.

У большасці выпадкаў адбываецца замена каштоўных матэрыялаў, напрыклад, волавам, меддзю, бронзай з залачэннем ці серабрэннем. Пры іх вырабленні маглі прымяняцца адліўка ў форму ці стварэнне новых падробных штэмпеляў, у сучаснасці – камп’ютарныя тэхналогіі.

Фальшываманецтва як з’ява, якая накіравана на разбурэнне эканамічных асноў дзяржавы, вядома з антычных часоў. Неабходна адзначыць, што ў сусветнай практыцы заўсёды, і раней і зараз, здзяйсняецца аднолькавае пакаранне за падробку як уласных, так і іншаземных грашовых сродкаў.

Пакаранне за фальшываманецтва заўсёды было вельмі жорсткім. У Старажытнай Грэцыі выносілі смяротны прысуд. У Старажытным Рыме свабодных грамадзян прыгаворвалі да высылкі ці катаржных работ, рабоў распіналі на крыжы ці аддавалі ў цырк на разарванне звярам. У той жа час рабу, які данёс на фальшываманетчыка, даравалася свабода і правы вольнага чалавека. У больш познія часы, у еўрапейскіх краінах у дачыненні да падобных злачынцаў практыкавалася выколванне вачэй, адсяканне рук, акунанне зажыва ў кацёл з кіпячым алеем, заліванне ў горла расплаўленага металу і інш.

*Гісторыя фальшываманецтва на тэрыторыі Беларусі* – гэта яшчэ адна цікавая старонка нумізматычных даследаванняў.

Аб распаўсюджанасці фальшываманецтва на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага сведчыць з’яўленне ў Статуце 1566 г. асобнага артыкула, прысвечанага гэтай незаконнай з’яве. Канчаткова пакаранне за падробку манеты было сфармулявана ў Статуце 1588 г. (Раздзел I, артыкул 17 «О фальшованью монеты…»): «теж хто бы монету нашу фальшовал, переправовал и обрезывал…тые мають быти на горле огнем карани без милосердья…», што азначала спаленне зажыва [67, с. 91].

Беларускія землі ў сувязі са спрыяючымі ўмовамі – геаграфічнае становішча, гістарычны лёс – былі ў справе еўрапейскага фальшываманецтва ў ліку першых і па колькасных і па якасных паказчыках.

У архівах можна знайсці значны аб’ём судовых дакументаў і іншых пісьмовых крыніц, якія зафіксавалі практычна ўсе бакі дзейнасці фальшываманетчыкаў, што працавалі на тэрыторыі Беларусі і нават супрацоўнічалі з адпаведнымі замежнымі цэнтрамі, падрабляючы ў розныя гістарычныя перыяды як манеты, так і папяровыя грошы [29].

У запісах актавых кніг магілёўскага магістрата за 8 ліпеня 1720 г. зафіксавана абвінавачанне магілёўскага месціча Мацвея Стэфановіча ў падробцы расійскіх медных капеек. Пад катаваннямі ён прызнаўся, што фабрыкаваць капейкі разам з паплечнікамі – нейкімі Барысам Пятровічам і Стаскам – вучыўся сем гадоў таму назад у немца ў Шклове. У апраўданне дзеянняў Мацвей звяртаў увагу на тое, што манету ён вырабляў не ад імя Аўгуста II, а ад імя Пятра I. У выніку суд змяніў прысуд са спалення на адсячэнне галавы, але ад выканання гэтай пастановы Мацвея Стэфановіча выратавалі манахі кармеліты і бернардынцы [54, с. 256–257].

У грашовым абарачэнні на тэрыторыі Беларусі XIX – пачатку XX ст. прысутнічала пэўная колькасць фальшывых расійскіх манет. Большасць іх была зроблена шляхам ліцця ў форму, якая ў спрошчаным варыянце складалася з дзвюх палавін з выявамі аверса і рэверса падрабляемай манеты. Форма, як правіла, выраблялася з гліны, гліняна-пясочнай сумесі, гіпсу, крэйды.

У матэрыялах Мінскага галоўнага суда за 1824–1825 гг. захавалася справа па абвінавачванні групы вязнікаў і салдат гарадскога астрога ў выраблені фальшывых манет. У ёй зафіксаваны шэраг эпізодаў, звязаных з падробкай і выкарыстаннем падробных манет непасрэдна ў турме. У працэсе выраблення фальсіфікатаў вязнікі залівалі расплаўленае ў меднай лыжцы волава ў адмысловую форму. Яна была зроблена з дзвюх шчыльна прылягаючых дошак, унутры якіх было два паглыбленні, з устаўленымі крэйдавымі кружкамі з адціснутымі загадзя выявамі аверса і рэверса сапраўднай манеты. У выніку, калі залітае волава застывала, то з формы даставалі ўжо гатовую манету [27].

Заканадаўства Расійскай імперыі XIX ст. прадугледжвала для фальшываманетчыкаў скасаванне ўсіх правоў і катаржныя работы (ад чатырох да дванаццаці гадоў у залежнасці ад цяжкасці злачынства). Суровым было пакаранне за выраблене і збыт фальшывых манет і папяровых грошай у СССР. Крымінальная адказнасць за падробку грашовых сродкаў прадугледжана і заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Яскравую характарыстыку фальшываманецтву як грамадскай з’яве даў расійскі юрыст А. Коні (1844–1927), які пісаў, што падробка грашовых знакаў, на першы погляд, не парушае непасрэдна нічыіх правоў, але на самай справе ад гэтага злачынства пакутуе і асобны індывід і цэлае грамадства. Ён адзначае наступнае: «фальшывыя паперкі, як бы дрэнна яны не былі зроблены… уяўляюць вядомую каштоўнасць, яны каштуюць, у сэнсе працы, дорага, і падробка іх спалучана з вялікай рызыкай… фальшывыя асігнацыі падобны на казачны клубок змей. Кінуў яго нехта ў адным месцы, а папаўзлі змейкі паўсюль…» [29, с. 24].

* * *

Манеты, якія паступаюць у музейныя калекцыі, у абсалютнай большасці выпадкаў каразіраваныя (пакрыты слаямі розных вокіслаў) і падлягаюць ачыстцы.

Працэс ачысткі манеты праходзіць некалькі этапаў: вызначэнне металу, увільгатненне манеты, хімічная, у спалучэнні з частковай механічнай, ачыстка манеты, кансервацыя.

Кожны з металаў, што ўваходзіць у сплаў, праяўляецца сваёй па колеры карозіяй. Напрыклад, медзь і бронза ўтвараюць вокіслы вішнёва-чырвонага (закіс медзі), цёмна-зялёнага (вуглякіслая медзь), ці бледна-жоўтага (вуглякіслы свінец) колераў.

Часам медныя і бронзавыя манеты пакрыты пацінай – празрыстым слоем няшкодных вокіслаў, які не замінае бачнасці выявы і легенды і з’яўляецца сведчаннем старадаўнасці манеты. Няправільна праведзеная ачыстка знішчае паціну і надае манеце занадта яркі бляск, што робіць яе падобнай да наваробнай. Выкарыстанне ў такіх выпадках спецыяльных хімічных рэчываў вяртае манеце яе гістарычны «ўзрост».

Адпаведную ачыстку праходзяць і больш устойлівыя да ўздзеяння знешняга асяроддзя срэбныя манеты, якія паступова пакрываюцца вокісламі медзі зялёнага ці фіялетава-шэрага колеру.

Найбольш трывалыя да неспрыяльных умоў плацінавыя і залатыя манеты пры неабходнасці спачатку ачышчаюць у ацэтоне ці бензіне, а потым уздзейнічаюць на іх адпаведнымі хімічнымі рэчывамі.

Пасля ачысткі ўсе манеты абавязкова прамываюць у кіпені дыстыляванай вады і прасушваюць.

Апошні этап – гэта кансервацыя ачышчаных манет, у працэсе якой яны пакрываюцца парафінам ці сінтэтычнай смалой [54, с. 677–678].

Скарб – адзіны непадзельны комплекс, і таму ён мае ў музейных фондах асобныя ўмовы захоўвання. Навуковая апрацоўка манетнага скарбу праходзіць наступныя этапы: фіксацыя абставін знаходкі, ачыстка манет, фіксацыя агульнай масы скарбу, агульнае вызначэнне манет, сістэматызацыя іх па групах, падзел кожнай групы на адпаведныя падгрупы, вызна-

чэнне кожнай манеты (маса, дыяметр, суадносіны бакоў), сістэматызацыя манет па краінах, у межах адной краіны – у храналагічным парадку, у межах аднаго года – ад большага наміналу да меншага.

Манеты скарбу рэгіструюцца пад нумарамі дробу: лічнік – гэта агульны для ўсіх манет скарбу інвентарны нумар, а назоўнік – парадкавы нумар адпаведнай манеты.

Сабраная інфармацыя ў розных аб'ёмах заносіцца ў кнігу паступленняў і затым у навуковы каталог, дзе прыводзіцца больш падрабязная інфармацыя (інв. № – дзяржава – эмітэнт – час яго кіравання – манетны двор – назва манеты – дата эмісіі – метал – маса – дыяметр – суадносіны аверса і рэверса – ступень захаванасці – ступень рэдкасці – заўвагі).

Па асаблівасцях тэхналагічнага працэсу чаканкі калекцыйныя манеты падзяляюцца на дзве асноўныя групы: выкананыя ў звычайнай ці палепшанай якасці – анцыркулейтэд (англ. uncirculated – манеты, якія не былі ў абарачэнні) і пруф (англ. proof – трывалы; манеты маюць роўнае люстэркавае поле і кантрасны матавы рэльеф).

Для вызначэння калекцыйнай вартасці манеты істотнае значэнне маюць ступені яе захаванасці і рэдкасці. У міжнароднай нумізматычнай практыцы склаліся некалькі, часам вельмі груваcткіх (да 70 пазіцый), сістэм вызначэння захаванасці манет – ад якасці «анцыркулейтэд» да «вельмі дрэннай» (выяў амаль не бачна) і іх рэдкасці – ад «звычайнай» да «ўнікальнай».

!!

*Манета як сродак грашовага абарачэння мае сваe гісторыю ўзнікнення і эканамічную аснову існавання, а таксама характарызуецца шэрагам матэрыяльных і знешніх уласцівасцей. Пэўную ролю ў гісторыі грашовага абарачэння займаюць і манеты нерэгулярных эмісій. Захаванне манеты ў музейнай нумізматычнай калекцыі патрабуе правядзенне яе ачысткі, кансервацыі і навуковай апрацоўкі.*

## Заданні для самакантролю

1. Вызначыць матэрыяльныя характарыстыкі манеты.
2. Ахарактарызаваць віды манетных проб.
3. Выявіць знешнія характарыстыкі манеты.
4. Даць характарыстыку манетнай легендзе.
5. Растлумачыць прызначэнне асобных груп манет нерэгулярных эмісій.
6. Пералічыць асноўныя этапы ачысткі і кансервацыі манет.
7. Апісаць працэс вызначэння калекцыйнай вартасці манет.

## Тэма 1.4. Тэхніка манетнай вытворчасці

Манета – гэта аб'ект гісторыі тэхнічнай думкі, прадмет масавай, спачатку рамеснай, а потым машыннай вытворчасці. Веданне гісторыі манетнай справы і працэсу вырабу манет з'яўляецца неабходным этапам правядзення іх паўнавартаснага вызначэння (напрыклад, удакладненне датавання, аўтэнтычнасці).

Першапачаткова ў адпаведнасці з манетнай рэгаліяй дзяржаўная ўлада, якая мела выключнае права на чаканку манеты, магла надаваць яго прыватным асобам як прывілей ці даручэнне, а таксама перадаваць у арэнду.

Манетная вытворчасць ажыццяўлялася ў невялікіх рамесных майстэрнях, якія знаходзіліся ў валоданні манетчыкаў-арандатараў. У сваю чаргу яны былі абавязаны выконваць правілы манетнай стапы, адлічаць частку прыбыткаў ад чаканкі манет арэндадаўцу, набываць неабходнае абсталяванне, аплачваць працу рабочых і інш. У далейшым манетная вытворчасць канцэнтруецца на дзяржаўных манетных дварах.

Манеты могуць быць выраблены двума спосабамі – ліццё ў форму і чаканка.

Тэхніка ліцця ў першую чаргу характэрна для антычнага перыяду. *Працэс ліцця ў форму* адбываўся шляхам заліўкі расплаўленага сплаву ў форму (напрыклад, гіпсавую, вапняковую). Форма магла быць адзінкавай і групавой. У апошнім выпадку для раўнамернага размеркавання расплаўленага металу паміж асобнымі паглыбленнямі-формамі рабіліся каналы (літнікі). Пры застыванні металу гэтыя каналы абломлівалі, а іх рэшткі зачышчалі.

У залежнасці ад формы (дзвюхбаковая ці аднабаковая) манета магла адлівацца як з дзвюхбаковай, так і з аднабаковай выявай. Як варыянт, адлітым мог быць толькі манетны кружок, на якім потым, шляхам чаканкі наносілася адна- ці дзвюхбаковая выява.

Літыя кружкі антычных манет адрознівае авальная ці адносна бобападобная форма і значная таўшчыня.

Спосабам адліўкі выраблялісся старажытнакітайскія манеты, шэраг медных антычных манет (напрыклад, манеты Ольвіі VI–IV стст. да н. э., старажытнарымскія асы, некаторыя манеты Рымскай імперыі III ст. н. э.).

Сваю спецыфіку мелі многія манеты Старажытнай Грэцыі, якія выраблялiся з літых кружкоў з аднабаковай выявай. Выява чаканілася ніжнім штэмпелем, калі разагрэты літы манетны кружок прыціскалі да яго стрыжнем з шыпамі і потым білі малатком. У выніку на манетным кружку знізу адбівалася выява, а зверху заставаліся адбіткі шыпоў – невялічкія паглыбленні, што мелі пераважна прамавугольную форму. Замест стрыжня мог выкарыстоўвацца плоскі штэмпель.

Трэба адзначыць, што тэхніка ліцця – адзін са спосабаў вырабу фальшывых манет.

Грунтоўна даследаваным з'яўляецца *спосаб ручной чаканкі манет.* Працэс ручной (як у далейшым і машыннай) чаканкі манет праходзіў 5 этапаў: падрыхтоўчыя работы, выраб манетных пласцін, выраб штэмпеляў, чаканка манет, верыфікацыя.



Ручная чаканка манет

*1. Падрыхтоўчыя работы* складаюцца з працэсаў металургічнага характару (апрацоўка металічнай руды; выраб цанаў (металічных загатовак) – зліткаў металічных сплаваў; калі сплаў быў высакародным, цан з яго меў зададзеную пробу).

Плаўка металаў адбывалася ў спецыяльнай пасудзіне – тыглі, які меў канічную ці цыліндрычную форму і вырабляўся з вогнетрывалых матэрыялаў – высокаўстойлівых да ўздзеяння металаў і іх сплаваў. Тыгель мог умяшчаць да некалькіх кілаграмаў металічнага сплаву.

*2. Выраб манетных пласцін.* Падчас гэтага працэсу адбывалася раскоўка цанаў молатамі ў пласціны неабходнай таўшчыні. З XIV ст. для гэтай аперацыі пачалі выкарыстоўваць спецыяльны плюшчыльны стан. Далей з пласцін неабходна было выразаць дыскавідныя нарыхтоўкі. Адзін з варыянтаў атрымання круглай формы – гэта разразанне металічнага ліста на квадраты, якія потым абразаліся да круга. Вуглы на квадратных пласцінах маглі таксама адбівацца малаткамі, што, бясспрэчна, змяншала страты на пераплаўку рэшткаў металу. Часам манеты чаканілі і на чатырохвугольных пласцінах. Такія манеты (някруглыя па форме) называліся кліпамі (ад швед. klippe – рэзаць нажніцамі).

З цягам часу для выраблення манетных кружкоў сталі выкарыстоўваць полыя стрыжні неабходнага дыяметра з заточаным краем, якімі з металічнага ліста высякаліся манетныя нарыхтоўкі. Гэты спосаб дазваляў у шмат разоў паскорыць працэс вытворчасці.

У завяршэнне гэтага этапу манетныя кружкі для надання ім неабходнай якасці і прывабнага знешняга выгляду абпальваліся, чысціліся ў водным растворы кухоннай солі і віннага каменю (крышталічны асадак, які выпадае пры вытворчасці віна) ці ў кадцы с вугальным пылам, якая круцілася.

Абпал – гэта высокатэмпературная тэрмічная апрацоўка ў адпаведным (нейтральным, акісляльным і інш.) асяроддзі манетных кружкоў пры тэмпературы ніжэй за кропку плаўлення. Гэты тэхналагічны працэс надаваў вырабу неабходныя фізіка-тэхнічныя ўласцівасці.

*3. Выраб штэмпеляў.* Для чаканкі манеты былі неабходны два штэмпелі – ніжні і верхні. Штэмпелі – гэта стальныя (сплаў жалеза з вугляродам і некаторымі дадаткамі) ці бронзавыя (сплаў медзі і волава) стрыжні з адпаведнай выявай на тарцы.



Штэмпелі

Асноўнымі прыладамі манетчыка былі грабштыхель (ням. Grabstichel ад graben – капаць, sticheln – калоць), або разец для гравіроўкі, цыркуль, набор пунсонаў (невялікія па дыяметры стрыжні з рэльефнай выявай на зрэзе). З дапамогай гэтых прылад на адным з тарцоў кожнага з манетных штэмпеляў гравіраваліся ці выбіваліся пунсонамі негатыўныя (паглыбленыя) выявы і легенды (у люстэркавым варыянце).

Адзін з канцоў ніжняга штэмпеля меў конусападобнае (для зручнасці) завяршэнне, якое ўстаўлялася ў драўляную калоду. Верхні штэмпель для зручнага трымання ў руцэ меў пасярэдзіне спецыяльную выемку.

Нескладаныя па выяве манетныя штэмпелі маглі быць выраблены за 15–30 хвілін, складаная кампазіцыя выраблялася ад некалькіх гадзін да 2–3 дзён [46, с. 103].

У працэсе працы манетчыкі ўносілі шэраг удасканаленняў. Штэмпелі (асабліва верхнія) адносна хутка прыходзілі ў непрыгоднасць. Для паскарэння вырабу новага штэмпеля пачалі выкарыстоўваць матрыцу – стальны пазітыўны макет задуманай манеты ў натуральную велічыню. На разагрэтай рабочай паверхні будучага штэмпеля гэтым пазітыўным макетам выбівалі ўжо негатыўную выяву, якая пасля гартавання служыла матрыцай для чаканкі манет. З дапамогай такой матрыцы можна было неаднаразова аднаўляць штэмпельныя прылады.

З антычных часоў у чаканцы манет эпізадычна выкарыстоўваліся спалучаныя верхні і ніжні штэмпелі, што дазваляла атрымліваць манеты з аднолькавымі суадносінамі верхніх частак аверса і рэверса. Гэтыя суадносіны абавязкова фіксуюцца пры навуковым апісанні манеты.

*4. Чаканка манет.* Працэс непасрэднай чаканкі манеты заключаўся ў тым, што манетная нарыхтоўка накладалася на цэнтр ніжняга штэмпеля, прыціскалася верхнім штэмпелем, пасля ўдару малатком па ім на абодвух баках кружка адбіваліся адпаведныя выява і легенда. У выніку з'яўлялася новая манета.

*5. Верыфікацыя* (юсціроўка) – праверка манет. У рэчышчы апошняга этапу праводзіўся знешні агляд манет, правяраліся іх маса і памеры (напрыклад, шляхам апускання манеты ў адпаведную па дыяметры і шырыні шчыліну ў спецыяльнай скрыні).

Манеты, выраблены ручным спосабам, зразумела, маглі мець пэўныя хібнасці – памылкі ў выбары манетнай нарыхтоўкі, у легендзе, выкарыстанні ў выніку тэхналагічнага збою ці наўмысна штэмпеляў дзвюх розных манет у адной пары (гібрыдныя манеты), а таксама не свайго гуртавага абціскальнага колца, ссоўванні штэмпелю, выкарыстанні двайнога ўдару (пры атрыманні слабаадбітай выявы на манеце).

Гібрыдныя манеты, а таксама манеты з памылкамі ў легендзе (што можа быць і сведчаннем падробкі) карыстаюцца асаблівай увагай даследчыкаў і калекцыянераў.

* * *

Далейшае развіццё тэхнікі прывяло да частковай механізацыі, а ў больш познія часы і практычна поўнай аўтаматызацыі працэсаў манетнай вытворчасці.

Да канца XV ст. у манетнай справе не назіралася нейкіх глабальных змен. Манеты выраблялія ручным спосабам пры дапамозе элементарнага абсталявання. Са з'яўленнем на пачатку XVI ст. у грашовым абарачэнні буйной срэбнай манеты – талера – паўстала аб'ектыўная патрэба ва ўдасканаленні тэхнічнага абсталявання. Масавая чаканка такой манеты старым спосабам была немагчыма.

На пачатку XVI ст. Леанарда да Вінчы (1452–1519) распрацаваў апарат, які выразаў аднолькавыя манетныя кружкі з металічнай стужкі і чаканіў манету з дапамогай прэса і молатавай прылады. Верхні штэмпель быў усталяваны ў бервяне, якое ўздымалася і апускалася на блоку націскам нагі на педаль.



Молатавая прылада для чаканкі манет

У далейшым замест ручной раскоўкі металічных цанаў малаткамі пачынае выкарыстоўвацца вальцовачны станок, у якім цан, для атрымання пласціны неабходнай таўшчыні, шматразова прапускаўся паміж стальнымі цыліндрамі, якія круціліся.



Балансір

У сярэдзіне XVI ст. быў вынайдзены шрубавы прэс (балансір і яго варыянты). У наступныя перыяды балансір стаў самым распаўсюджаным манетным прэсам. Верхні штэмпель у гэтай канструкцыі замацоўваўся на хадавым шрубе, які падымаўся і апускаўся пры дапамозе доўгага двухплечнага рычага з грузамі па баках. Рычаг прыводзіўся ў дзеянне некалькімі рабочымі. Балансір ствараў моцны і спружыністы ўдар і вяртаў верхні штэмпель ва ўзведзенае становішча.

У хуткім часе на базе вальцовачнага станка ствараюць механізм для чаканкі манет. У аснове канструкцыі былі два валы, на якіх былі выразаны па некалькі экзэмпляраў верхніх і ніжніх штэмпеляў. Паміж валамі пракатвалася раскаваная металічная паласа, на якой адбіваліся адпаведныя выявы. Заставалася толькі высекчы з паласы на спецыяльным абсталяванні гатовыя манеты. Сістэма рычагоў і зубчастых перадач дазваляла дасягаць на манетах адносна дакладнае сумяшчэнне аверсных і рэверсных выяў. У выніку далейшага ўдасканалення штэмпелі на валах пачалі размяшчаць у спецыяльных паглыбленнях, што рабіла зручнай іх замену новымі экзэмплярамі.



Валы вальцовачнага станка



Медныя пласціны з адбітымі вальцовачным станком манетамі

Тэхніка «вальцверк» не набыла шырокага распаўсюджвання, таму што патрабавала дакладнай сінхранізацыі руху абодвух валоў, а манеты ў працэсе вытворчасці атрымлівалі некаторую дэфармацыю формы і выяў.

У другой палове XVI ст. на Парыжскім манетным двары пачалося вырабленне манетнага гурта з дапамогай раздымнага трохчастнага колца, якое ўстаўлялася ў круглую рамку. На ўнутранай паверхні колца магла быць выгравіравана легенда, зроблены нейкі арнамент ці насечка. У выніку сціскання колцам манетнага кружка на ім утвараўся гурт з адпаведнымі выявамі.

У канцы XVII ст. на Лонданскім манетным двары пачала працаваць гурцільная машына, на якой манетны кружок пад ціскам прапускаўся паміж дзвюма дугападобнымі планкамі, на якіх унутры была выгравіравана выява ці легенда.



Віды гуртаў



Гурцільны станок

Далейшы прагрэс тэхнікі манетнай вытворчасці быў звязаны з прымяненнем конскай цягі, магутнасці вады, выкарыстаннем паравога рухавіка, а потым і электрычнасці.

У 1786 г. швейцарац П’ер Дро стварыў манетны станок з паравым рухавіком, укамплектаваны шрубным прэсам, гурцільным колцам і пнеўматычным апаратам, які выконваў шэраг вытворчых аперацый.



Чаканка манет
на Санкт-Пецярбургскім манетным
двары ў канцы XIX ст.

Звяртаючыся да пытання прадуктыўнасці працы манетчыкаў мінулага, можна прывесці наступныя даныя. Ручная чаканка XI–XVII стст. давала на выхадзе 6 манет у хвіліну, пры выкарыстанні шрубнага прэса – 30 манет, на ўдасканаленай манетаробнай машыне ў канцы XIX ст. выраблялі 100 манет, а тэхнічныя магчымасці напрыканцы XX ст. павялічылі гэтую лічбу да 120 манет у хвіліну [46, с. 105].

У наш час комплексны манетаробны стан ахоплівае працэс ад выраблення манетных кружкоў да іх кампактнай упакоўкі.

Сучасныя тэхналогіі і метады чаканкі манет знайшлі шырокае выкарыстанне ў вытворчасці як памятных, так і рэгулярных манет. З дапамогай спецыяльнай тэхнікі і асобых метадаў чаканкі на манеце з'яўляюцца шаўкавіста-матавая паверхня і люстэркавы рэльеф.

Новыя тэхналогіі дазваляюць атрымаць высокі рэльеф, які надае памятным манетам асаблівыя эстэтычныя якасці і прыгажосць. Для гэтага выкарыстоўваюцца наступныя тэхналагічныя прыёмы:

– пры змене крысталічнай структуры металічнага сплаву ствараюцца манетныя нарыхтоўкі, якія для атрымання высокага рэльефу не патрабуюць моцнага ціску;

– манетныя нарыхтоўкі вырабляюцца з узвышэннем у тых месцах, дзе для ўтварэння высокага рэльефу патрабуецца больш металу;

– спецыяльны прэс рэгулюе моц і хуткасць ціску на манетную нарыхтоўку, што дае магчымасць дасягаць ідэальнага эфекту.

Тэхнічнае абсталяванне дазваляе надаваць памятным манетам розныя формы (ад самых простых да трохмерных мініяцюрных скульптур), для чаго выкарыстоўваюцца адпаведныя, сфарміраваныя з дапамогай камп'ютарных тэхналогій нарыхтоўкі і штэмпелі.

Часам на манетах з дапамогай мікрапячаткі лазарнай гравіроўкі штэмпеля ствараюцца мікранадпісы і мікравыявы.

Цікавай практыкай можна назваць і нанясенне на манеты схаваных выяў, якія можна пабачыць толькі пад пэўным вуглом зроку ці падзення святла. Існуюць манеты, што маюць розныя выявы на святле і ў цемры.

Пры дапамозе лазарных нанатэхналогій магчыма атрыманне на манеце вясёлкавага поля, ці рознакаляровага пакрыцця асобных выяў без афарбоўкі з дапамогай стварэння своеасаблівай аптычнай ілюзіі, што адбываецца пры праламленні святла.

Манета можа быць пакрыта рознакаляровымі эмалямі, іншымі металамі (пазалота, срэбра), быць пацініраванай (у выніку хімічнай апрацоўкі набыць розныя адценні шэрага колеру), упрыгожанай галаграмай, мець устаўкі са шкла і інкрустацыі каштоўнымі і паўкаштоўнымі камянямі.

На манеты можна таксама наносіць і QR-коды (штрыхкоды), якія ўтрымліваюць неабходную карыстальніку інфармацыю аб аб'екце.

Сучасныя памятныя і рэгулярныя манеты могуць быць біметалічнымі (створанымі з двух металічных сплаваў), калі складовыя часткі манетнай нарыхтоўкі (колца і ўнутраная частка) злучаюцца ў выніку сумеснай дэфармацыі (нязначнае расплюшчванне) у працэсе чаканкі. Пры наяўнасці ў манетнай вытворчасці розных металічных сплаваў неабходна ўлічваць іх узаемную фізічную і хімічную сумяшчальнасць. Манеты могуць быць створаны і з выкарыстаннем каляровых палімерных уключэнняў.

* * *

Да тэмы манетнай вытворчасці маюць дачыненне і ніжэйзгаданыя віды манет.

*Брактэаты* (лац. bractea – тонкая металічная пласцінка) – вельмі тонкая манета (маса магла вагацца ад 1 да 0, 11 г, дыяметр – ад 12 да 51 мм). Брактэаты з’явіліся ў Германіі на пачатку XII ст. як наступства працэсу «псавання манеты». Назва «брактэат» утварылася ў XVII ст., а да гэтага такія манеты іменаваліся як і звычайныя дэнарыі [6, с. 120–121].

Брактэаты мелі аднабаковую выяву і выраблялiся з дапамогай толькі верхняга штэмпеля. Для таго каб змякчыць яго ўдар, пад манетную нарыхтоўку падкладаўся, напрыклад, кавалак лямцу ці скуры. У выніку на аверсе ўтваралася выпуклая, а на рэверсе – увагнутая выява.

Часам удар штэмпелем мог фрагментарна прабіць нарыхтоўку наскрозь. Адзначаны і выпадкі, калі пад верхні штэмпель падкладалі некалькі брактэатных нарыхтовак і адразу атрымлівалі пэўную колькасць гатовых манет.

Тэхніка вырабу брактэатаў дазваляла атрымліваць манеты больш танна і хутка, па спрошчаным варыянце вытворчага працэсу з мінімізацыяй выяў і легенд.

Брактэаты былі разлічаны для абарачэння на невялікай тэрыторыі на працягу нязначнага перыяду часу. Менавіта такі падыход вырашаў усё ўзрастаючыя рынкавыя патрэбы ў манеце.

Гэтым спосабам маглі вырабляцца таксама і прыватныя грошы, якія мелі лакальную сферу абарачэння. Зразумела, што наяўнасць падобных манет у нумізматычнай калекцыі патрабуе асабліва беражлівых адносін да іх захоўвання і экспанавання.

*Скіфатныя манеты* маюць выразную сподачкападобную форму, абумоўленую выкарыстаннем своеасаблівых штэмпеляў, адзін з іх быў выпуклы, а другі – увагнуты (напрыклад, візантыйскія залатыя манеты канца XI ст.).

Вытворчасць расійскіх манет у дапятроўскія часы адбывалася ў так званай тэхніцы драцяной чаканкі. Спецыфіка спосабу вырабу драцяных манет заключалася ў тым, што манетныя нарыхтоўкі выраблялiся з невялікіх кавалкаў срэбнага дроту, якія ў выніку расплюшчвання набывалі няправільную авальную форму.




Працэс вырабу драцяных манет

Зразумела, што круглыя штэмпелі адбівалі на такіх непаўнавартасных манетных «кружках» толькі фрагмент выявы і легенды. Станоўчым момантам было тое, што пры гэтым адбывалася эканомія металу і памяншэнне аб'ёму чалавечай працы – кавалкі дроту выкарыстоўваліся поўнасцю, без адходаў, звычайных пры выразанні круглых манетных нарыхтовак з металічнага ліста.

Праўда, трэба адзначыць, што такі спосаб вытворчасці патрабаваў толькі высакапробнага срэбра (дрот з нізкаякаснага срэбра ірваўся пры працяжцы), што прыводзіла да залішніх выдаткаў з дзяржаўнай казны.

Гэтая тэхніка ў пэўны час мела распаўсюджанне і на тэрыторыі ВКЛ.

*Перачаканка манеты* – чаканка новай манеты на кружках манет, пабываўшых у абарачэнні. Перачаканка магла быць выклікана рознымі прычынамі. Яе мог праводзіць як той жа, так і новы эмітэнт з мэтай, напрыклад, эканоміі металу і выдаткаў на вытворчыя працэсы, неабходнасці паскарэння выпуску новай манеты, атрымання фінансавых прыбыткаў ад змены наміналу манеты, а таксама пры правядзенні рэнавацыі манеты (перыядычнае зняцце з абарачэння старой манеты і абмену яе на новую на больш выгадных для эмітэнта ўмовах).

Часам перачаканка праводзілася і па палітычных матывах як дэманстраванне перамогі над праціўнікам.

*Контрамаркіраванне* (надчаканка) – працэс, пры якім на манеце дадаткова ставіўся нейкі невялікі знак, літара, выява. Контрамаркіраванне магло выконваць функцыю дазволу на выкарыстанне насельніцтвам іншаземнай манеты, зацвярджэння сапраўднасці, працягу абарачэння ці змены намінальнай вартасці нейкай грашовай адзінкі.



Контрамаркіраваны «яфімак». Ø 40–42 мм

Яскравым прыкладам контрамаркіравання з'яўляюцца іспананеапалітанскія талерныя манеты – так званыя «філіпкі» і расійскія яфімкі «з прыметай» (больш падрабязна аб гэтых манетах – у адпаведных раздзелах ніжэй).

!!

*Манета з'яўляецца пэўным вынікам і паказчыкам тэхнічнага развіцця адпаведнай краіны. Вытворчасць манеты можа здзяйсняцца двума спосабамі – ліццё ў форму і чаканка. Працэс ручной чаканкі манет праходзіў шэраг этапаў, якія захаваліся і пры далейшай яго мадэрнізацыі (выкарыстанне паравога рухавіка, электрычнасці, уключэнне ў вытворчы працэс разнастайных прыстасаванняў для частковай механізацыі працы манетчыкаў і г. д.). Неабходна адзначыць і некаторыя асобныя тэхнічныя прыёмы, што мелі месца ў манетнай вытворчасці пры вырабе брактэатаў, драцяных і іншых манет, а таксама і хібнасці, якія маглі з'яўляцца пры ручным спосабе чаканкі.*

## Заданні і пытанні для самакантролю

1. Даць характарыстыку спосабам вырабу манет.
2. Назваць асноўныя этапы ручной чаканкі манет.
3. Раскрыць асаблівасці вырабу манетнага штэмпеля.
4. Прывесці прыклады мадэрнізацыі чаканкі манет.
5. Ахарактарызаваць тэхніку чаканкі драцяных манет.
6. Апісаць тэхніку чаканкі брактэатаў, скіфатных манет.
7. Чым вызначалася неабходнасць правядзення перачаканкі і контрамаркіравання манет?

## Тэма 1.5. Грашовыя скарбы – помнікі гісторыі і культуры

Скарб уяўляе сабой комплекс манет (папяровых грошай), які сваімі якаснымі і колькаснымі паказчыкамі характарызуе пэўную тэрыторыю і час.

Манетныя скарбы з’яўляюцца адной з самых інфарматыўных гістарычных крыніц. Яны аб’ектыўна сведчаць аб складзе манетнага фонду, адлюстроўваюць унутраныя і знешнія эканамічныя, палітычныя, культурныя сувязі таго ці іншага рэгіёна ў дадзены перыяд гістарычнага развіцця. Манеты, адкрытыя разам з нейкімі артэфактамі, адназначна вырашаюць заўсёды складаную праблему датавання знаходак.

Утварэнне скарбаў – гэта самы звычайны і шырокараспаўсюджаны спосаб захоўвання каштоўнасцей. Аб гэтым сведчаць як пісьмовыя крыніцы, так і непасрэдна склад і характар манетных дэпазітаў.



Манетны скарб XVII ст.
в. Засоўе Лагойскага р-на Мінскай вобл.,
знаходка 1974 г.

Абсалютная большасць скарбаў – дастаткова сціплыя грашовыя сумы, што належалі прадстаўнікам незаможных груп насельніцтва. Грашовыя скарбы амаль заўсёды маюць падрыхтаваную загадзя ўпакоўку. Манеты могуць быць загорнуты ў тканіну, скуру і бяросту, упакаваны ў гліняны ці металічны посуд, закрыты накрыўкай, каменем ці заліты воскам. На ўнутраных сценках начынняў часам можна пабачыць пакінутыя манетамі адбіткі вокіслаў. У ганчарным рамястве нават існавала спецыяльная галіна па вырабе разнастайных па аб’ёме і форме начынняў для скарбаў.

Геаграфічнае становішча беларускіх зямель і гістарычныя падзеі, што адбываліся на працягу стагоддзяў, абумовілі стракаты, «шматнацыянальны» склад грашовых дэпазітаў.

Большасць з адкрытых скарбаў былі захаваны для зручнасці карыстання на невялікай (0,2–05 м) глыбіні і ўяўлялі нязначныя па матэрыяльнай вартасці зберажэнні, якія маглі належаць прадстаўнікам самых шырокіх колаў насельніцтва.

Папулярна выказванне, што ў скарба двое бацькоў – дастатак і бяда. Зразумела, што збіраць і хаваць грошы ў патаемных месцах на «чорны», а можа, і «светлы, радасны» дзень вымушалі людзей розныя жыццёвыя абставіны, а рэчаіснасць вельмі часта залішала іх гаспадара магчымасці выкарыстаць свае накапленні. Напрыклад, ваенныя падзеі маглі паўплываць на некаторае павелічэнне колькасных паказчыкаў у працэсе ўтварэння скарбаў, але гэты ўсплёск характарызуе толькі эпізод, а не цэлы перыяд у гісторыі грашовага абарачэння.

Адкрыццё манетнага дэпазіту – заўсёды надзвычайная падзея і неверагодны набор выпадковых супадзенняў. Кожны грашовы скарб – з'ява індывідуальная, сярод іх немагчыма сустрэць поўнае падабенства. Грашовыя дэпазіты адрозніваюцца адзін ад другога цэлым спектрам якасных і колькасных параметраў. Унікальнасць такога помніка гісторыі і культуры, як грашовы скарб, патрабуе асабліва беражлівых адносін.



Манетны скарб 1918 г. в. Чарневічы Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл., знаходка 1-й пал. 1970-х гг.

З эканамічнага пункту гледжання грашовыя скарбы з'яўляюцца своеасаблівымі рэгулятарамі грашовага абарачэння. Функцыянаванне рынкавых адносін патрабуе пэўную грашовую суму. У выпадках, калі грашовая маса перавышае патрэбы рынку, адбываецца зыход лішніх грошай у рэзерв (у выглядзе скарбаў) і наадварот – пры неабходнасці папаўнення грашовай масы, пэўныя аб'ёмы грошай вяртаюцца ў рыначнае абарачэнне.

Агульная колькасць скарбаў, што адносяцца да адпаведнага перыяду, характарызуе ўзровень эканамічнага развіцця рэгіёна, дзе яны былі захаваны.

У нумізматычнай літаратуры існуе некалькі поглядаў на прычыны большай ці меншай ступені канцэнтрацыі манетных знаходак на пэўнай тэрыторыі. У першым варыянце ідзе гаворка аб узрастанні колькасці скарбаў як выніку заняпаду экономікі краіны. У адпаведнасці з другім меркаваннем, павелічэнне колькасці грашовых дэпазітаў – сведчанне актыўнага рынкавага жыцця.

Правільным будзе разглядаць гэтыя меркаванні як бакі адной з'явы. Упадак экономікі на пэўнай тэрыторыі можа праявіцца ў рэзкім узрастанні колькасці манетных дэпазітаў толькі пры ўмове, што раней у гэтым рэгіёне існавалі развітыя таварна-грашовыя адносіны [51, с. 58].

Навуковае даследаванне манетнага дэпазіту – працэс даволі складаны. Вывучэнне скарбу дае магчымасць адказаць на шэраг пытанняў гісторыі грашовага абарачэння, вызначыць склад пэўных грашовых сістэм, узровень сацыяльна-эканамічнага, тэхнічнага, культурнага развіцця краіны ў адпаведныя перыяды, прасачыць міжнародныя гандлёвыя сувязі, а таксама датаваць розныя прадметы, што былі знойдзены разам з манетамі.

Пры першаснай класіфікацыі дэпазіт вызначаецца як грашовы, грашова-рэчавы ці рэчавы. У працэсе далейшага вызначэння ён можа быць аднесены да адной з наступных падгруп, напрыклад, скарбаў страчаных (якія засталіся ў сховішчах насуперак волі ўладальніка), зваротных (захаваных з намерам іх выкарыстання ў будучым), незваротных (культавыя ахвяраванні), кароткатэрміновага

накаплення (асабістыя), доўгатэрміновага накаплення (княскія, манастырскія, купецкія ці разбойніцкія зберажэнні), надзвычайных абставін (схаваныя паспешліва, у неахайнай упакоўцы ці без яе), фальшывых манет (захаваных, як лагічна ўявіць, самімі фальшываманетчыкамі). Скарбы падробных манет – надзвычайна рэдкая з'ява, тым не менш на тэрыторыі Беларусі зафіксавана некалькі такіх выпадкаў [28].

Пры даследаванні грашовага скарбу праводзіцца атрыбуцыя кожнай манеты (вызначаюцца яе знешнія і матэрыяльныя характарыстыкі) і датаванне магчымага часу яго захавання.

Час захавання скарбу ўмоўна звязваюць з годам чаканкі наймалодшай манеты з яго складу. Зразумела, што для больш дакладнага датавання павінны ўлічвацца дадатковыя абставіны. Напрыклад, пры адсутнасці прытоку больш позніх эмісій, пэўныя манеты маглі прысутнічаць у абарачэнні даволі доўгі час пасля іх выпуску; іншаземныя манеты маглі паступіць на пэўную тэрыторыю праз значны час пасля іх эмісіі; калі на манеце адсутнічае дата чаканкі, яе адносяць да ўсяго перыяду кіравання яе эмітэнта і інш.

Праблема датавання скарбаў мае агульнанавуковае значэнне. Дыскусіі па пытанні часу захавання грашовага скарбу пачаліся ў канцы XIX ст. Шэраг даследчыкаў лічыць, што для больш дакладнага вызначэння неабходна да даты чаканкі малодшай манеты дадаваць адносна невялікую колькасць гадоў. Прычым буферны перыяд будзе меншы для скарбаў з мясцовай манетай і большы для дэпазітаў з замежнымі грашыма.

Праціўнікі гэтага падыходу згодны з існаваннем прамежкавага перыяду, але слушна адзначаюць, што ўсталяваць аднолькавую яго працягласць для ўсіх выпадкаў немагчыма. У выніку адзіным універсальным метадам вызначэння часу захавання грашовых скарбаў застаецца ўмоўная дата, звязаная з часам чаканкі малодшай манеты дэпазіту.

Інфармацыю аб пэўных традыцыях, вытворчых прыёмах утрымлівае і ўпакоўка скарбу.

Адзін ці некалькі скарбаў не ў стане адлюстраваць усю складанасць і шматграннасць таварна-грашовых адносін рынку, элементамі якога яны з'яўляюцца. Грунтоўнае нумізматычнае даследаванне заснавана на спалучэнні аналізу тапаграфіі знаходак скарбаў і факталагічнага матэрыялу з пісьмовых крыніц.

* * *

Справай рэгістрацыі знаходак грашовых скарбаў і асобных манет з другой паловы XIX ст. займалася Імператарская археалагічная камісія.

Найбольш цікавыя манеты са скарбаў па рашэнні камісіі перадаваліся ў музейныя калекцыі, за што асоба, якая іх выявіла, атрымлівала адпаведнае ўзнагароджанне, а астатняя частка дэпазіту ў залежнасці ад абставін або вярталася ёй, або адпраўлялася на пераплаўку на манетны двор. У асобных выпадках дублетныя экзэмпляры з дзяржаўных музейных нумізматычных калекцый ішлі на продаж прыватным збіральнікам. На наш час

архівы Археалагічнай камісіі захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі матэрыяльнай культуры Расійскай акадэміі навук.

На тэрыторыі Беларусі, пачынаючы з XIX ст., зафіксавана адкрыццё больш за 1,5 тыс. грашовых скарбаў (на жаль, пэўная частка знойдзеных дэпазітаў не зарэгістравана).

Прыблізна палова ад усяго зафіксаванага аб'ёму адкрытых на тэрыторыі Беларусі на працягу XIX–XXI стст. і ўведзеных у навуковы абарот грашовых скарбаў па розных прычынах не паступіла ў музейныя фонды краіны, а засталася толькі адзначанай на старонках пісьмовых крыніц.

Грашовыя скарбы не з'яўляюцца рэдкімі помнікамі даўніны. Скарбавыя знаходкі звычайна адбываюцца пры сельскагаспадарчых і будаўнічых работах, а зрэдку і пры дапамозе птушак і жывёл (стрыж – г. Барысаў, 1845; крот – в. Любоўша Баранавіцкага раёна, 1888; свінні – г. Слуцк, 1921; в. Вёска Старобінскага раёна, 1961; в. Атрубок Докшыцкага раёна, 1963) ці ў выніку дзеяння прыродных стыхій (пас. Касалякі Кармянскага раёна, 1964) [51, с. 56 ].

*Табліца*

**Прыклады самых знакамітых скарбаў Беларусі**

| Год знаходкі | Месца | Склад | Датаванне |
|---|---|---|---|
| 1936 г. | г. Магілёў | 476 дукатаў<br>35 манетных двароў Еўропы | Канец XVII ст. |
| 1973 г. | в. Каз'янкі Полацкага р-на Віцебскай вобл. | Вядома 7663 куфіцкіх дырхама | Сярэдзіна X ст. |
| 1979 г. | в. Вішчын Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл. | Грашова-рэчавы комплекс: 18 плацежных зліткаў літоўскага, кіеўскага і наўгародскага тыпаў; унікальныя ювелірныя вырабы | Сярэдзіна XIII ст. |
| 1971 г. | г. Рагачоў | Фальшывыя манеты | Захаваны пасля 1831 г. |
| 1997 г. | г. Полацк | Фальшывыя манеты | Захаваны паміж 1540–1550 гг. |
| 1988 г. | г. Мінск | Грашова-рэчавы скарб з 547 срэбных прадметаў (посуд, узнагародныя знакі, манеты) | Канец XIX – пачатак XX ст. |

Пытанне каму належыць скарб – таму, хто яго знайшоў, ці ўладальніку зямлі – мае адвечную актуальнасць.

У часы Рымскай імперыі практыкаваўся раўназначны падзел скарбу паміж асобай, якая знайшла дэпазіт, і ўладальнікам зямлі.

У сярэдневяковай Еўропе таму, хто выявіў скарб, пры разглядзе справы ў судзе, для таго каб пакінуць сабе грошы, трэба было даказаць недаказальнае – адсутнасць дапамогі ў пошуках з боку нячыстай сілы.

Згодна са статутам Вялікага Княства Літоўскага 1588 г. (раздзел IX, артыкул 30 «О найденью скарбу захаваного в земли або в яком покла-женью») скарб пакідалі таму, хто яго знайшоў, калі знаходка была на ўласнай зямлі, калі не – то дэпазіт падзяляўся напалову з землеўладаль-нікам [67, с. 268].

У адпаведнасці з польскім заканадаўствам канца XVII ст. скарб перада-ваўся ва ўласнасць землеўладальніка, які і вызначаў памер узнагароды.

У Расіі пачатку XVII ст. даносчыку звестак пра знаходжанне скарбу перадавалася яго частка, а астатняе ішло ў казну. У далейшыя часы скарб, які быў знойдзены на казённых ці абшчынных землях, пераходзіў у казну, а на прыватных землях – іх уладальніку.

У СССР грашовы дэпазіт з’яўляўся ўласнасцю дзяржавы. Асоба, якая знайшла скарб, атрымлівала 25 % ад яго матэрыяльнага кошту, а калі утой-вала факт знаходкі, несла адміністратыўную ці крымінальную адказнасць.

Заканадаўствам Рэспублікі Беларусь усталявана, што знойдзеныя грашовы і грашова-рэчавы скарбы пераходзяць у дзяржаўную ўласнасць. Пры гэтым уласнік зямельнага ўчастка ці іншай маёмасці, дзе быў захава-ны скарб, і асоба, якая яго знайшла, маюць правы на атрыманне ўзнага-роды ў памеры 50 % ад вартасці дэпазіту (маецца на ўвазе гістарычная вартасць). Узнагароджанне паміж асобамі размяркоўваецца ў роўных частках, калі не было іншага пагаднення.

Заканадаўства таксама ўстанаўлівае, што ўзнагарода не выплачваецца асобам, якія знайшлі скарб у ходзе выканання службовых абавязкаў (на-прыклад, археалагічных даследаванняў, этнаграфічных экспедыцый і іншай навуковай дзейнасці).

У выпадках утойвання знойдзенага дэпазіту ўзнагароджанне знаход-чыку не выплачваецца, і ў залежнасці ад вартасці скарбу прадугледжана адміністратыўная ці крымінальная адказнасць.

* * *

Тэма грошай і грашовых скарбаў знайшла адлюстраванне ў мастацкай літаратуры і фальклоры. Беларускія этнографы і літаратары XIX – пачатку XX ст. – І. Насовіч (1788–1877), Я. Баршчэўскі (1794–1851), П. Шпілеўскі (1823–1861), П. Шэйн (1826–1900), М. Нікіфароўскі (1845–1910), Е. Рама-наў (1855–1922), А. Сержпутоўскі (1864–1940) сабралі значны аб’ем фак-тычнага матэрыялу.

Традыцыйным кампанентам апублікаваных імі міфалагічных апавядан-няў, прымет і павер’яў, традыцый, загадак і тлумачэнняў сноў з’яўляюцца грошы. Вывучэнне твораў фальклору праз прызму сацыякультурнага развіцця грамадства дазваляе высветліць праяўленне асноўных функцый грошай у штодзённым жыцці чалавека [25; 30].

У фальклорных творах распавядаецца пра рытуальныя дзеянні, неабходныя пры ўтварэнні грашовага скарбу, пра злыя і добрыя сілы, якія яго ахоўваюць, даюць парады шукальнікам грашовых дэпазітаў.

У народных паданнях грашовыя скарбы лічыліся жывымі істотамі, што маглі з'яўляцца перад чалавекам агеньчыкам, у антрапаморфным ці зааморфным выглядзе і быць афарбаванымі ў жоўты (золата) ці белы (срэбра) колер.

Скарбы падзяляюцца на «злыя» (замоўленыя ўладальнікам) і «добрыя» (вольныя ад замовы). «Злыя» скарбы ахоўваюць такія нячысцікі, як *палявік* (адказвае за палявыя скарбы, можа з'яўляцца як нечаканая цень ці громападобны рогат і інш.), *лесавік / пушчавік / ляшук* (займаецца ляснымі скарбамі, мае выгляд старога з белым тварам і сінімі вачыма), *багнік / дрыгавік* (захоўвае багацце ў балотах, знешне сябе не праяўляе), *скарбнік / кладавік* (загадвае скарбамі на прысядзібных участках, самы заможны і сквапны з усіх, выглядае як стары, апрануты ў срэбнае адзенне, залатую шапку, мае срэбны пасах з залатой булавешкай і срэбную торбу з сухім хлебам, што выпрасіў у людзей).

«Добрыя» скарбы, якія адкрываліся толькі добрым людзям, ахоўвалі светлыя сілы: *дзедзя* (жабрак з вогненна-чырвонымі барадой і вачыма, ён мог навесці на чалавека сон і пакінуць яму грошы, яго галава здаля была падобна на агеньчык і, каб скарб выйшаў на паверхню, праз яе трэба было нешта перакінуць), *бялун* (стары, які жыве ў прыдарожным жыце, пры дакрананні да яго са словамі «рассыпся»ператвараецца ў кучу манет, пакутуе ад інфлюэнцы, просіць падарожніка выцерці яму нос і пры станоўчым выніку дорыць грошы), *купальскі дзядок* (стары з кветкамі і травамі ў кошыку, калі перад ім разгарнуць абрус з пачастункамі, можа кінуць на яго грошы ці «папараць-кветку»).

Для пошукаў скарбаў і зняцця магчымага праклёну выкарыстоўвалі рукапісныя кнігі з парадамі для шукальнікаў скарбаў.

У «Траўніках» былі сабраны рэкамендацыі па выкарыстанні ў пошуках захаваных грошай адпаведных раслін.

*Папаратнік* (папараць, папаратка) нібыта квітнее ў купальскую ноч (7 ліпеня) сіняватым агеньчыкам, яго кветка, кінутая ў паветра, апускаецца на месца схаванага скарбу.

*Плакун-трава* прымушае нячысцікаў плакаць, а нямога пеўня на месце грашовага захавання закрычаць.

*Разрыў-трава* (спрыг, скакун) адчыняе любыя замкі. Шукаць яе можна па-рознаму, напрыклад, на месцы падзення з каня жалезных пут, ці там, дзе пры касьбе зламалася каса, а таксама замазаўшы глінай уваход у птушынае гняздо – птушка сама прынясе разрыўтраву, каб адкрыць сваё жытло.

У «Вызыўных кнігах» можна прачытаць формулы зваротаў да нячыстай сілы, калі ўзнікала жаданне прадаць сваю душу ў абмен на грашовы скарб. «Роспісы» прама ўказвалі, як прайсці да таго месца, дзе знаходзіцца скарб.

У вуснай форме існавала інфармацыя аб алгарытме дзеянняў пры пошуках скарбу: калі нечакана з'яўляўся перад чалавекам скарб у выглядзе агеньчыка, праз яго трэба было нешта хутка перакінуць; пры даставанні з зямлі грашовага скарбу нельга было нагінацца больш за тры разы, таму што нячысцік мог зацягнуць пад зямлю і г. д. Адкрыць месцазнаходжанне скарбу можна было з дапамогай абгарэлай лучыны, кутняга зуба вісельніка, свечкі з чалавечага тлушчу ці воску, што стаяла ў галаве нябожчыка пры яго адпяванні і інш.

З грашыма звязаны шматлікія прыметы, якія традыцыйна перадаюцца з пакалення ў пакаленне.

Грошы – і металічныя і папяровыя – трэба захоўваць «тварам» (аверсам) да сябе, а вяртаць грошы «тварам» да таго, хто даў іх у пазыку, каб не пераводзіліся ва ўладальніка; нельга дарыць кашалёк, а таксама і любы посуд пустым – трэба пакласці ў яго нейкія грошы; месяц заможнага жыцця чакае чалавека, калі ён, з грашыма ў руках, выпадкова пабачыць маладзік; калі засвярбела левая далонь, тады для атрымання ў далейшым нейкіх грошай трэба яе пацалаваць; не вяртаць пазычаныя грошы праз парог; браць грошы левай рукой, а вяртаць правай; адносіцца да грошай з павагай; не спяшацца траціць атрыманыя грошы, яны павінны «пераначаваць» у доме і шмат іншага.

Манеты адыгрывалі пэўную ролю ў побыце і звычаях. З іх выраблялі маністы і завушніцы, выкарыстоўвалі як элемент упрыгожання адзення. Манеты клаліся пад рог падмурка пры будаўніцтве жылля, іх выкарыстоўвалі ў вясельных і пахавальных абрадах, як ахвяраванні багам, у якасці падарунка. У хаце грошы захоўваліся ў спецыяльных патаемных месцах.

Шырокая папулярнасць тэмы грошай тлумачыцца, зразумела, іх трывалым уваходжаннем у штодзённае жыццё чалавека.

Грошы – прыклад філасофскага ўвасаблення адзінства дабра і зла. І менавіта на гэты аспект рабіўся ўпор у творах беларускага фальклору. Будучы рэгулятарамі эканамічных адносін у грамадстве, грошы тым не менш заўсёды адыгрывалі і адну з ключавых роляў у фарміраванні светапогляду чалавека.

Паняцці «скарб», «грошы» – аснова многіх прыказак і прымавак, напрыклад:

*Закапаў скарб – закапаў спакой.*

*Знайшоў заклятыя грошы на сваю пагібель.*

*Навошта той клад, калі ў дзетках лад.*

*Дзе грошы гавораць, там праўда маўчыць.*

*Не той бедны, хто грошай не мае, а той, хто душы не мае.*

*У чужой кішэні пятак рублём здаецца.*

*Хто грошай не мае, той спакойна спіць.*

І, мабыць, самае жыццесцвярджальнае выказванне: *Будзем мы – будуць і грошы.*

Паняцце *«грошы»* ахоплівае неверагодна шырокае інфармацыйнае поле, якое ўключае не толькі эканамічныя, сацыяльныя і палітычныя сувязі, але і духоўнае жыццё чалавека і грамадства ў цэлым, што дае магчымасць вызначаць грошы як *феномен культуры.*

!!

*Грашовыя скарбы з'яўляюцца асновай нумізматычных даследаванняў. Пры існаванні шэрагу сістэм класіфікацыі скарбаў у першую чаргу яны падзяляюцца на грашовыя і грашова-рэчавыя. Утварэнне скарбаў – гэта звычайны і шырокараспаўсюджаны спосаб захоўвання каштоўнасцей.*

*На тэрыторыі Беларусі пачынаючы з XIX ст. зафіксавана больш за 1,5 тыс. адкрытых дэпазітаў, частка з якіх знаходзіцца ў музейных калекцыях нашай краіны. Алгарытм дзеянняў у выпадках адкрыцця скарбу фіксуецца ў адпаведных дзяржаўных заканадаўчых дакументах.*

*Тэма скарбаў знайшла шырокае адлюстраванне як у літаратурных творах, так і ў фальклоры.*

## Заданні і пытанні для самакантролю

1. Даць азначэнне паняццю «грашовы скарб».
2. Даказаць, што ўтварэнне грашовых скарбаў у адпаведныя перыяды гісторыі з'яўляецца звычайным спосабам захоўвання грошай.
3. Якім чынам грашовыя скарбы рэгулявалі грашовае абарачэнне?
4. Пералічыць асноўныя класіфікацыйная групы, на якія падзяляюцца грашовыя скарбы.
5. Як праводзіцца датаванне грашовага скарбу?
6. У якіх музеях Беларусі знаходзяцца найбольшыя калекцыі грашовых скарбаў?
7. Прывесці прыклады выкарыстання тэмы скарбаў у літаратурных творах.

## Раздзел 2
## ГІСТОРЫЯ ГРАШОВАГА АБАРАЧЭННЯ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (канец I – пачатак XXI ст.)

Гісторыя грашовага абарачэння на беларускіх землях падзяляецца на некалькі перыядаў. Перыяды да канца XV ст. маюць уласныя назвы, якія звязаны з найбольш распаўсюджанай манетай, і вызначаюцца на падставе скарбавага матэрыялу. Пачатак перыяду звязваецца са з'яўленнем у складзе адкрытых скарбаў пануючай у далейшым манеты, заканчэнне – са спыненнем яе масавага абарачэння. Зразумела, што гэтае датаванне прыблізнае. Для перыядаў больш позніх часоў характэрна прывязка да агульнагістарычнай перыядызацыі.

Перыядызацыя гісторыі грашовага абарачэння на тэрыторыі Беларусі выглядае наступным чынам.

Перыяд рымскага дэнарыя (канец I – сярэдзіна V ст.)
Безманетны перыяд [першы] (сярэдзіна V – пачатак IX ст.)
Перыяд куфіцкага дырхама (пачатак IX – канец X ст.)
Перыяд заходнееўрапейскага дэнарыя (канец X – канец XI ст.)
Безманетны перыяд [другі] (канец XI–XIII ст.)
Перыяд пражскага гроша (XIV – канец XV ст.)
Грашовае абарачэнне ў канцы XV – сярэдзіне XVII ст.
Грашовае абарачэнне ў другой палове XVII – канцы XVIII ст.
Грашовае абарачэнне ў канцы XVIII ст. – кастрычніку / лістападзе 1917 г.
Грашовае абарачэнне ў савецкі перыяд (кастрычнік / лістапад 1917 г. – снежань 1991 г.)
Грашовае абарачэнне ў Рэспубліцы Беларусь (з 1991 г.)

## Тэма 2.1. Перыяд рымскага дэнарыя (канец I – сярэдзіна V ст.). Перыяд куфіцкага дырхама (пачатак IX – канец X ст.)

*Першы перыяд* у гісторыі грашовага абарачэння на тэрыторыі Беларусі звязаны з антычнымі манетамі. У абсалютнай большасці выпадкаў гэта былі манеты Рымскай імперыі. Іншыя дзяржавы гэтага старажытнага перыяду гісторыі прадстаўлены вельмі рэдкімі адзінкавымі знаходкамі.

Рымскія манеты, выраблены шляхам ліцця ў форму, з’явіліся ў IV ст. да н. э. У III ст. да н. э. пачынае выкарыстоўвацца тэхніка манетнай чаканкі.

Базавым паняццем лічыльна-грашовай і вымяральнай сістэм Старажытнага Рыма быў «ас» (лац. ass – нешта «цэлае»), які падзяляўся на 12 унцый. У грашовай сістэме ас выконваў ролю лічыльнага паняцця і назвы меднай манеты. Першапачаткова ас як вагавая адзінка адпавядаў 1 лібры (фунту) і меў масу 272,88 г, а ў далейшым яна ўжо складала 327,45 г.

На медных асах-манетах як асноўных грашовых адзінках прысутнічала абазначэнне наміналу – I, на большых наміналах (зборных манетах) былі адпаведна лічбы II (2 аса, дупондзій), III (3 аса, трыпондзій), V (5 асаў, квінкусіс) і X (10 асаў, дэкусіс). Дробнымі ў адносінах да аса былі наміналы семіс ($^1/_2$ аса, ці 6 унцый), трыенс (4 унцыі), квадранс (3 унцыі), секстанс (2 унцыі), унцыя.

У другой палове III ст. да н. э. у Рыме пачалі чаканіць *срэбны дэнарый* (лац. denarius – складзены з дзесяці), які быў роўны 10 асам і першапачаткова меў масу ў 4 скрупулы (4,55 г; лац. scrupulum, scripulus – маленькі каменьчык, $^1/_{24}$ унцыі, ці 1,137 г). У срэбры чаканіліся і такія наміналы, як віктарыян (3 скрупулы), квінарый (2 скрупулы), сестэрцый (1 скрупул).



Рымская імперыя. Дэнарый. III ст. Ø 17–22 мм

У IV ст. з’явіліся *срэбныя міліярысій* (лац. miliarense – тысячнае) і *сіліква* (лац. siligua – нешта драбнюткае).

Сістэматычная чаканка *залатога аўрэуса* (лац. aureus – залаты) і зрэдку яго фракцый пачалася ў апошнія дзесяцігоддзі I ст. да н. э.

У выніку грашовай рэформы, праведзенай пры



Рымская імперыя. Аўрэус. II ст. Ø 19 мм

імператары Аўгусце (27 г. да н. э. – 14 г. н. э.), *сестэрцый* (лац. semis + tertius – два з паловай; манета, роўная 2,5 аса) стаў вялікай бронзавай манетай масай у 1 унцыю (≈ 27 г) і былі ўсталяваны новыя суадносіны паміж рознымі грашовымі адзінкамі.



Рымская імперыя. Сестэрцый. II ст. Ø 30 мм

Залаты аўрэус з першапачатковай масай у 8,19 г быў роўны 25 срэбным дэнарыям і 100 бронзавым сестэрцыям, адпаведна срэбны дэнарый адпавядаў 4 сестэрцыям, ці 16 асам. У IV ст. месца аўрэуса займае *залаты солід* масай у 4,55 г і яго фракцыі.

Рымскія манеты мелі аднатыпнае афармленне. На аверсе – партрэт імператара ў профіль і кругавая легенда. На рэверсе – выява міфалагічнага характару (сцэны з рымскай гісторыі і міфалогіі, выявы багоў і герояў, побытавыя, ваенныя сюжэты) і легенда. На рэверсах манет з некаштоўных матэрыялаў, у прыватнасці сестэрцыяў, была абрэвіятура – літары «S» і «C» (Senatus consulto / па рашэнні Сената), якая азначала, што эмісія здзейснена па пастанове такога дзяржаўнага органа, як Сенат.

Асобнае месца ў гэты перыяд займаюць *субератныя манеты* (лац. subaeratus дакладна азначае «субмедзь», sub – пад, aes – медзь, літаральна – «з меддзю ўнізе»), якія чаканіліся з некаштоўнага металу і былі пакрытыя (плакетаваныя) з абодвух бакоў тонкім слоем золата ці срэбра. Такі спосаб выраблення манет выкарыстоўваўся як пры вытворчасці афіцыйных манет (напрыклад, падчас складаных эканамічных ці ваенных сітуацый), так і ў дзейнасці фальшываманетчыкаў.

Дыскусійным застаецца пытанне аб прычынах эмісій так званых *сератных манет* (італ. serrata – камуна). Яны адрозніваліся наяўнасцю па краі манеты да 20 засечак. Зорчатыя па форме сератныя манеты чаканіліся на загадзя вышчарбленых нарыхтоўках. Шырокапрынятым тлумачэннем з'яўлення такіх манет лічыцца імкненне даказаць агульную цэласнасць манеты (адсутнасць ядра з некаштоўнага металу). Але ёсць версія, звязаная з тэхналогіяй манетнай вытворчасці: магчымае трэсканне цэлага манетнага кружка пры ўдары верхнім штэмпелем. Трэба адзначыць, што з цягам часу фальшываманетчыкі авалодалі тэхнікай падробкі манет-сератаў, калі медная нарыхтоўка адпаведнай формы (з засечкамі) пакрывалася тонкай плёнкай каштоўнага металу.



Манета-серат. Ø 17–22 мм

* * *

На беларускіх землях рымскія манеты па ступені распаўсюджання былі прадстаўлены срэбнымі дэнарыямі, меднымі ці бронзавымі сестэрцыямі і залатымі аўрэусамі. З'яўленне рымскіх дэнарыяў на беларускіх землях тлумачыцца некалькімі прычынамі – прытокам на паўднёва-заходнюю тэрыторыю прадстаўнікоў усходнегерманскіх плямёнаў готаў – носьбітаў вельбарскай культуры, а таксама праходжаннем праз суседнюю тэрыторыю сучаснай Польшчы знакамітага «бурштынавага» шляху, па якому з Балтыі ў Міжземнамор'е дастаўляўся бурштын. Ён выкарыстоўваўся для ўпрыгожвання палацавых інтэр'ераў, у ювелірнай справе, медыцыне, з яго выраблялі дробную пластыку, чары для віна, посуд для захоўвання добрых пахаў, амулеты, яму прыпісвалі магічную моц.

Аналіз тапаграфіі знаходак рымскіх манет сведчыць аб іх распаўсюджанасці па ўсёй тэрыторыі краіны з канцэнтрацыяй на тэрыторыі сучасных Брэсцкай і Гродзенскай абласцей Беларусі [58].

Спыненне прытоку эмісій рымскіх манет звязана з развіццём негатыўных з'яў у эканамічным і палітычным стане Рымскай імперыі, што прывяло да пагаршэння якасці манет і памяншэння маштабаў іх чаканкі.

Пасля падзення Рымскай імперыі (476 г.) маладыя еўрапейскія дзяржавы пры фарміраванні сваіх грашовых сістэм выкарыстоўвалі некаторыя здабыткі старажытнарымскай манетнай сістэмы.

На беларускіх землях таго часу рымскія манеты функцыянаваць як паўнавартасныя грошы не маглі. Але тым не менш бясспрэчна, што яны адыгрывалі, у першую чаргу, ролю своеасаблівых таварагрошай.

Галоўным было тое, што манеты Рымскай імперыі далі мясцоваму насельніцтву першаснае ўяўленне аб такім феномене, як грошы.

* * *

Знаходкі рымскіх манет на беларускіх землях пачалі фіксавацца яшчэ ў XIX ст., але найбольш значныя скарбы рымскіх дэнарыяў на тэрыторыі Беларусі былі адкрыты ў пазнейшы час. У 1993 г. каля в. Малеч Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці на глыбіні 0,4–0,5 м быў адкрыты манетны скарб, з якога вядома 389 рымскіх дэнарыяў (з іх 4 імітацыі дэнарыяў) I – пачатку III ст. Манеты знаходзіліся ў ляпным посудзе вельбарскай культуры. Захоўваецца гэты дэпазіт у Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь [59].

Малецкі манетны скарб – адзіны з усіх знойдзеных на беларускіх землях дэпазітаў унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (1-я катэгорыя) [13, с. 667].



Скарб рымскіх манет. I – пачатак III ст.
Знойдзены ў 1993 г. каля в. Малеч Бярозаўскага р-на Брэсцкай вобл.

Пэўны аб'ём рымскай манеты, назапашанай у ранейшыя часы, мог і ў далейшым выкарыстоўвацца мясцовым насельніцтвам у таварным абарачэнні.

У 1968–2011 гг. каля в. Алекшыцы Бераставіцкага раёна Гродзенскай вобласці быў знойдзены манетна-рэчавы скарб, з якога вядома 446 рымскіх дэнарыяў, адчаканеных у перыяд з 75 г. па 195 г.: 436 манет (сярод іх – некалькі імітацый) захоўваюцца ў Музеі грошай Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, 10 манет – у Нумізматычным кабінеце БДУ. Рэчавая частка прадстаўлена дзвюма фрагментаванымі фібуламі, што датуюцца рубяжом IV/V – сярэдзінай V ст. [5].

Алекшыцкі манетна-рэчавы скарб – самы вялікі па колькасці рымскіх манет антычны дэпазіт сярод адкрытых на тэрыторыі Беларусі.

Унікальнай знаходкай для беларускіх зямель з'яўляецца адкрыццё ў 2011 г. скарбу з-пад в. Турэц Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці (канец III – пачатак IV ст.), які складаўся з 18 медных тэтрадрахмаў, што прадстаўляюць лакальную, правінцыяльную чаканку для Александрыі Егіпецкай пад уладай Рымскай імперыі. Скарб захоўваецца ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь [1, с. 11].

У далейшым на тэрыторыі Беларусі разгарнуйся першы безманетны перыяд, у якім, зразумела, працягвалася паступовае развіццё таварнай вытворчасці, аб чым сведчаць і археалагічныя даныя.

!!

*Перыяд рымскага дэнарыя на тэрыторыі Беларусі характарызуецца прысутнасцю ў грашовым абарачэнні пэўнага набору рымскіх манет, якія ў сувязі з тагачасным узроўнем сацыяльна-эканамічнага развіцця мясцовага насельніцтва не маглі паўнавартасна выконваць функцыі грошай і абмяжоўваліся ў асноўным роллю своеасаблівых таварагрошай. Тым не менш менавіта рымскія манеты пазнаёмілі насельніцтва з такой з'явай, як «грошы» і далі ўяўленне аб магчымасцях іх выкарыстання.*

* * *



Арабскі халіфат. Куфіцкі дырхам. VI–VIII стст. Ø 28 мм

*Куфіцкі дырхам* – срэбная манета Арабскага халіфата – тэакратычнай ісламскай дзяржавы, якая ўзнікла ў VII ст. Вярхоўная свецкая і духоўная ўлада ў ёй належала халіфу, якому падпарадкоўваліся яго намеснікі ў асобных рэгіёнах вялікай краіны – эміры.

Тэрыторыя гэтай дзяржавы ў часы росквіту ахоплівала землі Аравійскага паўвострава, Леванта, Каўказа, частку Паўночнай Афрыкі ад Егіпта да Туніса і Іранскае нагор'е.

Назва манеты *«дырхáм»* паходзіць ад грэч. «драхма» – жменя, кісць. Так першапачаткова называліся таварагрошы – 6 жалезных пруткоў, што маглі змясціцца ў руцэ. У далейшым гэты тэрмін перайшоў на грэчаскую манету – драхму.

Вызначэнне *«куфіцкі»* – звязана з назвай іракскага горада Эль-Куфа, дзе ў канцы VII ст. быў распрацаваны своеасаблівы «куфіцкі» стыль напісання арабскага шрыфту, які характарызаваўся выразнымі геаметрычнымі формамі і агульнай выцягнутасцю па гарызанталі. Графіка гэтага новага шрыфту аказалася вельмі зручнай для рэзчыкаў штэмпеляў на шматлікіх манетных дварах краіны.

Куфіцкія дырхамы – манеты монаэпіграфныя. У ісламе забаранялася ствараць выявы як боскіх, так і жывых істот, што лічылася грэшнай

справай. У гэтых абставінах значнае месца ў ісламскім мастацтве займала арабская каліграфія – майстэрства прыгожага напісання. Каліграфічны варыянт арнаменту выкарыстоўваўся разам з раслиннымі і геаметрычнымі роспісамі.

Пры адсутнасці выяў адзінай крыніцай інфармацыі на дырхамах была легенда. Камбінаваны ці радкова-кругавы надпіс размяшчаўся на двух баках манеты. Пры гэтым аверс дырхама вызначаўся пачаткам легенды, а рэверс – яе працягам. У легенду ўваходзілі дата і месца чаканкі, імя і тытул эмітэнта – халіфа, а ў больш позняя часы, калі пачаўся працэс распаду халіфата, найбольш магутных эміраў. Асноўнае месца ў легендзе займала цытата з Карана.

Датаванне дырхамаў адпавядала мусульманскаму календару. Хіджра (араб. – уцёкі) – назва эры мусульманскага календара, звязаная з уцёкамі ў 622 г. (па грыгарыянскім календары) прарока Мухамада і першых мусульман з Меккі ў Ясрыб (з 622 г. – Медына). Пры неабходнасці пераводу даты мусульманскага календара ў грыгарыянскую каляндарную сістэму выкарыстоўваюць адпаведныя формулы і спецыяльныя табліцы.

З’яўленне ў IX–X стст. на тагачасных беларускіх землях куфіцкіх дырхамаў звязана з актыўным развіццём гандлёвых адносін еўрапейскіх краін з краінамі Усходу. Пры распаўсюджанасці знаходак дырхамаў па ўсёй тэрыторыі Беларусі, іх канцэнтрацыя адзначаецца на землях Падняпроўя і Падзвіння, праз якія праходзіў шлях «з варагаў у грэкі», што абслугоўваўся арабскай манетай.

Дырхамы, па сутнасці, сталі першымі сапраўднымі грашовымі сродкамі на тэрыторыі Беларусі, якія выконвалі ўсе асноўныя іх функцыі. Яны адыгрывалі ролю меры вартасці, сродку абарачэння, плацяжу, накаплення, а таксама з’яўляліся і сусветнымі грашыма. Арабская манета настолькі трывала ўвайшла ў штодзённае жыццё насельніцтва, што нават пачаўся працэс яе мясцовай падробкі. Аб гэтым сведчыць, напрыклад, знаходка (1891) у в. Емянец Невельскага павету Віцебскай губерні каменнай формы для адліўкі імітавання куфіцкага дырхама [54, с. 109].

Дырхамы выкарыстоўваліся і як упрыгажэнні. Пісьмовыя крыніцы паведамляюць аб тым, што існавала традыцыя выраблення з іх караляў. У скарбах і ў жаночых пахаваннях сустракаюцца дырхамы з дзірачкамі ці вушкамі для нанізвання іх на шнурок. Пры гэтым не выключалася і магчымасць вяртання гэтых манет у сферу грашовага абарачэння (прабіты дырхам захоўваў папярэднюю масу!).

Зразумела, што нармальнае функцыянаванне рынку, ажыццяўленне здзелак куплі-продажу немагчыма без разменнай манеты. Для стварэння больш дробных грашовых адзінак дырхамы ламалі ці рэзалі на адпаведныя фракцыі (½, ¼ , ці меншая частка).

У пісьмовых крыніцах больш позняга часу зафіксавана грашовая тэрміналогія, распаўсюджаная даследчыкамі і ў перыяд куфіцкага дырхама. *Нагата* (ад араб. нагд – паўнавартасная; адпавядала суме ў 2 дырхамы), *куна* (ад слова «куніца»; адпавядала суме ў 1 дырхам), *рэзана* (ад слова

«рэзаць»; складала ½ дырхама), *векша* (ад слова «вавёрка»; адпавядала суме, меншай за палову часткі дырхама).

Гэтыя тэрміны, але ўжо з іншым грашовым напаўненнем, захаваліся і ў далейшыя часы. Дырхам і яго фракцыі сталі асновай для развіцця грашова-вагавай сістэмы.

* * *

Перыяд куфіцкага дырхама падзяляюць на чатыры этапы [54, с. 110].

*Таблица*

**Этапы грашовага абарачэння куфіцкага дырхама**

| Этап | Характарыстыка |
|---|---|
| Пачатак IX ст. – 833 г. | Характэрнымі асаблівасцямі гэтага этапу з'яўляюцца перавага эмісій дзвюх дынастый – Амеядаў і Абасідаў; панаванне дырхамаў, чаканеных манетнымі дварамі на тэрыторыі Паўночнай Афрыкі; у скарбах прысутнічаюць драхмы іранскай дынастыі Сасанідаў (дынастыі персідскіх правіцеляў, кіраваўшых у Сасанідскай імперыі ў III–VII стст.) |
| 833–900 гг. | Пераважаюць дырхамы халіфаў Абасідаў, у скарбах з'яўляюцца дырхамы магутных эмірскіх родаў |
| 900–938 гг. | Памяншаецца колькасць манет халіфскай чаканкі і павялічваецца колькасць эмірскіх манет. У большасці гэта былі эмісіі найбольш магутнага на той час роду эміраў Саманідаў, чаканеныя на манетных дварах Бухары, Самарканда, Мадзіна-аш-Шаша (сучасны г. Ташкент) |
| 938–980-я гг. | У скарбах адзначаецца поўнае панаванне эмірскіх чаканак (саманідскай і інш.) |

* * *

Самы позні скарб дырхамаў на тэрыторыі Беларусі, які датуецца прыблізна 986–987 гг., быў знойдзены ў в. Красная Міёрскага раёна Віцебскай вобласці ў 1896 г. У складзе дэпазіту 66 цэлых манет (астатнія – фрагментаваныя). 17 дырхамаў паступілі ў Імператарскі Эрмітаж, 62 манеты перададзены ў Віленскі музей старажытнасцей, частка – у Пецярбургскі ўніверсітэт, а астатнія экзэмпляры былі адпраўлены на пераплаўку на Пецярбургскі манетны двор.

У 1955 г. у в. Пагарэльшчына Валожынскага раёна Мінскай вобласці быў адкрыты манетна-рэчавы скарб, у які ўваходзіла 1 904 куфіцкіх дырхамаў VIII – пачатку X ст. Рэчавая частка прадстаўлена фрагментамі срэбнай шыйнай грыўні і бранзалетаў. Дэпазіт датуецца 910-мі гг. і захоўваецца ў Нумізматычным кабінеце музея гістарычнага факультэта БДУ [63, с. 6].

У 1973 г. па правым беразе р. Заходняя Дзвіна каля в. Каз'янкі Полацкага раёна Віцебскай вобласці быў знойдзены найбуйнейшы на ўсходнеславянскіх землях скарб куфіцкіх дырхамаў X ст., з якога вядома 7663 манеты (захоўваюцца ў Нацыянальным Полацкім гісторыка-культурным музеі-запаведніку; вельмі значная колькасць манет трапіла пасля знаходжання скарбу да прыватных асоб; некаторыя з манет вядомы па алоўкавых эстампажах і фотаздымках) [24].

Манеты скарбу былі чаканены ў гарадах Паўночнай Афрыкі, Блізкага Усходу, Закаўказзя, Цэнтральнай і Сярэдняй Азіі. Скарб датуецца часам не пазней другой паловы 940-х гг.

Цікавы манетна-рэчавы скарб быў адкрыты ў 2000 г. каля в. Брылі Барысаўскага раёна Мінскай вобласці. У складзе дэпазіту 290 (214 цэлых і 76 фрагментаваных) куфіцкіх дырхамаў, франкскі меч, шыйная грыўня і 10 гірак-разнавагаў. Скарб датуецца канцом X ст. і захоўваецца ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь [49, с. 23–110].

У другой палове X ст. краіны Усходу перажывалі негатыўныя наступствы спусташэння радовішчаў срэбра і адпаведнага скарачэння аб'ёмаў яго здабычы. Паралельна ішоў складаны працэс далейшага развіцця феадальнага грамадства – аслабленне цэнтральнай улады, разгортванне феадальных усобіц, драбленне краіны на эміраты, рост і ўзмацненне асобных рэгіёнаў і гарадоў, развіццё гандлю.

Арабскі халіфат у выніку страчвае пазіцыю магутнай гандлёвай дзяржавы. У сувязі з гэтым у канцы X ст. сістэматычнае паступленне дырхамаў новых эмісій на тэрыторыю Беларусі спынілася. Скарбавы матэрыял сведчыць аб тым, што працэс выкарыстання дырхамаў пэўны час яшчэ працягваўся, але ўжо страціў масавы характар.

!!

*Першымі сапраўднымі грашыма на беларускіх землях, якія ў рэальнасці выконвалі ўсе асноўныя функцыі грошай, сталі куфіцкія дырхамы Арабскага халіфата. У гэты час з'яўляюцца і першыя лічыльныя паняцці – нагата, куна, рэзана, векша. Канцэнтрацыя знаходак дырхамаў на тэрыторыі беларускага Падняпроўя і Падзвіння звязана з праходжаннем у дадзеным рэгіёне гандлёвага шляху «з варагаў у грэкі», які абслугоўваўся менавіта гэтай манетай.*

## Заданні і пытанні для самакантролю

1. Назваць перыяды гісторыі грашовага абарачэння на тэрыторыі Беларусі.
2. З чым звязана паступленне на тэрыторыю Беларусі рымскіх манет?
3. Назваць рымскія манеты, якія паступалі на беларускія землі.
4. Растлумачыць паходжанне тэрмінаў «куфіцкі», «дырхам».
5. Назваць прычыны паступлення куфіцкіх дырхамаў на тэрыторыю Беларусі.
6. Вызначыць асаблівасці асобных этапаў перыяду куфіцкага дырхама.
7. Пералічыць найбольш значныя скарбы рымскіх манет і куфіцкіх дырхамаў, адкрытых на тэрыторыі Беларусі.

## Тэма 2.2. Перыяд заходнееўрапейскага дэнарыя (канец X – канец XI ст.)

Перыяд заходееўрапейскага дэнарыя, названы ў адпаведнасці з пануючай у гэты час манетай, разгортваўся на фоне актыўнага развіцця маладых еўрапейскіх дзяржаў, у якіх была наладжана шырокамаштабная чаканка ўласнай срэбнай манеты з агульнаеўрапейскай назвай – дэнарый (своеасаблівая спадчына антычных часоў).

У грашовым абарачэнні гэтага часу на тэрыторыі Беларусі знаходзіліся тры групы манет: заходнееўрапейскія дэнарыі (асноўная група), візантыйскія манеты і першыя ўсходнеславянскія манеты – златнікі і срэбранікі.

Першая група манетных эмісій прадстаўлена дэнарыямі розных краін, дзе яны мелі свае мясцовыя назвы, напрыклад, германскія пфенігі (ням. Pfanne – патэльня, сподак; першапачаткова яны мелі скіфатную форму), французскія дзенье, англійскія пені і інш.



Заходнееўрапейскія дэнарыі IX–XI стст. Ø 15–20 мм

Дэнарыі ўяўлялі сабой невялікія срэбныя манеты з дастаткова нескладанымі выявамі, што было абумоўлена нізкім узроўнем тэхнічных магчымасцей і адсутнасцю адпаведных традыцый манетнай вытворчасці. У большасці выпадкаў дэнарыі мелі неахайныя выявы варыяцый крыжа, людзей, будынкаў, а таксама лацінскія легенды.

Значны аб'ём гэтай манеты вывозіўся на ўсход, трапляючы ў тым ліку і на тэрыторыю Беларусі. Найбольш працяглае паступленне заходнееўрапейскіх дэнарыяў адбывалася на наўгародскіх землях (па першую трэць XIII ст.), а самым кароткатэрміновым гэты перыяд быў на ўкраінскіх землях (па другое дзесяцігоддзе XI ст.).

Манетныя скарбы заходнееўрапейскіх дэнарыяў, адкрытыя на тэрыторыі Беларусі, адзначаны характэрнымі рысамі: датаваныя да сярэдзіны

XI ст. складаюцца прыкладна ў роўных частках з англа-саксонскіх манет, з аднаго боку, і германскіх і іншых дзяржаў – з другога. У далейшым у скарбах пачынаюць пераважаць германскія пфенігі.

Самы ранні з вядомых скарбаў з заходнееўрапейскімі манетамі на беларускіх землях быў знойдзены ў 1926 г. у в. Стары Дзедзін Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобласці (дата захавання – паміж 980 і 985 гг.). Знайшоў гэты скарб у двух гліняных гаршчках мясцовы селянін Трафім Гудкоў, які араў свой надзел. Дэпазіт паступіў у Беларускі дзяржаўны музей і быў страчаны падчас Другой сусветнай вайны. У склад скарбу срэбных манет уваходзіў 201 дырхам, 1 візантыйскі міліярысій, 2 дэнарыя (пфеніга) Германскай імперыі [54, с. 118–119]. У гонар знаходжання гэтага скарбу пры ўездзе ў вёску пастаўлены ўнікальны помнік – валун з памятным надпісам.




Валун з памятным надпісам у в. Стары Дзедзін
Клімавіцкага р-на Магілёўскай вобл. Устаноўлены ў 2010 г.

У 1957 г. у в. Дзягцяны Капыльскага раёна Мінскай вобласці быў адкрыты грашова-рэчавы скарб, з якога вядома 320 манет і 20 фрагментаў ювелірных вырабаў. Манетная частка складалася з дырхамаў Арабскага халіфата і дэнарыяў еўрапейскіх краін. Скарб утрымліваў найвялікшую колькасць чэшскіх дэнарыяў (123 манеты) сярод астатніх скарбаў, адкрытых на тэрыторыі Беларусі. Дэпазіт захоўваецца ў Нацыянальным гістарычным музеі (большая частка) і Нумізматычным кабінеце БДУ (меншая частка).

Скарачэнне, а потым і спыненне прытоку дэнарыяў на тэрыторыю Беларусі тлумачыцца працэсамі агульнагістарычнага развіцця, звязанымі з нарастаннем унутраных патрэб еўрапейскіх краін ва ўласнай манеце (феадальная раздробленасць, усобіцы, узнікненне новых гарадоў, пашырэнне гандлю і інш.).

* * *

Другая група манет прадстаўлена невялікім аб'ёмам візантыйскай чаканкі.

Візантыйская імперыя была адной з найбольш эканамічна магутных дзяржаў у свеце і валодала развітой грашовай сістэмай. Манетная вытворчасць грунтавалася на стандартным наборы матэрыялаў – золаце, срэбры і медным сплаве – бронзе.

За больш чым тысячагадовую гісторыю Усходняя Рымская (Візантыйская) імперыя пакінула ў гісторыі грашовага абарачэння значную колькасць разнастайных манет з золата, срэбра, медзі і медных сплаваў.

Галоўным цэнтрам манетнай вытворчасці імперыі быў Канстанцінопальскі манетны двор. Акрамя яго ў пэўныя перыяды з рознай працяглацю на тэрыторыі Візантыйскіх правінцый працавала амаль паўтара дзясятка манетных вытворчасцей (Сіракузы, Фесалонікі, Александрыя, Карфаген, Херсанес і інш.).

Візантыйскія манеты мелі на аверсе стандартнае афармленне з абстрактнай паяснай выявай імператара, які замест традыцыйнага для рымскіх манет лаўровага вянка на галаве меў дыядэму. З X ст. на рэверсе манет з'яўляецца выява Перамогі з крыжом у руцэ, а потым яе змяняюць выявы Багародзіцы, Хрыста, а таксама шэрагу святых.

Манетныя легенды да VII ст. былі лацінскамоўнымі. Паступова дамінуючай мовай надпісаў становіцца на пачатку XII ст. грэчаская. У легендзе прыводзіцца імя святога і імя і тытул адпаведнага імператара. Месца чаканкі манет адзначаецца пачатковымі літарамі назвы горада, дзе размяшчаўся манетны двор.

Дызайн візантыйскіх манет аказаў значны ўплыў на знешняе афармленне першых усходнеславянскіх манет X–XI стст. – златнікаў і срэбранікаў.

У абарачэнні на тэрыторыі беларускіх зямель прысутнічалі візантыйскія манеты X–XI стст. – залатыя *намісмы*, срэбныя *міліярысіі* і медныя *фолісы* [52].



Візантыя (імперыя). Намісма. XI ст. Ø 20–30 мм



Візантыя (імперыя). Міліярысій. X ст. Ø 20–22 мм



Візантыя (імперыя). Фоліс. V–VI стст. Ø 20–35 мм

Традыцыйна візантыйскія манеты, як і рымскія, прынята падзяляць на 3 групы ў адпаведнасці з выкарыстаным матэрыялам.

Да групы залатых манет адносіцца *солід* (лац. solidus – цвёрды, трывалы, масіўны). Фракцыямі соліда (златніца, візанта, ці безанта) былі *семісіс* (семіс), роўны $^1/_2$ соліда і *трымісіс* (трыенс) у $^1/_3$ соліда. У VIII–XII стст. для соліда выкарыстоўвалася назва *намісма* (грэч. nomos – звычай, закон, законны сродак плацяжу). З XI ст. у грашовым абарачэнні Візантыі з'яўляецца залатая скіфатная манета.

У групу срэбных манет уваходзілі *міліярысій* (лац. miliarensis – тысячны; першапачаткова прыраўноўваўся $^1/_{1000}$ залатога фунта/лібры) і яго фракцыі – кераты ($^1/_2$ міліярысія), гексаграм ($^1/_{12}$ соліда), сіліква ($^1/_{24}$ соліда), палова сіліквы.

Неабходна таксама адзначыць, што залатыя і срэбныя манеты Візантыі мелі дастаткова высокую пробу, якая значна зменшылася ў канцы існавання імперыі (1453).

У групу медных манет уваходзіў *фоліс* (лац. follis – торбачка) і інш.

На рэверсе фоліса прыводзіліся абрэвіятурнае вызначэнне манетнага двара і літары, якія адпавядалі яго вартасці ў нуміях (дробная медная манета).

Напрыклад, Е ($^1/_8$ фоліса, ці 5 нуміяў), І ($^1/_4$ фоліса, ці 10 нуміяў), К ($^1/_2$ фоліса, ці 20 нуміяў), М (1 фоліс, ці 40 нуміяў).

Манеты Візантыйскай імперыі шырока выкарыстоўваліся ў замежных гандлёвых сувязях і асядалі ў разнастайных грашовых скарбах на землях іншых краін. У сувязі з гэтым адзначаецца высокая ступень іх даследаванасці.

* * *

Найбольш цікавай была трэцяя група грашовых эмісій, што складалася з першых усходнеславянскіх манет – златнікаў і срэбранікаў, якія былі распаўсюджаны і на тэрыторыі Беларусі. Чаканка ўласнай манеты – гэта не толькі эканамічная патрэба, але і дэклараванне свайго суверэнітэту.

Назвы гэтых манет носяць умоўны характар і былі прапанаваны расійскімі нумізматамі XIX ст. на падставе вывучэння летапіснага матэрыялу. Пісьмовыя крыніцы не пакінулі прамых сведчанняў аб выпуску першых усходнеславянскіх манет, што значна абцяжарыла працэс іх даследавання.

Дызайн златнікаў і срэбранікаў знаходзіўся пад уплывам традыцый візантыйскай манетнай чаканкі. Гэтыя манеты чаканіліся на літых кружках [66, с. 38].



Кіеўскае княства. Златнік. X ст. Ø 19–24 мм

Эмісія златнікаў (аналагаў візантыйскага соліда) была здзейснена ў Кіеве князем Уладзімірам Святаславічам (980–1015) і, верагодна, была прымеркавана да Хрышчэння Русі (988).

Маса гэтай манеты (прыблізна 4,2 г) звязана з адзінкай вымярэння масы – залатніком (4, 266, ці $^1/_{96}$ частка фунта).

Існуе два тыпы златнікаў. Манеты першага тыпу (I тып) маюць на аверсе выяву князя з трызубцам над левым плячом і кірылічную легенду «ВЛАДИМИР НА СТОЛЕ». На рэверсе – пагрудная выява Ісуса Хрыста і кірылічная легенда – «ИСУС ХРИСТОС».

Златнікі другога тыпу (II тып) маюць аналагічныя выявы і адрозніваюцца аверснай кірылічнай легендай «ВЛАДИМИР, А СЕ ЕГО ЗЛАТО».

Златнік з'яўляецца адной з самых рэдкіх манет у свеце. Увогуле вядома 12 экз. гэтай манеты. З іх 9 экз. адносяцца да I тыпу, а 3 – да II тыпу. Кожная з гэтых 12 манет мае сваю гісторыю [64, с. 19–24; 66, с. 130–163].

Першы вядомы златнік (II тып) у 1796 г. кіеўскі збіральнік Г. Бунге набыў на кірмашы ў аднаго казака, які атрымаў манету ад маці пры ад'ездзе ў войска. У 1816 г. гэты златнік быў апублікаваны і ў хуткім часе стаў уласнасцю кіеўскага збіральніка М. Магілянскага, які прывёз яго ў Пецярбург для паказу аматарам старажытнасцей. З унікальнай манетай азнаёміўся на той час і ўладальнік узгаданай вышэй выбітнай нумізматычнай калекцыі ў Гомелі граф М. Румянцаў. З манеты былі зроблены сургучныя адбіткі.

У 1821 г. гэты златнік быў назаўсёды страчаны М. Магілянскім у Кіеве падчас прагулкі.

Яшчэ адзін златнік (II тып) у 1878 г. кіеўскі збіральнік С. Бадзілеўскі купіў у рыначнага гандляра за 15 рублёў (для параўнання – праз невялікі час такую ж манету вялікі князь Георгій Міхайлавіч набыў за 1300 рублёў). У 1904 г. калекцыянер падараваў сваю нумізматычную калекцыю, уключна і златнік, Кіеўскаму мастацка-прамысловаму і навуковаму музею. Зараз гэты златнік захоўваецца ў Нацыянальным музеі гісторыі Украіны.

Калекцыя златнікаў Дзяржаўнага Эрмітажа (Санкт-Пецярбург) складаецца з 7 экз. (I тып), прычым 6 з іх паходзяць са знакамітага Пінскага скарбу 1804 г., а 1 экз. паступіў у 1917 г. разам з нумізматычнай калекцыяй І. Талстога.

У 1886 г. вялікі князь Георгій Міхайлавіч набыў у сваю калекцыю златнік I тыпу. Ёсць меркаванне, што прыйшла гэтая манета з Адэсы. Пасля 1918 г. калекцыя амаль поўнасцю апынулася за мяжой, а пасля 1950 г. была прададзена ў ЗША. Пэўная частка гэтага збору засталася ў сховішчах Дзяржхрана каштоўных металаў (Масква), а ў 1930-х гг. некалькі каштоўных манет з калекцыі князя паступілі ў музеі. Златнік быў перададзены Дзяржаўнаму гістарычнаму музею (Масква), дзе зараз і захоўваецца.

У 1863 г. адэскі збіральнік М. Мурзакевіч для ўласнай калекцыі набыў златнік І тыпу. Доўгі час ён лічыў гэтую манету страчанай ці скрадзенай, але потым знайшоў яе сярод сваіх папер. У 1881 г. калекцыянер падараваў свой златнік Адэскаму гарадскому музею (зараз – Адэскі археалагічны музей НАН Украіны, дзе і захоўваецца златнік).

Златнік (II тып) знаходзіцца ў прыватнай калекцыі (Расія).

Такім чынам, на наш час з 12 вядомых златнікаў захавалася 11 экз. (10 экз. знаходзяцца ў дзяржаўных музеях Украіны і Расіі, а 1 – у прыватнай калекцыі ў Расіі).

Златнікі І тыпу захоўваюцца ў Дзяржаўным Эрмітажы (Санкт-Пецярбург) – 7 экз.; Дзяржаўным гістарычным музеі (Масква) – 1 экз.; Адэскім археалагічным музеі НАН Украіны – 1 экз. Златнікі II тыпу: Нацыянальны музей гісторыі Украіны (Кіеў) – 1 экз. і прыватная калекцыя (Расія) – 1 экз.

Адзіным зафіксаваным дэпазітам з утрыманнем златнікаў стаў знакаміты Пінскі скарб, адкрыты ў 1804 г. мясцовым шляхціцам Рыдзеўскім пры апрацоўцы свайго агарода.

У дакуменце эрмітажнага архіва за 9 мая 1804 г. захаваўся запіс аб тым, што «шляхтич Рыдзевский из Пинска поднес Е. И. В. двадцать старинных золотых медалей, найденных им нечаянно в земле. Государь император, удостоив их принять по редкости, высочайше пожаловал шляхтичу Рыдзевскому перстень, а медали, от него доставленные, повелел отдать в Эрмитаж для хранения с прочими» [66, с. 143].

На наш час 6 экз. златнікаў І тыпу з гэтага скарбу захоўваюцца ў зборах Дзяржаўнага Эрмітажа (Санкт-Пецярбург).

З Пінскага скарбу 1804 г., датуемага XI ст. (не раней за 1059 г.), вядома 20 залатых манет. У склад дэпазіту, акрамя златнікаў, уваходзілі і візантыйскія манеты.

Існуе меркаванне, што астатнія з вядомых пяці златнікаў паходзяць з Кінбурнскага (Дняпроўска-Лімaнскага) скарбу (Украіна), выяўленага, верагодна, у 1863 г. Знаходжанне гэтага скарбу не было зафіксавана ў пісьмовых крыніцах, і яго магчымае існаванне і адкрыццё з’яўляецца вынікам спалучэння ўскосных даных і лагічных разважанняў даследчыкаў [66, с. 156].

Да ліку *першых усходнеславянскіх манет* адносяцца і *срэбранікі*, якія эмітаваліся з той жа мэтай, што і златнікі. Гэтыя манеты былі пушчаны ў абарачэнне трыма эмітэнтамі на працягу 988–1018 гг.

Срэбранікі кіеўскага князя Уладзіміра Святаславіча (4 тыпы) чакаліся ў Кіеве з білону і срэбра [54, с. 120–121].



Кіеўскае княства. Срэбранік.
X–XI стст. Ø 22–30 мм

*Табліца 1*

**Тыпы срэбранікаў Уладзіміра Святаславіча**

| Тып | Аверс | Рэверс |
|---|---|---|
| I | выява князя з трызубцам над левым плячом і кірылічная легенда «ВЛАДИМИР НА СТОЛЕ» ці «ВЛАДИМИР, А СЕ ЕГО СРЕБРО» | пагрудная выява Ісуса Хрыста і кірылічная легенда – «ИСУС ХРИСТОС» ці «ИС ХС» |
| II–IV | выява князя і кірылічная легенда – «ВЛАДИМИР НА СТОЛЕ» | трызубец і кірылічная легенда «А СЕ ЕГО СРЕБРО» ці «СВЯТОГА ВАСИЛЯ» (хрысціянскае імя князя Уладзіміра) |

Святаполк Яраполчыч (князь тураўскі, пляменнік князя Уладзіміра), будучы на вялікакняскім прастоле (1015–1016, 1018), эмітаваў у Кіеве 3 тыпы білонных срэбранікаў.

*Табліца 2*

**Тыпы срэбранікаў Святаполка Яраполчыча**

| Тып | Аверс | Рэверс |
|---|---|---|
| I | выява князя на прастоле і кірылічная легенда «СВЯТОПОЛК НА СТОЛЕ» | родавы знак Рурыкавічаў у выглядзе двузубца і кірылічная легенда «А СЕ ЕГО СРЕБРО» |
| II | паясная выява апостала Пятра (хрысціянскі патрон князя Святаполка) і кірылічная легенда «ПЕТРОС» (двойчы) | двузубец і кірылічная легенда «ОГЕОС (скажонае грэч. «Огіос» – Святы) ПЕТРОС» |
| III | выява князя на прастоле і кірылічная легенда «ПЕТОР (далей нечытальнае слова)» | двузубец і нечытальная легенда |

Срэбранікі наўгародскага князя Яраслава Уладзіміравіча чаканіліся са срэбра ў Ноўгарадзе (1014–1015).

*Табліца 3*

**Срэбранікі Яраслава Уладзіміравіча**

| Аверс | Рэверс |
|---|---|
| выява Святога Георгія (патрон Яраполка) і грэчаская легенда «О[гиос] ГЕОРГИО[с]» | трызубец і кірылічная легенда «ЯРОСЛАВЛЕ СРЕБРО АМНN» |

Даследчыкі адзначаюць таксама існаванне групы манет, падобных на срэбранікі Яраслава, адносячы іх да магчымых скандынаўскіх імітаванняў.

Срэбранік – адносна рэдкая манета. На тэрыторыі Беларусі зафіксавана чатыры выпадкі падобных знаходак.

У 1873 г. – у курганным могільніку каля былога маёнтка Вотня Быхаўскага раёна Магілёўскай вобласці знойдзены 4 срэбранікі Уладзіміра Святаславіча І тыпу (адзін з срэбранікаў разламаны на 3 часткі). 3 срэбраніка паступілі ў Дзяржаўны гістарычны музей (Масква), 1 – у прыватную калекцыю [64, с. 27, 29, 36].

Фрагмент срэбраніка Уладзіміра Святаславіча ІІІ тыпу ўваходзіў у склад скарбу, знойдзенага ў 1886 г. у в. Парэчча Талачынскага раёна Віцебскай вобласці; захоўваецца ў Дзяржаўным Эрмітажы (Санкт-Пецярбург) [54, с. 122; 64, с. 85].

У 2004 г. у курганным могільніку каля в. Мохаў Лоеўскага раёна Гомельскай вобласці знойдзены фрагменты двух срэбранікаў Уладзіміра Святаславіча (ІІ і ІV тыпы) [53, с. 94]. Манеты захоўваюцца ў Гомельскім палацава-паркавым ансамблі.

У 2009 г. у п. Усходні Магілёўскага раёна знойдзены срэбранік Уладзіміра Святаславіча І тыпу; захоўваецца ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь.

Невялікая агульная колькасць знойдзеных златнікаў і срэбранікаў сведчыць аб абмежаванасці гэтых манетных эмісій. Сучаснымі даследчыкамі адзначаецца існаванне сярод зафіксаваных срэбранікаў (асабліва ў прыватных калекцыях) значнай колькасці антыкварных падробак, якія выяўляюцца ў ходзе выкарыстання комлексных метадаў праверкі іх аўтэнтычнасці.

Пытанне аб пераважанні эканамічных ці палітыка-ідэалагічных прычын правядзення эмісій златнікаў і срэбранікаў застаецца адкрытым. Верагодна, трэба разглядаць эмісію першых усходнеславянскіх манет як спалучэнне неабходнасці вырашыць эканамічную праблему стварэння сваёй грашовай сістэмы, імкнення праз чаканку златнікаў і срэбранікаў рэалізаваць прадстаўнічую функцыю ўласнай манеты і ўвайсці суверэнным удзельнікам у кола краін хрысціянскага свету.

Першыя ўсходнеславянскія манеты на працягу свайго абарачэння былі паўнавартаснымі грашовымі сродкамі і маглі выконваць усе асноўныя функцыі грошай.

!!

*Разгледжаны перыяд характарызуецца выкарыстаннем у грашовым абарачэнні на тэрыторыі Беларусі некалькіх груп манет: заходнееўрапейскіх дэнарыяў, візантыйскіх манет і першых усходнеславянскіх эмісій златнікаў і срэбранікаў. Пашырэнне манетнага фонду звязана ў першую чаргу з развіццём гандлёва-эканамічных стасункаў і патрэбамі ўнутранага рынку ў грашовых сродках. Аналіз тапаграфіі знаходак нумізматычнага матэрыялу гэтага перыяду сведчыць аб тым, што канцэнтрацыя заходнееўрапейскіх дэнарыяў адзначаецца ў рэгіёне беларускага Падняпроўя і Падзвіння.*

## Заданні і пытанні для самакантролю

1. Вызначыць групы манет, што знаходзіліся ў абарачэнні ў разгледжаны перыяд.
2. Дэнарыі якіх краін паступалі на тэрыторыю Беларусі?
3. Хто, калі і дзе чаканіў першыя ўсходнеславянскія манеты?
4. У якіх сучасных музеях захоўваюцца златнікі?
5. Назваць выпадкі знаходак на тэрыторыі Беларусі златнікаў і срэбранікаў.
6. Пералічыць знаходкі найбольш значных грашовых скарбаў гэтага перыяду на тэрыторыі Беларусі.
7. Чым знакаміты скарб з в. Стары Дзедзін Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобласці (1926)?

## Тэма 2.3. Безманетны перыяд [другі] (канец XI–XIII ст.). Перыяд пражскага гроша (XIV – канец XV ст.)

Перыяд XI–XIII стст. адзначаны ў гісторыі Беларусі важнымі падзеямі ў сацыяльна-эканамічным і палітычным жыцці. Адбывалася фарміраванне Вялікага Княства Літоўскага, якое працягвала традыцыі дзяржаўнасці, закладзеныя на беларускіх землях у ранейшыя часы (Полацкае, Тураўскае княствы). Зразумела, што гэты працэс павінен быў забяспечвацца грашовымі сродкамі. Але, як разглядалася ў папярэдніх тэмах, прыток асноўнага наміналу – заходнееўрапейскага дэнарыя – па аб’ектыўных прычынах быў спынены, а ўласнай манетнай чаканкі на беларускіх землях яшчэ не было. У сувязі з гэтым пачалося выкарыстанне срэбных плацёжных зліткаў, што мелі адпаведную масу і форму, а таксама назву – *грыўні (рублі)*.

Этымалогія тэрміна «грыўня» разбіралася ў тэме 1.3. Паходжанне назвы *«рубель»* мае некалькі версій: магчыма сувязь гэтай назвы са словам «рубить» (зліткі секлі («рубили») на часткі (фракцыі)); верагодна і сувязь со словам «рубец», які з’яўляўся на адпаведных злітках у працэсе іх вытворчасці (у выніку даліўкі металу ў форму).

Матэрыялам для вырабу гэтых грашовых сродкаў служылі запасы дырхамаў і дэнарыяў, а таксама імпартны срэбны лом.

Тэхніка вырабу грыўняў мела шэраг асаблівасцей. Расплаўленае срэбра вылівалася ў спецыяльную адкрытую форму з вогнеўстойлівага матэрыялу (напрыклад, з сумесі гліны, пяску, вуголля, апілак і інш.) ці проста ўтрамбаванае заглыбленне ў зямлі. Бакавая паверхня грывень набывала пры астыванні металу пэўную шурпатасць.

Палавіна грыўні называлася «полтина» (паўрубель). Выраблялiся паўрублі шляхам рассякання грыўні на дзве паловы ці адліўкай у адпаведную форму.

Грыўні не адразу выціснулі з абарачэння манеты, скарбы XIII ст. часткова ўтрымліваюць і манеты папярэдніх перыядаў.

На тэрыторыі Беларусі сустракаюцца розныя віды грывень, але асноўнымі былі літоўская (100–110 г), кіеўская (140–165 г) і наўгародская (190–210 г). Некаторыя даследчыкі сярод літоўскіх зліткаў выдзяляюць і асобную падгрупу масіўных трохгранных грывень (170–190 г), якія па шэрагу параметраў адрозніваюцца ад падобных да іх наўгародскіх аналагаў [72, с. 23].



Кіеўская грыўня. 9–10х4–5 см

Назвы плацёжных зліткаў штучныя і звязаны з асноўнымі цэнтрамі іх вытворчасці ці з месцам знаходак. Пісьмовыя крыніцы сведчаць, што літоўскія грыўні, якія мелі насечкі на паверхні,

называліся *«ізроямі»* (магчыма, з-за нягладкай паверхні). Аб гэтым сведчыць, напрыклад, кірылічнае графіці на некалькіх злітках са скарбу, адкрытага ў канцы XVIII ст. у г. Разані, на якіх да імя магчымага ўладальніка дадавалася і назва злітка («Борисов изрой») [65, с. 67]. На некаторых грыўнях сустракаюцца клеймы больш позняга, чым злiткі, паходжання.


Наўгародскія і літоўскія грыўні.
14–20 см, 10–17 см

У безманетны перыяд склалася даволі няпростая грашова-вагавая сістэма. У пісьмовых крыніцах гэтага часу ўзгадваюцца грашовыя тэрміны, што ўзніклі яшчэ ў IX–X стст. для вызначэння дырхамаў і іх частак (нагата, куна, рэзана, векша). Верагодна, яны выкарыстоўваліся як дробныя ў адносінах да грыўні вагавыя і лічыльныя паняцці (грыўня як вагавая адзінка ў XII ст. адпавядала прыкладна 204 г).

Для прыкладу, у найбольш старадаўнім з вядомых поўных спісаў зборніка «Златаструй» (XII ст.), які ўтрымлівае словы і павучанні Іаана Златаструя, пішацца аб вельмі гаротным чалавеку, што не меў нават дзвюх векш.

Напрыклад, у літаратурным помніку «Слова аб палку Ігаравым» (XII ст.) гаворыцца аб даніне па вавёрцы з двара.

На выбітным помніку беларускай гісторыі і культуры – крыжы Ефрасінні Полацкай (1161) – узгадваюцца адпаведныя грашовыя тэрміны, напрыклад, выкарыстаныя матэрыялы ацэнены ў 100, а зробленая работа ў 40 грывень.

У пісьмовым помніку «Правосудие митрополичье» (XIII ст.) вызначаюцца наступныя памеры штрафу за крадзеж: голуба – 9 кун, гуся – 30 кун, лебедзя – 30 кун, кошкі – 3 грыўні, сабакі – 3 грыўні, кабылы – 60 кун, вала – 3 грыўні, каровы – 40 кун, парася – нагата, авечкі – 5 кун, жарабца – грыўня.

Грашовая тэрміналогія гэтага перыяду захавалася і ў тэкстах берасцяных грамат, знойдзеных у Расіі, Украіне, Беларусі (Віцебск, 1959; Мсціслаўль, 1980, 2014). У віцебскай берасцяной грамаце, якая датуецца мяжой XIII–XIV стст., утрымліваецца просьба аб куплі жыта за 6 грывень [54, с. 134, 137].

У сэнсе «грошы» ў XI ст. выкарыстоўвалася слова «куны», а ў XIII ст. у гэтым жа значэнні слова «срэбра».

Дробныя здзелкі куплі-продажу адбываліся з дапамогай «футравых» грошай – скурак пушных звяроў. У якасці грошай маглі выкарыстоўваць і іншыя тавары са стабільнай вартасцю.

* * *

На тэрыторыі Беларусі было знойдзена некалькі цікавых скарбаў грывень.

У 1893 г. на беразе Дняпра каля в. Задруцце Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці быў адкрыты самы вялікі дэпазіт плацёжных зліткаў у Беларусі. Глінянае начынне ўтрымлівала 89 цэлых і 3 фрагментаваныя зліткі кіеўскага тыпу агульнай масай 14,5 кг. Скарб датуецца XIII ст. Дэпазіт паступіў у Пецярбургскую археалагічную камісію і быў размеркаваны паміж музейнымі ўстановамі Пецярбурга, Масквы, Разані, Арла, Ноўгарада, Херсона, Пенсільванскім універсітэтам (ЗША), Берлінскім нумізматычным кабінетам і прыватнымі калекцыямі. Вядома, што ў 1929 г. 13 зліткаў апынуліся ў Эрмітажы.

У 1902 г. у в. Слабодка Лагойскага раёна Мінскай вобласці быў адкрыты грашовы скарб з 24 цэлых і 7 фрагментаваных зліткаў (10 наўгародскага і 21 літоўскага тыпаў) і масай у 3361,42 г. Дэпазіт быў перададзены ў Гістарычны музей (Масква) і часткова распрададзены прыватным асобам.

У 1979 г. у в. Вішчын Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці студэнтамі БДУ пры правядзенні вучэбнай археалагічнай практыкі быў знойдзены ўнікальны грашова-рэчавы скарб сярэдзіны XIII ст. Неўпакаваны дэпазіт быў закладзены паміж валунамі. У яго складзе было 18 плацёжных зліткаў (8 літоўскіх, 6 кіеўскіх і 2 наўгародскіх, а таксама 2 паўрублі літоўскага і наўгародскага тыпаў).

Гэта першы зафіксаваны выпадак знаходкі ў Беларусі адразу трох відаў грашовых зліткаў. Рэчавая частка скарбу прадстаўлена аздобленымі пазалотай, зярненнем, перагародчатай эмаллю срэбнымі ювелірнымі вырабамі (бранзалеты, колты, падвескі, пацеркі). Знешні выгляд дэпазіту, адсутнасць упакоўкі сведчаць аб прыналежнасці яго да скарбаў «надзвычайных абставін», утвораных у экстрэмальнай сітуацыі. Месца захоўвання – Нумізматычны кабінет гістарычнага факультэта БДУ [15, с. 140].

Некалькі знаходак літоўскіх грывень адбыліся ў першых дзесяцігоддзях XXI ст. (в. Турэйск Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці, 5 літоўскіх грывень, 2009, Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь; Слонімскі раён Гродзенскай вобласці, 2 літоўскія грыўні, 2009, прыватная калекцыя; Круглянскі раён Магілёўскай вобласці, паўрубель, 2009, прыватная калекцыя; Ашмянскі раён Гродзенскай вобласці, паўрубель, 2011, прыватная калекцыя) [73, с. 208–209].

Арэал большасці знаходак грыўняў супадае з арэалам распаўсюджання на тэрыторыі Беларусі заходнееўрапейскага дэнарыя (Верхняе Падняпроўе і Падзвінне).

!!

*Спыненне прытоку заходнееўрапейскага дэнарыя прывяло да ўтварэння манетнага вакууму, які, пры адсутнасці ўласнай чаканкі, быў запоўнены зліткамі-грыўнямі (рублямі), прадстаўленымі на тэрыторыі Беларусі ў абсалютнай большасці 3 відамі: літоўскімі «ізроямі», кіеўскімі і наўгародскімі. Працягвалася і выкарыстанне традыцыйных лічыльных паняццяў (напрыклад, нагаты, куны), якія атрымалі новае напаўненне. Пэўную інфармацыю аб безманетным перыядзе захоўваюць тагачасныя пісьмовыя крыніцы.*

* * *

*Перыяд пражскага гроша* (XIV–XV стст.) характарызуецца разгортваннем працэсу складання беларускай народнасці і завяршэння аб’яднання беларускіх зямель у складзе ВКЛ.

Назва гэтага перыяду ў гісторыі грашовага абарачэння звязана з пануючай у ВКЛ і іншых еўрапейскіх краінах да канца XV ст. срэбнай манетай – *пражскім грошам* [55].

Першыя пражскія грошы былі адчаканены ў 1300 г. на манетным двары ў Кутнай Горы (Чэхія), дзе было адкрыта багатае радовішча срэбра.

Існуе легенда, якая тлумачыць назву мястэчка Кутна Гора («старая манаская рыза»). У ёй гаворыцца, што на месцы радовішча нейкаму манаху прысніліся срэбныя злiткі, а калі ён прачнуўся, для памяці накрыў гэтае месца сваёй старой рызай.

На аверсе пражскага гроша размешчана каралеўская карона, кругавая легенда «DEI GRACIA REX BOHEMORUM» / «Божай ласкай кароль Чэхіі» і імя адпаведнай каралеўскай асобы. На рэверсе – выява двуххвостага льва (геральдычны сімвал Чэхіі) з кругавой легендай – «GROSSI PRAGENSES» / «Грош пражскі».



Чэхія (каралеўства). Пражскі грош. XIV ст.
Ø 27 мм

Эмісію пражскіх грошаў здзяйснялі ў гады свайго праўлення Вацлаў II Пржэмысловіч (1278–1305), Ян I Люксембург (1310–1346), Карл I Люксембург (1346–1378), Вацлаў IV Люксембург (1378–1419), Георгій Падэбрад (1458–1471).

Назвы пражскага гроша ў пісьмовых крыніцах характарызуюць яго знешні выгляд, якасць і паходжанне, напрыклад, «шырокі», «добры», «прагскі», «чэскі». Склад беларускіх манетных скарбаў гэтага перыяду практычна аднастайны – прыблізна 96 % складаюць эмісіі Вацлава IV, астатнія эмітэнты – каля 4 % [54, с. 151].

У працэсе эмісіі пражскіх грошаў адбылося паступовае пагаршэнне якасных паказчыкаў – зніжэнне пробы (з 930° да 610°) і масы (з 3,77 да 2,7 г).

Паступленне пражскага гроша на беларускія землі адбывалася праз паўднёвую Польшчу, Галіцыю, Кіеўшчыну, Чарнігаўшчыну, адкуль манеты траплялі на тэрыторыю беларускага Падняпроўя.

Першае ўзгадванне пражскага гроша ў беларускіх крыніцах адносіцца да канца 1330-х гг. У сувязі з тым, што пражскія грошы паступалі на суседнія пскоўскія і наўгародскія землі праз тэрыторыю ВКЛ, у мясцовых пісьмовых крыніцах іх называлі «грошамі літоўскімі» (рэальны літоўскі грош з'явіўся толькі ў 1535 г.).

З пачаткам гусіцкіх войнаў (1419–1434) і часовым спыненнем (да 1457 г.) чаканкі пражскага гроша, Кутнагорскі манетны двор страчвае былыя пазіцыі найбуйнейшага еўрапейскага цэнтра манетнай вытворчасці.

* * *

У другой палове XIV ст. на тэрыторыі ВКЛ склаліся ўсе ўмовы для стварэння ўласнай манетнай сістэмы. Сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны – пераўтварэнне гарадоў у буйныя гандлёва-рамесныя цэнтры, пашырэнне знешняга гандлю, падатковыя зборы і інш. патрабавалі з'яўлення агульнадзяржаўнай манеты.

У гэты перыяд на землях ВКЛ ужо існавалі развітыя вагавая і лічыльна-грашовая сістэмы.

Як лічыльна-грашовыя тэрміны выкарыстоўваліся *капа* (60 пражскіх грошаў, прадметаў), *паўкапы* (30 пражскіх грошаў, прадметаў), *рубель* (100 пражскіх грошаў) і *паўрубель* (50 пражскіх грошаў), польская лічыльная *грыўня* (48 пражскіх грошаў).

Капа (чэш. kopa – куча) – вельмі папулярная на працягу некалькіх стагоддзяў лічыльная адзінка на тэрыторыі ВКЛ. Яна служыла для вызначэння нейкіх 60-ці прадметаў. У дачыненні да грошай капа ў розныя перыяды мела напаўненне адпаведнымі грашовымі адзінкамі.

Эквівалентам агульнага паняцця «грошы» ў другой палове XIV ст. становіцца тэрмін *«пенязі»* (раней гэтую функцыю выконвалі словы «куны» і «срэбра»).

Вагавай адзінкай для срэбра была *грыўня, пражская грыўня* (210–219 г) і *кракаўская грыўня* (197,68 г), якая падзялялася на 4 вярдункі (фертоны), 24 скотца (скойца), 96 кварт.

Першыя агульнадзяржаўныя манеты ВКЛ – срэбныя літоўскія дэнарыі, якія атрымалі мясцовую назву – *«пенязі»*, з’явіліся ў канцы 1380-х гг.



Вялікае Княства Літоўскае. Ранні літоўскі дэнарый.
Ø 11–15 мм

Існуе шэраг версій аб больш канкрэтным часе пачатку чаканкі літоўскіх дэнарыяў, а таксама аб іх эмітэнце. Найбольш аргументаванай з’яўляецца канцэпцыя, паводле якой эмісія гэтай манеты была здзейснена вялікім князем Ягайлам (1377–1381; 1382–1392) каля 1387 г.

У сувязі з адсутнасцю археалагічных і пісьмовых даных аб месцы чаканкі агульнадзяржаўнай манеты застаецца пытанне і аб лакацыі манетнай вытворчасці. Аналіз тапаграфіі знаходак раннелітоўскіх манет на сучаснай тэрыторыі Літвы і Беларусі дае даследчыкам магчымасць са значнай доляй верагоднасці вызначыць такім месцам менавіта Вільню [50, с. 176].

Эмісія першых манет насіла, зразумела, і дэкларатыўны характар. Манеты як дзяржаўны сімвал акрамя эканамічнай выконвалі і рэпрэзентатыўную функцыю.

У цэлым пачатак эмісіі ўласнай манеты быў аб’ектыўна вызначаным этапам у далейшым дзяржаўным будаўніцтве ВКЛ.

Літоўскі дэнарый (пенязь) уяўляў сабой невялікую срэбную манету, выкананую на невысокім тэхнічным узроўні, з дрэнна захаваўшыміся на наш час выявамі і легендамі, якія зараз прадстаўляюць даследчыкам шырокае поле для самых супрацьлеглых інтэрпрэтацый.

У іх вытворчасці магла выкарыстоўвацца не толькі звычайная выразка з ліста, але і тэхніка «драцяной» чаканкі. Менавіта гэтым можа тлумачыцца часам няправільная форма манет.

У ходзе вывучэння адзінкавых экзэмпляраў і скарбавых знаходак літоўскіх дэнарыяў вызначана (на падставе выяў) больш за дзесяць тыпаў гэтай манеты.

Напрыклад, можна прывесці такія класіфікацыйныя групы, якія мелі выявы: «ПЕЧАТ / наканечнік дзіды, крыж»; «ПЕЧАТ / леў, пляцёнка»; «Калюмны / наканечнік дзіды, крыж»; «Калюмны і вершнік»; «вершнік / падвоены крыж»; «партрэт чалавека / леў, пляцёнка»; «рыба-колца / падвоены крыж»; «леў / арол».



Вялікае Княства Літоўскае.
Раннія літоўскія дэнарыі

Пры адсутнасці пісьмовых даных немагчыма дакладна вызначыць суадносіны літоўскага дэнарыя з іншымі грашовымі адзінкамі, але, у любым выпадку, пенязі адыгрывалі ролю дробных манет у дачыненні да больш значных наміналаў.

Раскіданасць метралагічных параметраў уведзеных у навуковае абарачэнне экзэмпляраў ранніх літоўскіх дэнарыяў ускладняе правядзенне іх класіфікацыі і сістэматызацыі.

Тэрыторыя ВКЛ складалася з шэрагу ўдзелаў, якія мелі пэўны ўзровень самастойнасці. Да нашага часу дайшла і група манет удзельных Валынскага, Кіеўскага, Ноўгарад-Северскага, Падольскага, Старадубскага і іншых княстваў.

Праблематыка пачатковага этапу фарміравання агульнадзяржаўнай манетнай сістэмы ВКЛ, а таксама ўласны грашовы чакан некаторых удзельных князёў знаходзяцца зараз у стадыі вывучэння літоўскімі, беларускімі, расійскімі, польскімі даследчыкамі [9; 12; 50; 73].

Рэдкія знаходкі зусім невялікіх скарбаў і адзінкавых літоўскіх дэнарыяў на тэрыторыі Беларусі канцэнтруюцца ў асноўным у паўночна-заходнім рэгіёне краіны.

Нумізматычныя калекцыі Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж», Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, Нумізматычнага кабінета музея гістарычнага факультэта БДУ, Музея грошай Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь маюць у сваім складзе раннія літоўскія дэнарыі.

* * *

Тэрытарыяльнае пашырэнне і далейшае эканамічнае развіццё ВКЛ патрабавала значнага павелічэння аб'ёму манетнага фонду краіны. Пражскі грош, рэлікты папярэдняга перыяду – срэбныя зліткі-грыўні і ўласныя пенязі не маглі забяспечыць узрастаючыя патрэбнасці ўнутранага і знешняга рынкаў. Таму ў грашовае абарачэнне гэтага перыяду паступова ўваходзілі манетныя эмісіі шэрагу іншых краін. Значнай з'явай гэтага часу было ўключэнне ў грашовы фонд ВКЛ залатой манеты.

Увогуле, еўрапейскія залатыя манеты з'явіліся ў XIII ст. – у Генуі чаканілі генавіны, у Фларэнцыі – фларыны, у Венецыі – дукаты. Апошнія і сталі ў выніку пануючым залатым наміналам і эталонам для залатой чаканкі іншых дзяржаў.

Паходжанне назвы *«дукат»* (лац. ducatus – герцагства) звязваюць з завяршальным словам легенды «SIT TIB CHRISTA DATUS QUEM TU REGIS JESTE DUCATUS» / «Гэта герцагства, якім ты кіруеш, табе, Хрыстос, прызначаецца». У рэчаіснасці назва «дукат» выкарыстоўвалася значна раней для срэбнай манеты некаторых італьянскіх герцагстваў.



Дукат. Венецыя. XV ст. Ø 21 мм

Папулярнай залатой манетай у другой палове XV ст. быў *вугорскі* (венгерскі) *дукат*. Ён меў 23,5-каратную пробу і стандартную агульную масу ў 3,5 г (3,44 г складала маса хімічна чыстага золата).

У пісьмовых крыніцах дукат суправаджаецца вызначэннямі «чырвоны» (залаты), «важны», «добры» і «вугорскі» (венгерскі), якія характарызуюць яго высокую якасць і дзяржаўную прыналежнасць. Прыведзеныя эпітэты маглі сведчыць аб узнікшай неабходнасці адасобіць венгерскія дукаты ад іншых, менш значных па якасці залатых манет, што з'явіліся ў абарачэнні [40, с. 17].

У грашовым фондзе разглядаемага перыяду прысутнічалі і залатыя англійскія *ноблі*, якія мелі неафіцыйную назву «карабельнікі», таму што на аверсе была выява карабля ў марскіх хвалях. Гэтыя манеты, па масе большыя амаль у два разы за дукат, маглі выкарыстоўвацца ў якасці данатыўнай манеты, а таксама выконваць адну з функцый грошай – станавіліся сродкам накаплення залатых запасаў. У нобля былі фракцыі ў ½ і ¼ часткі.

Сярод іншаземных манет можна ўзгадаць срэбныя *шылінгі* (соліды) Тэўтонскага і Лівонскага ордэнаў, якія актыўна ўдзельнічалі ў гандлёвых сувязях, а таксама прыходзілі на землі ВКЛ у ходзе працяглых ваенных сутыкненняў з крыжакамі. Рэдкімі для беларускіх зямель былі *срэбныя дырхамы* і *медныя пулы* Залатой Арды, *кракаўскія грошы, галандскія дэнарыі, медныя сярэднеазіяцкія манеты* і інш.

Такім чынам, *манетная сістэма* ВКЛ пачала фарміравацца ў перыяд, калі ў абарачэнні знаходзіўся даволі стракаты набор грашовых сродкаў – срэбныя зліткі, залатыя і срэбныя іншаземныя манеты, сярод якіх *дамінуючую пазіцыю займалі пражскія грошы.*

Неабходна адзначыць таксама, што ў ВКЛ да гэтага часу ўжо скlaліся лічыльна-грашовая і вагавая сістэмы, зафіксаваныя ў шматлікіх пісьмовых крыніцах. У выкарыстанні з'явіўся і новы тэрмін *«гатавізна»*, які вызначаў грашовую суму ў рэальнай манеце (гатоўку).

Панаванне ў грашовым абарачэнні пражскага гроша і эмісія агульнадзяржаўнай манеты – літоўскага дэнарыя (пенязя) спрыялі паступовай нівеліроўцы мясцовых удзельных грашовых рынкаў і ўзмацненню вялікакняскай улады.

!!

*Перыяд пражскага гроша адзначаны ўваходжаннем у грашовае абарачэнне шырокага спектра манет, але самай значнай падзеяй гэтага часу быў пачатак чаканкі ВКЛ уласнай манеты – літоўскіх дэнарыяў (пенязяў). Праблематыка эмісіі гэтай манеты з'яўляецца адным з найбольш складаных пытанняў у сучасных навуковых даследаваннях. У выкарыстанні былі такія лічыльна-грашовыя паняцці, як рубель, паўрубель, капа, паўкапа.*

## Заданні для самакантролю

1. Назваць прычыны з'яўлення ў грашовым абарачэнні плацежных зліткаў.
2. Пералічыць асноўныя віды грывень і ахарактарызаваць тэхніку іх выраблення.
3. Растлумачыць этымалогію тэрмінаў «грыўня», «рубель», «ізрой».
4. Назваць знаходкі скарбаў грывень на тэрыторыі Беларусі.
5. Вызначыць знешнія ўласцівасці пражскага гроша.
6. Даць характарыстыку першым уласным манетам ВКЛ.
7. Пералічыць музеі Беларусі, у калекцыях якіх знаходзяцца раннія літоўскія дэнарыі.

## Тэма 2.4. Грашовае абарачэнне ў канцы XV – сярэдзіне XVII ст.

У канцы XV – сярэдзіне XVII ст. адбываецца канчатковае фарміраванне манетнай сістэмы ВКЛ. Гэты працэс праходзіў на фоне значных сацыяльна-эканамічных і палітычных падзей у гісторыі краіны: заключэнне Люблінскай уніі (1569), развіццё міжнародных гандлёвых сувязей, рост беларускіх гарадоў, якія пераўтвараліся ў буйныя цэнтры гандлю і рамёстваў, паўплывалі на актывізацыю таварна-грашовых адносін.

У канцы праўлення Казіміра IV Ягелончыка (1440–1492) быў заснаваны Віленскі манетны двор (умоўна прынятая дата – 1492), які стаў цэнтрам манетнай вытворчасці ВКЛ.

Другім цэнтрам манетнай вытворчасці гэтага перыяду стаў Тыкоцінскі манетны двор. Існуе некалькі меркаванняў наконт даты яго адкрыцця і перыяду дзейнасці – 1566 г. [54, с. 663] ці 1562–1572 гг. [18]. У сувязі з абмежаванай крыніцавай базай гісторыя гэтага манетнага двара вывучана на наш час недастакова падрабязна.

У межах агульнай характарыстыкі манетных эмісій ВКЛ неабходна прывесці кароткую інфармацыю аб чаканцы манет у разглядаемы перыяд на манетных дварах дзяржавы [22, с. 9–57; 74, s. 143–159].

Казімір IV Ягелончык эмітаваў дробны срэбны дэнарый (пенязь).

Пры Аляксандры Ягелончыку (1492–1506) адбывалася чаканка срэбных наміналаў – дэнарыя і паўгроша.

Пры Жыгімонце I (1506–1548) былі эмітаваны паўгрош і грош.

Росквіт манетнай чаканкі ВКЛ прыйшоўся на час кіравання дзяржавай Жыгімонтам II Аўгустам (1548–1572), калі ў Вільні (па меркаванні некаторых даследчыкаў і ў Тыкоціне) быў адчаканены шырокі спектр срэбных і залатых наміналаў. У грашовае абарачэнне ўведзены абол ($^{1}/_{2}$ дэнарыя), дэнарый, падвоены дэнарый, паўгрош, грош, падвоены грош, трохграшовік (трояк), чатыры грошы, шасціграшовік (шастак), чвэрцькопка (паўталер) і паўкопка (талер), дукат, партугал.

Пры Стэфане Баторыі (1576–1586) эмітуюцца дэнарый, падвоены дэнарый, шэлег (солід), грош, трохграшовік (трояк), шасціграшовік (шастак), талер, дукат.

Пэўны ўздым развіцця грашовая сістэма ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай перажыла і ў часы кіравання Жыгімонта III Вазы (1587–1632), калі на Віленскім манетным двары значнымі накладамі былі адбіты падвоены дэнарый, шэлег, грош, паўтараграшовік, трохграшовік (трояк), дукат, 3 дукаты, 5 дукатаў (паўпартугал), 10 дукатаў (партугал).

Самай значнай падзеяй для манетнай сістэмы ВКЛ быў выпуск уласных варыянтаў асноўных еўрапейскіх грашовых наміналаў – гроша (1535), дуката (1547) і талера (чвэрцькопкі, паўкопкі) (1564). Ніжэй будуць прыведзены іх падрабязныя апісанні.

Эмісія літоўскага гроша на Віленскім манетным двары пачалася ў 1535–1536 гг.



Вялікае Княства Літоўскае. Грош. 1535 г.
Ø 25–27 мм

Цікавым момантам знешняга афармлення гэтых манет з’яўляецца тое, што на аверсе пад выявай «Пагоні» прастаўлены літарныя вызначэнні месяцаў чаканкі – у 1535 г. – S (September), N (November), а ў 1536 г. – J (Januarius, Junius ці Julius), F (Februaris), M (Martius ці Maius), A (Augustus). Літоўскі грош меў пробу ў VI лотаў (гэта значыла, што манета была білоннай), агульная маса складала 2,57 г, прыраўніваўся да 10 літоўскіх дэнарыяў (пенязяў). Для параўнання, польскі грош на гэты час меў таксама пробу ў VI лотаў, агульную масу 2,06 г і адпавядаў 8 літоўскім дэнарыям (пенязям).

У 1547 г. быў адчаканены першы літоўскі *дукат*.

На аверсе – партрэтная выява Жыгімонта II Аўгуста з колавай легендай, якая складаецца з яго імя і тытула.

На рэверсе – шасцipольны шчыт з выявамі геральдычных сімвалаў Польшчы («Арол»), Вялікага Княства Літоўскага («Пагоня»), роду Сфорца («Вуж»), г. Кіева (Архангел Міхаіл), Жамойці («Мядзведзь»), Валыні (прамы геральдычны крыж з падоўжанымі верхняй і ніжняй галінкамі).

Рэверсная легенда інфармуе аб тым, што гэта залатая манета ВКЛ.



Вялікае Княства Літоўскае. Дукат. 1548 г.
Ø 22 мм

У 1564 г. на Віленскім [54, с. 160–161] ці Тыкоцінскім [18, с. 20] манетным двары чаканяцца чвэрцькопкі (чвэрць капы / 15 грошаў / паўталер), а ў 1564–1565 гг. – паўкопкі (палова капы / 30 грошаў / талер).

На аверсе манет – каранаваная манаграма Жыгімонта II Аўгуста, якая падзяляе на дзве роўныя часткі дату 1564 , а ўнізе – лічба XXX (грошаў) у талера і лічба XV (грошаў) у паўталера.

На рэверсе – шасціпольны шчыт з выявамі, аналагічнымі выявам на рэверсе літоўскага дуката.




Вялікае Княства Літоўскае.
Талер. 1564 г. Ø 41,5 мм

З Віленскім ці, па другой версіі, Тыкоцінскім манетным дваром звязана чаканка ў 1565–1566 гг. так званага іранічнага («сатырычнага») трайнога гроша (трохграшовіка).

На аверсе гэтай манеты – герб «Пагоня», вызначэнне намінала – «III» і колавая легенда «SIGISM AVG REX POL MAG DVX LIT» / «Сігізмунд Аўгуст кароль Польшчы Вялікі князь Літоўскі».

На рэверсе – чатырохрадковая легенда з біблейскім выказваннем «QVI / HABITAT IN / COELIS IRRI / DEBIT EOS» / «Той, хто жыве на нябёсах, пасмяецца над вамі». Пад легендай – каралеўская манаграма, якая падзяляе дату чаканкі (1565) на дзве роўныя часткі.




Вялікае Княства Літоўскае.
«Сатырычны» траяк. 1565 г. Ø 21 мм

Мэта выпуску гэтай манеты ў наш час тлумачыцца некалькімі часам супрацьлеглымі версіямі. Легенда, па розных меркаваннях, магла быць здзекам над імкненнем улад да ўніфікацыі польскай і літоўскай манеты, ці з’яўлялася зваротам да літоўскіх апанентаў уніі з Польшчай.

Увогуле высокі ўзровень тэхнічнага выканання прадукцыі манетных двароў у Вільні і Тыкоціне сведчыць аб выкарыстанні ўдасканаленага абсталявання і прасунутых тэхналогій вытворчасці манет.

* * *

Агульнапрынятымі лічыльна-грашовымі паняццямі гэтага часу былі – злоты (30 польскіх грошаў), копа (60 літоўскіх грошаў), рубель (100 літоўскіх грошаў) і іх палавінныя фракцыі.

У сувязі з гістарычнымі абставінамі на рынках ВКЛ у разглядаемы перыяд суіснавалі дзве манетныя сістэмы – літоўская і польская. Паміж літоўскімі і польскімі грашовымі адзінкамі склаліся наступныя суадносіны.

1 літоўскі грош = 10 дэнарыям, а 1 польскі грош = 8 дэнарыям. Адсюль, 1 літоўскі грош = 1 ¼ польскага гроша, 1 польскі грош = $^{4}/_{5}$ літоўскага гроша (8:10), ці 4 літоўскіх гроша = 5 польскім.

Існаванне на рынках дзвюх манетных сістэм адбівалася на грашовай лексіцы. Для вызначэння польскага гроша ў мясцовай грашовай тэрміналогіі выкарыстоўваліся паняцці «асмак» (у сувязі з роўнасцю 8 пенязям), «лядскі», «польскі», «сужоны».

Развіццё інтэграцыйных тэндэнцый паміж ВКЛ і Польшчай патрабавала ўніфікацыі літоўскай і польскай манетных сістэм. Але намаганні кіруючых колаў у гэтым кірунку не знаходзілі практычнага ажыццяўлення, і спробы выкарыстання адзіных стандартаў у манетнай вытворчасці не мелі поспеху.

Рэалізавана такая ўніфікацыя была толькі падчас грашовай рэформы 1578–1580 гг. Стэфана Баторыя. Ход рэформы быў прадстаўлены ў сеймавых Ардынацыях 1578 і 1580 гг. Упершыню ў дзяржаве ўводзілася адзіная па метралагічных параметрах для ВКЛ і Польшчы манетная сістэма.

Грашовыя наміналы літоўскай і польскай чаканкі, што мелі аднолькавую не толькі пробу, але і масу, адрозніваліся па вонкавым афармленні.

На аверсе змяшчалася партрэтная выява Стэфана Баторыя з колавай легендай, якая ўтрымлівала яго імя і тытул. На рэверсе знаходзіліся геральдычныя сімвалы Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага ў выглядзе двух набліжаных з нахілам каранаваных шчытоў з выявай «Арла» і «Пагоні».

Рознай была рэверсная легенда, якая паведамляла, што манета з'яўляецца адпаведна ці грошам ВКЛ, ці Польшчы. Тым не менш яшчэ вельмі доўгі час – да другой паловы XVII ст. традыцыйна захоўваліся пасобныя разлікі на літоўскія і польскія грошы.




Вялікае Княства Літоўскае.
Грош. 1580 г. Ø 23–24 мм

Беларускія пісьмовыя крыніцы XVI ст. зафіксавалі некалькі спецыфічных прыкладаў грашовай лексікі – «четвертак» і «пятак». Расшыфроўка гэтых тэрмінаў дала наступныя вынікі: «четвертак» з’яўляўся паловай асмака (8 дэнарыяў : 2 = 4 дэнарыя), а «пятак» – палова літоўскага гроша (10 дэнарыяў : 2 = 5 дэнарыяў).

* * *

У абарачэнні гэтага перыяду ўдзельнічаў даволі шырокі спектр залатой манеты – дукаты, англійскія ноблі («карабельнікі»), паўноблі і партугалы.

Найбольш распаўсюджанай залатой манетай па-ранейшаму быў дукат. Пісьмовыя крыніцы ў сувязі з практычна аднолькавымі метралагічнымі параметрамі не вызначалі, за выключэннем «угорскіх», паходжанне гэтай залатой манеты. Папулярнасць венгерскага дуката прывяла да таго, што ў пісьмовых крыніцах назва манеты абмяжоўвалася толькі словам «угорскі» [40, с. 18].

Дукат таксама адыгрываў ролю адзінкі вымярэння масы для залатых ювелірных вырабаў. Ролю данатыўнай ці інвестыцыйнай манеты працягвалі выконваць англійскія ноблі і паўноблі.

У разглядаемы перыяд з’яўляецца і новы залаты намінал – партугал – залатая манета Партугаліі, чаканеная каралём Мануэлам І (1495–1521). Яна ўяўляла сабой 10-дукатавую па масе манету і мела фракцыі ў чвэрць (2,5 дуката) і ў палову (5 дукатаў) партугала; выпускаліся таксама і падвоеныя партугалы (20 дукатаў). Зразумела, што партугал мог быць не толькі сродкам плацяжу, але і данатыўнай і інвестыцыйнай манетай. Чаканены па стандартах дуката, ён стаў узорам для выпуску падобных буйных залатых манет і ў іншых еўрапейскіх краінах.

У 1936 г. у г. Магілёве пры пракладцы водаправода быў знойдзены скарб з 476 дукатаў, якія прадстаўляюць практычна ўсе еўрапейскія краіны. Скарб датуецца пачаткам 1690-х гг. 466 манет гэтага скарбу захоўваюцца ў Дзяржаўным Эрмітажы (Санкт-Пецярбург).

* * *

Найвышэйшым срэбным наміналам манетнай сістэмы быў талер (палавінная фракцыя – паўталер). Першыя талеры (аналагі цірольскіх гульдэнгрошэнаў, што чаканіліся з 1484 г.) з’явіліся ў 1518 г. у г. Іаахімстале (зараз – г. Яхімаў, Чэхія). Іх назва звязана з другой часткай назвы горада. У Расіі за гэтымі манетамі замацавалася назва, дадзеная па першай частцы назвы горада, – «яфімкі».

*Талеры* – высакапробныя масіўныя (28–31 г) срэбныя манеты, якія заўсёды выраблялiся на высокім тэхнічным і мастацкім узроўні.

Эмісіі ўласнай талернай манеты ў Рэчы Паспалітай мелі невялікія аб’ёмы, асноўнае месца ў манетным фондзе краіны займалі талеры заходнееўрапейскага паходжання.



Палашнік (Рэспубліка Злучаных правінцый, рэйксдальдэр, 1655). Ø 40–42 мм



Ляўковы талер (Рэспубліка Злучаных правінцый, лёвендальдэр, 1589). Ø 40–42 мм

У беларускіх пісьмовых крыніцах зафіксаваны прыклады мясцовай грашовай тэрміналогіі ў дачыненні да талераў. Своеасаблівыя назвы заходнееўрапейскіх талераў звязаны ў першую чаргу з выявамі на іх. Напрыклад, Рэспубліка Злучаных правінцый была прадстаўлена *рэйксдальдэрамі* (нідэрл. rijksdaalder), якія называліся «палашнікі», таму што мелі выяву ваяра з палашом (мячом), і *лёвендальдэрамі*, якія атрымалі назву «леўкі», «талеры ляўковыя», «левікі», бо мелі выяву льва. *Патагоны* (разнавіднасць дальдэраў) Іспанскіх Нідэрландаў адпведна выяве дзвюх скрыжаваных паліц Геракла (бургундскага крыжа) называліся «крыжовыя»; 8 рэалаў Іспаніі – «рыалы», «рыалавыя».



Крыжовы талер (Іспанскія Нідэрланды, патагон, 1649). Ø 40–42 мм

Асобае месца ў грашовым абарачэнні ВКЛ займалі іспана-неапалітанскія манеты – паўталеры Карла V (іспанскі кароль пад імем Карл I) (1516–1556), паўталеры і талеры Філіпа II (1556–1598).

Гісторыя гэтых манет звязана са знакамітай жонкай Жыгімонта I Старога і маці Жыгімонта II Аўгуста – Бонай з роду міланскіх герцагаў Сфорца. Пасля смерці мужа яна вярнулася ў 1556 г. на радзіму з вялікай грашовай сумай і маёмасцю, што прывезла калісьці з сабой у якасці пасагу. Пазычыўшы іспанскаму каралю Філіпу II 430 000 дукатаў, Бона неўзабаве памірае. Яе нашчадак – Жыгімонт II Аўгуст звяртаецца да іспанскага боку з просьбай аб тэрміновым вяртанні пазычанай сумы. Крызісная эканамічная і палітычная сітуацыя ў краіне, выкліканая ў тым ліку ўдзелам краіны ў Лівонскай вайне (1558–1583), патрабавала значнай фінансавай падтрымкі. Частковае вяртанне азначанай сумы адбывалася не ў золаце, а срэбнай манетай – талерамі і паўталерамі Філіпа II і паўталерамі яго папярэдніка на троне – Карла V.

На аверсах гэтых манет былі партрэтныя выявы адпаведнага манарха. Контрамаркіраваныя талеры і паўталеры былі пераважна з партрэтам Філіпа II, таму называліся «філіпкамі».

Увогуле, талеры на тэрыторыі ВКЛ былі шырокараспаўсюджанай манетай, якая, нягледзячы на паходжанне, без перашкод паступала ў грашовае абарачэнне. Менавіта гэтыя іспананеапалітанскія талеры, якія называюць яшчэ «спадчынай каралевы Боны», перад пускам іх у абарачэнне праходзілі абавязковае контрамаркіраванне на Віленскім (па некаторых даных – на Тыкоцінскім) манетным двары.



Вялікае Княства Літоўскае. Філіпок (контрамаркіраваны паўталер Карла V). Ø 34,5–35 мм

> Кантрамарка мела круглую форму з каранаванай манаграмай Жыгімонта II Аўгуста – злучаных лацінскіх літар «S» і «A», якая падзяляла напалову дату надчаканкі – 1564. Прастаўлялася гэтая надчаканка, што сімвалізавала найвышэйшую асобу ў дзяржаве, на рэверсным баку манеты, пераўтвараючы яго на тэрыторыі ВКЛ у аверс.

Контрамаркіраванне праводзілася з мэтай надання гэтай групе талернай манеты на законнай аснове завышанага курсу.

Паводле Універсала ад 17 траўня 1564 г. філіпкі атрымлівалі намінальны курс у 60 польскіх грошаў (рэальна па колькасці ўтрымання срэбра ў манеце ён быў роўным толькі 33,5 польскім грошам), паўфіліпкі адпаведна атрымлівалі намінальны курс у 30 польскіх грошаў, тады як рэальны іх курс прыраўноўваўся 16,75 польскім грошам. Філіпкі, пушчаныя ў абарачэнне па завышаным амаль удвая курсе, сталі першымі крэдытнымі грашыма ВКЛ.

Абяцанне выкупу гэтых талераў было выканана ў снежні 1565 г. па афіцыйным завышаным курсе. Зразумела, што адбылося практычна поўнае вяртанне філіпкаў у казну і далейшая іх пераплаўка на манетным двары.

Філіпкі і паўфіліпкі – дастаткова рэдкія манеты. На тэрыторыі Беларусі навукова зафіксавана толькі два выпадкі знаходжання філіпкаў у складзе адкрытых скарбаў. У нумізматычных калекцыях беларускіх музеяў іх можна ўбачыць у Нумізматычным кабінеце музея гістарычнага факультэта БДУ і Барысаўскім аб’яднаным музеі [36, с. 205–206].

У Нумізматычным кабінеце музея гістарычнага факультэта БДУ захоўваецца знойдзены ў 1974 г. у в. Засоў'е Лагойскага раёна Мінскай вобласці скарб канца першага дзесяцігоддзя XVII ст. з 752 білонных, срэбных і залатых манет ВКЛ, Рэчы Паспалітай і іншых еўрапейскіх краін. У яго складзе дзве контрамаркіраваныя манеты (паўфіліпкі): 1 паўталер Карла V і 1 паўталер Філіпа II.

У Барысаўскім аб'яднаным музеі знаходзіцца дэпазіт, адкрыты ў 1979 г. у в. Хутар Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці. Скарб з 2093 манет, які датуецца пачаткам XVII ст., мае ў сваім складзе дзве контрамаркіраваныя манеты (паўфіліпок і філіпок): 1 паўталер Карла V і 1 талер Філіпа II.

* * *

У абарачэнні былі таксама *шылінгі* Лівонскага ордэна, шылінгі, грошы і *драйпёлькеры* (1,5 гроша) Прусіі, а таксама паступова выбываючыя з манетнага фонду насельніцтва пражскія грошы.

Дастаткова распаўсюджанай дробнай манетай на беларускіх землях былі білонныя шылінгі Лівонскага ордэна. Іх папулярнасць даказваецца масавай падробкай гэтага наміналу на тэрыторыі Беларусі.

Улетку 1997 г. на калекцыянерскіх рынках Беларусі з'явілася значная колькасць унікальных фальшывых манет-падробак пад шылінгі Лівонскага ордэна, маючых, па звестках, паходжанне са знойдзенага «на беразе ракі» ў Полацку скарбу. Са скарбу, які разышоўся па руках, вядома 14 манет-нарыхтовак з медзі, бронзы, білону і нават высакапробнага срэбра.

Даследаванне паказала, што гэтыя манеты з'яўляюцца падробкамі пад рэвельскі шылінг – самую распаўсюджаную манету грашовай гаспадаркі Лівоніі XV–XVI стст. Манетныя штэмпелі былі выраблены двума рэзчыкамі, адзін з якіх зрабіў удалыя рэплікі манет, а другі – непісьменнае іх імітаванне. Неабходна адзначыць адсутнасць у фальшываманетчыкаў аднароднага лігатурнага сплаву і выкарыстанне манетных кружкоў прыблізна правільнага дыяметра, але рознай таўшчыні, што прыводзіла да ваганняў іх масы.

На падставе кампаратыўнага аналізу тагачасных пісьмовых крыніц з указаннем на вельмі значныя аб'ёмы фальшывых шылінгаў, што паступалі з тэрыторыі Полаччыны і вядомых са скарбу манет, можна зрабіць высновы аб існаванні ў Полацку падпольнага манетнага двара [35].

Скарб датуецца перыядам паміж 1540 і 1550 гг. Вядомыя манеты са скарбу захоўваюцца ў Нумізматычным кабінеце музея гістарычнага факультэта БДУ (7 экз.), прыватных калекцыях (6 экз.), Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь (1 экз.).

Полацкі манетны скарб 1997 г. (?) з'ўляецца яскравым прыкладам вынікаў грабежніцкай дзейнасці «чорных капальнікаў», якія скрылі інфарма-

цыю аб дакладным месцы знаходжання скарбу і зрабілі немагчымым даследаванне тэрыторыі, дзе маглі знаходзіцца рэшткі дзейнасці ўнікальнага манетнага двара па вырабе грашовых фальсіфікатаў.

У разглядаемы перыяд у грашовым абарачэнні на тэрыторыі Беларусі з'явіліся першыя медныя манеты шатландскага паходжання – *цёрнеры* (англ. turner), або падвоеныя пені. Гэтыя манеты зафіксаваны ў беларускіх скарбах 1640–1650-х гг. Большасць цёрнераў, знойдзеных у скарбах на беларускіх землях, адносяцца да эмісій Карла I (1625–1649) [57].

На аверсе цёрнера адлюстраваны каранаваная манаграма Карла I «CR» (Карл кароль), унізе вызначэнне наміналу «II» (2 пені). На рэверсе размешчана выява геральдычнага сімвала Шатландыі – кветкі чартапалоху і легенда «Ніхто не дакранецца да мяне без пакарання». Дата на манеце адсутнічае.

Уключэнне цёрнераў у грашовае абарачэнне на тэрыторыі Беларусі звязана з абвастрэннем напачатку XVII ст. англа-шатландскіх адносін. Гэтыя ўнутраныя праблемы выклікалі эміграцыю часткі шатландцаў у іншыя еўрапейскія краіны, у тым ліку і ў ВКЛ. У Княстве прыезджыя шатландцы пераважна займаліся дробным гандлем ці найомаліся на службу ў войска. Менавіта яны і завезлі на тэрыторыю Беларусі дробныя разменныя манеты – цёрнеры, у якіх на той час была відавочная патрэба.

* * *

У грашовым абарачэнні на тэрыторыі Беларусі выкарыстоўвалася і расійская манета. Таму неабходна звярнуцца да асвятлення асноўных момантаў гісторыі манетнай сістэмы Расіі разглядаемага перыяду.

У расійскай грашовай сістэме XV–XVII стст. адсутнічалі ўласныя залатыя манеты, за выключэннем некалькіх выпадкаў эмісій пачатку XVII ст., калі ўрадам Васілія Шуйскага (рускі цар з 1606 г. па 1610 г.) і інтэрвентамі ад імя Уладзіслава Жыгімонтавіча (цар маскоўскі ў 1610–1612 гг. і тытулярны да 1634 г.) былі выпушчаны залатыя манеты. Так, Васілій Шуйскі, вычарпаўшы запасы срэбра, для аплаты шведскіх наймітаў мусіў эмітаваць залатыя дзенгі і капейкі, якія былі ў дзесяць разоў даражэй за срэбныя іх аналагі [65, с. 126].

У Расіі добра ведалі еўрапейскую залатую манету (дукаты, карабельнікі, партугалы), якая, паступаючы на рынкі, станавілася таварам, а не плацежным сродкам. Замежнае манетнае золата выкарыстоўвалася ў ювелірнай справе, а таксама адыгрывала ролю своеасаблівых расійскіх узнагарод – «залатых». Залатая іншаземная манета выконвала ў Расіі адну са спецыфічных грашовых функцый – сродку накаплення багацця, папаўняючы царскія, княскія і царкоўныя сховішчы.

З другой паловы XIV ст. Маскоўскае княства, а пазней і іншыя рускія землі прыступілі да чаканкі ўласнай высакапробнай срэбнай манеты, зробленай у эканомнай па тэхналогіі вытворчасці тэхніцы драцяной чаканкі.

У грашовым абарачэнні на тэрыторыі рускіх княстваў выкарыстоўваліся срэбныя «драцяныя» манеты – дзенгі і паўдзенгі (полушки), у Ноўгарадзе і Пскове – дзенгі і чвэрці дзенег, а месцамі і медныя пулы (дробная разменная манета) [41; 65, с. 106]. Замежныя манеты ў абарачэнне не дапускаліся. Пры адсутнасці сваіх радовішчаў срэбра патрэба ў сыравіне задавальнялася пастаўкамі з еўрапейскіх краін манетнага срэбра і срэбнага лому.

Асноўнымі лічыльна-грашовымі паняццямі былі *рубель* (маскоўскі лічыльны рубель – 200 дзенег, наўгародскі лічыльны рубель – 216 дзенег), грыўня, алтын (ад татар. «шэсць», роўны 6 дзенгам, ці 3 капейкам, на 3 маскоўскія лічыльныя рублі ішло 100 алтынаў).



Расія (царства).
Капейка. XVI ст. 14х11 мм

У 1535–1538 гг. у Рускай дзяржаве праводзіцца грашовая рэформа Алены Глінскай [65, с. 111]. Рэформа была накіравана на ўпарадкаванне і ўмацаванне грашовай сістэмы – стварэнне ўніфікаванага набору грашовых адзінак на аснове лічыльнага рубля (адпавядаў 68 г срэбра). Да гэтай рэформы асноўным наміналам была маскоўская дзенга (маскоўка).

У ходзе рэформы галоўным наміналам манетнай сістэмы становіцца срэбная капейка (наўгародка).

Увогуле іерархія грашовых адзінак выглядала наступным чынам:

– капейка (наўгародка) – маса 0,68 г, зменшаная ў далейшым да 0,28 г. На аверсе капейкі была выява вялікага князя (цара) у выглядзе вершніка з дзідай, а на рэверсе – легенда з тытулам і імем эмітэнта, з 1596 г. зрэдку прапісвалася і літарная дата;

– дзенга (маскоўка) – маса 0,34 г (дзенга, роўная ½ капейкі).

На аверсе дзенгі была выява вялікага князя (цара) у выглядзе вершніка з мячом (шабляй), а на рэверсе – легенда з тытулам і імем эмітэнта;

– «полушка» (палова дзенгі, $^{1}/_{4}$ капейкі) – маса 0,17 г. На яе аверсе была выява птушкі, на рэверсе кароткая легенда «государь» («царь»).

Такім чынам, 1 лічыльны рубель = 10 лічыльным грыўням = 100 капейкам (наўгародкам) = 200 дзенгам (маскоўкам) = 400 «полушкам».

Існаваў таксама і набор дадатковых паняццяў, якія адпавядалі палове, чвэрці і дзясятай частцы лічыльнага рубля.

Насельніцтва беларускіх зямель, якое карысталася на гэты час паўнавартаснай па знешніх і матэрыяльных характарыстыках срэбнай і залатой

манетай, зразумела, з пэўнай асцярогай ставілася да спецыфічнай расійскай манеты. Тым не менш драцяная манета эпізадычна ўдзельнічала ў грашовым абарачэнні, а яе высакапробнасць была прывабная для выкарыстання ў ювелірнай справе. Менавіта з дзвюма расійскімі капейкамі, якія былі прызначаны для каралёў, звязаны гіганцкі полацкі пажар 1643 г. [54, с. 184–185].

У канцы XVII ст. пачалася абмежаваная распрацоўка радовішчаў срэбра на тэрыторыі Сібіры. Асноўнай жа крыніцай паступлення срэбнай сыравіны, як ужо адзначалася, заставалася еўрапейскае манетнае срэбра і срэбны лом.

Да пачатку XVII ст. у Расіі захоўвалася права свабоднай чаканкі, калі фізічныя асобы маглі замаўляць на грашовых дварах чаканку манеты з уласнай срэбнай сыравіны. Перапрацоўка замежнага манетнага срэбра ў капейкі была вельмі выгаднай справай (талер ацэньваўся ў межах 36 капеек, а выраблялі з яго 40–42 капейкі) [65, с. 120–121].

У канцы 1640-х гг. адбылася поўная дзяржаўная манапалізацыя закупак срэбра і канцэнтрацыя чаканкі манеты ў Маскве.

Значнай падзеяй у гісторыі Расіі стала грашовая рэформа 1654–1663 гг. Аляксея Міхайлавіча (гады праўлення 1645–1676). У пэўнай ступені гэтая рэформа звязана з уваходжаннем у склад Расіі ў 1654 г. Левабярэжнай Украіны. Неабходна было стварыць такую манетную сістэму, якая б не толькі ўмацавала дзяржаўныя фінансы, але і спрыяла найхутчэйшаму ўключэнню далучаных зямель у агульнарасійскі рынак. У ходзе рэформы планавалася правесці пэўную мадэрнізацыю расійскай манетнай сістэмы: увесці ў абарачэнне медную манету і выраблсць манеты круглымі па форме.

У срэбры былі адчаканены рубель і палова паўрубля (25 капеек), а таксама пушчаныя ў абарачэнне яфімкі і паўяфімкі «з прыметай».

Рубель (1654) чаканіўся на талерных манетных кружках з механічна збітымі выявамі. Талеры былі назапашаны ў царскай казне яшчэ ў папярэднія гады.



Расія (царства). Рубель. 1654 г. Ø 40–42 мм

На аверсе рубля размяшчалася выява цара-вершніка і колавая легенда з яго імем і тытулам «Божиею милостию великий государь, царь и великий князь Алексей Михайлович всея Великия и Малыя России».

На рэверсе змешчана выява двухгаловага арла ў квадраце ў атачэнні арнаменту. Зверху – літарнае вызначэнне даты «лета 7162» (1654), а знізу – намінал «Рубль». Ужо ў 1655 г. урад быў вымушаны спыніць выпуск непаўнавартаснага рубля.

Палова паўрубля (1654) чаканілася на рассечаных на 4 часткі талерах з папярэднім механічным знішчэннем выяў.

На аверсе была выява цара-вершніка ў атачэнні падзеленага на тры часткі вызначэння наміналу – «пол/пол/тин».

На рэверсе – радковая легенда з царскім імем і тытулам эмітэнта.



Расія (царства). «Полуполтина». Чацвяртак. 1654 г.

Срэбныя рубель і палова паўрубля, адбітыя падчас рэформы, мелі прымусова завышаны курс. Рэальны курс рубля складаў 64 капейкі (намінальны курс = 100 капеек), паловы паўрубля – 16 капеек (намінальны курс = 25 капеек) [65, с. 128].

Яфімкі і паўяфімкі «з прыметай» (кляймо, кантрамарка) уяўлялі сабой адпаведна талеры і рассечаныя напалову талерныя манеты. Кантрамаркі ў дадзеным выпадку азначалі дазвол на законны ўдзел манеты ў грашовым абарачэнні Расіі.



Расія (царства). Яфімак
Ø 40–42 мм

Яфімкі і паўяфімкі контрамаркіраваліся двума клеймамі: круглым – з выявай цара-вершніка з дзідай і прамавугольным – з датай надчаканкі – «1655».

Звяртае ўвагу непрынятае на той час у Расіі вызначэнне даты «арабскімі» лічбамі, а не літарамі кірылічнага алфавіта. Тлумачыцца гэта тым, што яфімкі «з прыметай» прызначаліся для аплаты службы расійскім вайскоўцам падчас ваенных дзеянняў 1654–1667 гг. на тэрыторыі ўсходніх зямель Украіны і Беларусі. Мясцовае насельніцтва, зразумела, было звыклае да выкарыстання пры напісанні дат менавіта «арабскімі» лічбамі. Таму манеты з датай «1655» не маглі выклікаць лішніх пытанняў. У выніку рублёвікі і яфімкі «з прыметай» прымаліся беларускім насельніцтвам як звычайныя талеры. Яны прысутнічаюць у беларускіх скарбах, але найбольшая колькасць знаходак гэтай манеты зафіксавана на тэрыторыі Украіны.

Яфімкі «з прыметай» з’яўляліся паўнавартаснай манетай, таму што мелі афіцыйны курс у 64 капейкі, які адпавядаў іх рэальнай вартасці. Паўяфімкі адпаведна ацэньваліся ў 32 капейкі. Надчаканка яфімкаў спынілася ў канцы 1655 – пачатку 1656 г. У расійскім грашовым абарачэнні яны заставаліся да пачатку 1659 г., калі былі забаронены і выкуплены ў насельніцтва разам з рублёвікамі і «полуполтинами» за медныя грошы.

У медзі чаканіліся – дзенга ($^1/_2$ капейкі), капейка, грош (2 капейкі), алтын (3 капейкі), паўрубель (50 капеек).

> Круглы па форме паўрубель называўся яшчэ «медным яфімкам». На яго аверсе была выява цара-вершніка і колавая легенда з яго імем і тытулам, а на рэверсе – выява двухгаловага арла ў квадраце ў атачэнні арнаменту. Зверху абазначана літарная дата чаканкі, знізу – вызначэнне наміналу: «полтинник».

Назва наміналу прапісвалася таксама на алтыне («алтын») і на грошы («4 денги»).

Акрамя круглых медных паўрублёў была спроба адбіць і круглыя медныя манеты больш нізкіх наміналаў, але яны фактычна не дайшлі да нашага часу [65, с. 126].

Медныя «драцяныя» капейкі, прызначаныя для ўнутранага рынку, па вонкавым афармленні былі падобныя на срэбны варыянт гэтага наміналу. Эмісія завышаных аб’ёмаў медных манет прывяла да рэзкага зніжэння іх вартасці, што пацягнула за сабой адпаведныя негатыўныя наступствы – рост кошту тавараў, адмову вытворцаў прадукцыі і гандляроў прадаваць тавары за медзь і інш.

Медныя манеты, чаканеныя падчас рэформы, мелі прымусова завышаны курс.

Злоўжыванні ўрада ў галіне грашовай палітыкі прывялі да «меднага» бунту 1662 г. у Маскве і хваляванняў у шэрагу іншых расійскіх гарадоў. У выніку чаканка медных капеек была спынена і пачаўся іх выкуп у казну, у абарачэнні працягвалі выкарыстоўвацца срэбныя капейкі.

Для правядзення грашовых разлікаў выкарыстоўваліся такія лічыльна-грашовыя паняцці, як алтын (3 капейкі), грыўня (10 капеек), паўрубель (50 капеек), рубель (100 капеек).

Рэформа была першай, праўда няўдалай, спробай увядзення ў Расіі меднай капейкі і срэбнага рубля. Акрамя таго, адбылася матэрыялізацыя (манетызацыя) звыклых лічыльных паняццяў у форме рэальных манет – рубля, паўрубля, паловы паўрубля, алтына.

Скарбавы матэрыял і пісьмовыя крыніцы гэтага перыяду сведчаць, што ў манетны фонд усходнебеларускіх зямель былі ўключаны адносна значныя аб’ёмы срэбных рускіх капеек, якія, у адрозненне ад медных расійскіх наміналаў, актыўна выкарыстоўваліся ў мясцовым грашовым абарачэнні [23].

!!

*Разгледжаны перыяд адзначаны ў першую чаргу завяршэннем працэсу фарміравання манетнай сістэмы ВКЛ (выпуск уласных варыянтаў агульнапрынятых у еўрапейскіх краінах наміналаў – гроша, талера і дуката). Характэрнай з'явай гэтага часу былі няроўныя суадносіны паміж літоўскім і польскім грошамі (4:5), ліквідаваныя грашовай рэформай Стэфана Баторыя. У грашовых разліках шырока выкарыстоўваліся такія лічыльныя паняцці, як капа і злоты. Манетны фонд гэтага часу ў значнай колькасці складаўся з іншаземнай манеты.*

## Заданні для самакантролю

1. Пералічыць падзеі, якія завяршылі працэс фарміравання манетнай сістэмы ВКЛ.
2. Вызначыць суадносіны, што склаліся паміж літоўскім і польскім грошамі.
3. Назваць мэты і вынікі грашовай рэформы Стэфана Баторыя.
4. Назваць лічыльна-грашовыя паняцці разглядаемага перыяду.
5. Прывесці прыклады мясцовых назваў талернай манеты на тэрыторыі ВКЛ.
6. Назваць мэты і вынікі грашовай рэформы Алены Глінскай.
7. Ахарактарызаваць мэты і вынікі грашовай рэформы Аляксея Міхайлавіча.

## Тэма 2.5. Грашовае абарачэнне
## ў другой палове XVII – канцы XVIII ст.

Разглядаемы перыяд у гісторыі Рэчы Паспалітай быў часам паступовага разгортвання сацыяльна-эканамічнага і палітычнага крызісу. У гаспадарчым жыцці краіны ішло далейшае ўмацаванне фальваркава-паншчыннай сістэмы, якая прыводзіла да разарэння сялянства, падрываліся ўнутрыгандлёвыя сувязі паміж гарадамі і вёскамі, назіраліся спад таварнай вытворчасці і збядненне асноўнай масы насельніцтва. У выніку гэтых працэсаў рэзка зменшыліся падатковыя паступленні ў дзяржаўную казну.

Значны ўплыў на пагаршэнне эканамічнага стану ў краіне аказалі працяглыя ваенныя дзеянні, што разгарнуліся ў сярэдзіне XVII – пачатку XVIII ст. (вайна 1648–1654 гг., вайна з Расіяй 1654–1667 гг., вайна са Швецыяй 1655–1660 гг., Паўночная вайна 1700–1721 гг.). Ваенныя выдаткі перавысілі ўсе магчымыя межы. Дзяржаўная казна не магла забяспечыць першачарговых абавязкаў.

На фоне абмежаванай манаршай улады і страты дзеяздольнасці асноўнага органа дзяржаўнай улады – сейма, у краіне пачаўся палітычны крызіс.

Прадстаўлены перыяд багаты не толькі матэрыяльнымі рэліктамі грашовага абарачэння, але і разнастайнымі пісьмовымі крыніцамі, якія запаўняюць тыя лакуны, што непазбежна застаюцца пры нават самым дасканалым вывучэнні скарбавага матэрыялу. Дакументы ствараюць магчымасць даследаваць найбольш значныя аспекты грашовай гаспадаркі, напрыклад, скласці кола грашовых адзінак, што былі ў абарачэнні, вызначыць іх рэальны рынкавы курс і пакупную здольнасць, прасачыць эвалюцыю рынкавых коштаў, мясцовую грашовую тэрміналогію, што была народжана ўзаемаўплывам польскай, літоўскай, заходнееўрапейскай і расійскай лексікі, нарэшце, высветліць праяўленне такіх функцый грошай, як мера вартасці, сродак абарачэння, плацяжу, накаплення, сусветныя грошы.

З другой паловы XVII ст. грашовая гаспадарка, якая грунтавалася на значнай колькасці нізкапробнай манеты і параўнальна невялікім аб'ёме срэбных і залатых манет, усё часцей адыходзіць ад традыцыйных норм рынкавага абарачэння і ліку. Назіраецца рэзкае ваганне курсаў асноўных наміналаў і, як наступства гэтага, коштавых суадносін паміж імі.

Манеты заходнееўрапейскіх краін даволі часта траплялі на рынкі Беларусі пад тымі ж імёнамі, што іх польскія і літоўскія аналагі. Гэта «маскіроўка» часам не толькі вельмі абцяжарвае, але і робіць немагчымым адасабленне іншаземнай чаканкі з узгадваемых пісьмовымі крыніцамі грашовых сум.

Характэрнай асаблівасцю манетнага фонду Беларусі была надзвычайная стракатасць рынкавых сродкаў плацяжу. Наступствамі такой разнастайнасці манет, што знаходзіліся ў абарачэнні, сталі адсутнасць стабільнасці курсаў іх абарачэння і неабходнасць выкарыстання ў штодзённасці

лічыльных паняццяў для таго, каб прывесці да агульнай асновы розныя рэальныя наміналы многіх краін.

У першай чвэрці XVIII ст. дакладна прасочваюцца тэндэнцыі да ўзмацнення эканамічных кантактаў усходняй часткі краіны з Расіяй. Беларускі рынак увабраў не толькі значную колькасць расійскай манеты, але і некаторыя расійскія лічыльна-грашовыя тэрміны. Усталёўваюцца даволі стабільныя суадносіны паміж літоўскімі, польскімі і заходнееўрапейскімі наміналамі, з аднаго боку, і расійскімі – з другога.

На тэрыторыі ВКЛ працавалі Віленскі, Тыкоцінскі, Ковенскі (зараз – г. Каўнас; 1665–1666), Брэсцкі (1665–1666), Гродзенскі (1706–1707, 1793) манетныя двары. У 1667 г. адбылося спыненне дзейнасці галоўнага цэнтра манетнай вытворчасці ВКЛ – Віленскага манетнага двара.

Наконт існавання і дзейнасці Гродзенскага манетнага двара існуюць два супрацьлеглыя меркаванні. Частка даследчыкаў лічыць, што Гродзенскі манетны двор дзейнічаў менавіта ва ўказаныя даты [54, с. 241; 74, s. 161]. Другая частка прытрымліваецца поглядаў, што такі манетны двор, магчыма, існаваў у XVI ст., а ў 1706–1707 гг., у сувязі з акупацыяй у гэты час горада шведскім войскам, ён дзейнічаць не мог [17].

Адсюль выцякае немагчымасць чаканкі ў Гродне Аўгустам II Моцным (1697–1706, 1709–1733) апошніх агульнадзяржаўных манетных эмісій ВКЛ – літоўскага пробнага трайнога гроша 1706 г. і малатыражнай эмісіі літоўскага шасціграшовіка 1706–1707 гг. Выпускі гэтых манет звязваюцца даследчыкамі з некаторымі іншаземнымі манетнымі дварамі, а талер Таргавіцкай канфедэрацыі 1793 г. адносіцца імі да Варшаўскага манетнага двара [17, с. 40–42].

Пры праўленні Яна II Казіміра Вазы (1648–1668) былі здзейснены наступныя манетныя эмісіі ВКЛ – шэлег (солід), грош, 1,5 гроша, 3 грошы (траяк), 6 грошаў (шастак), орт (ням. Ort – чацвёртая частка ад нечага, у дадзеным выпадку талера), 30-грашовік (проба), паўдукат, дукат.

Ян III Сабескі (1674–1696) эмітаваў 6 грошаў (шастак; проба).

Аўгуст II Моцны адчаканіў апошнія эмісіі ВКЛ – 3 грошы (траяк; проба) і 6 грошаў (шастак) [22, с. 58–65; 74, s. 159–161].

Лічыльную функцыю ў гэтым перыядзе, па-ранейшаму, выконвалі такія лічыльна-грашовыя адзінкі, як злоты (30 польскіх грошаў), капа (60 літоўскіх грошаў), рубель (100 літоўскіх грошаў) і іх палавінныя фракцыі. Выніковыя сумы маглі быць таксама пералічаны на іншыя грашовыя адзінкі.

* * *

У крызіснай сітуацыі другой паловы XVII ст. у Рэчы Паспалітай у 1659–1666 гг. праводзіцца адна з самых вядомых грашовых рэформ.

Мэтай рэформы было ўпарадкаванне фінансавага становішча шляхам пуску ў абарачэнне непаўнавартасных манет з прымусова завышаным курсам.

Асноўныя напрамкі будучай грашовай рэформы былі распрацаваны практычна адразу пасля ўступлення на прастол караля польскага і вялікага князя літоўскага Яна II Казіміра Вазы.

Праект рэформы прадугледжваў:
– адмову ад нізкапробнай іншаземнай манеты;
– павелічэнне аб’ёмаў здабычы срэбра;
– далейшую ўніфікацыю грашовай сістэмы;
– увядзенне забароны на перапрацоўку высакапробнай срэбнай манеты ў нізкапробную дробную;
– узмацненне пакарання фальшываманетчыкаў.

Падчас рэформы ў абарачэнне былі ўведзены дзве новыя манеты – медны солід (шэлег) і білонны трыццаціграшовік (тымф, тынф).

Аўтарам праекта чаканкі меднага соліда стаў ***Ціт Лівій Бараціні*** (Бураціні). У многіх еўрапейскіх краінах ён быў вядомы як выбітны навуковец і паспяховы вынаходнік-практык, які меў авантурныя схільнасці характару. Веды і здольнасці Бараціні знаходзілі прымяненне ў астраноміі, архітэктуры, фізіцы, метралогіі і інш. Прыехаўшы ў Рэч Паспалітую, ён арандуе Кракаўскі манетны двор.

Менавіта Ціт Лівій Бараціні і прапанаваў праект, які нібыта мог бы вырашыць усе ўзнікшыя праблемы і выратаваць дзяржаўныя фінансы. Супрацьстаяць яго «геніяльнаму» па прастаце і лагічнасці пабудовы плану было проста немагчыма. Па праекце Ціта Лівія Бараціні ў грашовае абарачэнне пускаліся медныя соліды з завышаным курсам.

Увогуле, солідам (лац. solidus – трывалы, цэльны) першапачаткова называлася залатая рымская манета, з XVI ст. – разменная білонная, з XVII ст. – медная манета.

Мясцовая назва соліда – «шэлег». Шэлегі выкарыстоўваліся для характарыстыкі вельмі збяднелага стану чалавека, пра якога маглі, напрыклад, сказаць, што ў яго «ані шэлега няма».

На час правядзення рэформы ў грашовым абарачэнні на тэрыторыі Беларусі прысутнічалі білонныя і ў нязначнай колькасці медныя польскія шэлегі. Шэлегі мелі наступны курс: 1 грош адпавядаў 3 білонным і 4 медным шэлегам.

Разынка авантурнага праекта Бараціні была ў тым, што медныя шэлегі пускаліся ў грашовае абарачэнне па курсе вышэйшых па вартасці білонных аналагаў, і, такім чынам, абвяшчалася іх парытэтнасць: плюс да таго нізкі кошт меднай сыравіны. Разгледзім матэматычную аснову праекта.

1 медны шэлег = 1 білоннаму шэлегу = $^1/_3$ гроша (1 грош = 3 шэлегам).

1 фунт медзі каштаваў 45 шэлегаў, а выраблялі з гэтага фунта 300 (!!!) экз. медных шэлегаў.

Размяркоўваліся гэтыя 300 шэлегаў наступным чынам:

– 45 шэлегаў ішлі на аплату 1 фунта сыравіны;

– 84 шэлегі складала аплата вытворчых выдаткаў, працы манетчыкаў і даход арандатара манетнага двара;

– 171 шэлег уяўляў чысты прыбытак, які літаральна «з неба» падаў у дзяржаўную казну.

Зразумела, што такі «звышдаход» толькі з 1 фунту медзі дазваляў бы вырашыць усе фінансавыя праблемы і не мог не прывабіць улады сваёй прастатой і маштабнасцю задумы.

Рэальная вартасць меднага шэлега складала толькі 15 % ад намінальнай вартасці. Гэта можна разлічыць, улічваючы кошт у 45 шэлегаў 1 фунта медзі, з якога атрымлівалі 300 экз. шэлегаў, склаўшы наступную прапорцыю:

300 шэлегаў – 100 %
45 шэлегаў – X %
X = 45 x 100 : 300 = 15 %.

Пісьмовыя крыніцы сведчаць аб тым, што насельніцтва краіны прымала медныя шэлегі не па намінальным (1 грош = 3 шэлега), а па рэальным курсе, які даходзіў да 5 шэлегаў за 1 грош.

Эмісія медных шэлегаў першапачаткова вызначалася сумай у 2 млн злотых (па 1 млн для Польшчы і Княства). Агульны наклад чаканкі медных шэлегаў у выніку павінен быў скласці 180 млн экз.

1 злоты = 30 грошам, 1 грош = 3 шэлегам, 1 злоты = 90 шэлегам, адсюль, 90 шэлегаў x 2 млн злотых = 180 млн экз. шэлегаў.

На самай справе колькасць манет рэальна адчаканеных на манетных дварах Польшчы і ВКЛ склала значна большую суму.

Падлікі паказваюць, што эмісія медных солідаў толькі для ВКЛ склала 877 835 358 экз., гэта значыць – амаль 1 млрд экз. [54, с. 218]. Для забеспячэння магчымасці чаканкі такой вялікай колькасці манет было нават створана некалькі новых манетных двароў.




Рэч Паспалітая. Медны солід літоўскі («Барацінка»). 1665 г. Ø 15–16 мм

Маса соліда (шэлега) – прыкладна 1,27 г, дыяметр – 1,5–1,7 см.

На аверсе літоўскіх медных шэлегаў – партрэтная выява Яна Казіміра і колавая легенда «IOAN CAS REX» / «Ян Казімір Кароль».

На рэверсе – «Пагоня» і колавая легенда «SOLI MAG DVC LIT» / «Солід Вялікага Княства Літоўскага» і дата чаканкі.

Польскія медныя шэлегі адрозніваліся рэверснай выявай («Арол») і легендай, якая вызначала іх польскую прыналежнасць.

Нягледзячы на аргументаваныя сцвярджэнні Ціта Лівія Бараціні аб тым, што танныя па сабекошце медныя шэлегі не будуць падрабляцца, фальшываманетчыкі актыўна ўключыліся ў працэс фабрыкацыі гэтай манеты, павялічыўшы і так астранамічны наклад шэлегаў на непадлічаную, але велізарную колькасць.

Парадаксальнасць сітуацыі заключалася ў тым, што фальсіфікаты ў сувязі з таннасцю медзі часам мелі нават большую масу, чым сапраўдныя шэлегі, але насельніцтва спакойна прымала відавочныя падробкі нараўне з чаканенымі на манетных дварах. У пісьмовых крыніцах таго часу падробныя шэлегі называлі «злыя».

Медныя шэлегі з цягам часу атрымалі назву, звязаную з ініцыятарам іх чаканкі, – «барацінкі» («баратынчыкі»).

Барацінкі чаканіліся з 1659 г. па 1666 г., але ўжо з сярэдзіны 1663 г. стаў відавочным крызісны вынік праекта. У абарачэнні шэлегі па сваім рэальным кошце заставаліся яшчэ на працягу другой паловы XVIII ст.

Адмоўныя вынікі выпуску ў абарачэнне медных солідаў прымусілі рэфарматараў шукаць іншыя шляхі выхаду са складанага фінансавага становішча. Якраз у гэты час з’явіўся праект чаканкі нізкапробных манет са значным заніжэннем колькасці срэбра адносна іх намінальнага кошту.

У 1663 г. арандатар некалькіх буйных польскіх манетных двароў, прадстаўнік роду вядомых германскіх манетчыкаў ***Андрэй Тымф*** прадставіў на разгляд урадавай камісіі праект выпуску білоннай манеты наміналам у 1 злоты (30 грошаў), якая называлася «złotówka» ці «орт златковы». Праект быў ухвалены. Яго рэалізацыяй Андрэй Тымф займаўся разам з братам Томасам. Эмісіі гэтай манеты праводзіліся на манетных дварах Львова, Быдгошча, магчыма, Кракава, а таксама Вільні (проба). Пазней гэта манета, у адпаведнасці з прозвішчам аўтара праекта, стала называцца *«тымфам» («тынфам»)*.

Білонная манета з намінальным курсам у 30 грошаў утрымлівала срэбра толькі на 12 грошаў і была, такім чынам, манетай непаўнавартаснай. Рэальная вартасць тымфа складала 40 % ад вартасці намінальнай. Разлік выглядае наступным чынам:

30 грошаў – 100 %
12 грошаў – X %
X = 12 x 100 : 30 = 40 %.

Тымф чаканіўся з білону пробы ў VIII лотаў яго маса складала 6,72 г, дыяметр – 3 см.



Рэч Паспалітая. Тымф. 1663 г. Ø 31 мм

На аверсе тымфа была выява манаграмы Яна ІІ Казіміра Вазы «ICR» і колавая легенда «DAT PRETIVM SERVATA SALVS POTIORQ METALLO EST» / «Жаданне выратаваць Бацькаўшчыну перавышае сапраўдны кошт металу». Па знешнім выглядзе гэтай манаграмы тымф атрымаў назву «падкоўка». Існавала і своеасаблівая расшыфроўка манаграмы «ICR» – «Initium calamitatis Regni» / «Пачатак пагібелі дзяржавы».

На рэверсе тымфа размяшчалася выява іспанскага чатырохпольнага шчыта з двума дзяржаўнымі сімваламі – «Арлом» Польшчы і «Пагоняй» ВКЛ, радавым гербам Вазаў «Снапом» на цэнтральным шчытку, вызначэннем наміналу ў ніжняй частцы шчыта – «XXX GRO. POL.» / «30 грошаў польскіх» і колавай легендай – «MONET. NOV. ARGE. REG. POL.» / «Манета новая срэбная Каралеўства Польскае». Па баках шчыта часам размяшчаліся ініцыялы Андрэя Тымфа «А» і «Т».

Тымфы чаканіліся толькі ў польскім варыянце з 1663 г. па 1666 г. (выключэнне складала чаканка пробнага трыццацігрto грашовіка ў 1666 г. на Віленскім манетным двары). Агульны наклад эмісій тымфаў склаў 9 млн экз. Гэтыя манеты таксама не набылі падтрымкі з боку насельніцтва краіны і, знаходзячыся ў абарачэнні да 1776 г., яны прымаліся па нізкім курсе.

У выніку рэфарматарскіх дзеянняў на рынках скаліся дзве паралельныя лічыльна-грашовыя сістэмы – медная і срэбная.

Паняцце «наддача», зафіксаванае ў пісьмовых крыніцах, вызначала дадатковую суму – кампенсацыю пры разліках не срэбрам, а меддзю.

Падчас правядзення грашовай рэформы пачаў праяўляцца эканамічны закон грашовага абарачэння Каперніка – Грэшэма, паводле якога пры ўмове аднолькавасці наміналаў манеты з больш каштоўнага металу выціскаліся з абарачэння манетамі менш каштоўнымі. Білонныя трыццаціграшовікі і асабліва медныя шэлегі вельмі хутка занялі пануючае месца ў грашовым абарачэнні Рэчы Паспалітай, выціскаючы з выкарыстання паўнавартасную срэбную манету.

Будучы непаўнавартаснымі грашыма, барацінкі і тымфы сталі матэрыяльным увасабленнем дадатковых ускосных падаткаў для насельніцтва. Эмісіі крэдытных медных солідаў і білонных трыццаціграшовікаў толькі ўзмацнілі інфляцыю і прывялі да незваротных наступстваў у фінансавай гаспадарцы краіны.

У 1666 г. грашовая рэформа атрымала лагічнае завяршэнне. Бараціні і браты Тымфы былі прыцягнуты да суда, але Тымфы проста з’ехалі за межы краіны, а Бараціні, ведаючы, што лепшая абарона – гэта нападзенне, падаў сустрэчны іск на 1,5 млн злотых, выйграў суд і яшчэ некалькі гадоў да сваёй смерці арандаваў Кракаўскі манетны двор.

* * *

Крызісныя з’явы другой паловы XVII ст. адбіліся і на фінансах краіны. У грашовым абарачэнні, акрамя барацінак і тымфаў, знаходзіліся білонныя манеты Шведскай Прыбалтыкі, талеры і золата Нідэрландаў, шастакі і орты Прусіі, срэбныя і медныя манеты Расіі.

Агульнадзяржаўныя манетныя эмісіі ў часы кіравання Аўгуста II Моцнага адноўлены не былі (за выключэннем вышэйназваных пробнага літоўскага трохграшовіка 1706 г. і нязначнай, па-сутнасці дэкларатыўнай, эмісіі літоўскіх шасціграшовікаў 1706–1707 гг.). Невялікія па аб’ёме эмісіі буйных і разменных манет пастаўлялі ў грашовае абарачэнне некаторыя гарадскія манетныя двары Польшчы, а таксама Лейпцыгскі манетны двор Саксоніі.

Аўгуст III (1733–1763) працягваў чаканку польскіх наміналаў у Саксоніі, але ў апошняе дзесяцігоддзе яго кіравання адбылася значная актывізацыя дзейнасці польскіх манетных двароў.

Практыка асобных грашовых разлікаў на літоўскія і польскія грошы сышла ў мінулае. Падобны падзел, актуальны ў перыяд да грашовай рэформы 1578–1580 гг., страціў рэальную аснову, да таго ж у абарачэнні фактычна адсутнічалі літоўскія і польскія манеты наміналам у адзін грош.

Пісьмовыя крыніцы, ураўноўваючы паняцці «літоўскі грош» і «асмак», у далейшым аддаюць перавагу абагульняючаму тэрміну – «асмак». Най-

больш распаўсюджаным лічыльна-грашовым паняццем становіцца «злоты», «капа» сустракаецца значна радзей.

У XVII – пачатку XVIII ст. у пісьмовых крыніцах сустракаюцца грашовыя тэрміны «полпятак» і «дзясятнік». «Полпятаком» у часы, калі літоўскія паўгрошы практычна зніклі з абарачэння, мог быць паўтараграшовік (3 грошы адпавядалі 5 грошам меднымі шэлегамі), а «дзясятнікам» называлі шасціграшовік, які ішоў па курсе 10 грошаў у меднай манеце.

Кіруючыя ўлады Рэчы Паспалітай XVIII ст. імкнуліся шляхам шэрагу грашовых рэформ вырашыць складаныя фінансавыя праблемы дзяржавы.

У 1752 г. праводзіцца грашовая рэформа, якая мадэрнізуе манетную сістэму, набліжаючы яе па некаторых параметрах да саксонскай. Выглядала абноўленая манетная сістэма наступным чынам: медзь – солід, грош; білон – 1,5 гроша, паўшастак, шастак, тымф (18 грошаў); срэбра – 8 грошаў, паўталер, талер; золата – паўдукат, дукат, двайны дукат, паўаўгустдор (2,5 талера), аўгустдор, двайны аўгустдор.

Значныя падзеі ў рэчышчы грашовага абарачэння адбываліся і ў часы праўлення Станіслава Аўгуста Панятоўскага (1764–1795). У 1765 г. адкрыўся Варшаўскі манетны двор, які стаў цэнтрам грашовай вытворчасці ў Рэчы Паспалітай.

У 1766 г. праводзіцца чарговая, накіраваная на ўпарадкаванне манетнай сістэмы грашовая рэформа, у выніку якой быў паніжаны курс дуката, зменшана проба талера, спынены выпуск білонных паўтарака, паўшастака, шастака, залатых паўдуката, паўаўгустдора, аўгустдора, двайнога аўгустдора. Уведзены новыя віды манет: з медзі – паўгрош, траяк, білонныя грош і двайны грош; са срэбра – 4 грошы.

Шляхам абмену на новыя медныя манеты пачалося выцісканне з абарачэння медных эмісій Яна II Казіміра Вазы і Аўгуста III. У выніку манетная сістэма набыла наступны выгляд: медзь – солід, паўгрош, грош, траяк; білон – грош, 2 грошы; срэбра – 4 грошы, 8 грошаў, паўталер, талер; золата – дукат.

У выніку рэформы дзяржаўныя фінансы былі часова прыведзены ў парадак, але яны не набылі трывалай стабільнасці. Выхад з гэтай сітуацыі рэфарматары ўбачылі ў павышэнні намінальнага курсу білонных і срэбных манет пры адначасовым зніжэнні іх якасці. Для рэалізацыі гэтага праекта ў 1787 г. была праведзена яшчэ адна грашовая рэформа, у ходзе якой працягвалася ўдасканаленне грашовай гаспадаркі.

Цікавы эпізод у гісторыі грашовага абарачэння Рэчы Паспалітай адбыўся ў канцы XVIII ст. Варшаўскі сейм 1788–1792 гг. прыняў у 1791 г. Канстытуцыю, якая павінна была спрыяць урэгуляванню палітычнага крызісу ў краіне. Супраць такога павароту падзей выступіла Таргавіцкая канфедэрацыя.




Рэч Паспалітая.
Талер Таргавіцкай канфедэрацыі. 1793 г.
Ø 41–44 мм

У 1793 г. была здзейснена маланакладная эмісія так званага талера Таргавіцкай канфедэрацыі. Гэты талер з'яўляецца прыкладам монаэпіграфнай манеты, яго аверс і рэверс поўнасцю пакрыты легендай, якая мае антыканстытуцыйны сэнс. Месца яго чаканкі (Гродна ці Варшава) разглядаецца даследчыкамі ў розных версіях.

Падчас паўстання Тадэвуша Касцюшкі (1794) фінансавыя пытанні вырашала Вышэйшая Народная Рада. 8 чэрвеня 1794 г. Рада абвесціла Маніфест аб грашовай рэформе, у выніку якой была паніжана проба талера, спынена чаканка медных манет і паўталераў і з'явіліся новыя наміналы.

У манетную сістэму ўваходзілі: білон – 6 грошаў, 10 «грошаў медных»; срэбра – 4 грошы, 8 грошаў, талер; золата – дукат, паўстаніслаўдор, станіслаўдор.

Невялікія вытворчыя магчымасці Варшаўскага манетнага двара не маглі забяспечыць патрэбы паўстанцаў, якія вялі баявыя дзеянні, таму Рада прыняла нетрадыцыйнае рашэнне наладзіць эмісію папяровых грашовых знакаў. У грашовым абарачэнні з'явіліся казначэйскія білеты ў 5, 10, 25, 50, 100, 500, 1000 злотых і разменныя наміналы ў 5, 10 грошаў, 1 і 4 злотыя. Паражэнне паўстання прывяло да абвяшчэння папяровых грошай па-за законам, чаканка манет працягвалася.

У сувязі з апошнім падзелам Рэчы Паспалітай у 1795 г. Варшаўскі манетны двор часова быў закрыты. На 1796 г. расійскія ўлады з мэтай стварэння дадатковай вытворчасці для перачаканкі меднай манеты запланавалі адкрыццё Полацкага манетнага двара. Была падрыхтавана неабходная дакументацыя, вызначаны штат, памеры заробкаў і аб'ёмы будучай вытворчасці, у горад было нават завезена адпаведнае абсталяванне, але новыя ўнутрыпалітычныя рэаліі ў Расійскай імперыі паўплывалі на ануляванне гэтага праекта.

* * *

Як ужо адзначалася, у грашовым абарачэнні на тэрыторыі Беларусі пэўнае месца займалі расійскія манеты. Значнае пашырэнне іх удзелу ў гаспадарчым жыцці звязана з вынікамі грашовай рэформы Пятра I (1682–1725), праведзенай з мэтай мадэрнізацыі грашовай сістэмы Расіі ў рэчышчы еўрапейскіх стандартаў.

Падрыхтоўка рэформы (1700–1704) пачалася яшчэ ў канцы XVII ст. Нязручная срэбная капейка ўжо не магла задаволіць узрастаючыя патрэбы

расійскага рынку. Для прыкладу, можна ўзгадаць асабліва клапотны пералік дробных манет пры правядзенні значных плацяжоў пры буйных гандлёвых здзелках.

Паралельна з неабходнасцю мадэрнізацыі манетнай сістэмы краіны Пётр I павінен быў вырашыць адвечную задачу змяншэння выдаткаў на манетную вытворчасць з дзяржаўнай казны. Гэта можна было зрабіць шляхам зніжэння колькасці срэбра ў лічыльным рублі. У 1698 г. адбылося апошняе зніжэнне масы срэбнай капейкі да 0,28 г, што давала магчымасць надаць будучаму матэрыялізаванаму рублю масу ў 28 г, якая ўкладалася ў ваганні масы талера [65, с. 142].

Для пераадолення недаверу насельніцтва да меднай манеты з 1696 г. пачалося абавязковае датаванне срэбных капеек, якое працягвалася і ў далейшым пры эмісіі новых разменных медных наміналаў. Даты на звыклых срэбных драцяных капейках даказвалі, што іх чаканка працягваецца, а медныя манеты ўсяго толькі сродак размену. Акрамя гэтага, адбылося абнародаванне царскага ўказа, дзе падкрэслівалася, што медная манета выпушчана для палягчэння дробнага гандлю і давалася гарантыя на поўную роўнасць срэбра і медзі ў грашовым абарачэнні [Там жа, с. 143–144].

У перыяд 1700–1704 гг. адбыліся наступныя эмісіі:

1700 г. – у медзі былі адчаканены палова «полушки» ($^{1}/_{8}$ капейкі), «полушка» ($^{1}/_{4}$ капейкі), дзенга ($^{1}/_{2}$ капейкі).

1701 г. – у срэбры чаканяцца дзесяць дзенег (5 капеек), грыўня («гривенник» – 10 капеек), палова паўрубля (25 капеек), паўрубель (50 капеек – «полтина»); у золаце – чырвонец і двайны чырвонец.

1704 г. – чаканяцца медная капейка, срэбныя рубель і алтын.



Расія (царства). Чырвонец. 1701 г.
Ø 23–24 мм



Расія (царства). Капейка. 1704 г.
Ø 23–25 мм



Расія (царства). Рубель. 1704 г.
Ø 41–44 мм

Трэба падкрэсліць, што галоўныя манеты – медная капейка і срэбны рубель былі апошнімі і завяршылі такім чынам фарміраванне рэфармiраванай манетнай сістэмы. У аснове яна захоўвала традыцыйны для Расіі дзесяцярычны прынцып пабудовы, што набыў матэрыялізацыю ў выглядзе суадносін паміж адпаведнымі наміналамі новай манетнай сістэмы. Не ўкладаўся ў яе толькі адзін намінал – алтын, які быў захаваны Пятром I, мабыць, як даніна пэўнай традыцыі расійскай лічыльна-грашовай сістэмы.

Пётр I, рэфармуючы манетную сістэму Расіі, уводзіў у яе еўрапейскія стандарты.

Срэбны рубель і чырвонец адпавядалі ваганням масы талера і дуката.

Да еўрапейскіх стандартаў адносілася таксама афармленне аверса і рэверса новых манет – на іх з’явілася партрэтная выява царскай асобы з адпаведнай легендай і дзяржаўны герб.

Навацыяй было і тое, што Пётр I выкарыстоўваў у манетнай чаканцы тры асноўных металы, агульнапрынятыя ў еўрапейскай манетнай справе: медзь, срэбра і золата, а таксама адзіную для ўсіх манет дыскавідную форму.

Літарнае датаванне на пятроўскіх манетах у сувязі з каляндарнай рэформай (1699) і пераходам на новую эру «ад нараджэння Хрыста» паступова замяняецца «арабскімі» лічбамі. Да пачатку 1720-х гг. яны поўнасцю замяняюць традыцыйныя кірылічныя літары.

Паказальна, што Пётр I, улічваючы негатыўныя вынікі грашовай рэформы Аляксея Міхайлавіча, не фарсіраваў увядзенне ў грашовае абарачэнне меднай капейкі, што магло б зноў выклікаць хвалю незадавальнення сярод насельніцтва. У ходзе рэформы быў зроблены прадуманы і вельмі прагматычны захад. Звыклыя дарэформенныя драцяныя капейкі чаканіліся паралельна з новымі круглымі меднымі і срэбнымі аналагамі да 1718 г.

Насельніцтва на практыцы пабачыла, што пры адсутнасці абмежаванняў медная і срэбная капейкі поўнасцю роўныя. І вось тут зноў варта ўзгадаць эканамічны закон грашовага абарачэння Каперніка – Грэшэма, у адпаведнасці з якім медныя капейкі замянілі срэбныя аналагі.

Як вынік, у 1718 г. чаканка медных і срэбных капеек была спынена, а ў 1724 г. эмісія капеек, але толькі медных, была адноўлена [69, с. 164]. Так, насельніцтва перайшло на карыстанне меднымі капейкамі.

У некаторых сучасных даследаваннях часам сустракаецца дата сканчэння грашовай рэформы менавіта ў 1718 г., у якім была пастаўлена завяршальная кропка ў выкарыстанні срэбра для расійскай дробнай разменнай манеты.

Асобнае месца ў дзейнасці Пятра I у сферы грашовага абарачэння займаюць і так званыя расійска-«польскія» манетныя эмісіі – «чехи», «шестаки», «тинфы», прататыпам якіх паслужылі польскія «пулторак» 1620-х гг., шостак і саксонскі зэхстэльталер. Гэтыя манеты былі прызначаныя для

абарачэння на ўкраінскіх, беларускіх, літоўскіх і іншых землях, але вельмі нізкая, у параўнанні з прататыпамі, рэальная вартасць з'явілася прычынай іх агульнага байкатавання рынкамі [56].

Значнай падзеяй пятроўскіх часоў было адкрыццё ў 1724 г. Санкт-Пецярбургскага манетнага двара.

У далейшыя часы ў расійскай манетнай сістэме, не парушаючы яе асноў, з'яўляліся новыя наміналы. У абарачэнне паступілі залатыя манеты – *імперыял* і яго палавінная фракцыя – *паўімперыял*, якія мелі стандартны знешні выгляд і чаканіліся з перапынкамі з 1755 г. па 1897 г.

Імперыял (10 лічыльных залатых рублёў па 1,161 г хімічна чыстага золата на 1 рубель) змяшчаў 11,61 г хімічна чыстага золата;
паўімперыял (5 лічыльных залатых рублёў па 1,161 г хімічна чыстага золата на 1 рубель) меў адпаведна 5,8 г хімічна чыстага золата.



Расійская імперыя. Імперыял. 1766 г. Ø 24,3 мм

З 1897 г. па 1911 г. чаканка залатой манеты (5, 10 рублёў) працягвалася, але з іншымі метралагічнымі паказчыкамі [69, с. 38–39].

Ва ўсходнебеларускіх пісьмовых крыніцах XVIII ст. часам узгадваюцца назвы грашовых адзінак, сэнс якіх, зразумелы сучаснікам, зараз патрабуе расшыфроўкі. Адным з іх з'яўляецца «рускі злоты» – тэрмін, які спалучае традыцыйнае польскае лічыльна-грашовае паняцце «злоты» (30 грошаў) і эпітэт «рускі».

Узнікненню гэтага тэрміна спрыяла ўсталяванне ва ўсходняй Беларусі ў першай чвэрці XVIII ст. курса капейкі ў 3 грошы. У сваю чаргу, гэтыя стабільныя суадносіны аказалі ўплыў на фарміраванне зручнага для насельніцтва паняцця, якое аб'ядноўвала польскі лічыльны злоты і рэальную расійскую капейку. Злоты пры курсе абарачэння капейкі ў 3 грошы адпавядаў 10 (30 : 3) капейкам.

Аб уваходжанні новых расійскіх манет (капейкі, алтына, грыўні, паўрубля, рубля) у грашовае абарачэнне ўсходнебеларускага рынку, а таксама аб навацыях у галіне лічыльных паняццяў сведчаць шматлікія пісьмовыя крыніцы. Гэтаму працэсу ў значнай ступені садзейнічала і тое, што ўсходнебеларуская тэрыторыя стала адной з асноўных арэн Паўночнай вайны.

Такім чынам, у першай чвэрці XVIII ст. складаюцца больш-менш стабільныя суадносіны паміж літоўскімі, польскімі, заходнееўрапейскімі і расійскімі наміналамі.

У далейшым руская манетная і лічыльна-грашовая сістэмы, заснаваныя на зручнай для разлікаў і выкарыстання дзесяцярычнай аснове і еўрапейскіх стандартах, заваёўваюць на беларускім рынку больш трывалыя пазіцыі.

!!

*Самай значнай падзеяй гэтага перыяду ў гісторыі грашовага абарачэння на тэрыторыі Беларусі з’яўлялася грашовая рэформа Яна ІІ Казіміра Вазы (1659–1666), якая была выклікана складанай эканамічнай сітуацыяй і прывяла да пагаршэння фінансавага становішча ў дзяржаве. Не змаглі прынесці станоўчыя вынікі і шэраг грашовых рэформ XVIII ст. Знікненне з палітычнай карты Еўропы Рэчы Паспалітай выклікала кардынальныя змены ў грашовым абарачэнні на беларускіх землях.*

## Заданні для самакантролю

1. Вызначыць мэты, шляхі правядзення і вынікі грашовай рэформы Яна ІІ Казіміра Вазы.
2. Апісаць знешнія характарыстыкі меднага шэлега і тымфа.
3. Назваць грашовыя рэформы ў Рэчы Паспалітай у XVIII ст.
4. Пералічыць вынікі грашовай рэформы Пятра І.
5. Вызначыць дзеянне эканамічнага закону грашовага абарачэння Каперніка – Грэшэма ў ходзе грашовых рэформ Яна ІІ Казіміра Вазы і Пятра І.
6. Назваць знешнія і матэрыяльныя характарыстыкі імперыяла.
7. Даць характарыстыку першым папяровым грошам, якія былі выпушчаны на тэрыторыі Рэчы Паспалітай.

## Тэма 2.6. Грашовае абарачэнне ў канцы XVIII ст. – кастрычніку / лістападзе 1917 г.

Уступленне Рэчы Паспалітай у перыяд незваротнага ўнутрыдзяржаўнага крызісу прывяло ў другой палове XVIII ст. да падзелаў яе тэрыторыі (1772, 1793, 1795) паміж бліжэйшымі суседзямі і знікнення з палітычнай карты свету.

Уваходжанне беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі паўплывала на ўсе бакі сацыяльна-эканамічнага і палітычнага жыцця насельніцтва. У галіне грашовай гаспадаркі гэты працэс прывёў у выніку да поўнага ўключэння беларускіх зямель у агульнарасійскі рынак.

Грашовае абарачэнне разглядаемага перыяду падзяляецца на два этапы:
1. Канец XVIII – сярэдзіна XIX ст.
2. 1860-я гг. – кастрычнік / лістапад 1917 г.

*Першы этап (канец XVIII – сярэдзіна XIX ст.)* характарызуецца працягам выкарыстання беларускім насельніцтвам звыклага набору манет. Знізіўся прыток нідэрландскіх манет, працягваецца паступленне талераў Прусіі, меднай і срэбнай манеты герцагства Варшаўскага, трывала ўваходзяць у абарачэнне расійскія грашовыя адзінкі.

У гэты час з'яўляюцца і некаторыя новыя для беларускага рэгіёна грашовыя тэрміны, звязаныя з мясцовай спецыфікай. У дакументах сустракаюцца такія паняцці, як «восьмигривенник», бярлінка пруская (30 капеек), «десятёрка» польская (10 грошаў, ці 20 капеек), пяцёрка (5 грошаў, ці 10 капеек), вердынг (6 капеек) [33].

Разглядаемы перыяд стаў завяршальным этапам у працэсе паступовага ўваходжання беларускіх зямель у сістэму расійскай грашовай гаспадаркі.

Аб'ектыўныя прычыны прымусілі расійскі ўрад правесці запаволены паэтапны перавод насельніцтва беларускіх зямель, уключаных у склад імперыі, на выкарыстанне толькі расійскіх грашовых сродкаў. Захады на канкрэтнае вырашэнне гэтай праблемы пачынаюцца ў 1830–1840-я гг., калі прыняты некалькі адпаведных урадавых дакументаў. Працэс здавання беларускім насельніцтвам у казну па вызначаным курсе польскіх і заходнееўрапейскіх манет быў завершаны ў 1847 г.

Такім чынам, толькі ў сярэдзіне XIX ст. беларускія землі былі канчаткова ўключаны ў агульнарасійскі рынак.



Расійская імперыя.
Плацінавыя 3, 6, 12 рублёў. 1828, 1831, 1831 гг.
12 рублёў – Ø 36 мм, 6 рублёў – Ø 28 мм, 3 рублі – Ø 23 мм

У адпаведнасці з урадавымі ўказамі 1828, 1829, 1830 гг. у абарачэнне былі ўведзены плацінавыя рублі – 3, 6, 12, якія адпавядалі па дыяметры срэбным манетам у 25 капеек, 50 капеек і рубель. З'яўленне плацінавых манет тлумачыцца тым, што на Урале было адкрыта радовішча гэтага металу. На той час плаціна не магла яшчэ па тэхнічных параметрах (напрыклад, высокая тэмпература плаўлення) атрымаць іншага, акрамя манетнай вытворчасці, рацыянальнага выкарыстання. Па каштоўнасці плаціна займала тады месца паміж срэбрам і золатам.

Уключэнне ў дзесяцярычную грашовую сістэму дванаццацікратнага прынцыпу вызначэння наміналаў, масы і памераў новых плацінавых манет звязана з тагачаснымі каштоўнаснымі суадносінамі плаціны і срэбра.

Плацінавая чаканка была спынена толькі ў 1845 г.

* * *

З 1768 г. па 1868 г. на Санкт-Пецярбургскім манетным двары адбывалася таемная чаканка залатой манеты, імітуючай па ўсіх параметрах галандскі дукат (чырвонец) [66, с. 282–297].

У афіцыйных дакументах яна праходзіла пад назвай «вядомая манета». У народзе ў дачыненні да гэтай манеты скламіся тры назвы: «пучковы» (у сувязі з выявай ваяра з пучком стрэл), «лабанчык» (вайскоўцам у Расіі галілі галаву – «забрывалі лоб»), «арапчык» (нязвыклы выгляд рыцара рабіў яго відавочным чужынцам – «арапам»).

Гэтыя манеты ў асноўным выкарыстоўваліся для забеспячэння выдаткаў дыпламатычных службаў, ваенных патрэб за мяжой, разнастайных выплат у Польшчы, Закаўказзі, Сярэдняй Азіі. «Вядомая» манета, зразумела, трапіла і ва ўнутранае абарачэнне.

Цікава, што аверсная легенда галандскіх дукатаў утрымлівала выказванне «CONCORDIA RES PARVAE CRESCUNT» / «Згода робіць малое вялікім» (частка афарызма старажытнарымскага гісторыка Гая Салюсція Крыспа «Concordia res parvae crescunt, discordia maximae dilabuntur» / «Згода робіцца малымі справамі, пры спрэчках і найвялікшае разбураецца»).




«Галандскі» дукат
расійскай чаканкі. 1849 г. Ø 21,8 мм

Пачатак выпуску падробак пад галандскія дукаты звязаны з беспрэцэдэнтным рашэннем Кацярыны II (1762–1796) правесці менш затратнае для казны фінансаванне Першай Архіпелагскай экспедыцыі ваенна-марскіх расійскіх эскадраў (1769–1774) у Міжземнае мора імітацыяй агульнапрынятай у Еўропе залатой манетай. Экспедыцыя праводзілася падчас руска-турэцкай вайны 1768–1774 гг.

Задуманая як разавая акцыя гэтая незаконная аперацыя па выпуску аналагаў галандскіх дукатаў паступова набывала ўсё большы размах. Развіццё дыпламатычных, знешнегандлёвых стасункаў, ваенныя дзеянні патрабавалі ад Расіі выкарыстання значных аб'ёмаў звыклай для еўрапейскага асяроддзя залатой манеты – галандскага дуката. Абменныя аперацыі малавядомай на міжнародным рынку рускай залатой манеты на галандскае золата прыносілі б расійскай казне непажадальныя страты. У выніку ў еўрапейскім грашовым абарачэнні з'явілася відавочна вялікая колькасць несапраўдных «галандскіх» дукатаў.

У 1849 г. Галандыя, якая не мела прамых доказаў гэтай грашовай авантуры, каб супрацьстаяць незаконным дзеянням Расіі, вырашыла ўвогуле спыніць чаканку сваіх дукатаў. Але Пецярбургскі манетны двор адказаў на гэтае дзеянне працягам выпуску «вядомай» манеты з апошняй законнай датай – 1849 г. (!).

Эмітаванне «вядомай» манеты завяршылася толькі ў другой палове XIX ст.

* * *

У 1815 г. на тэрыторыі Польшчы па рашэнні Венскага кангрэса ствараецца Каралеўства Польскае, якое фактычна знаходзілася пад патранатам Расійскай імперыі. З 1816 г. для польскага насельніцтва Варшаўскім

манетным дваром была выпушчана вялікая серыя манет, якая ўвайшла і ў манетны фонд беларускага рынку [68, с. 423–432; 69, с. 106–115]. Гэта былі медныя – 1, 3 гроша; білонныя – 5, 10 грошаў; срэбныя – 1, 2, 5, 10 злотых; залатыя – 25, 50 злотых. Легенды на манетах пісаліся на польскай мове.

На польскіх медных і білонных манетах змяшчаўся дзяржаўны герб Расійскай імперыі – двухгаловы арол з нагрудным шчытком, на якім была памешчана выява польскага арла. Срэбныя і залатыя манеты мелі партрэтную выяву Аляксандра I (1801–1825), якая захоўвалася і на адпаведных манетах часоў Мікалая I (1825–1855).




3 грошa часоў Польскага паўстання 1830–1831 гг. 1831 г. Ø 25 мм




2 злотых часоў Польскага паўстання 1830–1831 гг. 1831 г. Ø 26 мм

У 1831–1832 гг. на рынках Беларусі з’явіліся манеты Польскага нацыянальна-вызваленчага паўстання 1830–1831 гг. Серыя гэтых манет уключала медныя (3 гроша), білонныя (10 грошаў), срэбныя (2 і 5 злотых) і залатыя (праўдзівае імітаванне галандскага дуката) манеты. Яны мелі вельмі значнае адрозненне ад папярэдніх эмісій Варшаўскага манетнага двара. На іх аверсах (акрамя дуката) у якасці сімвала паўстання была размешчана выява герба Рэчы Паспалітай.

Дукаты мелі выяву маленькага польскага арла (над левым плячом рыцара), уключанага ў колавую легенду аверса, што праўдзіва ўказвала на месца іх чаканкі.

Акрамя манет, паўстанцы выпусцілі і папяровыя грошы – банкноты вартасцю ў 1 злоты.

Пасля задушэння паўстання ўзгаданыя грашовыя сродкі (акрамя дуката, у сувязі з адсутнасцю на ім герба Рэчы Паспалітай) былі выціснуты з абарачэння. З мэтай больш хуткага выдалення манет паўстання іх прымалі ў складзе падатковых плацяжоў і казённых збораў.

Манеты паўстання 1830–1831 гг. – рэдкія знаходкі на тэрыторыі Беларусі. Адзінкавыя іх адкрыцці зафіксаваны: г. п. Жалудок Гродзенскай вобласці (1908); г. Хойнікі Гомельскай вобласці (1965); п. Бярэзіна Бабруйскага раёна Магілёўскай вобласці (1979); г. п. Свіслач (1959); г. Брэст (2010).

У 1965 г. у Хойніках пры зносе ўзгорка быў адкрыты склеп сям'і роду Прозараў, дзе знайшлі дзве паўстанцкія манеты – 2 злотых і дукат.

У 1971 г. у г. Рагачове Гомельскай вобласці быў адкрыты ўнікальны скарб фальшывых манет, з якога вядома 485 медных манет з рэшткамі пасерабрэння – вельмі грубыя падробкі пад $^{1}/_{12}$ талера Прусіі, 10 грошаў Каралеўства Польскага (у складзе Расійскай імперыі), 10 грошаў часоў Польскага паўстання 1830–1831 гг. (большасць фальсіфікатаў).

Верагодны час захавання скарбу – непасрэдна пасля падаўлення паўстання. Месца захавання дэпазіту – Нумізматычны кабінет музея гістарычнага факультэта БДУ (483 манеты).

Манеты скарбу ў значнай колькасці разышліся па руках. Цікава, што дзве манеты з гэтага дэпазіту апынуліся далёка за межамі краіны – адна ў зборах Уладзіміра-Суздальскага музея-запаведніка (г. Уладзімір, Расія), другая – у прыватнай калекцыі (г. Адэса, Украіна) [28; 63, с. 18].

У першай палове XIX ст. Варшаўскі (з 1834 па 1850) і Пецярбургскі (з 1832 па 1841) манетныя двары здзейснілі выпуск серыі так званых двухмоўных расійска-польскіх манет.

Знешняе афармленне гэтых манет – сведчанне праяўлення аднаго з кірункаў рэпрэсіўнай хвалі, якая разгарнулася пасля задушэння Польскага паўстання 1830–1831 гг.

На манетах замест папярэдняга варыянта герба, які сумяшчаў геральдычныя сімвалы Польшчы і Расіі, з'явіўся дзяржаўны герб Расійскай імперыі. Польская мова ў манетнай легендзе захоўвалася толькі ў паўторным вызначэнні наміналу.




Каралеўства Польскае (у складзе Расійскай імперыі). 30 капеек 2 злотых. 1837 г. Ø 26 мм

На Варшаўскім манетным двары чаканіліся ў срэбры: 15 капеек / 1 злоты, 20 капеек / 40 грошаў, 25 капеек / 50 грошаў, 30 капеек / 2 злотых, ¾ рубля / 5 злотых, 1 ½ рубля / 10 злотых, а таксама пробныя 5 капеек / 10 грошаў і 10 капеек / 20 грошаў; у золаце: 3 рублі / 20 злотых. Падобныя суадносіны вызначаліся курсам 1 капейкі ў 2 грошы. Завяршэнне чаканкі «расійска-польскіх» манет адбылося ў 1850 г.

У 1850 г. замест лацінскага знака Варшаўскага манетнага двара («MW») быў уведзены яго кірылічны аналаг («ВМ»).

Варшаўскі манетны двор з 1842 г. да 1864 г. (з перапынкамі) чаканіў агульнарасійскую манету, а 1 студзеня 1868 г. ён быў афіцыйна закрыты [54, с. 670].

* * *

З 1769 г. у Расіі з'яўляюцца папяровыя грошы – *асігнацыі* (лац. assignatio – прызначэнне, фр. assignation – плацежнае распараджэнне) наміналам у 25, 50, 75, 100 (пазней – 5, 10) рублёў.

Увядзенне ў абарачэнне папяровых грашовых сродкаў плацяжу вырашала праблемы нястачы ў казне срэбра, а таксама нязручнасці карыстання вялікімі аб'ёмамі меднай і срэбнай манеты пры правядзенні значных плацяжоў. Асігнацыі мелі права на размен меднай манетай у спецыяльных асігнацыйных банках Пецярбурга і Масквы.

Галоўная ўмова захавання пакупнай здольнасці банкнот – гэта, на той час, адпаведнасць іх масы колькасці паўнавартасных грошай, неабходных для функцыянавання рынку. Парушэнне гэтых прапорцый прыводзіла да разгортвання інфляцыйных працэсаў.

У далейшым, у сувязі з непамерным колькасным павелічэннем эмісій папяровых грошай, адбывалася паступовае падзенне курсу папяровага рубля (у 1786 г. ён адпавядаў 98 капейкам срэбрам, а ў канцы XVIII ст. курс асігнацыйнага рубля ў срэбры панізіўся да 68 капеек). У выніку ў краіне склаліся дзве *грашовыя сістэмы* – асігнацыйная і срэбная.

Нягледзячы на выкарыстанне некаторых сродкаў аховы асігнацый ад падробкі (вадзяныя знакі, подпісы адказных асоб і інш.), ужо напачатку 1770-х гг. з'яўляюцца іх першыя падробкі. У далейшым фальсіфікацыя асігнацый набывае значныя маштабы.

Найбольш відавочна працэс зніжэння пакупнай здольнасці нацыянальнай валюты на расійскім таварным рынку разгарнуўся падчас франка-рускай вайны 1812 г., калі грашовы фонд краіны папоўніўся значнай колькасцю фальсіфікатаў расійскіх асігнацый французскай вытворчасці. Яны адрозніваліся ад сапраўдных пэўнымі дэталямі, але па некаторых пазіцыях падробкі нават пераўзыходзілі свае аналагі. Пасля сканчэння ваенных дзеянняў, каб не выклікаць абурэння насельніцтва, на працягу больш за дзесяць гадоў урад вымушаны быў праводзіць парытэтны абмен фальсіфікатаў на сапраўдныя асігнацыі.

Грашовая рэформа 1839–1843 гг., названая імем міністра фінансаў Расіі Я. Ф. Канкрына, прадугледжвала комплекс мерапрыемстваў па рэарганізацыі фінансаў.

1 ліпеня 1839 г. апублікаваны маніфест аб будучай рэформе і абвешчана аб увядзенні срэбнага монаметалізму. *Монаметалізм* – гэта грашовая сістэма, пры якой адзін з высакародных металаў становіцца ўсеагульным эквівалентам і асновай грашовага абарачэння. Срэбны монаметалізм існаваў у Расіі з 1843 г. па 1852 г.

У ходзе рэформы ролю ўсеагульнага эквіваленту стаў адыгрываць разліковы срэбны рубель. Разліковы рубель нельга блытаць з рэальным, які сістэматычна чаканіўся з 1704 г. Усе фінансавыя здзелкі павінны былі быць разлічаны ў адпаведнасці з курсам разліковага срэбнага рубля.

У гэты ж час у абарачэнні з’явіліся білеты Дэпазітнай касы наміналам у 3, 5, 10, 25, 50 і 100 рублёў, якія былі абвешчаны законным плацежным сродкам нараўне са срэбнай манетай.

У 1841 г. быў абвешчаны маніфест «Аб выпуску ў народнае абарачэнне крэдытных білетаў…» наміналам у 50 рублёў.

Такім чынам, у грашовым абарачэнні знаходзіліся тры віды папяровых грошай: асігнацыі, дэпазітныя і крэдытныя білеты. Найбольш устойлівымі сярод іх аказаліся менавіта крэдытныя білеты.

На завяршальным этапе рэформы ўрад прымае рашэнне аб ўвядзенні ў абарачэнне дзяржаўных крэдытных білетаў новага ўзору вартасцю ў 5, 10, 25, 50 і 100 рублёў. У 1843 г. пачаўся абмен папярэдніх відаў папяровых грошай на новыя крэдытныя білеты.

Першапачаткова крэдытны рубель быў роўны срэбнаму. Абмен асігнацый на крэдытныя білеты для зручнасці разлікаў адбываўся ў суадносінах 1 рубель у крэдытных білетах на 3,5 рубля асігнацыямі. У далейшым гэты курс у сувязі з павелічэннем аб’ёмаў выпуску крэдытных білетаў страціў сваю стабільнасць. Афіцыйнае абвяшчэнне аб спыненні абароту асігнацый адбылося ў 1849 г.

Размен крэдытных білетаў праводзіўся на срэбра і золата. З 1839 г. па 1848 г. для забеспячэння ўстойлівасці папяровага рубля была адчаканена серыя больш масіўных (пры змене манетнай стапы з 36 да 16 рублёў з пуда медзі) медных манет – ¼, ½, 1, 2, 3 капеек. Іх намінал указваўся ў срэбным эквіваленце (напрыклад, ¼ капейкі срэбрам). З увядзеннем у 1849 г. для медных эмісій 32-рублёвай стапы выпуск гэтых разменных манет спыніўся.

Дзякуючы радыкальным пераўтварэнням у ходзе грашовай рэформы, урад паспяхова вырашыў складаныя праблемы ўмацавання фінансаў і атрымання пэўнага прыбытку за кошт папярова-грашовых эмісій. У краіне была ўсталявана стабільная фінансавая сістэма. Ролю ўсеагульнага грашовага эквіваленту стаў адыгрываць разліковы срэбны рубель.

Трэба адзначыць таксама, што рэформа мела і некаторыя рысы біметалізму (напрыклад, існаванне свабоды чаканкі не толькі срэбнай, але і залатой манеты; размен крэдытных білетаў на срэбра і золата; захады ўрада на ўсталяванне стабільных суадносін паміж разліковымі срэбным і залатым рублямі).

Станоўчыя дасягненні рэформы былі скасаваны рэаліямі далейшых падзей, у першую чаргу Крымскай вайны (1853–1856), якая стала прычынай значнага павелічэння эмісіі крэдытных білетаў. Акрамя гэтага, неабходна ўлічваць, што Расія на той час была краінай, дзе адзначаўся невысокі ўзровень развіцця прамысловасці і тавара-грашовага абарачэння.

У сувязі з абставінамі, што склаліся на працягу 1850-х гг., быў спынены свабодны размен крэдытных білетаў на золата і срэбра, пачаліся ваганні курсу рубля і ў выніку фінансавая стабільнасць краіны была парушана.

* * *

XIX ст. адзначана выпускам шэрагу памятных манет. Сярод іх можна ўзгадаць адчаканены ў 1834 г. памятны рубель з выявай Аляксандраўскай калоны (Санкт-Пецярбург); паўтарарубель з профільным партрэтам Мікалая I, руска-польскім вызначэннем наміналу (1 ½ РУБЛЯ / 10 ZŁOT) на аверсе і профільнымі партрэтамі яго жонкі Аляксандры Фёдараўны і дзяцей на рэверсе (1839); рубель і паўтарарубель з выявай помніка-каплічкі на Барадзінскім полі (1839), а таксама мемарыяльныя рублі на каранаванне Аляксандра III (1881–1894; 1883), Мікалая II (1894–1917; 1896), да 100-годдзя франка-рускай вайны (1912); да 300-годдзя ўладарання дома Раманавых (1913) і інш.

* * *

*На другім этапе (1860-я гг. – кастрычнік / лістапад 1917 г.)* беларускія землі былі цалкам уключаны ў склад агульнарасійскага рынку. З 1876 г. фактычна адзіным цэнтрам манетнай вытворчасці становіцца Пецярбургскі манетны двор. Акрамя яго працаваў таксама і Гельсінгфорскі манетны двор, які выпускаў манеты для Вялікага Княства Фінляндскага.

Недастатковасць вытворчых магчымасцей Пецярбургскага манетнага двара прымусіла размяшчаць асобныя заказы на чаканку расійскіх медных, білонных і срэбных манет за мяжой – на манетных дварах Вялікабрытаніі (г. Бірмінгем), Бельгіі (г. Брусель), Францыі (г. Парыж, г. Страсбург), Японіі (г. Осака).

У гэты час завяршылася і гісторыя чаканкі «вядомай» манеты. У 1868 г. (праз 100 гадоў ад пачатку эмісіі!) Галандыя дасылае ноту пратэсту па пытанні чаканкі ў Расіі падробак пад галандскія дукаты. Расійскі бок вымушаны быў прызнаць выпуск такой манеты і спыніць яе чаканку.

Паступовае вывядзенне з абарачэння недэманетызаванай «вядомай» манеты адбывалася амаль да канца XIX ст., яна паступала на манетны двор на пераплаўку.

* * *

У 1895–1898 гг. у Расіі адбылася чарговая грашовая рэформа, традыцыйна названая імем міністра фінансаў Расіі С. Ю. Вітэ. Рэформа была выклікана значнымі фінансавымі праблемамі ў краіне.

У ходзе рэформы ў краіне быў уведзены залаты м о н а м е т а л і з м. Асновай фінансавых аперацый стаў разліковы залаты рубель, у якім утрыманне хімічна чыстага золата было зменшана на $^1/_3$, а дакладней, з 1,161 г да 0,774 г.

У выніку гэтага залатыя імперыялы і паўімперыялы для захавання ўсталяванай раней стандартнай масы сталі роўнымі адпаведна 15 і 7,5 рубля (выпускаліся толькі ў 1897 г.).

З 1897 г. па 1911 г. па новых стандартах была праведзена эмісія серыі залатых манет у 10 рублёў (хімічна чыстага золата – 0,774 х 10 = 7,74 г) і 5 рублёў (хімічна чыстага золата – 0,774 х 5 = 3,87 г).

Рэформа аказала стабілізуючы ўплыў на дзяржаўныя фінансы, умацавала курс рубля, садзейнічала прыцягненню ў эканоміку краіны айчынных і замежных капіталаў. Але, як і ў выпадку з папярэдняй рэформай, падзеі далейшай палітычнай і ваеннай гісторыі Расіі скасавалі станоўчыя вынікі праведзеных пераўтварэнняў. З пачаткам Першай сусветнай вайны ў 1914 г. абмен папяровых банкнот на золата быў спынены.

* * *

Фальшываманецтва як сацыяльна-эканамічны феномен з'яўляецца непазбежнай складовай часткай грашовай гаспадаркі любой дзяржавы. Манетны фонд Беларусі канца XVIII – першай паловы XIX ст. уяўляў сабой традыцыйны набор манет Рэчы Паспалітай, заходнееўрапейскіх краін, расійскіх наміналаў. Насычанасць манетнай сістэмы разнастайнымі грашовымі сродкамі садзейнічала актывізацыі дзейнасці фальшываманетчыкаў.

У сувязі з адпаведнымі зменамі ў складзе грашовага фонду ў першыя дзесяцігоддзі XIX ст. перад фальсіфікатарамі паўстала задача па пераарыентаванні іх дзейнасці на расійскія манеты і папяровыя грошы.

У Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў фондах губернскіх канцэлярый, судовых устаноў захавалася значная колькасць спраў з інфармацыяй аб абарачэнні фальшывых папяровых грашовых адзінак і манет, сярод якіх былі нават імперыялы і «вядомая» манета (рэплікі галандскіх дукатаў).

Статыстычны аналіз даследаваных дакументаў сведчыць, што падробка асігнацый і крэдытных білетаў была больш папулярна, чым выраблення фальшывых манет. У шэрагу беларускіх гарадоў існавалі нават «фабрыкі» па выпуску фальсіфікатаў папяровых грошай.

Падробныя асігнацыі і крэдытныя білеты вырабляліся літаграфічным спосабам з выкарыстаннем матрыц, выразаных на металічных дошках. Падробкі мелі памылкі ў тэксце і скажэнні выяў, але, як правіла, людзі не звярталі асаблівай увагі на дробны тэкст і дакладнасць малюнкаў на банкнотах.

Беларускія фальсіфікатары актыўна супрацоўнічалі з нелегальнымі замежнымі цэнтрамі па выпуску фальшывых расійскіх папяровых грашовых знакаў у Францыі, Англіі і Германіі. Дакументы сведчаць, што за мяжой, у большасці выпадкаў, фальсіфікаваліся буйныя папяровыя наміналы 50-рублёвай вартасці, што тлумачыцца высокай рызыкай пры транспарціроўцы фальшывак праз граніцу.

На тэрыторыю Расійскай імперыі праз беларускія землі, напрыклад, з Лондану ўвозіліся не толькі фальсіфікаты, але і папера для выпуску на месцы 5-, 10- і 25-рублёвых падробак.

Як сведчаць дакументы, сярод фальшываманетчыкаў былі прадстаўнікі розных сацыяльных груп і веравызнанняў. У судовых справах прыводзіцца апісанне следчых мерапрыемстваў па пошуку фальшываманетчыкаў, а часам і выраблення фальшывых грашовых знакаў, узгадваюцца факты знаходжання манетных нарыхтовак і прылад, неабходных для работы фальсіфікатараў. У некаторых выпадках можна было нават падлічыць прыбыткі, што атрымліваліся ад рэалізацыі падробных купюр.

У дакументах адзначана і прафілактычная работа ўлад па папярэджанні падобнага роду злачынстваў і неаднаразовыя спробы арганізаваць у межах некалькіх губерняў сумесныя акцыі па барацьбе з фальшываманецтвам.

У матэрыялах адпаведных судовых спраў адзначаецца цесная сувязь дзейнасці фальсіфікатараў з самымі рознымі бакамі штодзённага жыцця вясковага і гарадскога насельніцтва, што з'яўляецца дадатковай крыніцай па вывучэнні побытавай гісторыі Беларусі XIX ст.

* * *

Войны пачатку XX ст. прывялі Расію да дэстабілізацыі эканомікі. Гэты перыяд характарызуецца актыўным развіццём крызісных з'яў – узраслі знешнія пазыкі, банкі спынілі абмен папяровых грошай на золата, з абарачэння паступова зніклі не толькі залатыя і срэбныя, але і білонныя і медныя манеты.

З пачаткам Першай сусветнай вайны пачаўся працэс завяршэння манетных эмісій.

– 1914 г. – спыняецца выпуск срэбных 50 капеек;

– 1915 г. – завяршаецца эмісія білонных 5 капеек. Выпушчаны ў гэтым годзе срэбны рубель у абарачэнне не паступіў, бо насіў данатыўна-мемарыяльны характар і быў выкарыстаны як памятны падарунак для двух воінскіх падраздзяленняў, што адзначалі свой 100-гадовы юбілей;

– 1916 г. – спынілася чаканка медных $^1/_4$, $^1/_2$, 1, 2, 3, 5 капеек;

– 1917 г. – у абарачэнне ўведзены апошнія эмісіі білонных 10, 15, 20 капеек, якія чаканіліся ў 1916 г. з датай «1917».

Са спыненнем чаканкі манет рынкі страцілі не толькі паўнавартасныя, але і неабходныя дробныя грашовыя сродкі. Для частковага вырашэння ўзнікшай праблемы ўрад пускае ў абарачэнне папяровыя грашовыя сурагаты. Так, у 1915 г. у сувязі з недахопам разменнай манеты яе месца займаюць маркі-грошы, надрукаваныя на паўкардоннай паперы клішэ юбілейнай серыі паштовых марак з нагоды 300-годдзя дома Раманавых.

Гэтыя *маркі-грошы* на аверсе мелі партрэтную выяву расійскіх імператараў (1 капейка – Пётр I; 2 капейкі – Аляксандр II; 3 капейкі – Аляксандр III; 10 капеек – Мікалай II; 15 капеек – Мікалай I; 20 капеек – Аляксандр I).

На іх рэверсе знаходзілася выява двухгаловага арла і легенда «Имеет хождение наравне с медной монетой» (маркі наміналам у 1, 2, 3 капейкі) ці «Имеет хождение наравне с разменной серебряной монетой» (маркі наміналам у 10, 15, 20 капеек). Акрамя гэтага, на аверсах марак у 1 і 2 капейкі для больш працяглага захоўвання вызначэння наміналу былі зроблены надпячаткі, якія дубліравалі намінал у выглядзе вялікіх лічбаў «1» і «2».

Варта адзначыць, што вяліся і ўзрастаючыя эмісіі казначэйскіх разменных знакаў (1, 2, 3, 5, 50 капеек) і дзяржаўных крэдытных білетаў (1, 3, 5, 10, 25, 50, 100, 500 рублёў).

Першая сусветная вайна прынесла на акупіраваную тэрыторыю Беларусі прадукцыю манетных двароў Германіі і Аўстра-Венгрыі. Пфенігі, маркі, акупацыйныя «острублі» і манетавідныя боны (наміналамі ў 1, 2, 3 капейкі) занялі пэўнае месца ў грашовым абарачэнні рэгіёна.




Германія. Манетавідныя боны. 1, 2, 3 капейкі. 1916 г.
3 капейкі – Ø 28 мм, 2 капейкі – Ø 24 мм, 1 капейка – Ø 21,5 мм

На аверсе металічных бонаў размяшчалася нямецкамоўная легенда «Ведамства Вярхоўнага галоўнакамандуючага Усходу» і знак манетнага двара «А» (Берлінскі) ці «J» (Гамбургскі).

На рэверсе на фоне крыжа знаходзілася рускамоўнае вызначэнне наміналу і дата «1916».

Акупацыйныя германскія ўлады спрабавалі ўсталяваць на тэрыторыі Беларусі грашовую сістэму па германскім узоры. Напрыклад, быў вызначаны адпаведны курс паміж царскім рублём, пфенігам і капейкай, які карэкціраваўся на працягу акупацыйнага перыяду [37]. Аналагічныя праблемы ўзнікалі і падчас польскай акупацыі беларускіх зямель у 1919–1920 гг. [38].

Яскравым адлюстраваннем агульнага стану грашовага фонду Беларусі ў перыяд Першай сусветнай і грамадзянскай войнаў з'яўляецца склад грашова-рэчавага скарбу, знойдзенага ў першай палове 1970-х гг. у в. Чарневічы Баранавіцкага раёна Брэсцкай вобласці.

Утварэнню Чарневіцкага скарбу спрыяла ваенная сітуацыя, што склалася ў гэтым рэгіёне, які з сярэдзіны 1915 г. быў заняты германскай арміяй.

Дэпазіт быў захаваны ў алтарнай частцы разбуранай царквы. Складаўся скарб з 1877 манет (Расійская імперыя, Рэч Паспалітая, Аўстра-Венгрыя, Германія, акупацыйныя боны), трох марак-грошай, памінальнай запіскі і фрагмента паштовай карткі. Склад скарбу дае магчымасць меркаваць, што гэта так званы кубкавы збор ахвяраванняў на царкву. Малодшая з манет адбіта ў 1918 г., што дастаткова дакладна ўказвае на ўзрост знаходкі і тлумачыць абставіны ўтварэння скарбу з такіх разнастайных па складзе грашовых знакаў [34].

* * *

Часовы ўрад, які прыйшоў да ўлады ў выніку Лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі 1917 г., працягнуў актыўны выпуск інфляцыйных папяровых грошай, а таксама марак-грошай наміналам у 1, 2, 3 капейкі. У адрозненне ад царскіх эмісій, на адваротным баку марак-грошай замест выявы двухгаловага арла друкаваўся паўтор наміналу.

У сакавіку 1917 г. з'явіліся аблігацыі «Заём свабоды» наміналам у 20, 40, 50, 100 рублёў. Калі іх рэалізацыя сярод насельніцтва не ўдалася, каштоўныя паперы пусцілі ў грашовае абарачэнне як грашовыя адзінкі.

Летам – восенню 1917 г. былі выпушчаны крэдытныя білеты наміналам у 250 і 1000 рублёў, якія неафіцыйна называліся «думскімі білетамі», таму што на купюрах у 1000 рублёў была выява Таўрычаскага палаца, у якім адбываліся пасяджэнні Дзяржаўнай думы. Увосень таго ж года ў абарачэнне трапілі казначэйскія знакі ў 20 і 40 рублёў, названыя «керанкамі» (па прозвішчы старшыні Часовага ўрада А. Ф. Керанскага). У кастрычніку 1917 г. рэальная вартасць рубля ўпала да 6–7 капеек.

Менавіта ў гэты час з'яўляюцца своеасаблівыя грашовыя тэрміны – *«кусок»* (тысяча рублёў), *«лімон»* (мільён рублёў), *«ліманард»* (мільярд рублёў).

У рыначным абарачэнні пры практычна поўнай адсутнасці манетнага фонду знаходзілася значная колькасць папяровых грошай і шырока распаўсюджаных грашовых сурагатаў мясцовага паходжання (боны, квіткі, таварныя ордэры і інш.). Напрыклад, боны Харчовага камітэта Палескай чыгункі, боны Гомельскага гарадскога самакіравання, таварныя квіткі Бабруйскай сіяніскай установы, кароткатэрміновыя боны Слуцкага павятовага земства, разменныя білеты Магілёўскай губерні і мноства іншых.

Грашовы фонд Беларусі гэтага перыяду, маючы сваю спецыфіку, з’яўляўся складовай часткай агульнарасійскай грашовай гаспадаркі і адпавядаў асноўным тэндэнцыям яе развіцця.

!!

*Уваходжанне беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі прывяло ў сярэдзіне XIX ст. да поўнага іх уключэння ў склад агульнарасійскага рынку. Далейшае развіццё гісторыі грашовага абарачэння на тэрыторыі Беларусі адбывалася ўжо ў рэчышчы расійскай грашовай сістэмы.*

*Значнай падзеяй стала правядзенне рэформ Я. Ф. Канкрына (1839–1843) і С. Ю. Вітэ (1895–1898). На беларускіх землях, акрамя рэгулярных манетных і папяровых грашовых эмісій, знайшлі распаўсюджанне расійскія плацінавыя і «вядомыя» манеты, прадукцыя Варшаўскага манетнага двара, а таксама ў адпаведны час і папяровыя грошы Часовага ўрада.*

## Заданні і пытанні для самакантролю

1. Вызначыць спецыфіку грашовага абарачэння на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст.
2. Пералічыць асноўныя вынікі расійскіх грашовых рэформ XIX ст.
3. Даць вызначэнне паняцця «монаметалізм».
4. Што такое «вядомая» манета? Якія яе мясцовыя назвы?
5. Даць характарыстыку эмісіям Варшаўскага манетнага двара перыяду Польскага паўстання 1830–1831 гг.
6. Даць характарыстыку «расійска-польскім» манетным эмісіям.
7. Вызначыць склад грашовага фонду на беларускіх землях у часы Першай сусветнай вайны.

## Тэма 2.7. Грашовае абарачэнне ў савецкі перыяд (кастрычнік / лістапад 1917 – снежань 1991 г.)

Знешнепалітычныя падзеі і ўнутраная сітуацыя ў Савецкай краіне (грамадзянская вайна, палітыка «ваеннага камунізму») прывялі да гіперінфляцыі. У насельніцтва знаходзілася велізарная колькасць разнастайных відаў папяровых грашовых знакаў царскай Расіі, Часовага ўрада, а таксама і маса грашовых сурагатаў мясцовага паходжання. Выкарыстанне «іншародных» у дачыненні да Савецкай краіны грашовых адзінак прыводзіла да эканамічнай дэстабілізацыі [4]. Насельніцтва імкнулася як мага хутчэй перавесці грошы ў матэрыяльныя каштоўнасці. У краіне была ўведзена карткавая сістэма, якая абмяжоўвала выкананне грашыма адной з асноўных функцый – быць мерай вартасці.

У 1918 г. быў утвораны Народны банк РСФСР (з 1921 – Дзяржаўны банк РСФСР, з 1923 – Дзяржаўны банк СССР).

Манетнымі штэмпелямі (верагодна, для срэбных і білонных манет выкарыстоўваліся штэмпелі 1914 г., для медных – 1916 г.) царскай Расіі ў 1918 г. была адчаканена пэўная партыя манет наміналам ад ¼ капейкі да рубля [54, с. 300–301].

Крызісныя з'явы ў эканоміцы краіны: катастрафічная фінансавая сітуацыя, адсутнасць уласнай грашовай сістэмы – патрабавалі кардынальных пераўтварэнняў.

На працягу 1919 – пачатку 1924 г. адбыўся выпуск так званых *саўзнакаў* («савецкіх знакаў»). Гэтая група грашовых адзінак аб'ядноўвала ўсе папяровыя грашовыя эмісіі Савецкай краіны азначанага перыяду (выключэнне «саўзнакаў» з абарачэння завяршылася ў канцы 1924 г.). «Саўзнакі» ўяўлялі сабой стракаты, як па знешнім выглядзе, так і па намінальным вызначэнні, набор банкнот.

Напрыклад, можна разгледзець папяровыя эмісіі 1919 г. У сакавіку былі выпушчаны першыя савецкія папяровыя грошы – недатаваныя разліковыя знакі РСФСР – наміналам у 1, 2, 3 рублі, памерам – 34 х 43 мм, якія друкаваліся па 25 штук на аркушы і разразаліся ў неабходнай колькасці пры разліках.

У маі быў наладжаны выпуск крэдытных білетаў наміналам у 1, 3, 5, 10, 25, 50, 100, 250, 500, 1 тысячу рублёў і датай «1918». Яны друкаваліся клішэ, якія былі падрыхтаваныя яшчэ Часовым урадам. Купюры мелі выяву так званага дэмакратычнага варыянта двухгаловага арла без скіпетра, дзяржавы і карон.

У кастрычніку з'явіўся другі выпуск разліковых знакаў РСФСР наміналам у 15, 30, 60 рублёў. Банкноты гэтага выпуску ў адрозненне ад першай эмісіі разліковых знакаў мелі такія неабходныя атрыбуты папяровых грошай, як серыя і нумар (праўда, адзін і той жа для кожнага наміналу), подпісы адказных асоб, а таксама тэкст «Обеспечиваются всем достоянием республики».

У снежні выпушчаны крэдытныя білеты наміналам у 5, 10 тысяч рублёў з датай «1918» (таксама друкаваліся з клішэ, падрыхтаваным Часовым урадам). Банкноты з'яўляліся працягам выпуску вышэйзгаданых крэдытных білетаў і мелі аналагічнае афармленне.

Напачатку 1920-х гг. у сувязі з катастрафічным падзеннем вартасці «саўзнака» былі праведзены дзве дэнамінацыі. *Дэнамінацыя* (лац. denominatio – перайменаванне) – гэта памяншэнне ў 10, 100, 1000 і г. д. разоў намінальнага вызначэння новых грашовых знакаў, ці адпаведнае ўзбуйненне новых грашовых адзінак.

* * *

У 1922–1924 гг. у СССР была праведзена першая грашовая рэформа, распрацаваная пад кіраўніцтвам пятага наркома фінансаў РСФСР Р. Я. Сакольнікава (сапраўднае імя Г. Я. Брыліянт (1888–1939); рэпрэсаваны).

Асноўныя напрамкі будучых пераўтварэнняў былі абвешчаны ў лістападзе 1921 г. У пачатку 1922 г. у абарачэнне ўведзены папяровыя грошы новага ўзору пад назвай *«Государственные денежные знаки РСФСР»* наміналамі ў 50 капеек, 1, 3, 5, 10, 25, 50, 100, 240, 500, 1000 рублёў (пазней з'явіліся 5- і 10-тысячныя купюры).

Паралельна праводзілася і першая дэнамінацыя, у адпаведнасці з якой новы рубель быў роўны 10 тысячам рублёў «саўзнакамі», што заставаліся ў абарачэнні на працягу ўсёй рэформы.

У кастрычніку 1922 г. было прынята рашэнне аб правядзенні другой дэнамінацыі, у межах якой 1 рубель новымі грашовымі знакамі ўзору 1923 г. быў роўны 100 рублям узору 1922 г., ці 1 мільёну рублёў грашовымі знакамі папярэдніх (да 1922) выпускаў [3; 54, с. 308–311].

Праведзеныя дэнамінацыі павінны былі спрыяць стабілізацыі савецкага рубля, але не змаглі ўмацаваць пазіцыі «саўзнака». Напачатку 1924 г. адбыўся апошні выпуск купюры ў 25 тысяч рублёў узору 1923 г. У канцы 1924 г. абмен «саўзнакаў» на новыя грашовыя адзінкі быў завершаны.

У 1922 г. прымаецца ўрадавае рашэнне аб аднаўленні залатога забеспячэння грошай. Для стабілізацыі грашовага абарачэння праводзіцца эмісія білетаў Дзяржаўнага банка РСФСР, парытэтных залатому 10-рублёвіку царскай Расіі, – *чырвонцаў*. Гэтая назва была абрана пасля адпаведнага абмеркавання як найбольш падыходзячая для новай савецкай грашовай адзінкі, што мела залатое забеспячэнне.

Чырвонцы ўяўлялі сабой аднабаковыя з вадзянымі знакамі банкноты, легенда якіх была напісана пісьмовым варыянтам шрыфту. Такім чынам, першыя савецкія чырвонцы былі папяровымі.

На 1 разліковы залаты рубель з канца XIX ст. прыходзілася 0,774234 г хімічна чыстага золата, адсюль 1 чырвонец (10 залатых рублёў) адпавядаў 7,74234 г хімічна чыстага золата (0,774234 х 10). Чырвонцы забяспечваліся на 25 % каштоўнымі металамі, замежнай трывалай валютай і на 75 % – лёгка рэалізуемымі таварамі і кароткатэрміновымі абавязкамі.

Папяровыя чырвонцы, па сутнасці, былі крэдытнымі грашыма. Але залатое забеспячэнне зрабіла іх трывалым сродкам плацяжу. Зразумела, што паміж чырвонцам і іншымі грашовымі савецкімі знакамі складваліся адпаведныя суадносіны. Напрыклад, на 1 красавіка 1924 г. курс чырвонца дасягнуў максімальнага ўзроўню – 500 000 рублёў узору 1923 г.

Папяровыя чырвонцы падлягалі размену на золата і мелі наступны набор наміналаў – 1, 3, 5, 10, 25 чырвонцаў (банкноты ў 2 і 50 чырвонцаў за непатрэбнасцю выпушчаны не былі).

Для зручнасці размену чырвонцаў у лютым 1924 г. была выпушчана спецыяльная серыя казначэйскіх білетаў наміналам у 1, 3, 5 рублёў. 10 рублёў казначэйскімі білетамі адпавядалі 1 чырвонцу.

З утварэннем у 1923 г. Дзяржбанка СССР грашовыя эмісіі ажыццяўляліся ад імя гэтай установы. Так, у канцы 1923 г. з'явіліся папяровыя грошы ад імя СССР.

З 1921 г. было пастаўлена пытанне аб чаканцы савецкіх манет розных наміналаў. На працягу савецкага перыяду на тэрыторыі Савецкай Расіі і СССР працавалі наступныя цэнтры манетнай вытворчасці:

– Петраградскі манетны двор (1918–1924), Ленінградскі манетны двор (з 1924 г.).

– Ленінградскі завод (тэлефонны) «Чырвоная Зара» ў 1924–1925 гг. быў выкарыстаны для чаканкі меднай манеты.

– Краснакамскі манетны двор (г. Краснакамск Пермскага краю; 1941–1946 гг.).

– Маскоўскі манетны двор (з 1942 г.).

У 1921–1925 гг. (з датамі «1921–1923») ад імя РСФСР чаканяцца білонныя 10, 15, 20 капеек і срэбныя 50 капеек і 1 рубель. Увядзенне гэтых манет у абарачэнне адбылося толькі пасля выпуску неабходнага іх аб'ёму ў 1924 г.




РСФСР. 50 капеек. 1921 г. Ø 26,7 мм




РСФСР. 1 рубель. 1922 г. Ø 34 мм




РСФСР. 20 капеек. 1923 г. Ø 21,8 мм

На аверсе ўсіх наміналаў была выява герба РСФСР у атачэнні лозунга «Пролетарии всех стран, соединяйтесь!» і абрэвіятуры «РСФСР».

На рэверсе 50 капеек і 1 рубля – пяціканцовая зорка ў вяночку, у цэнтры якой адпаведны намінал, знізу – дата.

На рэверсе 10, 15, 20 капеек – вызначэнне наміналу ў кружку і вяночку пад сонечнымі промнямі.

У 1923–1924 гг. праводзіцца выпуск залатога чырвонца ад імя РСФСР (з датай «1923»).

На аверсе манеты размяшчаўся герб РСФСР у атачэнні пралетарскага лозунга і абрэвіятуры «РСФСР».

На рэверсе – селянін-сейбіт на фоне заводскага пейзажу, зверху абазначаны намінал «один червонец», знізу злева дата.




РСФСР. 1 чырвонец. 1923 г. Ø 22,6 мм

1 залаты чырвонец прыраўноўваўся папяроваму аналагу і, адпаведна, 10 царскім залатым рублям, меў агульную масу 8,6026 г, у тым ліку 7,74234 г хімічна чыстага золата (0,774234 х 10), 900-ю пробу і дыяметр 22,606 мм.

Аналагічныя чырвонцы ад імя СССР чаканіліся ў 1925 г.

Металічныя чырвонцы ў асноўным выкарыстоўваліся савецкім урадам у знешнім гандлі, але часткова прысутнічалі і ва ўнутраным грашовым абарачэнні.

З 1924 г. у абарачэнне паступілі медныя, білонныя і срэбныя манеты ад імя СССР. У медзі чаканіліся палова капейкі, 1, 2, 3, 5 капеек.




СССР. 1 капейка. 1924 г. Ø 21,3 мм

На аверсе 1, 2, 3, 5 капеек была размешчана выява герба СССР у акружэнні пралетарскага лозунга і абрэвіятуры «СССР».

На рэверсе – намінал і дата ў вянку з каласоў.

Палова капейкі мела на аверсе абрэвіятуру «СССР» і пралетарскі лозунг, а на рэверсе – вызначэнне наміналу і дату.

У білоне выпускаліся 10, 15, 20 капеек.

На іх аверсах была выява герба СССР з пралетарскім лозунгам і абрэвіятура «СССР».

На рэверсах – вызначэнне наміналу і дата ў атачэнні вянка з каласоў.




СССР. 20 капеек. 1924 г. Ø 21,8 мм




СССР. Паўрубель. 1924 г. Ø 26,7 мм




СССР. 1 рубель. 1924 г. Ø 34 мм

У срэбры чаканіцца паўрубель і рубель. На аверсе гэтых манет была выява дзяржаўнага герба, абрэвіятура «СССР» у атачэнні пралетарскага лозунга і ўказанне адпаведнага наміналу «Один полтинник», «Один рубль».

На рэверсе – выявы каваля (паўрубель) і рабочага з селянінам (рубель), знізу размяшчалася дата.

У 1924 г. у сувязі з недастатковымі вытворчымі магчымасцямі некаторыя манетныя наміналы чаканіліся ў Вялікабрытаніі – медныя 5 капеек (Бірмінгем), срэбныя 50 капеек (Лондан).

Паўрублі лонданскай вытворчасці адрозніваліся ад аналагічнай ленінградскай чаканкі наяўнасцю на гурце, акрамя легенды з вызначэннем масы, кірылічных літар «ТР» ці «ѲР» (ініцыялы адказнай за чаканку асобы, у дадзеным выпадку Томаса Роўза, ці Фамы Роўза), адпаведна на ленінградскіх паўрублях на гурце былі літары «ПЛ» (Пётр Латышаў).

Рэформа 1922–1924 гг. была неабходнай мерай у барацьбе за стабілізацыю фінансавага становішча ў краіне. Падчас гэтага добра падрыхтаванага і паслядоўна праведзенага мерапрыемства адбыліся збалансаванне бюджэту, спыненне незабяспечаных грашовых эмісій, аднаўленне народнай гаспадаркі. Станоўчым вынікам рэформы сталі: стабілізацыя рубля і дакладная структурызацыя грашовай сістэмы, якая складалася з папяровых грашовых адзінак (банкаўскіх і казначэйскіх білетаў) і разменных металічных грашовых сродкаў. Але гэтыя вынікі былі хутка скасаваны далейшымі негатыўнымі тэндэнцыямі ў эканамічным і палітычным развіцці савецкай краіны.

* * *

У манетнай вытворчасці ў 1926 г. адбылася замена медзі на больш трывалы і танны сплаў медзі і волава – бронзу (у далейшым выкарыстоўвалася алюмініевая бронза) для выпуску разменных манет вартасцю ў 1, 2, 3, 5 капеек. У медзі чаканілася толькі палова капейкі (да канца 1928 г.). У 1931 г. быў праведзены аналагічны пераход з білону на нікель пры чаканцы манеты ў 10, 15, 20 капеек.




СССР. 20 капеек. 1931 г. Ø 21,8 мм

Манеты нікелевай серыі 1931 г. мелі на аверсе выяву герба СССР у атачэнні пралетарскага лозунга.

На рэверсе размяшчаліся выява рабочага, які абапіраецца на шчыт з вызначэннем наміналу, дата і колавая легенда з поўнай назвай краіны.

У 1935 г. адбылася кардынальная змена знешняга выгляду нікелевых і бронзавых манет.




СССР. 1 капейка. 1935 г. Ø 15 мм




СССР. 10 капеек. 1935 г. Ø 17,3 мм

На аверсе замест лозунга «Пролетарии всех стран, соединяйтесь!» пад дзяржаўным гербам з’явілася абрэвіятура «СССР», напісаная па дузе.

Рэверс бронзавых манет застаўся без змен, а на меднанікелевых манетах вызначэнне наміналу было заключана ў рамку – квадрат з усечанымі вугламі ў акружэнні коласа і дубовых галінак.

Тып манет 1935 г. заставаўся амаль нязменным да 1961 г. У залежнасці ад колькасці саюзных рэспублік у гербе вар’іравалася колькасць абаротаў стужкі, што абвівала вянок (з 1957 г. – 15 віткоў).

У 1930-х гг. папяровыя чырвонцы становяцца звычайнымі крэдытнымі грашовымі знакамі. У 1938 г. у абарачэнне была выпушчана апошняя перадваенная серыя грашовых знакаў – *«Билеты Государственного банка СССР»* (узору 1937 г.) вартасцю ў 1, 3, 5, 10 чырвонцаў і *казначэйскія білеты* (узору 1938 г.) наміналам у 1, 3, 5 рублёў.

Гэтая серыя адрознівалася знешнім афармленнем: на банкнотах адсутнічаў тэкст, які гарантаваў размен білета Дзяржаўнага банка на золата, і подпісы адказных асоб. На чырвонцах размяшчаўся партрэт У. І. Леніна, які ў далейшым стаў абавязковым элементам усіх савецкіх банкавых білетаў (узораў 1947, 1961, 1991, 1992 гг.). Чырвонцы прысутнічалі ў грашовым абарачэнні краіны да канца 1947 г. і былі скасаваны ў ходзе грашовай рэформы.

* * *

Тэрыторыя Заходняй Беларусі, што ўвайшла ў склад Польшчы па Рыжскай дамове 1921 г. (Віленскае, Навагрудскае і Палескае ваяводствы), была ўключана ў зону дзеяння польскай грашовай сістэмы.

У гэты час у Польшчы ішоў працэс барацьбы з пасляваеннай інфляцыяй і станаўлення стабільнай грашовай сістэмы. У абарачэнні яшчэ знаходзіліся нямецкія акупацыйныя грошы, а таксама польскія злотыя і маркі.

У адпаведнасці з грашовай рэформай, праведзенай у краіне ў 1924 г., у абарачэнне былі ўведзены забяспечаныя золатам купюры ў 1, 2, 5, 10, 20, 50, 100, 500 злотых. Купюры ў 1000 і 5000 злотых у абарачэнне не паступілі. Эмітаваны таксама былі і разменныя білеты – папяровыя 1, 5, 10, 20, 50 грошаў [3; 42, с. 399–409].

У міжваенны перыяд адбываўся выпуск папяровых адзінак новых узораў.

На працягу 1924–1939 гг. Варшаўскім манетным дваром былі адчаканены і паступілі ў абарачэнне наступныя наміналы: золата – 10, 20 злотых; срэбра – 1, 2, 5, 10 злотых; нікель – 1 злоты, 10, 20, 50 грошаў; бронза – 1, 2, 5 грошаў.

З лістапада 1939 г. усе разлікі на тэрыторыі Заходняй Беларусі ажыццяўляліся ў савецкіх грашовых адзінках.

* * *

Падчас Вялікай Айчыннай вайны Ленінградскі манетны двор эвакуіруецца ў г. Краснакамск Пермскай вобласці. З лістапада 1941 г. па чэрвень 1946 г. Краснакамскі манетны двор перыядычна эмітаваў невялікія па аб'ёме партыі разменных манет. Асноўнае месца ў вытворчым працэсе гэтага прадпрыемства ў перыяд вайны займаў выпуск ордэнскіх і медалёвых узнагарод.

Рэгуляваннем фінансавых праблем на занятых Германіяй у часы Другой сусветнай вайны тэрыторыях кіравала Галоўнае ўпраўленне Імперскіх крэдытных кас. Дзейнічалі крэдытныя касы і ў Беларусі, дзе адбывалася паралельнае выкарыстанне як савецкіх, так і германскіх акупацыйных грашовых адзінак. Спецыяльныя ваенныя грошы Германіі (білеты Імперскіх крэдытных кас) былі прадстаўлены купюрамі ў ½, 1, 2, 5, 20, 50

марак, для якіх быў усталяваны курс: 1 ваенная марка была роўная 10 савецкім рублям. Савецкія грашовыя сродкі падлягалі паступоваму выцісканню з абарачэння.

Спецыфіка грашовага абарачэння на тэрыторыі Беларусі перыяду вайны была звязана з падзелам беларусіх зямель паміж living рознымі адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі адзінкамі.

У сувязі з гэтым грашовы фонд беларускага насельніцтва ўключаў, напрыклад, спецыяльныя «плацежныя сродкі забеспячэння для германскіх узброеных сіл», ваенныя часовыя рублі кіеўскага эмісійнага банка, карбованцы рэйхскамісарыяту «Украіна», спецыяльныя талоны генеральнай акругі «Беларусь» і генеральнай акругі «Літва» («тэкстыльпункты», «пункты»), што выдаваліся за здадзеную тэкстыльную сыравіну [42, с. 21–22, 31–32].

* * *

Пасля сканчэння Другой сусветнай вайны складанае фінансавае становішча ў краіне патрабавала правядзення пэўнага рэфармавання. У выніку інфляцыйных працэсаў у насельніцтва знаходзілася значная, амаль у 4 разы вышэй за норму, грашовая маса. Яна ўтварылася ў выніку пашырэння падчас вайны эмісіі папяровых грашовых сродкаў, а таксама прысутнасці ў абарачэнні фальшывых банкнот германскай вытворчасці.

Адзначаўся рост кошту на калгасных рынках і ў камерцыйным гандлі, праз які праходзіла частка дзяржаўных таварных фондаў. Ва ўнутраным гандлі суіснавала тры віды цаны: пайковая (па картках), камерцыйная і рынкавая. Картачная сістэма размеркавання асобных відаў харчовых і прамысловых тавараў па заніжанай цане, чарговы раз уведзеная ў краіне яшчэ ў ліпені 1941 г., ужо не адпавядала патрабаванням далейшага развіцця эканомікі. Адбывалася падзенне пакупнай здольнасці рубля і, як вынік, разгортванне інфляцыйных працэсаў.

Такім чынам, па ўсіх параметрах сфарміраваліся ўмовы для правядзення грашовай рэформы, якая б спрыяла аднаўленню разбуранай падзеямі вайны народнай гаспадаркі.

Падрыхтоўка праекта правядзення грашовай рэформы пачалася яшчэ ў 1943 г. За аснову была прынята жорсткая па шляхах рэалізацыі мадэль дасягнення пастаўленых мэт, якая не ўлічвала, што грашовыя накапленні большасці савецкіх грамадзян мелі працоўны, а не спекулятыўны характар.

Цыркуляцыя неафіцыйнай інфармацыі аб будучай грашовай рэформе выклікала сярод насельніцтва адпаведныя дзеянні. Спачатку прайшла хваля зніжэння ўкладаў насельніцтва ў ашчадныя касы. На знятыя грошы грамадзяне набывалі ўсе магчымыя тавары. У канцы 1947 г. у сувязі з чуткамі аб магчымай страце наяўных грошай пачаўся рэзкі рост паступленняў на разліковыя рахункі дзяржаўных працоўных ашчадных кас.

Другая па ліку грашовая рэформа ў СССР праводзілася з 16 па 29 снежня 1947 г. Аб яе пачатку было абвешчана 15 снежня 1947 г. [10]. Рэформа

мела канфіскацыйны характар і адбывалася ў форме дэнамінацыі. Паралельна была адменена і картачная сістэма забеспячэння харчовымі і прамысловымі таварамі. У краіне ўводзіліся адзіныя дзяржаўныя рознічныя таварныя цэны.

У ходзе рэформы з’явіліся новыя папяровыя купюры палепшанай якасці дзвюх катэгорый: дзяржаўныя казначэйскія білеты наміналам 1, 3, 5 рублёў і білеты Дзяржаўнага банка – 10, 25, 50, 100 рублёў. З абарачэння, такім чынам, зніклі грашовыя адзінкі пад назвай «чырвонцы», але гэтым тэрмінам неафіцыйна называліся дзесяцірублёвыя купюры. Манеты рэформа не закранала, таму ў выйгрышы апынуліся ўладальнікі грашовых сум у металічным варыянце.

Банкноты былі даволі значнымі па памеры. Напрыклад, купюра ў 1 рубель мела памер 80х125 мм, а купюра ў 100 рублёў – 230х115 мм [42, с. 324, 330].

На абмен наяўных старых купюр на новыя адводзіўся 1 тыдзень, а для аддаленых ад цэнтра паўночных і ўсходніх рэгіёнаў краіны – 2 тыдні. Гэты абмен у дачыненні толькі да наяўных папяровых грошай адбываўся ў дэнамінацыйнай прапорцыі – 1 новы рубель адпавядаў 10 старым.

Паралельна, але на больш ільготных умовах праводзілася і пераацэнка грашовых укладаў насельніцтва на разліковых рахунках ашчадных кас. Банкаўскія ўклады да 3 тысяч рублёў абменьваліся 1:1; пры суме ўкладу да 10 тысяч рублёў 3 тысячы абменьваліся 1:1, а астатняя частка – 2:3; пры ўкладзе больш за 10 тысяч рублёў дзесяцітысячная рублёвая сума залічвалася на рахунак па вышэйзгаданых умовах, а астатнія грошы – у прапорцыі 1:2.

Абмен грашовых сум да 3 тысяч у прапорцыі 1:1 задавальняў большасць грамадства, накапленні якога якраз і ўкладаліся ў гэты аб’ём. Зразумела, што індывідуальная ацэнка рэформы асобным грамадзянінам залежала ад выніковага памеру яго прыбытку ці страты грошай у выніку абменных аперацый.

Неабходна адзначыць, што рэформа не закранала намінальныя сумы працоўных даходаў (заробкаў) насельніцтва, яны выплачваліся ў новых грошах у папярэдніх памерах.

Уведзеныя ў ходзе рэформы новыя адзіныя цэны былі ніжэй за рынкавыя і камерцыйныя, але значна вышэй пайковых коштаў. Напрыклад, пайковая цана 1 кг жытняга хлеба вагалася ад 0,75 да 1 рубля 15 капеек, камерцыйная цана была ад 8 да 10 рублёў, рынкавая – 13 рублёў, у адзіных рознічных коштах усталёўвалася цана ў 3 рублі.

Увогуле рознічныя цэны на харчовыя і прамысловыя тавары шырокага ўжытку пасля рэформы значна перавышылі іх даваенны ўзровень.

У пасляэформенны час адбылося павышэнне тарыфаў на камунальныя, паштовыя, транспартныя і іншыя паслугі, скарачаліся разнастайныя кампенсацыйныя выплаты. Шырокае распаўсюджванне набылі «добраахвотныя» займы, якія ў сярэднім адпавядалі месячнаму заробку рабочых і служачых. Самі ж заробкі ўзрасталі дастаткова павольнымі тэмпамі, што выклікала адпаведны негатыўны настрой у грамадстве.

Для зняцця негатыўных стаўленняў сярод насельніцтва ўлады папулярызавалі ідэю накіраванасці рэформы супраць спекулянтаў і заможных грамадзян.

Неабходна адзначыць і станоўчыя вынікі рэформы ў маштабах краіны. Грашовая рэформа 1947 г. ліквідавала адмоўныя наступствы Другой сусветнай вайны ў сферы грашовай гаспадаркі краіны. Была значна зменшана грашовая маса, што знаходзілася на руках у насельніцтва, і створана самастойная фінансавая сістэма, якая не залежала ад курсу долара.

Скасаванне картачнай сістэмы раней, чым у іншых краінах, было заклікана прадэманстраваць перавагі сацыялізму. У краіне быў ліквідаваны таварны дэфіцыт і ўсталяваны адзіныя рознічныя цэны. Але жыццёвыя ўмовы савецкіх грамадзян заставаліся на вельмі нізкім узроўні.

Рэформа мела і знешнепалітычнае значэнне, таму што моцны рубель павінен быў стаць рэзервовай валютай у краінах сацыялістычнага лагера.

Працэсы выхаду з пасляваеннага крызісу і ўмацавання савецкага рубля былі праведзены дастаткова жорсткімі цэнтралізаванымі метадамі. Далейшае эканамічнае развіццё краіны, дыспрапорцыі мілітарызаванай народнай гаспадаркі непазбежна прывялі да паступовага разгортвання інфляцыйных працэсаў.

* * *

Чарговая грашовая рэформа ў СССР, па ідэалагічных прычынах афіцыйна вызначаная як змена маштабаў коштаў, пачалася 1 студзеня 1961 г. Неабходнасць яе правядзення была выклікана далейшым разгортваннем інфляцыі і падзеннем пакупнай здольнасці рубля. У адрозненне ад папярэдняй рэформы 1947 г., аб яе правядзенні абвясцілі загадзя. Яшчэ ў маі 1960 г. была апублікавана ўрадавая пастанова аб змене маштабаў коштаў і ўвядзенні ў абарачэнне грошай новага ўзору, а ў кастрычніку таго ж года пачаўся пералік укладаў насельніцтва ў зберагальных касах. Мэтай рэформы было абвешчана палягчэнне грашовага абарачэння і надання грошам паўнавартасці.

Зразумела, што гэта інфармацыя выклікала адпаведную рэакцыю ў грамадстве – пачалася скупка тавараў і, на падставе папярэдняга вопыту, узрастанне колькасці ўкладаў у ашчадныя касы.

Рэформа была праведзена ў форме дэнамінацыі з дэвальвацыяй. Паралельна адбылася і мяккая канфіскацыя грашовых сродкаў, што знаходзіліся ў насельніцтва. Абменныя аперацыі праводзіліся без абмежаванняў на працягу студзеня – сакавіка 1961 г., што спрыяла захаванню спакою ў грамадстве.

У ходзе рэформы папяровыя грашовыя знакі ўзору 1947 г. і манеты (акрамя наміналаў у 1, 2, 3 капейкі), чаканеныя ад імя РСФСР і СССР, пачынаючы з 1921 г., знімаліся з абарачэння і абменьваліся на новыя грошы ў прапорцыі: 1 новы рубель на 10 старых. У такой жа прапорцыі пералічваліся цэны, заробкі, сацыяльныя выплаты, ашчадныя ўклады і плацежныя абавязкі.

Адбылася дэвальвацыя савецкага рубля ў адносінах да замежнай валюты і золата.

Курс долара і залатое ўтрыманне рубля зменшыліся не ў 10, а толькі ў 4,44 разы. У выніку курс долара, які раней быў роўны 4 рублям, стаў адпавядаць не 40, як павінна было б быць пры дзесяцікратнай дэнамінацыі, а 90 капейкам.

Адпаведна змянілася і залатое ўтрыманне рубля – з 0,222168 яно павялічылася толькі да 0,987412 г, а павінна было раўняцца 2, 22168 г. У ходзе рэформы цана 1 грама золата з 4,5 рублёў змянілася на 1 рубель 1 капейку. На практыцы гэта азначала зніжэнне пакупніцкай здольнасці рубля, якая павысілася замест 10 у 2,5 разы. Паняцце «залатое ўтрыманне рубля» было, дарэчы, адменена як анахранізм у 1990 г.

Большасць насельніцтва не адразу адчула вынікі павышэння курсу долара і зніжэння залатога забеспячэння рубля, але ў далейшым, напрыклад, відавочна падаражалі імпартныя тавары.

З 1 студзеня 1961 г. у абарачэнне была выпушчана новая серыя папяровых грошай – «Государственные казначейские билеты СССР» вартасцю ў 1, 3, 5 рублёў і «Билеты Государственного банка СССР» вартасцю ў 10, 25, 50 і 100 рублёў. Банкноты захоўвалі ранейшыя легенды і папярэджанне аб недапушчальнасці падробкі казначэйскіх і банкаўскіх білетаў, вызначэнне наміналу прыводзілася на мовах 15 саюзных рэспублік. Партрэтная выява У. І. Леніна на банкаўскіх білетах была заменена на яго профіль-барэльеф.

Новыя папяровыя грошы былі меншыя па памеры, што спрыяла зніжэнню сабекошту і рабіла іх больш зручнымі ў выкарыстанні. Купюра ў 1 рубель мела памер 55х105 мм, а купюра ў 100 рублёў – 70х145 мм [42, с. 336, 338].




СССР. Манеты 1961 г.
20 кап. – Ø 21,8 мм, 15 кап. – Ø 19,56 мм, 10 кап. – Ø 17,27 мм,
5 кап. – Ø 25 мм, 3 кап. – Ø 22 мм, 2 кап. – Ø 18 мм, 1 кап. – Ø 15 мм

У абарачэнне ўводзіліся манеты новага ўзору: медна-цынкавыя (латунь) 1, 2, 3, 5 капеек і медна-нікелева-цынкавыя (нейзільбер) – 10, 15, 20, 50 капеек і 1 рубель.

У пробным варыянце была адчаканена і манета вартасцю ў палову капейкі, але з-за незапатрабаванасці (у гандлі цэны проста акруглілі да капейкі) яе масавы выпуск не адбыўся.

Новыя манеты ў большасці захавалі звыклае знешняе афармленне. Але некаторыя дэталі дызайну былі зменены. На аверсе манет ад 1 да 20 капеек абрэвіятура СССР размяшчалася не паўкругам, а ў радок; на рэверсе – намінал знаходзіўся ў атачэнні вяночка з двух каласоў, падзеленага датай (10, 15, 20 капеек) на дзве паловы.

Навацыяй для таго часу было з’яўленне медна-нікелевых манет наміналам у 50 капеек і 1 рубель.




СССР. 50 капеек. 1961 г. Ø 24 мм




СССР. 1 рубель. 1961 г. Ø 27 мм

Аверс 50-капеечнай манеты быў аналагічны манетам меншых наміналаў. На аверсе рублёвай манеты размяшчалася выява дзяржаўнага герба ў атачэнні колавай легенды «Союз Советских Социалистических Республик».

На рэверсе гэтых двух наміналаў у атачэнні вянка з двух каласоў давалася вызначэнне наміналу і дата.

Першапачаткова гурт у гэтых манет быў гладкі, але вельмі хутка з’явіліся іх фальсіфікаты, што прымусіла ўзмацніць ступень абароны гуртавай легендай, якая мела літарнае вызначэнне наміналу і дату, што дубліравала дату на рэверсе манеты («50 копеек» і дата, «Один рубль» і дата).

Рэформа прывяла да спрашчэння грашовых разлікаў і зніжэння выдаткаў на вытворчасць банкнот меншага памеру. У цэлым рэформа 1961 г. была спробай затармазіць разгортванне інфляцыйных працэсаў і закамуфліраваць іх негатыўныя вынікі, якія ўсё больш актыўна праяўляліся на працягу апошніх дзесяцігоддзяў існавання СССР.

* * *




СССР. Памятная манета. 1 рубель. 1965 г.
Медна-нікелевы сплаў. Ø 31 мм

З 1965 г. у СССР пачалася чаканка памятных манет. Характэрнай асаблівасцю першых выпускаў гэтых манет было тое, што яны па ідэалагічных прычынах пускаліся ў масавае абарачэнне. Гэта датычылася, напрыклад, памятных манет з медна-нікелевага сплаву: у гонар 20-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне (1965); серыі (10, 15, 20, 50 капеек і 1 рубель) з нагоды 50-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі (1967); рубля ў гонар 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна (1970); рубля, прысвечанага 30-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне (1975).

Значнае пашырэнне тэматыкі памятных манет, прысвечаных разнастайным падзеям і асобам, адбылося ў 1977–1991 гг. Улічваючы іх эмісію ў значна меншых аб’ёмах і выкарыстанне часам не толькі медна-нікелевага сплаву, але і каштоўных металаў (срэбра, золата, плаціны і паладзія), практыка знаходжання гэтых манет у штодзённым грашовым абарачэнні спынілася.

Найбуйнейшая серыя памятных манет была выпушчана з нагоды XXII Летніх Алімпійскіх гульняў 1980 г. Яна складалася з 45 манет, якія былі адчаканены ў 1977–1980 гг. на Ленінградскім і Маскоўскім манетных дварах.

У гэтай серыі былі прадстаўлены: 6 манет з медна-нікелевага сплаву наміналам 1 рубель, 14 манет са срэбра 900-й пробы наміналам 5 рублёў, 14 манет са срэбра 900-й пробы наміналам 10 рублёў, 6 манет з золата 900-й пробы наміналам 100 рублёў, 5 манет з плаціны 999-й пробы наміналам 150 рублёў.

Аверсы ўсіх манет мелі стандартнае афармленне з назвай краіны, дзяржаўным гербам і наміналам.

Рэверсы адлюстроўвалі алімпійскую сімволіку, віды спорту, архітэктурныя аб’екты.




СССР. Памятная манета,
прысвечаная г. Мінску.
Серыя «Летнія Алімпійскія гульні 1980 г.».
5 рублёў. 1977 г. Срэбра. Ø 33 мм

На рэверсе манеты, прысвечанай Мінску, дзе адбыліся футбольныя гульні, быў размешчаны калаж з выяў архітэктурных сімвалаў беларускай сталіцы савецкага перыяду: манумент Перамогі, будынкі Палаца прафсаюзаў, Палаца спорту, Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага театра оперы і балета Рэспублікі Беларусь.

У 1988 г. былі выпушчаны наваробныя варыянты юбілейных манет 1965–1986 гг. у якасці «proof», з гуртавай легендай – «1988 · Н», якая сведчыла ад наваробным паходжанні гэтых манет.

* * *

У студзені – красавіку 1991 г. у СССР праводзіцца апошняя грашовая рэформа, якая мела на мэце стабілізаваць грашовае абарачэнне, вырашыць праблемы таварнага дэфіцыту шляхам збаўлення ад залішняй наяўнай грашовай масы на руках ў насельніцтва і насіла, такім чынам, канфіскацыйны характар.

Падрыхтаваная ўрадам рэформа ўяўляла сабой комплексную праграму, накіраваную на рэанімацыю эканомікі, што знаходзілася ў стане глыбокага заняпаду, таксама прадугледжвалася і лібералізацыя сістэмы цэнаўтварэння. Значная роля пры правядзенні рэформы адводзілася эфекту нечаканасці. Але рэалізаваць удалося толькі першы этап – абмен грашовых знакаў.

Фармальнай прычынай для правядзення рэформы стала нібыта наяўнасць у грашовым абарачэнні вялікай колькасці фальшывых банкнот высокіх наміналаў замежнай вытворчасці, а таксама і супрацьстаянне дзейнасці спекулянтаў і карупцыянераў.

Аб правядзенні рэформы было абвешчана позна ўвечары – у 21 гадзіну 22 студзеня 1991 г. грамадзян праінфармавалі аб выключэнні з абарачэння і абмене 50-рублёвых і 100-рублёвых банкнот узору 1961 г.

У сціслыя тэрміны (23–25 студзеня) неабходна было здаць у аддзяленні ашчаднага банка, у касы па месцы працы ці вучобы ўсе скасаваныя банкноты, якія меліся ў наяўнасці.

Абмяняць адразу здадзеныя грошы на больш дробныя купюры можна было толькі на суму ў 1000 рублёў на чалавека. Абмен астатняй сумы на новыя банкноты ўзору 1991 г. адбываўся з адтэрміноўкай на некалькі месяцаў (да канца сакавіка). Паралельна была абмежавана мажлівасць зняцця грошай з разліковых рахункаў ашчаднага банка (не болей за 500 рублёў, з адзнакай у пашпарце!).

Тым не менш, нягледзячы на жорсткія тэрміны рэалізацыі рэформы, некаторыя савецкія грамадзяне паспелі ў апошнія да поўначы гадзіны захаваць свае зберажэнні, размяняўшы 50- і 100-рублёвыя банкноты на больш дробныя наміналы пры набыцці жэтонаў у працуючым яшчэ метро, чыгуначных і авіябілетаў (іх можна было потым здаць назад), адпраўляючы самі сабе ці блізкім людзям грашовыя пераводы ў паштовых аддзяленнях вакзалаў, аплачваючы кароткія паездкі ў таксі.

У выніку рэформы з абарачэння было знята прыблізна 14 мільярдаў наяўных рублёў. У канцы сакавіка быў скончаны абмен здадзеных грамадзянамі звыш вызначанай нормы грашовых сум. Паралельна з пэўным павышэннем памераў заробкаў і стыпендый адбылося значнае павышэнне розднічных коштаў на асноўныя тавары і паслугі.

Рэформа не прадугледжвала выпуск новых грашовых адзінак, аднак у тым жа 1991 г. у абарачэнне ўводзяцца новыя манеты вартасцю 10, 50 капеек, 1, 5, 10 рублёў. На гэтых манетах прастаўляўся знак манетнага двара (10 капеек, 5 і 10 рублёў – Маскоўскі манетны двор; 50 капеек, 1, 5 і 10 рублёў – Ленінградскі манетны двор).



СССР. Манеты. 1991 г.
10 руб. – Ø 25 мм, 5 руб. – Ø 24 мм,
1 руб. – Ø 21 мм, 50 кап. – Ø 18 мм,
10 кап. – Ø 17,27 мм

На аверсах усіх наміналаў былі адлюстраваны будынкі (купал) Вярхоўнага Савета СССР і Спаскай вежы Маскоўскага крамля з легендай «Государственный банк СССР».

На рэверсах размяшчаліся намінал і дата ў атачэнні коласа і галінкі дуба (на некаторых 10-рублёвых манетах прысутнічае дата «1992»!).

Манета ў 10 рублёў складалася з латуннага (сплаў медзі і цынку) дыска, які быў устаўлены ў колца з нейзільберу (сплаў медзі, нікеля і цынку). Для выраблення 10 капеек выкарыстоўваліся стальныя нарыхтоўкі, плакіраваныя тампаком (від латуні, дзе ўтрыманне цынку складае да 20 %).

Галоўнымі зменамі ў афармленні манет, якія былі эмітаваны пасля жнівеньскіх падзей 1991 г., стала адсутнасць дзяржаўнага герба.

Былі выпушчаны ў абарачэнне і новыя папяровыя грошы ўзору 1991 г. з агульнай для ўсіх банкнот назвай «Билеты Государственного банка СССР» вартасцю 1, 3, 5, 10, 50, 100 рублёў. Новыя банкноты наміналам у 1, 3, 5, 10 рублёў нязначна адрозніваліся ад аналагаў узору 1961 г. адценнем. На банкнотах наміналам 1, 3, 5, 10 рублёў (банкнота ў 25 рублёў не выпускалася) 1991 г. былі ліквідаваны традыцыйныя раней вызначэнні наміналу на нацыянальных мовах.

Рост цэн прымусіў у хуткім часе ўвесці ў абарачэнне і больш высокія наміналы ў 200, 500 і 1000 рублёў.

Банк Расіі (1990) быў абвешчаны пераемнікам Дзяржаўнага банка СССР (афіцыйна скасаваны ў 1992 г.).

Грашовая рэформа 1991 г. і іншыя рэфарматарскія захады ўрада ў сферы эканомікі прывялі да значнага зніжэння ўзроўню жыцця насельніцтва краіны. Страта шматгадовых накапленняў, павышэнне цэн на тавары і паслугі сфарміравала ў грамадства недавер да дзеянняў саюзнага ўрада.

Такім чынам, грашовы фонд насельніцтва Беларусі ў канцы 1991 – пачатку 1992 г. складаўся з даволі значнага набору наступных грашовых сродкаў СССР:

– папяровыя грошы ўзору 1961 г. наміналам ад 1 да 100 рублёў і адпаведны набор разменных манет, які ўключаў таксама 1, 2, 3 капейкі папярэдніх эмісій;

– папяровыя грошы ўзору 1991 г. (ад 1 да 1000 рублёў; за выключэннем купюры ў 25 рублёў);

– манеты ў 10, 50 капеек, 1, 5 і 10 рублёў узору 1991 г.

!!

*Грашовае абарачэнне на тэрыторыі Беларусі ў разгледжаны перыяд, зразумела, было цесна звязана з усімі падзеямі гісторыі савецкай краіны. Складаная фінансавая сітуацыя на пачатковым этапе ўсталявання савецкай улады вылілася ў выкарыстанне ў грашовым абарачэнні стракатага набору разнастайных эмісій папярэдніх улад. Фарміраванне савецкай грашовай сістэмы прывяло да нармалізацыі фінансавага становішча. Заходнебеларускія землі ў міжваенны перыяд у сувязі з іх уключэннем у склад Польшчы (1921–1939) знаходзіліся ў рэчышчы яе грашовай сістэмы. У СССР было праведзена некалькі грашовых рэформ (1922–1924, 1947, 1961, 1991). Савецкі перыяд быў адзначаны і выпускам вялікай колькасці памятных манет.*

## Заданні і пытанні для самакантролю

1. Назваць склад грашовага фонду на тэрыторыі Беларусі ў першыя гады савецкай улады.
2. Вызначыць мэты і вынікі першай савецкай грашовай рэформы 1922–1924 гг.
3. Вызначыць мэты і вынікі правядзення савецкіх грашовых рэформ 1947 г., 1961 г.
4. Назваць асаблівасці савецкай грашовай рэформы 1991 г.
5. Адсачыць трансфармацыю знешняга выгляду савецкіх манет.
6. Якім падзеям былі прысвечаны першыя выпускі памятных савецкіх манет?
7. Ахарактарызаваць склад грашовага фонду на тэрыторыі Беларусі ў канцы 1991 – пачатку 1992 г.

## Тэма 2.8. Грашовае абарачэнне ў Рэспубліцы Беларусь (з 1991 г.)

Гісторыя грашовай сістэмы Рэспублікі Беларусь невялікая па часе, але насычаная значнай колькасцю падзей і пераўтварэнняў.

27 ліпеня 1990 г. Вярхоўны Савет БССР прыняў «Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце БССР», у якой абвяшчалася незалежнасць Беларусі. 25 жніўня 1991 г. Дэкларацыі быў нададзены канстытуцыйны статус. 19 верасня 1991 г. дзяржава атрымала назву Рэспубліка Беларусь і новыя дзяржаўныя сімвалы. Самастойная дзяржава, зразумела, павінна была мець і ўласную грашовую сістэму. Па сутнасці, манеты і папяровыя грашовыя знакі з'яўляюцца паўнавартаснымі дзяржаўнымі сімваламі.

Як ужо адзначалася, апошнія рэфарматарскія дзеянні савецкага ўрада ў сферы эканомікі мелі вынікам значнае зніжэнне ўзроўню жыцця насельніцтва краіны. Павышэнне коштаў на тавары і паслугі, а таксама стан грашовых накапленняў, што страцілі сваю рэальную вартасць, выклікалі негатыўныя тэндэнцыі і паўплывалі на фарміраванне ў грамадстве недаверу савецкаму кіраўніцтву.

Нестабільнасці эканамічнай сітуацыі ў краіне ў канцы 1991 – пачатку 1992 г. спрыяў і склад грашовага фонду насельніцтва Беларусі, які ўяўляў сабой стракаты набор грашовых сродкаў.

У абарачэнні прысутнічалі:

– грашовыя знакі ўзору 1961 г. – папяровыя банкноты наміналам у 1, 3, 5, 10, 25, 100 рублёў і набор манет – 1, 2, 3, 5, 10, 15, 20, 50 капеек, 1 рубель, да якога маглі быць далучаны 1, 2, 3 капейкі папярэдніх эмісій;

– папяровыя грашовыя знакі ўзору 1991 г. ад 1 да 1000 рублёў (акрамя купюры ў 25 рублёў) і манеты наміналам у 10, 50 капеек, 1, 5 і 10 рублёў узору 1991 г.

Зразумела, што склаўшаяся сітуацыя патрабавала тэрміновага вырашэння. Пачынаецца праца над стварэннем уласнай грашовай сістэмы Рэспублікі Беларусь.

Афіцыйнай грашовай адзінкай Рэспублікі Беларусь быў прыняты беларускі рубель, роўны 100 беларускім капейкам.

Агляд гісторыі грашовай сістэмы сучаснай Беларусі будзе няпоўны, калі не нагадаць вядомы, але да канца не рэалізаваны праект па распрацоўцы манет і банкнот новага тыпу (1993).

У аснову дызайну папяровых грашовых знакаў пад назвай «Білеты Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь» наміналам у 1, 5, 10, 20, 50 і 100 рублёў была пакладзена ідэя адлюстравання на банкнотах выяў архітэктурных помнікаў і партрэтаў вядомых дзеячаў беларускай культуры.

На купюры наміналам у 1 рубель была размешчана выява Камянецкай вежы – помніка абарончага дойлідства канца XIII ст. Гэты аб’ект унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь па катэгорыі «0» як каштоўнасць, прадстаўленая ў папярэдні спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

На купюры наміналам у 5 рублёў знаходзілася выява Спаса-Праабражэнскай царквы ў Полацку, аб’екта гісторыка-культурнай спадчыны XII ст., які таксама ўнесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь з наданнем найвышэйшай катэгорыі значнасці.

На астатніх банкнотах былі партрэтныя выявы дзеячаў беларускай культуры, якія ўнеслі велізарны ўклад у развіццё кнігадрукавання і літаратуры.

На купюры 10 рублёў быў размешчаны партрэт пісьменніка і паэта Якуба Коласа (1882–1956); 20 рублёў – паэта Янкі Купалы (1882–1942); 50 рублёў – паэта Максіма Багдановіча (1891–1917).

На самай высокай па намінале банкноце – купюры ў 100 рублёў – размяшчаўся партрэт пачынальніка беларускага і ўсходнеславянскага кнігадрукавання Францыска Скарыны (каля 1470 – каля 1551).

Узоры банкнот былі датаваны 1993 г. Цікава, што сярод ахоўных элементаў гэтых банкнот прысутнічала схаваная выява жаночай галоўкі, прататыпам якой стала першая выканаўца ролі Паўлінкі ў спектаклі паводле аднайменнай п’есы Янкі Купалы Паўліны Мядзёлкі.

Па агульнапрынятых стандартах быў распрацаваны і манетны рад у 5, 10, 20, 50 капеек і 1 рубель. Але, як адзначалася вышэй, гэты праект не рэалізаваны на практыцы.

25 мая 1992 г. у абарачэнне паступілі «Разліковыя білеты Нацыянальнага банка Беларусі» вартасцю 50 капеек, 1, 3, 5, 10, 25, 50, 100 рублёў з выявамі на рэверсе прадстаўнікоў жывёльнага свету. З выявай зайца-русака на банкноце ў 1 рубель (1992) звязана неафіцыйная назва беларускіх грошай – «зайчыкі» [2].

*Табліца 1*

**Банкноты, уведзеныя ў абарачэнне ў Рэспубліцы Беларусь (1992–1999)**

| Дата ўвядзення / бок банкноты | Намінал | Выява |
|---|---|---|
| 25 мая 1992 г. рэверс | 50 капеек<br>1 рубель<br>3 рублі<br>5 рублёў<br>10 рублёў<br>25 рублёў<br>50 рублёў<br>100 рублёў | вавёрка<br>заяц<br>бабры<br>ваўкі<br>рысь з рысянём<br>лось<br>мядзведзь<br>зубр |
| канец 1992 г. рэверс | 200 рублёў<br><br>500 рублёў | «Брама Мінска» – архітэктурны комплекс на Прывакзальнай плошчы<br>плошча Перамогі |
| 1993 г. рэверс | 1 тыс. рублёў | будынак галоўнага корпуса Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі |
| 1994 г. рэверс | 5 тыс. рублёў<br><br>20 тыс. рублёў | агульны выгляд гістарычнага цэнтра Мінска – Верхні горад<br>будынак Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь |
| 1995 г. аверс | 50 тыс. рублёў | Брэсцкая крэпасць |
| 1996 г. аверс | 100 тыс. рублёў | Дзяржаўны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь |
| 1998 г. аверс | 500 тыс. рублёў | Рэспубліканскі палац культуры прафсаюзаў |
| 1999 г. аверс | 1 млн рублёў<br><br>5 млн рублёў | Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь<br>Палац спорту ў Мінску |

У маі 1994 г. пастановай Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь адзіным плацежным сродкам быў абвешчаны беларускі рубель (у наяўным грашовым абарачэнні – банкноты пад назвай «разліковыя білеты»).

Першапачаткова (1992–1994) выкарыстанне ў абарачэнні беларускіх разліковых білетаў мела пэўную спецыфіку – дзесяцікратнае павелічэнне намінальнай вартасці банкноты. На практыцы гэта азначала, што пры аплаце беларускімі рублямі трэба было да наміналу кожнай банкноты мысленна дадаваць адзін ноль і лічыць, напрыклад, 1 рубель за 10 рублёў, 25 рублёў за 250 рублёў і г. д.

* * *

У жніўні 1994 г. была праведзена першая дэнамінацыя беларускага рубля ў 10 разоў (дадаваць віртуальны ноль было ўжо не патрэбна).

Дэнамінацыя азначае змяншэнне колькаснага маштабу намінальнай вартасці грашовых знакаў.

1 студзеня 2000 г. праводзіцца другая дэнамінацыя ў 1000 разоў.

Адначасова 1 студзеня 2000 г. у абарачэнні з'яўляюцца «Білеты Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь» узору 2000 г. вартасцю 1, 5, 10, 20, 50, 100, 500, 1000, 5000 рублёў; у 2001г. – 10 000 рублёў; у 2002 г. – 20 000, 50 000 рублёў; у 2005 г. – 100 000 рублёў; у 2012 г. – 200 000 рублёў.

Рубель ужо не разменьваўся на больш дробныя наміналы (банкнота 50 капеек была выведзена з абарачэння).

Дызайн банкнот узору 2000 г. паўтарае, з улікам дэнамінацыі, выявы беларускіх архітэктурных аб'ектаў папярэдніх выпускаў папяровых грашовых адзінак. Напрыклад, на купюры 50 рублёў, як і ранейшай у 50 000 рублёў, была размешчана выява Брэсцкай крэпасці.

У сувязі з тым, што да дэнамінацыі купюры ў 10 000 рублёў не было, у банкнотны рад была далучана новая купюра ў 10 рублёў з выявай Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (будынак па вуліцы Чырвонаармейскай).

Банкноты ўзору 2000 г. мелі больш складаную сістэму абароны, што ўмацоўвала іх захаванасць ад падробкі.

З 2005 г. было зацверджана скарочанае вызначэнне беларускай нацыянальнай валюты «Br» (B – беларускі, r – рубель), якім прапаноўвалася замяніць ранейшыя «р.» і «руб.».

Банкноты ўзору 2000 г. былі двойчы мадыфікаваны. Працэс мадыфікацыі ўяўляе сабой нейкае пераўтварэнне з мэтай надання грашовым знакам новых уласцівасцей, якія ўзмацняць іх абарону ад магчымай падробкі.

У стварэнні ахоўных элементаў для папяровых грашовых знакаў выкарыстоўваюцца самыя розныя падыходы, што звязана з сучаснымі высокімі тэхналогіямі ў грашовай вытворчасці.

Першая мадыфікацыя ў краіне праводзілася ў 2010 г. і была звязана з увядзеннем у беларускай мове новых правіл арфаграфіі (2008). На купюрах у 50 рублёў і 50 000 рублёў замест «пяцьдзесят» стала пісацца «пяцьдзясят». Адначасова на купюрах азначаных наміналаў былі зроблены больш складаныя элементы абароны ад фальсіфікацыі. Напрыклад, на купюры наміналам 50 000 рублёў палімерная празрыстая нітка з тэкстам «НБРБ» была заменена металізаванай ахоўнай ніткай, якая пры праглядзе на святло мела выгляд цэльнай цёмнай паласы.

Другая мадыфікацыя адбылася ў 2011 г. і была звязана з неабходнасцю ўзмацніць ступень абароны ад падробкі купюр у 100, 500, 1000, 5000, 10 000 і 20 000 рублёў. Напрыклад, у новых купюрах (акрамя 100 рублёў) таксама, як і пры папярэдняй мадыфікацыі, замест палімернай празрыстай ніткі з тэкстам «НБРБ» з'явілася ныраючая металізаваная ахоўная нітка, што пры праглядзе на святло пераўтваралася ў цэльную цёмную паласу.

1 ліпеня 2016 г. праводзіцца трэцяя дэнамінацыя ў 10 000 разоў. Адначасова ў абарачэнне ўводзяцца банкноты ўзору 2009 г. (5, 10, 20, 50, 100, 200, 500 рублёў), якія маюць комплекс сучасных ахоўных элементаў, а таксама серыя манет (1, 2, 5, 10, 20, 50 капеек, 1 рубель, 2 рублі).




Рэспубліка Беларусь. Манеты ўзору 2009 г.
2 руб. – Ø 23,5 мм, 1 руб. – Ø 21,25 мм, 50 кап. – Ø 22, 25 мм,
20 кап. – Ø 20,35 мм, 10 кап. – Ø 17,7 мм, 5 кап. – Ø 19,8 мм,
2 кап. – Ø 17,5 мм, 1 кап. – Ø 15 мм

*Табліца 2*

**Банкноты ўзору 2009 г.,
уведзеныя ў абарачэнне 1 ліпеня 2016 г.**

| Намінал | Выява | Адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка, дзе знаходзіцца гісторыка-культурны аб’ект |
|---|---|---|
| 5 рублёў | Камянецкая вежа | Брэсцкая вобласць |
| 10 рублёў | Спаса-Праабражэнская царква ў г. Полацку | Віцебская вобласць |
| 20 рублёў | Палац Румянцавых і Паскевічаў у г. Гомелі | Гомельская вобласць |
| 50 рублёў | Мірскі замак у г. п. Мір | Гродзенская вобласць |
| 100 рублёў | Радзівілаўскі замак у г. Нясвіжы | Мінская вобласць |
| 200 рублёў | Магілёўскі абласны мастацкі музей імя П. В. Масленікава | Магілёўская вобласць |
| 500 рублёў | Нацыянальная бібліятэка Рэспублікі Беларусь | г. Мінск |

Тэматыка выяў на банкнотах аб’ядноўваецца дэвізам «Мая краіна – Беларусь». На іх адлюстраваны выбітныя аб’екты гісторыі і культуры кожнай з шасці абласцей Беларусі і асобна г. Мінска.

Некаторыя асаблівасці банкнот узору 2009 г. (напрыклад, факсіміле подпісу на банкнотах тагачаснага старшыні праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь П. П. Пракаповіча; вызначэнне наміналу на банкноце ў 50 рублёў у варыянце «пяцьдзесят», што не адпавядае сучаснаму правапісу; адсутнасць назваў прадстаўленых на банкнотах архітэктурных аб’ектаў) мадыфікаваліся ў працэсе далейшага абнаўлення грашовай масы.

У гонар беларускіх грошай у 2019 г. была выпушчана серыя паштовых марак «Гісторыя грашовых знакаў Беларусі» (3 маркі – А, N, Р і тры марачныя блокі), якая прадстаўляе банкноты 1992–2009 гг.

У беларускіх папяровых грашовых знаках выкарыстоўваецца пэўная колькасць элементаў аховы ад падробкі, інфармацыя пра частку з якіх знаходзіцца ў адкрытым доступе:

– усе выявы на папяровых грашовых знаках выконваюцца толькі рыскамі рознай шырыні;

– выкарыстоўваецца спецыяльная высакаякасная папера белага і таніраванага (светла-ружовага, светла-аліўкавага, бронзавага) колеру з характэрным храбусценнем;

– у працэсе выраблення паперы ў яе ўводзяць ахоўныя каляровыя валокны (рознакаляровыя кавалачкі сінтэтычных нітак памерам 3–5 мм), якія хаатычна размяшчаюцца на банкноце і пад уздзеяннем ультрафіялету пачынаюць свяціцца;

– вадзяныя знакі ўяўляюць сабой бачныя на прасвет цёмныя і светлыя выявы, што ўтвараюцца ў працэсе папяровай вытворчасці ў выніку тэхналагічнага станчэння папяровай масы пад ціскам спецыяльных валікаў з адпаведным рэльефным малюнкам. Гэта можа быць аднастайны ўзор ці асобны малюнак у рэчышчы сюжэта пэўнай банкноты;

– у банкноты могуць быць устаўлены пластыкавыя, ці металізаваныя ніткі шырынёй 1–2 мм, якія часам на адным з бакоў папяровага грашовага знака выходзяць на паверхню («ніткі, якія ныраюць»);

– асобныя выявы, лічбы, словы і літары могуць мець павялічаную таўшчыню фарбавага слоя (металаграфічны друк), што стварае магчымасць добрага ўспрымання іх навобмацак;

– на банкноце можа быць мікратэкст – бесперапынна паўтаральны тэкст, які чытаецца пры дапамозе лупы;

– шырока выкарыстоўваецца антыкапіравальная сетка, утвораная тонкімі лініямі, што паўтараюцца, якія скажаюцца пры сканіраванні;

– для людзей са слабым зрокам для вызначэння на банкнотах наміналаў існуюць спецыяльныя знакі, якія выконваюцца рэльефным друкам;

– выкарыстоўваюцца сумяшчальныя выявы, калі пры праглядзе банкноты на святло неафарбаваныя элементы аверса запаўняюцца колерам фрагментаў рэверса, ствараючы адзіны малюнак;

– на банкнотах існуюць схаваныя выявы, напрыклад, літары «РБ» становяцца бачнымі пры разглядзе банкноты пад вострым вуглом да крыніцы святла;

– выкарыстоўваецца металізаваная фарба, якая змяняе ступень бляску пры трапленні на яе яркага праменя святла;

– выкарыстоўваецца фарба, якая змяняе колер пры нахіле банкноты;

– выкарыстоўваецца неафарбаванае цісненне, што бачна пры коса падаючым святле;

– элементы аховы, якія ва ўльтрафіялетавых праменях набываюць розныя колеры;

– выкарыстоўваецца «ірысавы» раскат, калі адбываецца плаўны пераход ад аднаго колеру ў другі, а ў зоне змешвання фарбаў з'яўляецца новы трэці колер;

– выкарыстоўваецца «арлоўскі» друк – шматкаляровы друк з рэзкім (дыскрэтным) пераходам колераў без разрываў і сумяшчэнняў.

* * *

З 1996 г. у Рэспубліцы Беларусь пачынаецца выпуск памятных манет [8]. 27 снежня 1996 г. была адчаканена памятная беларуская манета з нагоды 50-годдзя Арганізацыі Аб’яднаных Нацый [14; 39]. Беларусь як адна з краін-заснавальніц ААН удзельнічала ў юбілейнай міжнароднай нумізматычнай праграме.




Рэспубліка Беларусь. Памятная манета,
прысвечаная 50-годдзю заснавання ААН.
1 рубель. 1996 г. Золата. Ø 22,05 мм

Манета была выканана ў золаце (916,7º), срэбры (925º) і медна-нікелевым сплаве.

На аверсе размешчаны выява дзяржаўнага герба, назва краіны, дата, а таксама вызначэнне пробы, металу, масы.

На рэверсе – выява бусла на фоне контуру карты Беларусі, знізу злева – эмблема ААН і лічба 50, кругавая легенда «Нацыі, аб’яднаныя за мір 1945–1995» і вызначэнне наміналу «1 рубель». Манеты чаканены на Каралеўскім манетным двары (Лондан). Гэтай эмісіяй быў пакладзены пачатак чаканкі беларускіх памятных манет.

Пры адсутнасці свайго манетнага двара Рэспубліка Беларусь мае магчымасці выбару тых манетных двароў, дзе выкарыстоўваюцца найноўшыя сучасныя вытворчыя тэхналогіі. Памятныя манеты Нацыянальнага банка чаканіліся на манетных дварах Вялікабрытаніі, Польшчы, Балгарыі, Швейцарыі, Германіі, Літвы, Казахстана, Расіі.

У Беларусі былі выпушчаны шматлікія серыі памятных манет і адзінкавыя мемарыяльныя манеты, прысвечаныя выбітным асобам, аб’ектам гісторыка-культурнай спадчыны краіны, гістарычным падзеям, шматлікім юбілейным датам, спартыўнай тэматыцы, народным паданням, казкам, святам, традыцыям беларусаў, жывёльнаму і расліннаму свету і інш. [43–45].




Рэспубліка Беларусь.
Памятная манета
серыі «Ахова навакольнага асяроддзя». 50 рублёў.
2002 г. Золата. Ø 25 мм




Рэспубліка Беларусь.
Памятная манета
серыі «Умацаванне і абарона дзяржавы». 20 рублёў.
2005 г. Срэбра. Ø 38,61 мм




Рэспубліка Беларусь.
Памятная манета
серыі «Гісторыя і культура Беларусі». 200 рублёў.
2005 г. Золата. Ø 40 мм




Рэспубліка Беларусь.
Памятная манета
серыі «Праваслаўныя святыя».
50 рублёў.
2008 г. Золата. Ø 21 мм




Рэспубліка Беларусь.
Памятная манета
серыі «Сямейныя
традыцыі славян». 20 рублёў.
2008 г. Срэбра. Ø 38,61 мм




Рэспубліка Беларусь.
Памятная манета
серыі «Знакі задыяка».
20 рублёў. 2009 г.
Срэбра. Ø 38,61 мм




Рэспубліка Беларусь.
Памятная манета
«Грунвальдская бітва.
600 гадоў». 50 рублёў.
2010 г. Золата. Ø 22 мм

Можна адзначыць серыю «Архітэктурная спадчына Беларусі» (выпускі 2019, 2020, 2021), якая першай сярод беларускіх памятных манет распрацавана на падставе спецыфікацыі рэгулярных біметалічных манет наміналам два рублі (гл. 3-ю старонку вокладкі).

Беларускія памятныя манеты паспяхова ўдзельнічалі ў міжнародных конкурсах памятных манет, дзе атрымалі шмат прызавых месцаў. Удзел у міжнародных праграмах дае магчымасць папулярызацыі і ў выніку паспяховай рэалізацыі беларускіх манет на міжнародным рынку.

!!

*Станаўленне ўласнай грашовай сістэмы Рэспублікі Беларусь прайшло шэраг этапаў. Да 1994 г. разліковыя білеты 1992 г. выпуску знаходзіліся ў паралельным абарачэнні з савецкімі грашовымі адзінкамі. У краіне тройчы (1994, 2000, 2016) праводзілася дэнамінацыя. У 2016 г. былі ўведзены ў абарачэнне білеты Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь узору 2009 г. Тэматыка беларускіх памятных манет ахоплівае шырокі спектр напрамкаў развіцця нашай гісторыі і культуры.*

## Пытанні і заданні для самакантролю

1. Калі з’явілася ў абарачэнні і як выглядала першая серыя разліковых білетаў Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь?
2. Чым былі выкліканы мадыфікацыі банкнот узору 2000 г.?
3. Калі і з якой мэтай у Рэспубліцы Беларусь праводзіліся дэнамінацыі?
4. Назваць асаблівасці першай дэнамінацыі 1994 г.
5. Якой падзеі была прысвечана першая беларуская памятная манета?
6. Даць характарыстыку ахоўным элементам беларускіх банкнот узору 2009 г.
7. Якія архітэктурныя аб’екты можна пабачыць на беларускіх банкнотах узору 2009 г.?

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ


*1.* Ад рымскага дэнарыя да беларускага рубля : каталог выставы / склад.: Р. І. Крыцук, В. М. Сідаровіч, А. В. Талкачова. – Мінск : Кнігазбор, 2018. – 104 с.

*2.* Банкноты и монеты Национального банка Республики Беларусь. 1992–2003. – Минск : Транстэкс, 2003. – 125 с.

*3. Баюра, А.* Денежная реформа 1922–1924 гг. и эмиссии бумажных денег / А. Баюра // Банкаўскі веснік. – 2013. – № 7 (588). – С. 55–62.

*4. Баюра, А.* Денежное обращение в Беларуси периода становления Советской власти (1917–1921) / А. Баюра // Банкаўскі веснік : материалы III Междунар. нумизмат. конф. «Монета – символ государства», 27–29 авг. 2007 г. – 2008. – № 7 (408). – С. 30–34.

*5. Белявец, В.* Алекшыцкі манетна-рэчавы скарб эпохі Вялікага перасялення народаў / В. Белявец, В. Сідаровіч // Банкаўскі веснік : материалы Междунар. нумизмат. конф. «Сохраняя прошлое – строим будущее», 5–6 окт. 2017 г. Часть II. – 2018. – № 2 (655). – С. 3–16.

*6.* Введение в специальные исторические дисциплины : учеб. пособие / Т. П. Гусарова [и др.]. – М. : Изд-во МГУ, 1990. – 280 с.

*7. Воробьева, А.* Музейному фонду Национального банка Республики Беларусь – 10 лет / А. Воробьева // Банкаўскі веснік : материалы III Междунар. нумизмат. конф. «Монета – символ государства», 27–29 авг. 2007 г. – 2008. – № 7 (408). – С. 16–18.

*8. Воробьева, А.* Памятные монеты – гордость Республики Беларусь / А. Воробьева // Банкаўскі веснік : материалы IV Междунар. нумизмат. конф. «Нумизматы и коллекции», 6–8 окт. 2009 г. – 2010. – № 7 (480). – С. 111–114.

*9. Гrималаускайте, Д.* Монеты Великого княжества Литовского в свете новых открытий: Литва (конец XX – начало XXI в.) / Д. Грималаускайте // Средневековая нумизматика Восточной Европы. – М., 2006. – Вып. 1. – С. 137–161.

*10. Грузицкий, Ю.* Первая послевоенная реформа (к 65-летию денежной реформы 1947 г.) / Ю. Грузицкий // Банкаўскі веснік. – 2013. – № 10 (591). – С. 56–62.

*11. Гужалоўскі, А. А.* Нараджэнне беларускага музея / А. А. Гужалоўскі. – Мінск : НАРБ, 2001. – 124 с.

